Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
«Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы»

Кафедра гісторыі Беларусі, археалогіі
і спецыяльных гістарычных дысцыплін

Э. С. Ярмусік

# КАНФЕСІЙНАЯ ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

*Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь
у якасці вучэбнага дапаможніка для студэнтаў устаноў
вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці «Сацыялогія»,
«Гісторыя (па напрамках)»*

Мінск
РІВШ
2016

УДК 94(476):2(075.8)
ББК 63.3(4)Беи:86.3
Я75

Р э ц э н з е н т ы :
прафесар кафедры філасофіі
Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта,
доктар філасофскіх навук прафесар *Т. П. Кароткая;*

дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і ўсходніх славян
Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова,
кандыдат гістарычных навук дацэнт *Т. В. Апіок;*

загадчык кафедры беларускага мовазнаўства Беларускага
дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка,
кандыдат філалагічных навук дацэнт *Д. В. Дзятко*

**Ярмусік, Э. С.**
Я75 Канфесійная гісторыя Беларусі : вучэб. дапам. / Э. С. Ярмусік. – Мінск : РІВШ, 2016. – 200 с.
ISBN 978-985-500-989-5.

У дапаможніку разглядаюцца важнейшыя этапы і падзеі канфесійнай гісторыі Беларусі ад старажытных часоў да сучаснасці. Аналізуецца дзейнасць на беларускіх землях важнейшых канфесій: праваслаўя, каталіцызму, пратэстантызму, мусульманства, іўдаізму. Раскрываецца іх роля ў гістарычным, грамадска-палітычным, сацыякультурным развіцці грамадства.

Адрасуецца студэнтам, магістрантам, аспірантам гуманітарных спецыяльнасцей.

**УДК 94(476):2(075.8)**
**ББК 63.3(4)Беи:86.3**

**ISBN 978-985-500-989-5**

© Ярмусік Э. С., 2016
© Афармленне. ДУА «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы», 2016

# УВОДЗІНЫ

Хрысціянства на беларускія землі прыйшло некалькі пазней, чым была афіцыйна хрышчана Русь (988 г.). Яму папярэднічаў доўгі перыяд існавання язычніцтва. З XIV ст. на беларускія землі сталі пранікаць іслам і іўдаізм, з другой паловы XVI ст. – пратэстантызм і ўніяцтва. Такая канфесійная палітра ў спалучэнні з этнічным фактарам адбівалася на палітычным, культурным, сацыяльным развіцці, а таксама на этнаканфесійных працэсах грамадства.

Беларускія землі за стагоддзі свайго існавання ўваходзілі ў склад розных дзяржаў – Кіеўскай Русі, Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага, Расійскай імперыі, а ў XX ст. – СССР і Польскай дзяржавы (Заходняя Беларусь). 27 ліпеня 1990 г. Вярхоўны Савет Беларускай ССР прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце БССР. З гэтага часу Беларусь пачала праводзіць сваю самастойную ўнутраную і знешнюю палітыку.

У кожнай з гэтых дзяржаў рэлігія і Царква як сацыяльны і грамадскі інстытут знаходзіліся ў розных умовах. У старажытнарускіх княствах і Расійскай імперыі дамінуючую ролю адыгрывала праваслаўе, у ВКЛ і Рэчы Паспалітай – каталіцтва. У СССР праводзілася бязбожная палітыка, скіраваная на вынішчэнне рэлігіі і суцэльную атэізацыю грамадства. Цяжкія выпрабаванні выпалі на долю канфесій у гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны. І толькі ў Рэспубліцы Беларусь склаліся абсалютна новыя дзяржаўна-канфесійныя адносіны, якія характарызуюцца роўнасцю ўсіх рэлігій перад законам, партнёрскімі адносінамі дзяржавы і Царквы дзеля вырашэння надзённых праблем беларускага грамадства, павышэннем ролі Царквы ў сацыяльным, грамадска-палітычным і культурным жыцці Беларусі.

У прапанаваным вучэбным дапаможніку, падрыхтаваным у адпаведнасці з дзяржаўнымі стандартамі вышэйшай адукацыі, коратка і даступна разглядаюцца асноўныя этапы канфесійнай гісторыі Беларусі, іх змест, праблемы. Раскрываецца роля канфесій у гістарычным, грамадска-палітычным і сацыякультурным развіцці беларускіх зямель, характарызуецца палітыка дзяржавы ў рэлігійнай сферы на

кожным гістарычным этапе. Матэрыял дапаможніка дазволіць павысіць агульнаадукацыйны і інтэлектуальны ўзровень студэнтаў, бо не ведаючы сваіх каранёў, чалавек лёгка можа патрапіць пад уплыў розных псеўдарэлігійных плыняў і сектаў.

Курс канфесійнай гісторыі Беларусі займае важнае месца ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў. Дысцыпліна вывучаецца аднačасова з іншымі нарматыўнымі і спецыяльнымі курсамі ў варыятыўнай частцы праграмы фарміравання спецыяліста-гуманітарыя (гісторыка, сацыёлага і інш.) сучаснага ўзроўню.

Вучэбны дапаможнік прызначаны для студэнтаў ВНУ, выкладчыкаў, настаўнікаў, а таксама для тых, хто цікавіцца гісторыяй рэлігіі і Царквы ў Беларусі.

## Тэма 1

# ХРЫСЦІЯНІЗАЦЫЯ РУСІ. ХРЫСЦІЯНСТВА Ў ГІСТОРЫІ ДЗЯРЖАЎ-КНЯСТВАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

*1.1. Дахрысціянскія вераванні нашых продкаў. Перадумовы пранікнення і ўвядзення хрысціянства на беларускіх землях.*

*1.2. Хрысціянства, яго сутнасць і прычыны ўзнікнення.*

*1.3. Хрышчэнне Русі князем Уладзімірам.*

*1.4. Хрысціянізацыя насельніцтва княстваў заходніх зямель Русі.*

*1.5. Роля хрысціянства ў развіцці культуры беларускіх зямель.*

## 1.1. Дахрысціянскія вераванні нашых продкаў. Перадумовы пранікнення і ўвядзення хрысціянства на беларускіх землях

Задоўга да прыняцця хрысціянства продкі сучасных беларусаў прытрымліваліся вераванняў, прынесеных сюды індаеўрапейцамі на рубяжы III–II тысячагоддзяў да н. э., а ў аўтахтоннага насельніцтва – існаваўшых яшчэ раней. Найбольш старажытныя і прымітыўныя вераванні людзей былі звязаны з пакланеннем прыродным аб'ектам і духам.

***Фетышызм*** (ад франц. *fetisch* – амулет) – вера ў звышнатуральныя ўласцівасці прыродных (камяні, дрэвы) альбо зробленых чалавекам неадушаўлёных прадметаў (фетышаў), пакланенне ім. Фетышызм з'яўляецца састаўным элементам усіх язычніцкіх вераванняў, а таксама ўсіх монатэістычных рэлігій (крыж, абразы ў хрысціян, чорны камень у мусульман і інш.).

***Татэмізм*** (татэм – у паўночна-амерыканскіх індзейцаў літаральна азначае «яго род») – комплекс вераванняў, міфаў, абрадаў і звычаяў, звязаных з уяўленнямі пра роднасць паміж групай людзей (родам, фратрыяй) і татэмам (пэўным відам жывёл, раслін, радзей – з'яў прыроды ці неадушаўлёнымі прадметамі), абагаўленне іх, пакланенне ім (вуж у балцкіх плямёнаў, карова ў індусаў, кошка ў егіпцян і інш.). Яны выяўляліся ў разнастайных формах:

- выявы татэмічных істот на сценах дамоў і на дэталях адзення;
- звычай урачыстага пахавання памерлых татэмаў;
- выкарыстанне ў якасці абярэгаў асобных частак цела татэмічных жывёл (зубы, скура, галава, пер'е, косці);
- звычай пераапранання ў скуру жывёл падчас свят, рытуальныя татэмічныя танцы;
- легенды, паданні, казкі пра паходжанне роду ад пэўнага татэма.

***Анімізм*** (ад лац. *animus* – душа, дух) – вера ў існаванне душ і духаў – фантастычных істот, надзеленых свядомасцю, воляй і іншымі ўласцівасцямі чалавека, якія дзейнічаюць ва ўсёй жывой і нежывой прыродзе (духі прыроды, хатнія духі і інш.). Анімістычныя ўяўленні з'яўляюцца прыкметнымі элементамі хрысціянства.

У VI–VIII стст. землі сучаснай Беларусі, Расіі і Украіны засяляліся славянскімі плямёнамі. Славяне былі язычнікамі.

***Язычніцтва*** (ад царк.-слав. *языцы* – народы, чужаземцы), ***паганства*** (ад лац. *paganus* – язычнік ) – прыняты ў багасլоўі і ўмоўна ў гістарычнай літаратуры тэрмін, які абазначае старадаўнія вераванні і культы, што існавалі да «вышэйшых» рэлігій (хрысціянства, ісламу, будызму). Язычніцтва ўключае рознастадыяльныя ўяўленні, ідэалагічныя напластаванні розных гістарычных эпох (анімізм, фетышызм, татэмізм і інш.). Яно ўзнікла як вынік поўнай залежнасці старажытнага чалавека ад сіл прыроды. Немагчымасць даць тлумачэнне прыродным з'явам прывяла да таго, што людзі звязвалі іх з дзейнасцю звышнатуральных сіл. На іх думку, у акружаючым іх свеце дзейнічалі злыя і добрыя духі, якія пастаянна паміж сабой змагаліся. Вельмі важнымі былі боствы, звязаныя з сіламі прыроды, якія ўплывалі на земляробства.

Вярхоўным боствам славян быў Род – Бог Неба, прабацька ўсяго: і свету, і багоў, і людзей. Яго пануючая роля засталася і ў беларускай лексіцы: *родны, парода, радзіма, ураджай, радзіць, прырода.* Бог Род першапачаткова называўся Дзіў, Дый. Такімі ж якасцямі, што і Род, надзяляліся Сварог (ад санскрыцкага *svarga* – неба), Стрыбог, Святавіт. Гэта таксама назвы вобраза Бога Неба, толькі ва ўяўленнях розных славянскіх плямёнаў, розных прафесій (так, кавалі пакланяліся Сварогу, мараходы – Стрыбогу).

Далей пад рознымі назвамі ідуць Багі Сонца, народжаныя вярхоўным боствам Родам, – Дажджбог, Каляда, Сотвар, Сура, Ярыла, Вялес. Так, Ярыла быў Богам веснавой урадлівасці і плоданашэння. Нашы продкі ўяўлялі яго прыгожым юнаком у белым адзенні, на белым кані, з пучком каласоў у руцэ. Вясной Ярыла адчыняў вароты на небе, спускаўся на зямлю, аб'язджаў палеткі, нівы, апладняў зямлю. Яго клопат – даваць жыццё не толькі хлебу, ураджаю, але і чалавеку – прыносіць дзяцей. У беларускіх міфах Ярыла згадваецца як апякун кахання, распаляе цялесны запал (таму не лічылася злачынствам пад яго покрывам і саграшыць у каханні). Легенды згадваюць, што вершнік на старажытным гербе «Пагоня» – гэта язычніцкі бог Ярыла.

Боствам сонца ў беларусаў выступала таксама Каляда. З гэтым вобразам звязана свята, якое прыходзілася на зімовы сонцаварот. Святкуюць яго і сёння з цікавымі абрадамі, калstriднымі песнямі. Вялікае свяціла Сонца з'яўлялася пад рознымі імёнамі, што адлюстроўвалі яго разнастайныя функцыі ў розную пару года: узімку – Каляда, вясной – Ярыла, у летні сонцаварот – Купала, Бог дастатку і ўраджаю.

Цанілі на Беларусі і ўшаноўвалі Бога Вялеса – апекуна абрадавай паэзіі і язычніцкіх святароў – вешчуноў (волхваў), Бога жывёлагадоўлі і багацця, а таксама мастацтва і паэзіі. «Слова пра паход Ігаравы» называе паэта Баяна ўнукам Вялеса. Багіняй летняй і асенняй урадлівасці была Цёця, ці Цётка. Па ўяўленнях нашых продкаў, гэта мажная пажылая жанчына, якая з'яўлялася на палетках, прыбраная ў спелыя каласы, з вянком на галаве і спелымі пладамі ў руках (з тых даўніх часоў захаваліся прымаўкі, звязаныя з гэтай «багіняй»: «Голад – не цётка: піражок не падсуне» альбо «Голад – не цётка: падапрэ – і лыка з'ясі»).

Адным з галоўных Багоў падчас хрышчэння ўсходніх славян, у тым ліку і продкаў беларусаў, лічыўся Пярун – грозны Бог грому і маланкі (бліскавіцы), караючы Бог агню і мяча, апякун ваеннага майстэрства. Звесткі пра яго найлепш захаваліся ў народнай памяці: у беларускай вёсцы састарэлыя людзі дагэтуль маланку называюць Перуном. Яго ўяўлялі сівавалосым волатам, які панаваў над зямлёй з вясны да восені, усё падпарадкоўваючы сваёй магутнай сіле.

Продкі лічылі, што падчас навальніцы Пярун на сваёй вогненнай калясніцы раз'язджаў па небе, удараў камянямі жорнаў адзін аб другі, тым самым выклікаў бліскавіцы і гром. Знойдзеныя на Беларусі каменныя сякеры называлі перуновымі стрэламі. Нацёртым з іх парашком лячыліся ад розных хвароб, жадаючы набыць моц і сілу Перуна. Людзі не маглі зразумець прычыны навальніцы, грому, удараў маланкі, лічылі, што гэта злуецца Бог Пярун, таму стараліся яго ўлагодзіць, прыносілі ахвяры да капішчаў, пабудаваных у яго гонар, стваралі ідалаў.

Шмат іншых багоў, менш значных, чым Бог Неба і Сонца, шанавалі нашы першабытныя продкі: Вярба – багіня вясны і абуджэння прыроды; Лёля (Ляля) – багіня вясны, дзявочай прыгажосці і кахання; Пераплут – Бог весялосці; Тур – боства дзікіх звяроў; Жыжаль – Бог агню і апякун кавальскай справы і інш.

Бліжэй да рэальнага жыцця чалавека існавала мноства духаў ніжэйшага рангу, духаў дабра і зла: дамавікі, хлеўнікі, гуменнікі, лесавікі, вадзянікі, свіцязянкі, ваўкалакі і іншыя істоты. Іх таксама трэба было ўлагоджваць, шанаваць, каб яны дапамагалі ў гаспадарцы, спрыялі яе дабрабыту, а не шкодзілі ва ўсім.

Апошнімі значыліся духі (бoствы) смерці і замагільнага існавання: Баба-Яга – багіня смерці; Зніч – бог пахавальнага агню ў беларусаў; Велямос (Велес) – бог замагільнага свету і інш.

Чаму нашы продкі шанавалі гэтых шматлікіх багоў?

Узровень жыцця старажытнага чалавека, яго ведаў аб навакольным асяроддзі быў вельмі нізкі: ён не мог растлумачыць тыя ці іншыя з'явы прыроды і таму прыпісваў іх волі багоў. А значыць – ім пакланяліся, стараліся задобрыць запрашэннем на трапезу, ахвярапрынашэннямі, схіліць да сябе малітвамі, заклінаннямі. У гонар багоў рабілі ідалаў-куміраў: спачатку з дрэва, потым з камянёў, будавалі ідальскія свяцілішчы (капішчы). Часта іх акружалі валам ці рвом, запальвалі рытуальны агонь. Культы звычайна адпраўлялі жрацы, якія маглі гэта рабіць, і старэйшыны родаў і плямёнаў, князі. Пасля прыняцця хрысціянства ўсе язычніцкія культы пачалі знішчаць і ганьбіць. Але доўга яшчэ панавала і двухвер'е: хрысціянства і язычніцтва.

## 1.2. Хрысціянства, яго сутнасць і прычыны ўзнікнення

***Хрысціянства*** (ад грэч. *Christos* – памазанік) – адна з самых распаўсюджаных і развітых сусветных рэлігій, паслядоўнікі якой пакланяюцца Ісусу Хрысту. Хрысціянства з'яўляецца монатэістычнай рэлігіяй, якая прызнае адзінага Бога як вышэйшы абсалют, што стварыў свет і чалавека «па вобразе і падабенству свайму» (у адрозненне ад язычніцкага шматбожжа).

Хрысціянства ўзнікла ў першай палове I стагоддзя нашай эры ва ўсходніх правінцыях Рымскай імперыі сярод іўдзейскага сектанцтва, яго ніжэйшых слаёў. Пазней яно пачало распаўсюджвацца сярод іншых этнічных і сацыяльных груп. У ходзе свайго развіцця яно распалася на чатыры асноўныя галіны: старажытныя ўсходнія (нехалкідонскія) цэрквы, праваслаўе, каталіцызм і пратэстантызм. У сваю чаргу ў кожнай з іх вылучыліся розныя плыні, напрамкі, групы, секты.

Якія ж асноўныя дагматы хрысціянскай рэлігіі?

Зменены вобраз Бога: у хрысціянстве Ён – глыбокая тайна, любоў да чалавека; Бог – творца ўсяго свету і людзей таксама; трыадзінства Бога – Бог адзіны, але ў трох асобах: Бог Айцец, Бог Сын і Бог Дух Святы; вера ў Месію, божага выратавальніка, другое прышэсце Хрыста; Сын Божы – ёсць сапраўдны Бог, народжаны ад Бога Айца праз Духа Святога; Сын Божы народжаны (ад звычайнай жанчыны), а не створаны (праз беззаганнае зачацце Дзевы Марыі); з'яднанне ў Хрысце двух пачаткаў – божага і чалавечага; падзел на два пачаткі ў чалавеку: духоўнае і цялеснае (у хрысціян – перавага духу над целам, як у старажытных язычнікаў-грэкаў; перавага цялеснага – моцныя фізічна атлеты); роўнасць усіх людзей перад Богам (Хры-

стос – абаронца бедных, негатыўныя адносіны да багатых у раннім хрысціянстве); сусветная грахоўнасць людзей, пачынаючы з першароднага граху; існаванне дабра і зла ў свеце. Пачатак зла ідзе ад Адама і Евы; смяротнасць чалавека, бессмяротнасць душы, яе выратаванне шляхам бесперапыннага духоўнага ўдасканалення; вера ў страшны суд, выратаванне.

Галоўная каштоўнасць хрысціянства – маральна-этычная праблематыка (ад іўдзеяў – 10 запаведзяў Маісея і яе вяршыня – Нагорная пропаведзь Хрыста (гл. Евангелле ад Матфея, гл. V)). Хрысціянства паклала пачатак новай культуры, прызнала ў чалавеку асобу. Чалавек – зямное ўвасабленне Бога, створанае па вобразе і падабенству свайму. Асноўныя дагматы змешчаны ў Свяшчэннай кнізе хрысціян – Бібліі, якая складаецца з дзвюх частак – Ветхага Запавету (іўдзейская Тора) і выключна хрысціянскай – Новага Запавету (з чатырох Евангелляў).

На працягу доўгага часу хрысціянства падвяргалася ганенням з боку рымскіх улад, ішла жорсткая барацьба з язычніцтвам. І толькі ў IV ст., распазнаўшы сутнасць хрысціянскай ідэалогіі, рымскія імператары для забеспячэння пакорнасці народных мас сталі абапірацца на хрысціянскую арганізацыю. Былі закрыты ўсе язычніцкія храмы, а хрысціянства з рэлігіі, якая праследавалася,ператварылася ў дзяржаўную і хутка набыла сусветны характар. З VI ст. хрысціянства пачало распаўсюджвацца па ўсёй заходняй Еўропе, а з канца X ст. яго прынялі ўсходнія славяне – Кіеўская зямля, Наўгародская, Полацкая.

Якія прычыны садзейнічалі хрысціянізацыі Еўропы? Хрысціянская ідэалогія звярталася да ўсіх людзей свету без уліку іх этнічнай, нацыянальнай прыналежнасці. Яна адпавядала інтарэсам усіх сацыяльных слаёў (і бедных, і багатых), без уліку сацыяльнай прыналежнасці. Язычніцкая рэлігія ўжо не задавальняла патрэбы грамадства: яна стала тормазам у станаўленні новага феадальнага ладу, яго палітычнага, эканамічнага і сацыяльнага развіцця. Язычніцтва не магло забяспечыць новых адносін панавання і падпарадкавання, прыводзіла да дарэмнага знішчэння матэрыяльных і людскіх рэсурсаў, не спрыяла развіццю нацыянальнай культуры, бо тармазіла міжнародныя сувязі з хрысціянскімі краінамі і ўскладняла азнаямленне з дасягненнямі замежнай цывілізацыі. Хрысціянскі Бог станавіўся тайнай для людзей, язычніцкія ж (і грэчаскія, і рымскія, і славянскія) такімі не былі – жылі побач з людзьмі, займаліся часта распустай, здрадай. Людзі ім больш не верылі, таму колькасць паслядоўнікаў хрысціян павялічвалася даволі хутка.

# 1.3. Хрышчэнне Русі князем Уладзімірам

У IX ст. адбываліся істотныя змены ў грамадскім ладзе ўсходніх славян. Распад рода-племянных адносін прывёў да фарміравання феадальнага грамадства і ўтварэння дзяржаў-княстваў. У 882 г. у выніку паходу варажскага князя Алега з Ноўгарада ў Кіеў і захопу ім кіеўскага прастола ўтварылася дзяржава Русь, або Кіеўская Русь. Яна была адной з магутнейшых еўрапейскіх дзяржаў таго часу.

Існуючая рода-племянная (язычніцкая) рэлігія не адпавядала інтарэсам класавага (феадальнага) грамадства. Таму ў X ст. узнікла патрэба ў новай рэлігіі, якая адначасова з'явілася б і дзяржаўнай. Паводле летапісу, да кіеўскага князя Уладзіміра (960–1015) прыходзілі пасланнікі розных рэлігій: мусульманскай, іўдзейскай, каталіцкай. Кожны з іх імкнуўся расказаць аб перавазе сваёй рэлігіі. Аднак выбар князя Уладзіміра выпаў на «грэчаскую веру» – так у той час называлі праваслаўе.

Аб хрысціянстве на Русі ведалі даўно. Сярод дружыннікаў князя Уладзіміра былі хрысціяне, для якіх у Кіеве была пабудавана царква ў гонар св. прарока Ільі. Да Уладзіміра кіеўская княгіня Вольга (890–969 гг.) была хрысціянкай. Яе хрышчэнне, на думку некаторых даследчыкаў, магло адбыцца ў Канстанцінопалі (Царградзе) падчас візіту рускага пасольства (954–955 гг.).

Для любой рэлігіі характэрна вера ў звышнатуральнае. Вера славян у Рода, бостваСусвету, усёй прыроды і ўрадлівасці, затым Перуна сведчыла аб адносным манатэізме, што аб'ектыўна рыхтавала свядомасць старажытнарускага чалавека да ўспрыняцця новай рэлігі – аднабожжа, хрысціянскай рэлігіі. Асноўнае адрозненне візантыйскага праваслаўя, якое склалася як усходняя галіна хрысціянства пасля падзелу Рымскай імперыі (395 г.), ад старажытнарускай рэлігіі заключаецца ў тым, што яны адлюстроўваюць: першая – больш развітыя феадальныя адносіны, больш развітую свецкую культуру Візантыі, другая – разлажэнне першабытнаабшчынных адносін, а ў рэфармаваным выглядзе – з наданнем Перуну функцый вярхоўнага Бога – і фарміруючыя феадальныя адносіны. Сходнасць рэлігій у тым, што яны адлюстроўваюць рэальныя адносіны ў ілюзорнай форме.

Хуткаму пранікненню і распаўсюджанню хрысціянства садзейнічалі цесныя сувязі Русі з Візантыяй. Візантыйская імперыя была магутнейшай і багацейшай дзяржавай, імперыяй рамееў – так называлі сябе візантыйцы, якія лічылі сябе прадаўжальнікамі спра-

вы рымлян. Падобна ўсходнім уладарам, візантыйскі імператар з'яўляўся намеснікам боства на зямлі, і ўлада яго нічым не была абмежавана.

Князь Уладзімір добра ўсведамляў ролю і значэнне хрысціянства для ўмацавання дзяржаўнасці, пашырэння міжнародных сувязяў Русі, развіцця культуры. Прыняцце «грэчаскай веры» – праваслаўя – было гістарычнай неабходнасцю, бо ўраўноўвала Русь з астатнімі еўрапейскімі дзяржавамі, дзе на язычнікаў глядзелі як на непаўнапраўных. У 987 г. ён сам хрысціўся ў Корсуні (грэчаская калонія, зараз г. Херсанес, Крым), а ў 988 г. па яго загаду грэчаскае духавенства хрысціла дружыну князя, яго баяр і жыхароў Кіева. Хрышчэнне адбылося ў рацэ Днепр. Гэтая падзея вядома як Хрышчэнне Русі.

Але князь Уладзімір не спыніўся на хрышчэнні кіяўлян. Ён паслаў духавенства хрысціць жыхароў усіх гарадоў, якія знаходзіліся пад яго ўладай. У Іпацьеўскім летапісе сказана: «Володимеръ же просвещенъ самъ и сонове Яго и земля его … И нача ставити по градомъ церкви и попы и люди на крещенье приводити по всемъ градомъ и селом».

Спачатку хрысціянства закранула толькі княжацка-баярскую вярхушку, але з цягам часу яно распаўсюдзілася і на ўсе іншыя слаі насельніцтва.

Прыняцце хрысціянскай веры на Русі паклала пачатак глыбокім пераўтварэнням не толькі духоўнага, дзяржаўнага і грамадскага характару, але і спрыяла далучэнню шырокіх народных мас да высокай духоўнай культуры, паднімала ўзровень маральнасці, выпрацоўвала новыя ўяўленні аб жыцці і зямным прызначэнні чалавека.

Князь Уладзімір зрабіў адказны крок да таго, каб хрысціянства стала дзяржаўнай рэлігіяй. На той момант гэта было знакавым рашэннем. Князь Уладзімір увайшоў у гісторыю як чалавек, які ўвёў на падуладных яму землях хрысціянства і фактычна стварыў Русь, аб'яднаў народ у паўнацэнную дзяржаву з адзінай рэлігіяй. Усходнія славяне хутка засвоілі азы праваслаўнай культуры.

Працэсы інстытуцыялізацыі сям'і, дзяржавы і Царквы ішлі на Русі практычна паралельна. Прыняцце хрысціянства мела базавае значэнне для развіцця сямейна-роднасных адносін. За іх узор была ўзята хрысціянская візантыйская мадэль. Праваслаўе азначала новую фазу ў станаўленні славянскай сям'і – стварэнне і ўмацаванне манагаміі. Забарона палігаміі і пашырэнне сферы манагаміі шлюбу кардынальна змянілі сямейныя нормы і каштоўнасці ўсходніх сла-

вян. Да Хрышчэння Русі лічылася нармальным мець наложніц, выкрадаць дзяўчын, лёгка сыходзіцца і разыходзіцца. Цяпер жа сямейныя справы былі перададзены пад кантроль Царквы.

Хрысціянства паступова выцясняла язычніцкія вераванні, звычаі і абрады славян. На змену ім прыходзіла новая культура, якая спалучала ў сабе дасягненні еўрапейскай і традыцыйнай усходнеславянскай культуры. Гэта садзейнічала хуткаму развіццю пісьменства, архітэктуры, музыкі, іканапісу, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і інш.

## 1.4. Хрысціянізацыя насельніцтва княстваў заходніх зямель Русі

Пранікненне хрысціянства не было аднаразовым і спецыяльна арганізаваным актам. Яно пранікала ў славянскі свет у ходзе міжнародных дыпламатычных і гандлёвых сувязяў, дынастычных шлюбаў, ваенных дзеянняў. Садзейнічалі абмену рэлігійнай інфармацыяй працяглыя кантакты асобных людзей з іншымі народамі. Князі амаль усіх славянскіх зямель наймалі да сябе ў дружыны чужаземцаў, якія з’яўляліся носьбітамі культуры свайго народа і засвойвалі культуру і ідэалогію краіны наймальніка.

На землі сучаснай Беларусі хрысціянства таксама прыходзіла рознымі шляхамі. У Палессі, на землях дрыгавічоў, новая рэлігія ўсталявалася адносна мірным шляхам. Існуе легенда аб каменных крыжах, якія прыплылі па Дняпру і Прыпяці з Кіева і акрывавілі воды ў раёне Турава і Пінска. Уражаныя такім відовішчам, палешукі прынялі новую веру.

Некалькі па-іншаму працэс хрысціянізацыі адбываўся на землях крывічоў, якія не былі падпарадкаваны Кіеву. Старажытны Полацк імкнуўся праводзіць незалежную палітыку. Як сведчаць некаторыя гісторыкі, хрысціянства ўсходняга абраду (пазней – праваслаўе) у Полацкім княстве было перанята непасрэдна з Візантыі, улічваючы яго знаходжанне на шляху «з варагаў у грэкі», а таксама сваяцкія адносіны полацкіх князёў з візантыйскімі імператарамі (дачка Усяслава Чарадзея – жонка візантыйскага імператара Аляксея Комніна, маці Еўфрасінні Полацкай таксама была з таго ж роду).

Полацкія князі разумелі, што прыняцце хрысціянства непазбежна. Да таго ж яны добра ўсведамлялі, якія выгады яно нясе для падтрымання ўлады пануючага класа і развіцця культуры. Афіцыйнай жа датай прыняцця хрысціянства на Беларусі лічыцца заснаванне Полацкай епархіі – 992 г. Першым полацкім епіскапам, які ўпамі-

наецца ў летапісе, быў Міна. Пасвячэнне яго ў гэты сан адбылося ў 1105 г.

Працэс хрысціянізацыі зацягнуўся на некалькі стагоддзяў, бо сутыкнуўся з моцнымі язычніцкімі традыцыямі. Барацьба хрысціянства з язычніцтвам ішла па двух напрамках. Па-першае, пачалі ганьбіць язычнікаў, знішчаць месцы адпраўлення іх культаў, а замест іх будаваць хрысціянскія храмы, спальваць драўляных ідалаў, каменных – скідваць у рэкі і інш.; па-другое, ішло прыстасаванне язычніцтва да хрысціянства: многія язычніцкія абрады і святы перайшлі ў хрысціянскія (Дзяды, Радуніца, Каляды, Купалле і інш.); культ агню – лампады, свечкі, культ вады – хрышчэнне; пакланенне ідалам, амулетам замянялі крыжамі, абразамі, скульптурамі, мошчамі святых.

У перыяд Кіеўскай Русі вызначыліся асноўныя сферы дзейнасці праваслаўнай Царквы, узнікла буйное царкоўнае землеўладанне, сфарміравалася епархіяльная структура, з'явіліся манастыры. Полацкая, Тураўская і іншыя епархіі, у склад якіх у розныя часы ўваходзілі беларускія землі, былі падпарадкаваны Кіеўскай мітраполіі, якая ў царкоўна-кананічных адносінах падначальвалася Канстанцінопальскаму патрыярхату. Цэнтрамі хрысціянізацыі былі гарады. У сельскай мясцовасці хрысціянізацыя адбывалася больш павольна і завяршылася ў канцы XII – пачатку XIII ст.

Першымі вядомымі хрысціянамі ў Полацкім княстве былі Рагнеда Рагвалодаўна (у хрышчэнні Анастасія) (960–1000 гг.) і яе сын Ізяслаў (?–1001 гг.). Рагнеда-Анастасія пашырала новую веру спачатку на Полаччыну, потым на Смаленшчыну і іншыя крывіцкія землі. Пазней для Рагнеды і яе сына па загаду князя Уладзіміра быў пабудаваны горад Ізяслаў (сучасны г. Заслаўе). Тут жа ў заснаваным ёю манастыры яна і памерла. Рагнеда была першай жанчынай-манахіняй у Старажытнай Русі. Выхаваны ў духу хрысціянскай маралі яе 11-гадовы сын Ізяслаў быў абраны на княжацкі прастол у Полацку і тым самым была адноўлена дынастыя полацкіх князёў Рагвалодавічаў. Другі яе сын Яраслаў, празваны Мудрым, за 35 гадоў княжэння ў Кіеўская Русі ўмацаваў дзяржаву, узняў яе на вяршыню магутнасці, пакінуў нашчадкам першы на Русі збор законаў – «Праўда Яраслава», пабудаваў у Кіеве Сафійскі сабор, заснаваў Кіеўскую мітраполію.

Але хрысціянства да нас ішло не толькі з Усходу (з Візантыі), але і з Захаду (з Рыма). Аб гэтым сведчаць летапісы і дадзеныя раскопак. Знойдзена таксама шмат лацінскіх (заходніх) бажніц XII ст. у

Полацку і Смаленску. Вядома, што адзін з першых лацінскіх прапаведнікаў св. Баніфацый быў забіты язычнікамі на Беларусі ў 1009 г. Каля 1010 г. тураўскі князь Святаполк (979–1019 гг.), які жаніўся на дачцэ князя (будучага польскага караля) Баляслава Храбрага, разам са сваімі падданымі прыняў хрост паводле заходняга абраду (пазней каталіцызм). Пры епіскапе Райнберне ў Тураве ўзнікла епіскапства заходняга абраду (паміж 1008 і 1013 гг.). У 1186 г. было заснавана Лівонскае (Рыжскае) епіскапства, якое аказвала ўплыў на рэлігійную сітуацыю суседніх з ім беларускіх зямель. Першым епіскапам часткі беларускіх і літоўскіх зямель стаў Хрысціян, кафедра якой, відавочна, знаходзілася ў Наваградку. Святы Прастол выдаў прывілегію на падпарадкаванне новаўтворанага епіскапства непасрэдна папе. Такім чынам, яно атрымала права архіепіскапства. Гэтыя землі, як вядома, у XIII ст. стануць асновай ВКЛ. У XIV ст. развіццё хрысціянства заходняга абраду на беларускіх землях на пэўны час запаволілася. Значную перавагу тут мела хрысціянства ўсходняга абраду – праваслаўе.

Падчас прыходу хрысціянства на Беларусь яно яшчэ было адзіным: падзел на заходні і ўсходні абрады адбыўся ў 1054 г., а канчаткова аформіўся ў 1204 г., калі ўся Еўропа была ўжо хрысціянскай. Рымскім епіскапам (з V ст. – папам) супрацьстаялі канстанцінопальскія патрыярхі.

Далучэнне да хрысціянства насельніцтва беларускіх зямель стала знакавай падзеяй у нашай гісторыі. Яно станоўча паўплывала на ўсе бакі жыцця продкаў беларусаў, змяніла іх быт, мараль, светаадчуванне, узровень цывілізацыі. Паскорылася замена першабытнаабшчыннага ладу феадальным, у выніку чаго ўзмацнялася княжацкая ўлада, умацоўвалася дзяржаўная самастойнасць. Важную ролю адыгрывала хрысціянства як фактар інтэграцыі нашых зямель, умацавання дзяржаўнасці, кансалідацыі грамадства і выхавання патрыятычных пачуццяў насельніцтва.

Хрысціянства стварыла новы светапогляд, які змяніў сямейна-шлюбныя адносіны: замест язычніцкай палігаміі ўмацоўвалася манагамная сям’я. Гэта спрыяла, у сваю чаргу, развіццю вытворчасці. Спынілася практыка забойства шматлікіх жонак і слуг і пахаванне іх разам з памерлым гаспадаром, а таксама значных матэрыяльных каштоўнасцей. Новая рэлігія садзейнічала ўмацаванню міжнародных сувязяў з дзяржавамі больш высокай культуры, найперш з Візантыяй, антычныя традыцыі якой аж да XII ст. былі на больш высокім узроўні, чым у іншых еўрапейскіх краінах. З прыняццем хрысціянст-

ва высокімі тэмпамі пачала развівацца культура: паскорыўся працэс распаўсюджвання пісьменства, адукацыі, кніжнай асветы, літаратуры, жывапісу і інш.

## 1.5. Роля хрысціянства ў развіцці культуры беларускіх зямель

Прыняцце хрысціянства дало магутны імпульс развіццю культуры старажытна-рускіх зямель. На Русь прыехала мноства візантыйскіх майстроў усіх спецыяльнасцей, перш за ўсё будаўнікоў, ювеліраў, іканапісцаў. Менавіта яны ў многім задалі стыль горадабудаўніцтва, моцна паўплывалі на стыль паўсядзённага жыцця русаў. На Русі была ўведзена славянская азбука – кірыліца, распрацаваная асветнікамі з Маравіі братамі Кірылам і Мяфодзіем. Тым самым быў пакладзены пачатак шырокага развіцця славянскай пісьменнасці.

Культура беларускіх зямель X–XII стст. спалучала ў сабе язычніцкую і грэка-візантыйскую традыцыі. Гэта прывяло да ўзнікнення арыгінальных твораў літаратуры, архітэктуры, мастацтва. Язычніцкія традыцыі найбольш адлюстраваліся ў вуснай народнай творчасці, каляндарна-абрадавых песенных цыклах, прысвечаных розным язычніцкім святам (масленіца, купалле, каляды і інш.); сямейна-абрадавай паэзіі, казках, паданнях, легендах, замовах і інш. Песні і абрады цесна ўвязваліся з важнейшымі жыццёвымі падзеямі (нарадзіны, вяселле, пахаванне), а таксама з працоўнымі цыкламі.

Прыняцце хрысціянства, з аднаго боку, выцясняла народную культуру з паўсядзённага жыцця на другі план, але не знішчала і не адмаўляла яе. З другога боку, хрысціянства садзейнічала інтэграцыі беларускіх зямель у еўрапейскую культурную прастору.

Першымі культурнымі цэнтрамі сталі манастыры, у якіх былі сабраны бібліятэкі, заснаваны школы, ствараліся летапісы, перапісваліся кнігі. Царкоўныя дзеячы былі не толькі прапаведнікамі хрысціянства, але і станавіліся вядомымі асветнікамі.

Да пачатку XI ст. на тэрыторыі Беларусі ўжо існавала рэлігійная і свецкая літаратура – арыгінальная і ў перакладзе. З’явіліся кнігі Свяшчэннага Пісання – Біблія і яе састаўныя часткі. З XIII ст. да нас дайшло Тураўскае рукапіснае Евангелле – рэдкі помнік старажытнарускай пісьменнасці. Распаўсюджанымі жанрамі арыгінальнай літаратуры была жыційная, або агіяграфічная, літаратура. Першым творам лічыцца «Жыціе св. Еўфрасінні Полацкай».

Развіццё культуры на беларускіх землях у XII ст. звязана з дзейнасцю выдатных хрысціянскіх дзеячаў і асветнікаў: Еўфрасінні Полацкай (1101–1167 гг.), Кірылы Тураўскага (1130–1188 гг.), Клімента Смаляціча (?–1164), Аўрамія Смаленскага (?–?).

Еўфрасіння Полацкая – першая жанчына гэтага перыяду, прылічаная да ліку святых. Пра яе жыццё і дзейнасць напісана ў «Жыцці св. Еўфрасінні Полацкай», створаным, відаць, адразу пасля яе смерці. Духоўную мэту і сэнс жыцця Еўфрасіння бачыла ў сцвярджэнні новых, хрысціянскіх, маральных прынцыпаў існавання чалавека. Асветніца заснавала ў Полацку жаночы і мужчынскі манастыры, была фундатарам пабудовы каля 1160 г. царквы св. Спаса (цяпер Спаса-Еўфрасіннеўская) і царквы Багародзіцкай. Спаская царква была багата ўпрыгожана фрэскамі, якія маюць вялікую гістарычную і мастацкую каштоўнасць. Па заказу Еўфрасінні полацкім майстрам Лазарам Богшай у 1161 г. быў выраблены напрастольны шасціканцовы крыж для царквы св. Спаса. Крыж быў зроблены з кіпарысу, да яго пярэдняй і адваротнай паверхняў прымацаваны залатыя, да бакавых – сярэбраныя пласціны. Крыж быў упрыгожаны выявамі евангелістаў, заснавальнікаў праваслаўя, святых Еўфрасінні і яе бацькоў, багата аздоблены каштоўнымі камянямі.

Кірыла Тураўскі, як падаецца ў «Жыціі», «не любіў багацця і тленнай славы гэтага свету, найлепш стараўся спасцігнуць вучэнне боскіх кніг і добра напрактыкаваўся ў святых пісаннях». Ён быў першым вядомым на Русі «стоўпнікам», які зачыніўся ў манастырскай вежы, каб поўнасцю аддацца роздуму і малітвам. Каля 1169 г. князь Юрый Яраслававіч з тураўскімі старэйшынамі ўпрасілі Кірыла-манаха прыняць епіскапства. Да літаратурнай спадчыны Кірылы належыць 8 слоў-казанняў, 2 казанні пра манаскі чын і ангельскі чын, 2 прытчы пра душу і цела, 30 спавядальных малітваў і інш. Духоўная спадчына Кірылы Тураўскага ўзбагаціла тэалагічную, філасофскую, эстэтычную і этычную думку таго часу, садзейнічала ўзбагачэнню культуры свайго народа.

Клімент Смаляціч быў манахам Зарубскага манастыра каля Кіева, «кніжнікам і філосафам, якіх у Рускай зямлі не бывала». У 1147 г. на епіскапскім саборы Клімент Смаляціч быў узведзены на Кіеўскую кафедру. Ён – прыхільнік царкоўнай аўтакефаліі, чым выклікаў незадавальненне прагрэчаскі настроеных іерархаў. Да нас дайшоў толькі адзін твор Клімента Смаляціча – «Пасланне Фаме прэсвітару», у якім ён абгрунтоўвае свае погляды на інтэрпрэтацыю тэкстаў Свяшчэннага Пісання, апісвае сваё ўяўленне пра Сусвет, характарызуе Бога як

непазнавальную абсалютную істоту, якая, аднак, пазнаецца ў сваіх тварэннях. Яго заклік захаваць маральную часціню думак і ўчынкаў, духоўнае памкненне да найвышэйшых каштоўнасцей быцця гучыць сучасна і надзённа.

Прысвяціў сябе манаскаму служэнню і Аўраамій Смаленскі. У 1198 г. ён прыняў сан прэсвітара і стаў шырока вядомы як прапаведнік і настаўнік не толькі для манаскай брацііі, але і для недухоўных асоб. Аўраамій Смаленскі заклікаў смалян няўхільна прытрымлівацца маральных прынцыпаў хрысціянства, клапаціцца пра духоўнае ўдасканаленне жыцця.

З хрысціянствам на Русі ўзнік новы тып збудаванняў – мураваны крыжова-купальны храм, збудаваны з тонкай квадратнай цэглы – плінфы. У X–XI стст. храмы будавалі пераважна майстры, запрошаныя з Візантыі. Яны прынеслі на старажытнарускія землі традыцыі канстанцінопальскага, ці правінцыяльнага, будаўніцтва Візантыйскай імперыі. У беларускіх землях у вялікай колькасці ўзводзіліся праваслаўныя храмы-цэрквы. Сродкі на іх будаўніцтва ахвяравалі як заможныя людзі, так і просты народ. Аб колькасці цэркваў сведчаць многія летапісы, археалагічныя раскопкі. Асноўным будаўнічым матэрыялам спачатку было дрэва. Але па прычыне частых пажараў і войнаў драўляныя храмы згаралі дашчэнту. Так, у Лаўрэнцьеўскім летапісе сказана, што ў 1124 г. згарэла 600 цэркваў, а ў Тураве да канца XVI ст. было каля 80 цэркваў. Аб храмах у іншых гарадах Беларусі ў летапісах, якія да нас дайшлі, звестак няма.

Культавая манументальная архітэктура спалучала ў сабе лепшыя традыцыі як мясцовага, так і візантыйскага дойлідства. У X–XII стст. склаліся дзве архітэктурныя школы – полацкая і гродзенская. Для полацкай школы характэрна муроўка з плінфы «са схаваным радам», якая ўтварала двухколерную гаму паверхні сцяны, радзей – з чаргаваннем слаёў плінфы і вапняку. Выдатнымі помнікамі гэтай школы з'яўляюцца Сафійскі сабор (50-я гг. XI ст.), сабор Бельчыцкага манастыра (20–30-я гг. XII ст.) і Спаса-Прэабражэнская царква Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра (сярэдзіна XII ст.). Усяго ў Полацку ў XII ст. было пабудавана 10 храмаў. Яны былі ўпрыгожаны фрэскамі і керамічнай пліткай.

Яркім узорам гродзенскай школы дойлідства з'яўляецца Барыса-Глебская (XII ст.), або Каложская, царква. Сцены царквы ўпрыгожаны арнаментам – крыжамі з маёлікавай пліткі. У іх аснову ўмураваны шліфаваныя камяні-валуны, а ў верхняй частцы ўманціраваны

сасуды-галаснікі для паляпшэння акустыкі. Падлога выкладзена маёлікавай пліткай. Да гродзенскай архітэктурнай школы належаць таксама Ніжняя і Верхняя цэрквы на тэрыторыі гродзенскага замка.

Самабытнае развіццё атрымаў манументальны жывапіс – фрэскі – размалёўка мінеральнымі фарбамі сцен храмаў па сырым тынку. Ён спалучаў у сабе народныя традыцыі і лепшыя візантыйскія ўзоры. Самымі старажытнымі творамі гэтага мастацтва з'яўляюцца фрэскавыя роспісы полацкіх храмаў: Сафійскага сабора (XI ст.), Бельчыцкага і Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыроў (першая палова XII ст.).

У гэты перыяд з'яўляецца летапісанне. Да паловы XIV ст. рукапісы пісаліся на пергаменце, а пазней – на паперы замежнай вытворчасці. Вялікая ўвага надавалася вонкаваму выгляду рукапісных кніг. Можна меркаваць, што пры храмах Віцебска, Турава, Пінска, Бярэсця існавалі кансісторыі, у якіх рукапісы аздабляліся срэбнымі або залочанымі ўпрыгожаннямі, эмаллю.

Цэрквы былі не толькі культавымі ўстановамі, але і асяродкамі, дзе веруючыя атрымлівалі інфармацыю аб грамадска-палітычных, рэлігійных падзеях. У іх захоўваліся бібліятэка, казна, архівы. Каля сцен царквы адбываліся сходы гараджан. Царкоўная архітэктура, а таксама скульптура, мазаіка, прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якімі ўпрыгожваліся цэрквы, царкоўная музыка і спевы спрыялі развіццю і распаўсюджанню ведаў сярод веруючых, іх эстэтычнаму і маральнаму выхаванню.

## Тэма 2

# РЭЛІГІЯ І ЦАРКВА НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У ПЕРЫЯД ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIII–1569 г.)

*2.1. Праваслаўе на беларуска-літоўскіх землях.*

*2.2. Крэўская ўнія. Распаўсюджанне каталіцтва.*

*2.3. Рэфармацыя: сутнасць, яе сацыяльная і антыкаталіцкая накіраванасць.*

*2.4. Рэфармацыйны рух на Беларусі.*

*2.5. Іншыя рэлігійныя вызнанні: іўдаізм і іслам.*

*2.6. Уплыў рэлігіі на развіццё культуры беларускіх зямель.*

# 2.1. Праваслаўе на беларуска-літоўскіх землях

З другой паловы XIII ст. пачаўся працэс уваходжання беларускіх зямель у склад Вялікага Княства Літоўскага. Ён суправаджаўся значнымі зменамі як у сацыяльна-палітычным, эканамічным, так і культурным і рэлігійным жыцці. Гэта быў час, напоўнены важнымі гістарычнымі падзеямі. Утварэнне ВКЛ і далучэнне да яго беларускіх зямель абумовілі мноства прычын. Сярод галоўных – пагроза з боку Тэўтонскага ордэна і мангола-татар. Менавіта яны падштурхоўвалі як літоўскіх, так і беларускіх князёў да аб'яднання. Працэс фарміравання ВКЛ быў працяглым. Дынастычныя шлюбы, пагадненні (у рэдкіх выпадках закон) паміж асобнымі княствамі прывялі да федэратыўнага аб'яднання. У ім вядучую ролю адыгрывалі старажытнарускія формы кіравання дзяржавай з адпаведнымі законамі, мовай, рэлігіяй.

Заходняя частка беларускіх зямель у XIII – пачатку XIV ст. знаходзілася пад уладай галіцка-валынскіх князёў, якія ўзялі пад сваю апеку праваслаўную Царкву. Ва ўсходнебеларускіх землях (Полацк, Віцебск) існаваў калектыўны патранат баяр і мяшчан над мясцовай епіскапскай кафедрай, а таксама Спаса-Еўфрасіннеўскім манастыром. Нават у XVI ст. полацкія ўладыкі займалі сваю кафедру па чалабіццю мясцовых баяр. У XIII–XV стст. у Заходняй Русі перасталі будаваць каменныя храмы.

Кіраўніцтва праваслаўнай Царквой у ВКЛ у розныя часы ажыццяўлялася ў рамках некалькіх мітраполій: Літоўскай (называлася таксама «мітраполія Літоўская і Малой Русі», «Кіеўская, Літоўская і ўсея Русі»), Галіцкай, Кіеўскай («Кіеўскай і ўсея Русі»), а з 1458 г. – «Кіеўскай, Галіцкай і ўсея Русі».

З часоў вялікага князя літоўскага Гедыміна (1275–1341 гг.) распачаліся спробы стварэння асобнай мітраполіі з цэнтрам у Навагрудку. Са згоды канстанцінопальскага патрыярха Іаана XIII Гліка была створана Літоўская епархія (або Літоўска-Навагрудская мітраполія). У яе ўвайшлі, апрача Полацкай епархіі, вялікія тэрыторыі, якія раней уваходзілі ў склад Тураўскай кафедры. Мітраполія існавала да 1330 г.

Пасля ўключэння Кіеўскай зямлі ў склад ВКЛ у другой палове XIV ст. Кіеўская епархія зноў стала самай значнай у царкоўнай праваслаўнай структуры ВКЛ. Кіеўскаму мітрапаліту падпарадкоўваліся восем епархій, у тым ліку Полацкая і Тураўская.

Землі Беларусі ў XII–XVI стст. уваходзілі ў склад Наваградскай, Полацка-Віцебскай, Турава-Пінскай, Кіеўскай (мітрапалічай), Уладзіміра-Брэсцкай і Смаленскай епархій. Частка паўднёва-ўсходніх зямель з Гомелем і Чачэрскам уваходзіла ў Чарнігаўскую епархію. У XV – сярэдзіне XVI ст. у ВКЛ было 1,5–2 тысячы праваслаўных храмаў, але пасля падпісання Брэсцкай царкоўнай уніі іх колькасць паменшылася.

У 1415 г. літоўскі князь Вітаўт (1350–1430 гг.) сабраў у Наваградку восем праваслаўных епіскапаў і патрабаваў ад іх выбраць незалежнага ад Масквы Кіеўскага мітрапаліта. Ім стаў архімандрыт Грыгорый Цамблак (1364–1450 гг.). Але ён не быў прызнаны канстанцінопальскім патрыярхам. Пасля смерці Цамблака на кіеўскую кафедру вярнуўся мітрапаліт Фоцій, які ўзначальваў яе ў 1408–1414 гг., а затым да 1431 г. У 1430–1440 гг. у ВКЛ адбывалася грамадзянская вайна паміж прыхільнікамі і праціўнікамі уніі з Польшчай. Каб прыцягнуць на свой бок праваслаўных феадалаў, у 1432 г. вялікі літоўскі князь Свідрыгайла (1430–1432 гг.), а ў 1434 г. Жыгімонт Кейстутавіч (1432–1440 гг.) выдалі прывілеі, паводле якіх праваслаўныя феадалы ўраўніваліся ў правах з каталіцкімі. Гэта садзейнічала кансалідацыі феадалаў, апрача таго, яны атрымалі права, згодна з якім пазбаўляць іх пасады маглі толькі па суду. Канчатковае ўраўненне правоў феадалаў хрысціянскіх веравызнанняў адбылося толькі ў 1563 г.

Спрыяльным для праваслаўнай Царквы ў ВКЛ было княжанне Казіміра IV Ягелончыка (1440–1492 гг.). Кароль падараваў грамату праваслаўнаму мітрапаліту і ўсім праваслаўным епіскапам аб недатыкальнасці іх свяцісцельскіх правоў і суда, а таксама царкоўнай маёмасці. Пры Казіміры IV разгарнулася шырокае храмавае і манастырскае будаўніцтва, часта фундатарам быў сам кароль.

Міралюбівая палітыка ў адносінах да праваслаўя праводзілася пры каралях Жыгімонце I Старым (1506–1548 гг.) і Жыгімонце II Аўгусце (1548–1572 гг.). Аднак на праваслаўную Царкву ў той жа час узмацнілася наступленне Рыма. Не без уплыву рымскай курыі дзяржаўная ўлада падтрымлівала заснаванне на «рускіх» землях каталіцкіх манастыроў, якія разгарнулі дзейнасць па вяртанні праваслаўных у каталіцтва. Да 1563 г. праваслаўная знаць не мела права займаць вышэйшыя дзяржаўныя пасады.

## 2.2. Крэўская унія. Распаўсюджанне каталіцтва

З канца XIV ст. выспяваюць прычыны збліжэння ВКЛ і Польшчы. Да важнейшых з іх можна аднесці:

- супрацьстаянне знешняй крыжацкай агрэсіі;
- рэальную пагрозу адпадзення рускіх зямель (у XIV ст. польскія феадалы захапілі Галіцка-Валынскую Русь – этнічнае ядро будучай Украіны);
- неабходнасць развіцця эканамічных і культурных адносін.

Збліжэнне Літвы з Польшчай мела яшчэ адзін надзвычай важны аспект. Літва заставалася апошняй у Еўропе дзяржавай, дзе паганская меншасць дамінавала над хрысціянскай большасцю. Такая сітуацыя ставіла літоўскую дзяржаву ў ізаляванае і вельмі слабае становішча. Хрысціянізацыя Літвы была непазбежнай умовай уключэння яе ў сістэму еўрапейскай цывілізацыі, а выбар паміж Польшчай і Руссю азначаў для літоўскай шляхты не адмову ад паганства, а выбар паміж заходнім каталіцызмам і ўсходнім праваслаўем. Гэта быў не толькі палітычны, але і цывілізацыйны выбар, выбар этнакультурнай арыентацыі.

Заключэнне уніі адбылося ў пачатку лета 1385 г. у Крэўскім замку (зараз тэрыторыя Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці). Да 14 жніўня былі выпрацаваны абавязацельствы Ягайлы (1348–1434 гг.), якія ён павінен быў выканаць за атрыманне каралеўскай кароны. Вялікі князь абяцаў прыняць каталіцтва і звярнуць у гэтую веру сваіх сваякоў і падданых, кампенсаваць нанесеную Польшчы шкоду, адваяваць усе захопленыя іншымі краінамі польскія землі і «краіны свае Літву і Русь навечна далучыць да кароны каралеўства Польскага». Была сярод дамоўленасцей яшчэ адна. У 1377 г. пры падпісанні дагавора аб жаніцьбе Вільгельма Габсбурга на польскай каралеве Ядвізе бакі дамовіліся аб выплаце кампенсацыі ў 200 тысяч флорынаў (гэта больш за 700 кг золата) бакам, якія адмовіліся ад шлюбу. У Крэве і гэтую велізарную суму Ягайла абавязаўся заплаціць за польскі бок. На з'ездзе ў Ваўкавыску ў 1385 г. былі адобраны такія ўмовы уніі: аб'яднанымі дзяржавамі павінен кіраваць адзін чалавек, які спалучае функцыі караля і вялікага князя. Спачатку такім чалавекам будзе Ягайла, а затым – прамы нашчадак яго і Ядвігі. Вядзенне знешнепалітычных спраў, якія тычацца абедзвюх дзяржаў, а таксама абарона тэрыторыі павінны быць сумеснымі, унутранае кіраванне ў кожнай з краін – паасобнае, і ў Польшчы, і ў ВКЛ – свае

войскі, урады і асобная казна. Беларускаму насельніцтву была пакінута свабода веравызнання ўсходне-хрысціянскай веры.

У студзені 1386 г. праваслаўны Ягайла-Якаў хрысціўся па каталіцкім абрадзе і атрымаў новае імя – Уладзіслаў. Разам з ім у гэтым абрадзе прымалі ўдзел яго сваякі, у тым ліку і Вітаўт, які за два гады да гэтага ўжо хрысціўся па каталіцкім абрадзе. Праз чатыры дні адбыўся шлюб.

Практычна ў Крэўскім замку быў складзены і падпісаны акт дзяржаўна-прававога аб'яднання дзвюх дзяржаў. Юрыдычна унія была як бы інкарпарацыяй ВКЛ ў каралеўства Польскае. Ствараўся адзіны палітыка-дзяржаўны арганізм. Статус Ягайлы вызначаўся «як манарх абедзвюх краін». Пасля прыняцця уніі ўсе літоўскія і беларускія князі павінны былі прыняць прысягу на вернасць кароне Польскай, а баяры-католікі княства атрымалі тыя ж правы, што былі ў польскай шляхты. Але фактычна самастойнасць Вялікага Княства Літоўскага не была страчана. Княства захавала свае фінансы, войска, сімволіку, самастойна праводзіла знешнюю палітыку, акрамя выпадкаў, калі закраналіся сумесныя з Польшчай інтарэсы.

З прыняццем Ягайлам каталіцтва стала мяняцца сацыяльна-палітычнае і прававое становішча беларускіх зямель у ВКЛ. Каб умацаваць сваё становішча, Ягайла ў 1387 г. выдаў прывілей, які даваў літоўскім феадалам вялікія правы і вольнасці па прыняцці імі каталіцкай веры. Яны атрымлівалі неабмежаваныя правы валодання і распараджэння сваімі вотчынамі, вызваляліся ад шэрагу дзяржаўных павіннасцей. На праваслаўную знаць прывілей не распаўсюджваўся. Гэты дыскрымінацыйны ў адносінах да шляхты ўсходнеславянскага паходжання акт выклікаў не толькі незадаволенасць з яе боку, але і ўзняў антылітоўскія настроі. Тым больш, што Віленска-Радомская дамова 1401 г. зноў супрацьпастаўляла феадалаў каталіцкага веравызнання праваслаўным – рускім. У пастанове Гарадзельскага сейма 1413 г. зацвярджалася, што толькі «католікі, Рымскай царквы падуладныя», валодаюць і карыстаюцца эканамічнымі прывілеямі. Праваслаўныя феадалы пазбаўляліся права абрання вялікага князя. Яго маглі абіраць толькі «паны і шляхцічы зямлі літоўскай, прыхільнікі хрысціянскай рэлігіі, Рымскай царквы падуладныя, ня схізматыкі ці іншыя паганыя». Тут жа пацвярджалася забарона на шлюбы паміж католікамі і праваслаўнымі.

У 1387 г. Ягайла даў дазвол на заснаванне ў Вільні каталіцкага біскупства. Ён надзвычай шчодра надзяляў яго зямельнымі ўла-

даннямі з людзьмі. Дазволена было ва ўсім ВКЛ будаваць касцёлы. У лютым 1387 г. у вялікакняжацкім палацы ў Вільні вялікая група князёў, баяраў і рыцараў, якія з'яўляліся да гэтага альбо язычнікамі, альбо праваслаўнымі, перайшла ў каталіцтва. Вялікі князь адорваў усіх, хто прымаў каталіцтва, у прыватнасці, адзеннем з сукна, якое спецыяльна для гэтага было прывезена з Польшчы. Каталіцкую веру Ягайла абвясціў найважнейшай рэлігіяй ВКЛ. У Вільні быў згашаны святы агонь, разбураны паганскі храм і ахвярны алтар. Сталі дэманстратыўна забіваць шанаваных да гэтага літоўцамі-язычнікамі вужоў, высякаць барозавыя гаі, якія лічыліся святымі.

Каталіцтва пастутова распаўсюджвалася і на беларускія землі. Тут ствараліся парафіі, будаваліся касцёлы. Каталіцтва прынесла на беларускія землі новыя пачаткі, якія адлюстраваліся ў культуры, мастацтве, архітэктуры, літаратуры, а таксама аказалі істотны ўплыў на этнічныя працэсы.

## 2.3. Рэфармацыя: сутнасць, яе сацыяльная і антыкаталіцкая накіраванасць

Надыход Новага часу быў азнаменаваны ў пачатку XVI ст. распаўсюджваннем рэфармацыйных ідэй у большасці краін Заходняй Еўропы, якія ўзніклі ў час першапачатковага накаплення капіталу. У хуткім часе яны вылiліся ў грамадска-палітычны рух, які атрымаў назву Рэфармацыя. XVI–XVII стст. сталі часам не толькі палітычных, але і сацыяльных, і рэлігійных змен, якія ахапілі значныя колы грамадства не толькі ВКЛ і Рэчы Паспалітай, але і іншых краін.

У канцы XV – пачатку XVI ст. рымская каталіцкая Царква ў Заходняй Еўропе ўступіла ў паласу працяглага крызісу, вынікам якога стаў другі вялікі раскол у хрысціянстве (першы адбыўся ў 1054 г. як афіцыйны падзел хрысціянскай царквы на каталіцкую і праваслаўную) – Рэфармацыя. Ідэолагамі першай хвалі Рэфармацыі сталі Марцін Лютэр (1483–1546 гг.), Жан Кальвін (1509–1564 гг.) і Ульрых Цвінглі (1484–1531 гг.). Яны заклікалі веруючых да барацьбы са злоўжываннямі ў Царкве, вяртання да ідэалаў першапачатковага хрысціянства. Гэты рух быў падтрыманы ў Еўропе найшырэйшымі коламі грамадства: ад збяднелых сялян да кіруючых колаў свецкай улады.

Ідэалагічная дактрына Рэфармацыі была заснавана на выступленні маладой буржуазіі супраць каталіцкай Царквы, таму з

самага пачатку рух прыняў форму рэлігійнай барацьбы, характар праяўлення якой у еўрапейскіх краінах быў розны. Галоўнай сваёй задачай ідэолагі Рэфармацыі паставілі секулярызацыю (абміршчэнне) царкоўнага і манастырскага землеўладання, якое не абкладалася ніякімі падаткамі і прыносіла святарам вялікія прыбыткі.

Пачаткам заходнееўрапейскай Рэфармацыі лічыцца першае публічнае выступленне Марціна Лютэра ў канцы 1517 г. супраць папскіх індульгенцый. У 95 тэзісах, якія сталі першым дакументам, а затым у Вялікім і Малым катэхізісах ён выклаў сутнасць новай рэлігійнай дактрыны лютэранства, якая стала нацыянальнай рэлігіяй у Германіі. М. Лютэр абвясціў вучэнне Новага Запавету адзінай і дастатковай крыніцай веры ў Бога, тлумачыць якую кожны хрысціянін мог па ўласнаму разуменню. Адхіліўшы, такім чынам, афіцыйнае духавенства як непатрэбнае звяно ў сувязях чалавека з Богам, М. Лютэр пайшоў далей і выступіў супраць існавання самой каталіцкай Царквы, якая прэтэндавала на ролю заканадаўцы ў пытаннях веравызнання. Вера, сцвярджаў ён, – гэта дар Божы, пасланы чалавеку Святым Духам, а таму царква да яе не мае ніякага дачынення. М. Лютэр адхіліў і вярхоўную ўладу рымскага папы, бо царква, на яго думку, павінна была стаць грамадствам духоўна аб'яднаных і веруючых у Бога людзей. Разам з тым ён падпарадкоўваў розум чалавека ўнутранай яго веры, а арганізацыю новай царквы паставіў у залежнасць ад інтарэсаў дзяржавы. У ходзе Рэфармацыі і Вялікай сялянскай вайны (1524–1525 гг.), якія ўзніклі ў Германіі, перамогу атрымала княжацкая ўлада, арганізацыйна аформілася лютэранская Царква. Услед за Германіяй Рэфармацыя ахапіла іншыя еўрапейскія краіны.

Перагляд догмаў каталіцызму прывёў да ўзнікнення ў сусветным хрысціянстве новага напрамку – пратэстантызму. Рэфармацыя аказалася надзвычай папулярнай і хутка дасягнула межаў Усходняй Еўропы, дзе найбольш пашырылася ў ВКЛ. У канфесійных адносінах дзяржава характарызавалася прысутнасцю трох рэлігій: хрысціянства, ісламу і іўдаізму, прычым першая была прадстаўлена праваслаўем і каталіцтвам.

## 2.4. Рэфармацыйны рух на Беларусі

Рэфармацыйны рух, у які на працягу XVI ст. былі ўцягнуты ўсе колы грамадства ВКЛ, быў выкліканы зменамі, якія адбываліся

ў эканамінным, сацыяльным і палітычным жыцці дзяржавы. Адным са значных фактараў, які абумовіў яго ўзнікненне, было развіццё гарадоў. Да канца XVI ст. іх колькасць у ВКЛ узрасла да 700, больш паловы з якіх знаходзілася на беларускіх землях. Гарадское насельніцтва павялічвалася перш за ўсё за кошт сялянства, бо з развіццём эканомікі і ўзмацненнем прыгонніцтва пашыралася іх бегства ў гарады. Сялянства папаўняла гарадскі плебс, які заўсёды прымаў удзел у шматлікіх канфліктах і дабра ўспрымаў рэлігійныя навацыі. У беларускіх гарадах таксама жыло шмат выхадцаў з Польшчы, Германіі, Прусіі, Маскоўскай Русі і іншых краін, але да 80 % жыхароў былі беларусамі.

У барацьбе за свае саслоўныя правы гараджане былі не супраць заручыцца падтрымкай пратэстантаў, таму частка з іх падтрымала Рэфармацыю. Пашырэнне эканамічных сувязяў з суседнімі краінамі садзейнічала ўзмацненню культурнага абмену. На беларускія землі завозілася гуманістычная і рэфармацыйная літаратура, а моладзь вучылася ў еўрапейскіх універсітэтах. Адным з цэнтраў гуманістычнай думкі ў пачатку XVI ст. стаў Кракаўскі ўніверсітэт, дзе набылі адукацыю такія дзеячы Рэфармацыі, як Сымон Будны, Лаўрэнцій Крышкоўскі, Кіпрыян Базілік, Сымон Жак, Пётр з Ганёндза і інш.

Істотнай асаблівасцю рэфармацыйнага руху на беларускіх землях было тое, што, у адрозненне ад заходнееўрапейскага, ён развіваўся на феадальнай аснове і яго падтрымалі пануючыя колы грамадства, у першую чаргу магнатэрыя і частка шляхты. Рэфармацыя ставіла магната ў яго ўладаннях на чале царквы, што сімвалізавала яго палітычную вагу і незалежнасць. Магнаты, як і шляхта, былі не супраць захапіць зямельныя ўладанні каталіцкай Царквы і не плаціць ёй падаткі. Што ж тычылася сялянства, то ў пытаннях веравызнання яно заставалася індыферэнтным, і ў рэальным жыцці дзейнічаў прынцып: у якой царкве моліцца пан, у той – і селянін. Істотнае значэнне ў распаўсюджванні рэфармацыйных ідэй на беларускіх землях адыгралі таксама ідэі італьянскага і швейцарскага антытрынітарызму, мараўскага анабаптызму, сярэдневяковых ерасяў, якія прыйшлі з Маскоўскай Русі. Пад іх уплывам развівалася радыкальная плынь Рэфармацыі, а на практыцы ажыццяўляліся спробы рэалізаваць у жыцці ідэі сацыяльнай роўнасці і справядлівасці.

У буйных беларускіх гарадах Полацку, Менску, Слуцку пачалі з’яўляцца лютэранскія кірхі. У 1535 г. слуцкі князь Юрый Сямёнавіч

даў дазвол на вылучэнне ў горадзе пляца для пабудовы лютэранскай кірхі. Аб распаўсюджванні лютэранства на землях ВКЛ асабліва рупіўся ў тыя часы прапаведнік Аўраам Кульва. У 1539 г. ён адкрыў у Вільні лютэранскую школу, у якой займалася 60 асоб.

Асноўнай жа плынню Рэфармацыі стаў кальвінізм. Яго замацаванне было звязана з імем тагачаснага канцлера Мікалая Радзівіла Чорнага (1515–1565 гг.). Вялікая ўлада дазволіла яму пры рэформе царквы не лічыцца з аўтарытэтамі. У пачатку 1550-х гг. Мікалай Радзівіл Чорны схіліўся да Рэфармацыі і выступіў супраць каталіцкай Царквы. Наведаўшы Германію і ўласнымі вачыма паглядзеўшы на новую царкву, пасля вяртання на радзіму ён прыступіў да царкоўных пераўтварэнняў. У Вільні, Бярэсці, Нясвіжы, Клецку і іншых месцах былі заснаваны кальвінісцкія зборы, куды былі запрошаны таленавітыя прапаведнікі Марцін Чаховіц, Сымон Жак, Сымон Будны, Фама Фальконій, Ян Ласкі, Пётр з Ганёндза. Мікалай Радзівіл Чорны ўступіў у перапіску з Ж. Кальвінам, М. Лютэрам і іншымі прадстаўнікамі рэфармацыйнага руху.

Дзеля папулярызацыі рэфармацыйных ідэй на тэрыторыі дзяржавы Мікалай Радзівіл Чорны прыступіў да арганізацыі кнігавыдавецкай справы. У 1553 г. у Бярэсці была заснавана першая на беларускіх землях друкарня, дзе кракаўскімі друкарамі Ваявудкай і Мурмеліусам былі выдадзены «Катэхізіс« Сымона Зака, «Песні славы боскай» Яна Зарэмбы і іншыя творы антыкаталіцкага напрамку. Гэта была свайго роду ідэалагічная падрыхтоўка рэфармацыйнага руху.

Даволі хутка ў цэнтральных і заходніх рэгіёнах Беларусі, дзе была пашырана каталіцкая Царква, з’явіліся кальвінісцкія зборы. Першы з іх быў зафіксаваны ва ўладаннях Мікалая Радзівіла Чорнага ў 1553 г. у Бярэсці. Услед за ім зборы ўзніклі ў Беліцы, Клецку, Койданаве, Нясвіжы, Іўі, Лоску, Любчы, Заслаўі, Дуброўне, Смаргоні, Ашмянах і іншых гарадах і мястэчках на беларускіх землях. Падтрымку Рэфармацыі аказалі Мікалай Радзівіл Руды, Астафій Валовіч, Ян Кішка, Ян Глябовіч, Юрый Зяновіч, Ян Абрамовіч і іншыя прадстаўнікі магнатэрыі і шляхты.

Паступова склалася арганізацыйна-тэрытарыяльная структура кальвінісцкай царквы ў ВКЛ. Літоўская правінцыя ў канцы XVI ст. складалася з шасці дыстрыктаў (рэлігійных акруг):

- Віленскага, куды ўваходзілі Вільня, Трокі, Ашмяны, Ліда, Браслаў;

- Завілейскага (Вількамір, Упліта, Коўна);
- Наваградскага (Наваградак, Рэчыца, Мазыр, Ваўкавыск);
- Рускага (Менск, Орша, Полацк, Мсціслаў, Віцебск);
- Берасцейскага (Бярэсце, Гродна, Пінск, Слонім);
- Жамойцкага (Кейданы, Шыдлаў і інш.).

На чале кожнага дыстрыкта стаяў суперінтэндант. Перыядычна склікаліся сіноды дыстрыктаў, якія называліся партыкулярнымі. Арганізуючым цэнтрам быў агульнадзяржаўны сінод, які штогод збіраўся ў Вільна і меў назву правінцыяльнага. Сумесныя польска-літоўскія сіноды называліся генеральнымі.

Першыя кальвінісцкія абшчыны ўзніклі ў прыватных уладаннях, большасць з якіх размяшчалася ў заходніх і цэнтральных паветах, дзе існавалі буйныя прыватнаўласніцкія маёнткі. Разнародны этнарэлігійны склад насельніцтва гэтага рэгіёна, у параўнанні з усходняй часткай Беларусі, дзе перавага належала праваслаўным, абумовіў большую распаўсюджанасць тут Рэфармацыі. На ўсходзе пратэстанцкія зборы ўзніклі спачатку ў буйных гарадах. Нягледзячы на тое, што кальвінізм быў выразнікам інтарэсаў новай буржуазіі, магнатэрыя і шляхта ВКЛ прыстасавалі яго да сябе і сталі выразнікамі свецкага і духоўнага кіраўніцтва насельніцтвам у сваіх маёнтках. Рэфармуючы каталіцкую Царкву, яны канфіскоўвалі яе землі і далучалі іх да сваіх уладанняў. У выніку ў канцы 1550-х гг. кальвінісцкая Рэфармацыя ў ВКЛ перамагла.

На працягу 1562–1565 гг. з лагера кальвіністаў вылучылася плынь, якая атрымала назву антытрынітарызму, або арыянства. Назва паходзіла ад імя святара Арыя, які жыў і прапаведаваў у IV ст. н. э. у Александрыі, выступаў супраць дагмата аб Святой Тройцы, за ўзнаўленне маралі першахрысціянскіх абшчын. Удзельнікі руху, якіх яшчэ ў Вялікім Княстве Літоўскім называлі «літоўскімі братамі», адмаўлялі дагмат Святой Тройцы, хрышчэнне немаўлят, прызнавалі Ісуса Хрыста не Богам, а чалавекам. У сацыяльна-палітычным аспекце арыяне выступалі супраць прыгонніцтва, прыватнай уласнасці, інстытутаў дзяржаўнай улады. Антытрынітарыі праследаваліся ў краінах Заходняй Еўропы, таму многія з іх знаходзілі прытулак у Польшчы і ВКЛ, дзе актыўна ўдзельнічалі ў рэфармацыйным руху. Першым, хто абгрунтаваў такія погляды, стаў Пётр з Ганёндза (Гёзка) (1525–30–1573 гг.).

Асабліва рэзка Пётр з Ганёндза крытыкаваў дагмат Святой Тройцы. Адзінай крыніцай хрысціянскай веры ён прапанаваў

лічыць Святое Пісанне, а астатняе, на яго думку, трэба было лічыць недакладнасцю.

Правадыром і ідэолагам антытрынітарызму ў ВКЛ стаў Сымон Будны (1530–1593 гг.), выпускнік Кракаўскага ўніверсітэта. У 1558 г. ён быў запрошаны Мікалаем Радзівілам Чорным на пасаду катэхета ў віленскую пратэстанцкую абшчыну з абавязкам вучыць дзяцей. Праз два гады ён стаў кальвінскім міністрам у Клецку, а ў 1562 г. выдаў свае выдатныя творы «Катэхізіс» і «Апраўданне грэшнага чалавека перад Богам». Сымон Будны распрацаваў рэлігійна-філасофскую дактрыну антытрынітарызму, выступіў супраць дагмату аб Святой Тройцы і крытыкаваў Біблію.

Сацыяльна-палітычную дактрыну антытрынітарызму стварыў Марцін Чаховіц (1532–1613 гг.). Ён, у прыватнасці, прапанаваў, каб на кіруючыя пасады ў пратэстанцкіх абшчынах – сеньёраў – абіралі не толькі шляхту, але і гарадскіх, вясковых жыхароў, каб усе рупіліся аб Царкве Божай. Маёмасць трэба раздаць бедным і жыць супольна. Усе роўныя перад Богам, таму жанчына, як і мужчына, павінна мець з ім аднолькавыя правы.

Даволі хутка ў Рэфармацыі вылучыліся два напрамкі: левы – плябейска-сялянскі і правы – шляхецка-бюргерскі. Першы атрымаў спачатку больш шырокае распаўсюджванне. У выніку ўдзельнікі руху пачалі больш цікавіцца сацыяльнымі праблемамі, захапляцца мараўскім анабаптызмам. Пад іх уплывам узмацнялася антыфеадальная барацьба сялянства і гарадскіх нізоў, у сувязі з чым сацыяльныя праблемы пачалі выходзіць на першае месца. У абшчынах арыян пашырыліся дыскусіі вакол наступных пытанняў: ці можа сапраўдны хрысціянін валодаць прыгоннымі сялянамі, зямлёй, маёнткамі, займаць дзяржаўныя пасады, звяртацца ў суд, падпарадкоўвацца свецкай уладзе і інш.

Цэнтрамі антытрынітарызму на Беларусі былі Іўе, Лоск, Любча, Навагрудак, Клецк. К сярэдзіне XVII ст. іх колькасць дасягнула 10 тысяч чалавек. Але ў час найвышэйшага ўздыму арыян было значна больш. У склад абшчын уваходзілі прадстаўнікі розных слаёў грамадства, пры гэтым асноўнае месца належала гарадскім нізам і рамеснікам.

Сацыяльная ідэалогія плябейскіх радыкалаў, нягледзячы на антыфеадальны напрамак, была ўтапічнай. Аднак у ідэйных спрэчках другой паловы XVI ст. яны атрымлівалі перамогу. У такіх абставінах арыянская шляхта і бюргеры, знаходзячыся ў апазіцыі, былі вымушаны з гэтым лічыцца. У сувязі з пашырэннем у 1580-я гг.

Контррэфармацыі ў антытрынітарызме адбывалася эвалюцыя. Каб абараніць сябе ад уздзеянняў улад, антытрынітарыі былі вымушаны падкрэсліваць свае лаяльныя адносіны да феадальнага грамадства.

Трансфармацыя была звязана з імем Фауста Сацына (1539–1604 гг.), які адыграў выключную ролю ў беларуска-літоўскім антытрынітарызме. Ён імкнуўся прымірыць абодва бакі і выпрацаваць умовы кампрамісу. Захаваўшы адмоўнае стаўленне левых да феадальнай дзяржавы, Ф. Сацын выкінуў з іх вучэння найбольш радыкальныя прапановы: праблему багатых і бедных, прыватнай уласнасці, валодання маёмасцю. Саступаючы правым, ён захаваў права на ўдзел у абарончай вайне. У выніку дзейнасці Ф. Сацына ўзрасла колькасць яго прыхільнікаў, асабліва за кошт маладых антытрынітарыяў.

З пачатку XVII ст. сацыніянства стала афіцыйным напрамкам у антытрынітарызме. На Беларусі яго ўмацаванне было звязана з імем Яна Ліцынія Намыслоўскага (1560–1630 гг.). У 1585 г. ён стаў рэктарам арыянскай школы, заснаванай у Еўі вядомым магнатам Янам Кішкам для дзяцей шляхты і гараджан розных веравызнанняў. У 1593 г. Ян Ліцыній Намыслоўскі стаў прапаведнікам арыянскай абшчыны ў Навагрудку, сустракаўся з Ф. Сацынам, вёў актыўную пастырскую і арганізацыйную дзейнасць. У сваіх поглядах ён пайшоў далей за Ф. Сацына і пачаў схіляцца да нонадарантызму – рэлігійна-філасофскага вучэння, прадстаўнікі якога адмаўляліся пакланяцца Хрысту, лічылі яго не Богам, а чалавекам, не верылі ў бессмяротнасць душы, замагільны свет, крытыкавалі Біблію.

Вялікае Княства Літоўскае, якое яшчэ ў XVI ст. вызначалася сваёй верацярпімасцю, у пачатку XVII ст. стала арэнай жорсткай барацьбы з іншаверцамі. Узмацніўся ціск на арыян з боку езуітаў. У 1617 г. яны былі выгнаны з Навагрудка, а іх царква разбурана. Становішча з кожным годам пагаршалася. Зачыняліся ўсе арыянскія школы і друкарні. У 1648 г. было абвешчана аб выключэнні арыян з ліку рэлігійных дысідэнтаў, а ў 1658 г. сойм Рэчы Паспалітай прыняў пастанову аб іх выгнанні за межы краіны. Давалася тры гады для вырашэння маёмасных спраў, пасля чаго кожны, хто прытрымліваўся такіх поглядаў, падлягаў смяротнаму пакаранню.

Рэфармацыя, тым не менш, стала яркай з'явай у грамадска-палітычным і культурным жыцці беларускага народа. Яна са-

дзейнічала фарміраванню грамадскай і этнічнай свядомасці, актывізацыі духоўнага жыцця, распаўсюджванню рэнесансна-гуманістычных тэндэнцый, умацаванню культурных сувязяў з замежнымі краінамі.

## 2.5. Іншыя рэлігійныя вызнанні: іўдаізм і іслам

Пранікненне іўдаізму адбывалася пераважна з захаду. Першым дакументам, які сведчыў аб пражыванні яўрэяў, а значыць, і існаванні іўдаізму на тэрыторыі сучаснай Беларусі, з'яўляецца прывілей ад 24 чэрвеня 1388 г., які выдаў у Луцку літоўскі князь Вітаўт яўрэям Брэста з мэтай іх далейшага перасялення. У ім устанаўліваліся прынцыпы пражывання яўрэяў у ВКЛ. За забойства яўрэя прадугледжвалася такое ж пакаранне, як і за забойства шляхціча. Яўрэям дазвалялася свабоднае адпраўленне абрадаў, а таксама займацца маёмаснымі і залогавымі аперацыямі. Апрача таго, Вітаўт забараняў абвінавачваць яўрэяў ва ўжыванні хрысціянскай крыві. Былі ўстаноўлены асновы аўтаноміі яўрэйскай абшчыны.

18 чэрвеня 1389 г. Вітаўт выдаў прывілей яўрэям Гродна. У дакуменце ўстанаўліваліся межы пасялення яўрэйскай абшчыны, вызваляліся ад падаткаў сінагогі і могілкі, рэгуляваліся гандлёвыя адносіны ў горадзе.

Прывілеі Вітаўта былі самымі верацярпімымі з усіх юрыдычных дакументаў, якія выдаваліся яўрэям Еўропы. Ім у ВКЛ гарантавалася больш правоў і свабод, чым у іншых еўрапейскіх краінах. Гарантыі правоў яўрэйскаму насельніцтву былі накіраваны на тое, каб прывабіць новых падданых у дзяржаву і забяспечыць рост гандлёвай праслойкі насельніцтва, яшчэ нязначнай у той час.

У канцы XIV ст. на землях ВКЛ існавала ўжо пяць яўрэйскіх абшчын: у Берасці (яўрэі называлі яго Брэск, ён з'яўляўся цэнтрам яўрэяў ВКЛ), Гродна, Тракаі, Луцку, Уладзіміры-Валынскім. Яўрэі з'яўляліся гараджанамі, у асноўным займаліся гандлем, рамяством, ліхвярствам, а таксама земляробствам.

На ўсходніх землях ВКЛ яўрэі пачалі сяліцца з XVI ст. Іўдзеі складалі істотную частку насельніцтва гарадоў і мястэчак, у кожным з іх былі пабудаваны драўляныя або каменныя сінагогі, а ў некаторых гарадах сінагог было некалькі. Апрача сінагог, будаваліся і невялікія малітоўныя дамы.

Іўдзейскія абшчыны ВКЛ мелі сваё ўнутранае самакіраванне. Рэлігійныя функцыі выконвалі равіны. Яны выбіраліся членамі абшчыны. Равіны таксама ўзначальвалі рэлігійныя школы – ешывы, абшчынныя судовыя органы, уваходзілі ў склад кіраўніцтва абшчыны, выконвалі іншыя адміністратыўныя функцыі. Вярхоўным органам яўрэйскага самакіравання ў ВКЛ быў Літоўскі ваад, у які ўваходзілі выбраныя прадстаўнікі акруг, што складаліся з асобных абшчын пэўнай тэрыторыі.

Мовай яўрэяў, якія пражывалі ў Беларусі, быў ідыш. На ім былі напісаны свяшчэнныя кнігі яўрэяў. Ідыш аказаў уплыў на беларускую мову. У сваю чаргу, частка лексікі ідыш беларускіх яўрэяў была непасрэдна ўзята з беларускай мовы. Яўрэі і беларусы сумесна пражывалі на беларускіх землях больш за шэсць стагоддзяў. Дзякуючы гэтаму адбывалася ўзаемаабагачэнне  іх культур, фарміраваліся талерантныя адносіны паміж этнасамі.

Аднак у гісторыі яўрэяў у ВКЛ былі і змрочныя старонкі. У 1495 г. вялікі князь літоўскі Аляксандр (1461–1506 гг.) нечакана загадаў яўрэям пакінуць ВКЛ. Магчыма, на такое рашэнне аказалі ўплыў каталіцкія клерыкалы. Але ў 1503 г. ён дазволіў яўрэям вярнуцца ў ВКЛ і выкупіць маёмасць, якая ім належала. У 1540 г. літоўскіх яўрэяў абвінавачвалі ў здзяйсненні розных злачынстваў супраць хрысціянскай веры. У прыватнасці, што яны купляюць хрысціянскіх дзяцей, якіх пасля абразаюць, каб затым пакінуць краіну і разам з маёмасцю і дзецьмі перасяліцца ў Турцыю. Праведзенае па ўказанні караля Жыгімонта І Старога Аўгуста (1467–1548 гг.) расследаванне не пацвердзіла гэтых абвінавачванняў. Каб у будучым пазбегнуць падобных канфліктаў, кароль выдаў указ, паводле якога яўрэям забаранялася схіляць хрысціян у сваю веру. Падобныя палажэнні былі замацаваны ў Статуце ВКЛ 1566 г.

У XIV–XV стст. у выніку ўнутранай барацьбы ў Залатой Ардзе і палітыкі вярхоўнай улады ВКЛ, зацікаўленай у прыцягненні татар, вядомых сваім воінскім майстэрствам, на землях Беларусі і Літвы пасялілася шмат перасяленцаў, якія вызнавалі іслам. Найбольшая іх колькасць перасялілася з ханам Тахтамышам у канцы XIV ст. у часы праўлення вялікага князя Вітаўта. Войскі літоўскія і татарскія ў 1397 г. хадзілі паходам на Дон і Прыазоўе, каб падпарадкаваць сабе тых татарскіх феадалаў, якія выйшлі з-пад уплыву Залатой Арды. Шмат татар, якія трапілі ў палон, а таксама прыхільнікаў Тахтамыша перасялілі ў ВКЛ. Татарскае войска ўдзельнічала ў Грунвальдскай

бітве 1410 г. з Тэўтонскім ордэнам. На беларускіх землях у той час было каля 20–22 тысяч татар.

Значныя абшчыны татар у XV–XVII стст. існавалі ў заходніх і цэнтральных паветах Беларусі – Лідзе, Іўі, Навагрудку, Слоніме, Мінску і інш. Асноўнымі культавымі цэнтрамі мусульманскіх прыходаў (джамітаў) былі мячэці, якія абслугоўваліся муламі (імамамі). Мулы, як і равіны, ажыццяўлялі розныя духоўныя і судовыя функцыі, вялі метрыкі. Богаслужэнне вялося на арабскай мове, а пазней – на татарскай. Свяшчэнныя кнігі прапісваліся арабскім пісьмом на старабеларускай і польскай мовах. Мулы прыбывалі з Крыма, некаторыя атрымлівалі адукацыю ў Турцыі.

Ва ўмовах поліэтнічнага грамадства ВКЛ татары мірна ўжываліся з хрысціянскім насельніцтвам. Больш таго, на рэлігійную свядомасць татарскай дыяспары пэўны ўплыў аказалі хрысціянскія традыцыі і абрады. З цягам часу татары ўспрынялі мову мясцовага насельніцтва.

Разам з тым беларускія татары свята выконвалі запаветы свяшчэннай кнігі – Карана. Абавязкамі кожнага веруючага было ўменне чытаць Каран і следаваць яго запаветам у паўсядзённым жыцці. Але ўзнікала праблема з арабскай мовай, якую беларускія татары не разумелі. Таму Каран і іншыя рэлігійныя тэксты пераводзіліся на даступныя ім мовы – літоўскую, беларускую або польскую. Гэтыя ўнікальныя помнікі татарска-беларускай (польскай, літоўскай) пісьменнасці атрымалі назву «Кітабы». У незвычайнай арабскай вязі гэтых кніг захавалася амаль у спрадвечным выглядзе старабеларуская гутарка.

Паступова колькасць вызнаўцаў ісламу расла і да XVI ст. дасягнула прыкладна 200 тысяч чалавек.

## 2.6. Уплыў рэлігіі на развіццё культуры беларускіх зямель

Беларускае мастацтва XIV–XVI стст. нясло на сабе адбітак праблем і супярэчнасцей грамадска-палітычнага жыцця дзяржавы. Яго развіццё было бурным і імклівым. У гэты час назіралася актыўнае засваенне традыцый рэнесанснай культуры, якая ўзбагачалася нацыянальнымі рысамі.

Немалую ролю адыграла таксама і багатая мастацкая спадчына старажытнабеларускіх княстваў, уздзеянне якой было вельмі значным. Пашырэнне ўзаемасувязяў з заходнееўрапейскімі краінамі,

перш за ўсё ў рэлігійных межах, спрыяла распаўсюджванню раманскага, гатычнага стыляў. Іх актыўнае ўваходжанне ў мастацкаю практыку абумовілі і асабістыя, унутрыдзяржаўныя прычыны. Засваенне новых мастацкіх стыляў адбывалася ў розных відах культуры неаднародна.

Культурнае жыццё на Беларусі ў XIV–XVI стст. было акрэслена гуманістычнай асветніцкай дзейнасцю выдатных прадстаўнікоў літаратуры – Ф. Скарыны, М. Гусоўскага, С. Буднага, В. Цяпінскага і інш.

Беларускія землі мелі параўнальна высокі ўзровень эканамічнага развіцця, таму больш важную ролю ў княстве адыгрывалі старабеларуская мова і культура. Мова выкарыстоўвалася як дзяржаўная, а таксама ў хатнім ужытку вялікіх князёў і феадальнай знаці. У выніку развіцця феадальнага грамадства ў межах этнічнай тэрыторыі Беларусі ў XIV–XVI стст. утварылася беларуская народнасць.

XIV–XVI стст. – эпоха ў развіцці культуры, якая атрымала ў Еўропе назву Адраджэнне, або Рэнесанс. Яна прыйшла на змену культуры Сярэдніх вякоў і папярэднічала культуры новага часу. Адраджэнне характарызавалася ўздымам свецкай навукі і мастацтва, станаўленнем нацыянальных моў, літаратур і нацыянальнай самасвядомасці, гуманістычным светапоглядам.

Дзякуючы трывалым сувязям з Еўропай беларуская культура таксама пазнала ўплыў ідэй Адраджэння, але тут меліся свае асаблівасці. Вялікае Княства Літоўскае знаходзілася на перыферыі еўрапейскага культурнага жыцця, тут не паспелі сфарміравацца элементы раннебуржуазнага грамадства, толькі зараджалася свецкая літаратура. Філасофская і грамадская думка працягвала арыентавацца на Біблію, не было выдатных дасягненняў у свецкіх відах мастацтва – жывапісе, скульптуры, музыцы. Тым не менш рысы Рэнесансу назіраліся ў архітэктуры, графіцы, асвеце і свецкіх відах мастацтва. Можна гаварыць аб шматграннасці і варыянтнасці рэнесанснай культуры на Беларусі.

Адукацыя, як і ў папярэдні перыяд, захоўвала рэлігійны характар. Пры праваслаўных цэрквах і манастырах існавалі школы, у праграму іх навучання ўваходзілі царкоўна-славянская граматыка, матэматыка, філасофія, тэалогія. Разам з тым пры праваслаўных брацтвах (гэта грамадскія аб’яднанні прыхаджан) у Вільні, Магілёве, Слуцку, Бярэсці, Полацку і г. д. дзейнічалі брацкія школы з больш шырокай праграмай, якая ўключала вывучэнне замежных і класічных (лацін-

скай і грэчаскай) моў, гісторыю, рыторыку. Навучанне ў іх было галоўным чынам бясплатным.

Шырокая праграма адукацыі існавала ў пратэстанцкіх школах. Найбольш вядомыя – у Іўі, Вільні, Бярэсці, Слуцку. Пратэстанты выступілі з прапановай заснаваць у ВКЛ універсітэт, але ва ўмовах контррэфармацыі ідэю перахапілі езуіты, а пратэстанцкія школы наогул былі зачынены.

Пашырэнне агульнага ўзроўню адукаванасці абумовіла ўзнікненне попыту на кнігі. У XIII–XVI стст. цэнтрамі перапісвання кніг з'яўляліся скрыпторыі – майстэрні па перапісцы кніг пры праваслаўных манастырах у Наваградку, Полацку, Смаленску, Вільні, Віцебску, Лаўрышаве, Супраслі, дзяржаўная канцылярыя ў Вільні, канцылярыі буйных феадалаў. Ствараліся значныя кнігазборы – бібліятэкі. Найбольш вядомымі былі бібліятэка Полацкага Сафійскага сабора, бібліятэкі манастыроў у Супраслі, Вільні, Слуцку, Пінску, а таксама кнігазборы навучальных устаноў (езуіцкіх калегіумаў і акадэмій) і прыватныя зборы магнатаў (Радзівілаў, Сапегаў і інш.).

Скрыпторыі не маглі задаволіць попыту на кніжнае слова, які ўвесь час узрастаў, таму не выпадкова, што ў ВКЛ узнікла кнігадрукаванне раней за ўсе ўсходнеславянскія землі. Заснавальнік усходнеславянскага кнігадрукавання – выдатны гуманіст і асветнік Францыск Скарына (1490–1551 гг.). У 1517–1519 гг. ён у Празе пераклаў і выдаў (з каментарыямі) Псалтыр і 22 кнігі Старога Запавету – Бібліі. У 1522 г. пераехаў у Вільню, дзе заснаваў першую на тэрыторыі ўсходніх славян друкарню, з якой выйшлі «Малая падарожная кніжыца» (1522 г.) і «Апостал» (1525 г.).

У 1550-я гг. у Бярэсці пачала працаваць пратэстанцкая друкарня Мікалая Радзівіла Чорнага – першая на Беларусі. Наогул, у 1560–1570-я гг. пратэстанцкія друкарні дзейнічалі ў Нясвіжы, Вільні, Слуцку, Уздзе, Лоску, Іўі, Ашмянах. Сярод найбольш вядомых выданняў пратэстантаў – «Брэсцкая Біблія» (1563 г.), «Нясвіжская Біблія« (1572 г.), «Новы Запавет» (1574 г.), «Размова паляка з літвінам» (1564 г.) і інш.

Першую кірылічную кнігу (на старажытнабеларускай мове) – «Катэхізіс» выдалі Сымон Будны і Лаўрэнцій Крышкоўскі ў Нясвіжскай друкарні ў 1562 г. У той жа год С. Будны надрукаваў кнігу «Пра апраўданне грэшнага чалавека перад Богам», пазней – «Біблію» (1572 г.), «Новы Запавет» (1574 г.), «Аб галоўных палажэннях хрысціянскай веры» (1576 г.).

У 1570-я гг. у маёнтку Цяпіна на Полаччыне заснаваў друкарню Васіль Цяпінскі (1540–1603 гг.). Ён выдаў «Евангелле» на царкоўнаславянскай мове з паралельным перакладам на беларускую мову. С. Будны і В. Цяпінскі выступалі ў абарону беларускай мовы, за развіццё на ёй пісьменнасці і кнігадрукавання.

Першадрукары Іван Фёдараў і Пётр Мсціславец пасля выгнання з Масквы працавалі на Беларусі ў маёнтку Рыгора Хадкевіча Заблудава Гродзенскага павета. У 1568–1569 гг. названыя першадрукары выдалі ў Заблудаўскай друкарні «Евангелле вучыцельнае», якое было першым друкаваным выданнем другой паловы XVI ст. Кніга ўяўляла сабой зборнік гутарак і павучанняў з тлумачэннем евангельскіх тэкстаў. У 1569–1570-я гг. І. Фёдараў там жа надрукаваў «Псалтыр» і «Часасловец». У 1580-я гг. І. Фёдараў пераехаў у Астрогу, дзе выдаў «Астрожскую Біблію» (1580–1581 гг.), а П. Мсціславец працаваў у друкарні братоў Мамонічаў у Вільні.

Напрыканцы XVI ст. у княстве дзейнічалі шматлікія друкарні – прыватныя, пры буйных праваслаўных брацтвах, пратэстанцкія. Актыўную дзейнасць распачалі езуіцкія друкарні. Выдавалася самая розная літаратура на беларускай, польскай, лацінскай мовах – як багаслоўская, так і свецкая, у тым ліку прававая. Так, у 1588 г. у друкарні Мамонічаў у Вільні ўпершыню быў выдадзены звод законаў – Статут ВКЛ. Выдавецкая дзейнасць была цесна звязана з развіццём літаратуры.

Як і раней, выдаваліся рукапісныя «Палеі», «Пацерыкі», «Пралогі», «Мінеі» – яны складаліся з твораў антычных і грэка-візантыйскіх аўтараў.

У сувязі з прыняццем Берасцейскай уніі ў 1596 г. шырокае распаўсюджанне атрымала палемічная літаратура. На старонках выданняў вяліся інтэлектуальныя спрэчкі паміж прыхільнікамі ўніі (П. Скарга, І. Пацей) і прыхільнікамі праваслаўя і пратэстантызму (Х. Філалет, М. Сматрыцкі, С. Будны, К. Астрожскі). Х. Філалет у сваім творы «Апокрысіс» (1597 г.) абвінавачваў іерархаў-уніятаў у матэрыяльных выгадах уніі. Найбольшага росквіту палемічная літаратура дасягнула ў першай палове XVII ст.

Развіццё музычнага мастацтва ішло ў межах царкоўных устаноў. З канца XV ст. развіваецца кантавая культура спеваў, а ў другой палове XVI ст. – партэсныя спевы. Спевакоў рыхтавалі ў брацкіх і манастырскіх школах. У канцы XVI ст. пры каталіцкіх установах – кляштарах сталі ўтварацца капэлы – калектывы, якія складаліся з аркестра і групы вакалістаў. З будаўніцтвам новых

каталіцкіх храмаў пачала пашырацца арганная музычная культура.

У XIV–XVI стст. адбывалася імклівае развіццё выяўленчага мастацтва – жывапісу, графікі, скульптуры. Іх вызначаў шэраг ўзаемазвязаных стыляў – готыка, рэнесанс, маньерызм. На характар выяўленчага мастацтва аказалі таксама значнае ўздзеянне багатыя традыцыі візантыйскай і старажытнарускай культуры. Мастацтву Беларусі была ўласціва цікавасць да паказу багатага ўнутранага свету асобы, яе маральнага аблічча. У жывапісе XIV–XVI стст. назіраецца імкненне да экспрэсіі, дынамікі, паказу драматычных сітуацый. Менавіта ў XIV–XVI стст. пачынаецца фарміраванне свецкіх форм мастацтва, якія дагэтуль не набылі адпаведных жанравых адрозненняў. Асабліва інтэнсіўна ў адзначаны перыяд развіваецца партрэт. Акрамя яго, мастакі звярталіся да манументальных выяў, пісалі абразы.

Аб манументальным жывапісе XIV–XVI стст. больш вядома з літаратурных і архіўных крыніц. Іх дадзеныя сведчаць, што фрэскавымі роспісамі былі ўпрыгожаны княжацкія палацы ў Віцебску, Троках, Крэве, Гродне, Віцебску, Полацку, цэрквы, касцёлы. Гэты жывапіс не захаваўся да нашага часу.

Самым значным помнікам манументальнага жывапісу XV ст., у стварэнні якога прымалі ўдзел беларускія мастакі, з'яўляюцца роспісы капліцы св. Тройцы ў Люблінскім замку (Польшча). Плоскасці сцен асноўнага аб'ёму храма, яго апсіда, скляпенні пакрываюць сюжэтныя кампазіцыі, арнаментальныя выявы. Па сваіх мастацкіх, стылістычных якасцях, зменах у размяшчэнні асобных сцэн яны нагадваюць больш ранні жывапіс, напрыклад, храмаў Бельчыцкага Барысаглебскага манастыра ў Полацку, фрэскавыя цыклы Наўгародскай царквы Фёдара Страцілата. Гэта асаблівасць, а таксама надпіс у самой капліцы даюць падставы сцвярджаць, што яе фрэскавае ўбранне было выканана беларускімі жывапісцамі, якімі кіраваў майстар Андрэй.

У XIV–XVI стст. разам з манументальным інтэнсіўна развіваецца станковы жывапіс. Аб найбольш ранніх творах вядома з літаратурных крыніц, у якіх згадваюцца асобныя абразы і партрэтныя выявы, даецца іх апісанне. Беларускі іканапіс разглядаемага перыяду вызначаецца моцным уздзеяннем візантыйскіх і старажытнарускіх традыцый. Але мясцовыя майстры здолелі выпрацаваць самастойныя правілы і схемы выяўлення святых, евангельскіх сюжэтаў, знайсці найбольш дасканалыя тэхнічныя прыёмы.

Для беларускіх абразоў XIV–XVI стст. адметным з’яўляецца шырокае выкарыстанне дэкаратыўна-пластычных сродкаў – разьбы і лепкі па ляўкасу, расфарбоўкі фону, разнастайных накладных элементаў, пакрыцця жывапіснай паверхні ахоўным лакам з яечнага бялку або смалы.

З XVI ст. у беларускім іканапісе назіраюцца пэўныя зрухі, звязаныя з уздзеяннем Адраджэння і маньерызму. На змену вытанчаннасці і ўмоўнасці вобразаў прыходзяць канкрэтнасць, вызначаная жыццёвая пераканаўчасць. Мастакоў пачынае хваляваць магчымасць увасаблення разнастайных чалавечых пачуццяў, каларытных дэталяў рэальнага жыцця. Самаму ранняму твору «Маці Боская Замілаванне» ( XIV– XV стст.) з Маларыты ўласцівы лірызм і пранікнёнасць пачуццяў. Візантыйскія традыцыі яўна адчуваюцца і ў абразе «Маці Боская Іерусалімская» (XV ст.) з Варварынскай царквы г. Пінска. У жывапісе канца XVI – пачатку XVII ст. яшчэ больш вымалёўваецца мясцовы тыпаж, прыкметней робіцца імкненне да перадачы элементаў быту, а таксама да прасторавай кампазіцыйнай пабудовы, аб’ёмнасці і важкасці выяўленых прадметаў.

На высокім узроўні развівалася звязаная з рукапіснай кнігай мініяцюра. Рукапісы XIV–XVI стст. часцей за ўсё ствараліся ў манастырах, дзе меліся бібліятэкі. Адным з самых буйных цэнтраў усходнеславянскага пісьменства быў Супрасльскі манастыр на Гродзеншчыне (зараз Падляшскае ваяводства, Польшча). Пры манастыры існавалі майстэрня для перапісвання і аздобы рукапісаў, пераплётная, а таксама бібліятэка. Другім значным асяродкам рукапіснай кнігавытворчасці на Беларусі быў Жыровіцкі манастыр.

Значнае развіццё атрымала дробная пластыка – літыя крыжы і абразкі, якія былі шырока распаўсюджаны ў асабістым ужытку. Храмы і касцёлы ўпрыгожваліся скульптурамі Ісуса Хрыста, святых, анёлаў. Скульптурныя кампазіцыі выкарыстоўваліся ў афармленні царскіх брам і алтароў.

У манументальным культавым дойлідстве XV–XVIII стст. найбольш яскрава і паслядоўна выявіліся самабытныя архітэктурна-мастацкія характарыстыкі беларускай готыкі, рэнесансу і барока, абумоўленыя спалучэннем традыцый мясцовага будаўніцтва з заходнееўрапейскімі сацыяльна-палітычнымі і культурнымі ўплывамі. Шырокую вядомасць набылі цэрквы абарончага тыпу канца XV – пачатку XVI ст.: Супрасльская, Сынкавіцкая, Мураванкаўская цэрквы-крэпасці. Яны спалучалі ў сабе функцыі культавай і абарон-

чай пабудовы. Па вуглах узвышаліся круглыя баявыя вежы з байніцамі. У час небяспекі тут маглі пэўны час знаходзіцца людзі і весці абарону. Акрамя чатырохвежавых цэркваў-крэпасцей, да беларускай готыкі належыць некалькі бязвежавых культавых пабудоў гэтага перыяду: Усялюбскі касцёл, Ішкальдскі Траецкі касцёл, Навагрудская Барысаглебская царква. У сярэдзіне XVI ст. з пашырэннем рэфармацыйнага руху пачалося актыўнае будаўніцтва пратэстанцкіх храмаў-збораў.

## Тэма 3

# РЭЛІГІЯ І ЦАРКВА НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У ПЕРЫЯД РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ (1569 г. – КАНЕЦ XVIII ст.)

*3.1. Брэсцкая царкоўная унія. Распаўсюджанне ўніяцтва на беларускіх землях.*

*3.2. Рэлігійныя праблемы ў дзяржаве. Пашырэнне ўплыву каталіцызму.*

*3.3. Контррэфармацыя і яе вынікі.*

*3.4. Праваслаўе на беларуска-літоўскіх землях.*

*3.5. Уплыў рэлігіі на развіццё адукацыі, літаратуры, мастацтва, архітэктуры беларускіх зямель.*

# 3.1. Брэсцкая царкоўная унія. Распаўсюджанне ўніяцтва на беларускіх землях

1 ліпеня 1569 года Польшча і Вялікае Княства Літоўскае падпісалі Люблінскую унію, у выніку якой утварылася новая дзяржава – Рэч Паспалітая. Сярод іншых праблем – палітычных, эканамічных і сацыяльных – рэлігійная займала важнае месца. Яшчэ з часоў караля польскага і вялікага князя літоўскага Ягайлы каталіцтва станавілася пануючай рэлігіяй у ВКЛ, выцясняючы пры гэтым праваслаўе. У новых гістарычных умовах, каб пазбегнуць канфліктаў, неабходна было зноў вярнуцца да вырашэння рэлігійнай праблемы.

Пад канец XVI ст. у палітычнай эліты ВКЛ, а таксама часткі праваслаўнага і каталіцкага духавенства выспявае ідэя уніі – аб'яднання праваслаўнай і каталіцкай Царквы пад патранатам рымскага папы. Гэта было выклікана шэрагам прычын унутрыпалітычнага і знешняга характару, а таксама становішчам праваслаўя.

Для ўмацавання Рэчы Паспалітай, як лічылі польскія ўлады і каталіцкія колы, неабходна было аб'яднаць праваслаўных украінцаў і беларусаў з палякамі-каталікамі. Такую ідэю падтрымлівала частка праваслаўных іерархаў, якая імкнулася вызваліцца з-пад апекі канстанцінопальскага патрыярха, які не меў дастаткова ўлады для абароны праваслаўнай Царквы ў Рэчы Паспалітай. Апрача таго, гэтая частка духавенства жадала захаваць сваё прывілеяванае становішча ў новай дзяржаве, ураўняць свае правы з каталіцкімі епіскапамі і падпарадкоўвацца толькі ўладзе папы і караля.

У 1590 г. некалькі праваслаўных епіскапаў тайна уступілі ў перагаворы з польскім каралём Жыгімонтам III (1587–1632 гг.) і выказалі жаданне далучыцца да каталіцкай Царквы. Пасля падпісання каралём універсала аб уніі епіскапы Кірыл Цярлецкі (1540–1607 гг.) і Іпацій Пацей (1541–1613гг.) накіраваліся ў Рым, каб засведчыць сваю адданасць папе. У кастрычніку 1596 г. кароль Жыгімонт III і кіеўскі мітрапаліт Міхаіл Рагоза (?–1599 гг.) па даручэнні папы рымскага Клімента VIII (1536–1605 гг.) склікалі ў Брэсце царкоўны сабор для афіцыйнага абвяшчэння уніі.

Аднак сабор адразу раскалоўся на два асобныя саборы – праваслаўны і ўніяцкі. Першы адхіліў унію, другі – абвясціў унію, прызнаў вяршэнства для ўніяцкай Царквы рымскага папы, асноўныя дагматы каталіцкай Царквы. Разам з тым захоўваліся праваслаўныя абрады і царкоўна-славянская мова ў набажэнствах. Уніяцкім епіскапам абяцалі сенатарскія званні (аднак гэта не было выканана). Уніяцкае духавенства, як і каталіцкае, вызвалялася ад падаткаў, уніяцкая шляхта атрымала магчымасць займаць дзяржаўныя пасады нараўне з каталіцкай шляхтай, а ўніяты-мяшчане ўраўніваліся ў правах з каталікамі-мяшчанамі.

Пасля Брэсцкага сабора пачалося насаджэнне уніі сярод праваслаўных. У праваслаўнай Царквы адбіраліся храмы і пераўтвараліся ва ўніяцкія, а веруючых цэлымі прыходамі пераводзілі ў новую веру. Гэта выклікала супраціўленне з боку беларускіх сялян і мяшчан, праваслаўных брацтваў. Не ўспрынялі унію шляхта праваслаўнага веравызнання і пратэстанты. Разам з тым у уніі знаходзіліся не толькі праціўнікі, але і гарачыя прыхільнікі. З цягам часу унія стала фактарам не толькі рэлігійнага, але і грамадска-палітычнага і сацыякультурнага жыцця насельніцтва беларускіх зямель.

Колькасць паслядоўнікаў новай веры спачатку была нязначнай. Але ўніяты ў другім і трэцім пакаленні лічылі унію сваёй роднай верай, якая дасталася ў спадчыну ад бацькоў.

Стабілізацыя ўніяцтва адбылася ў 30–40-я гг. XVII ст. На тэрыторыі Рэчы Паспалітай было каля 4 тысяч уніяцкіх і звыш 13,5 тысяч праваслаўных парафій. Найбольшая колькасць уніяцкіх парафій была ў Вільні, Бярэсці, Жыровічах, Полацку, Віцебску, Быцені і інш. Аднак у час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654–1667 гг. уніяцкая Царква апынулася на мяжы пагібелі. На тэрыторыі, занятай маскоўскім войскам, дзейнасць уніяцкай Царквы была забаронена.

Пытанне аб тым, якую ролю адыграла Брэсцкая унія не толькі ў гісторыі беларускага народа, але і ў цэлым у Рэчы Паспалітай і Усходняй Еўропы, здаўна было прадметам вострых дыскусій. Некаторыя гісторыкі сцвярджалі і сцвярджаюць, што унія садзейнічала кансалідацыі беларускага народа, фарміраванню яго этнічнай свядомасці, захаванню мовы і культуры ад паланізацыі, а таксама спрыяла ўключэнню беларускіх зямель у культурна-рэлігійную прастору заходняй цывілізацыі. Іншыя, наадварот, схільны бачыць у заключэнні уніі праяўленне дзяржаўна-рэлігійнай палітыкі, накіраванай на аслабленне праваслаўнай Царквы ў ВКЛ і адрыў яе ад уплыву

Маскоўскай патрыярхіі, а таксама на раскол адзінства беларускага і рускага народаў. Адназначна адмоўная ацэнка уніі праваслаўнай Царквой, якая разглядае яе як адступленне ад канонаў Святой Царквы і веравучэння. Уніяцкую Царкву абвінавачвалі ў рэлігійных канфліктах, у паглыбленні супярэчнасцей ва ўкраінска-беларускім грамадстве XVII–XVIII стст. Да сённяшняга дня ўніяцкая праблема з'яўляецца перашкодай у адносінах паміж праваслаўнай Царквой і каталіцкім Касцёлам.

## 3.2. Рэлігійныя праблемы ў дзяржаве. Пашырэнне ўплыву каталіцызму

Пасля заключэння уніі на беларуска-ўкраінскіх землях разгарнулася рэлігійна-грамадская барацьба яе прыхільнікаў і праціўнікаў. Адной з галоўных арэн гэтай барацьбы была Вільня. Вострыя канфлікты ўзнікалі ў Кіеве. На сейме 1601 г. пратэстанты і католікі выступілі сумесна з патрабаваннем прыняць сеймавую канстытуцыю, якая б гарантавала роўныя правы католікам і некатолікам, але кароль і сенат адмовіліся прымаць такое рашэнне, тым самым яшчэ раз пацвердзілі, што толькі ўніяцкая Царква прызнана ў Рэчы Паспалітай. На многіх сейміках па ініцыятыве пратэстантаў былі прыняты інструкцыі з патрабаваннямі гарантаваць правы праваслаўных. Урэшце барацьба ўвянчалася поспехамі: на сейме 1607 г. кароль падпісаў універсал, які пацвярджаў папярэднія правы праваслаўнай Царквы.

Але барацьба не сціхала. У лістападзе 1623 г. у Віцебску ўспыхнуў рэлігійны бунт супраць полацкага ўніяцкага епіскапа Іасафата Кунцэвіча (1580–1623 гг.), вядомага сваім жорсткім абыходжаннем з праваслаўнымі. Ён быў жорстка забіты, а яго цела выкінута ў Дзвіну. Адказам урада былі крывавыя рэпрэсіі – каля 100 чалавек былі прыгавораны да смяротнага пакарання. Горад пазбаўляўся Магдэбургскага права, з ратушы і цэркваў знялі званы.

Многія гарады таксама станавіліся арэнай вострых і частых канфліктаў паміж уніяй і праваслаўем. Выключную ролю тут адыгралі праваслаўныя брацтвы. Іх росквіт прыходзіцца на канец XVI – першую палову XVII ст.

На працягу ўсяго перыяду існавання Рэчы Паспалітай у ёй пастурова паглыбляўся раскол грамадства па нацыянальна-культурнай і сацыяльна-рэлігійнай прыналежнасці. На тэрыторыі Беларусі яго рысы мелі ярка выражаны характар. У канцы XVIII ст.

беларускія магнаты былі католікамі, а шляхта ў большасці сваёй прытрымлівалася каталіцтва або ўніяцтва. Па гэтай прычыне яны арыентаваліся на польскія нацыянальна-культурныя традыцыі. У той жа час большасць беларускага сялянства былі праваслаўнымі. І хаця колькасная перавага была ва ўніяцкіх парафій над праваслаўнымі, працэс замены праваслаўнага веравызнання каталіцкім у асяроддзі беларускіх сялян-уніятаў быў яшчэ не завершаны. Гэта паўплывала і на палітыка-ідэалагічнае размежаванне ў беларускім грамадстве.

У 1569 г. на Люблінскім сейме былі пацверджаны правы татар на будаўніцтва мячэцей і падрыхтоўку духавенства за мяжой. Для абмежавання ўплыву Асманскай імперыі на літоўскіх татар у 1672 г. кароль Ян ІІІ Сабескі (1674–1696 гг.) забараніў ім выконваць фетвы (правілы адносна ўжывання мусульманамі мяса) асманскага султана, які аднačасова з’яўляўся халіфам – духоўным лідарам мусульман. У 1591 г. у Рэчы Паспалітай пражывала каля 100 тысяч татар, дзейнічала каля 400 мячэцей. Да пачатку XVIII ст. колькасць татар-мусульман скарацілася ў выніку асіміляцыі да 30 тысяч.

У пачатку XVII ст. у Рэчы Паспалітай пачалося наступленне на культуру і духоўную своеасаблівасць мясцовых татар. Іх пачалі абмяжоўваць у выбарчым праве, будаўніцтве мячэцей і нават на бытавым узроўні. У гэтай сувязі большасць татар былі асіміляваны, страцілі сваю мову, а іх прозвішчы трансфармаваліся ў польскія або літоўскія. Многія прынялі каталіцкую веру. Аднак татары заставаліся вернымі рэлігіі сваіх продкаў. Больш таго, сярод прыхільнікаў ісламу з’явіліся прадстаўнікі іншых этнасаў.

Не адбылося істотных змен у становішчы і рэлігіі яўрэяў. У 1514 г. вялікі князь Жыгімонт І Стары выдаў прывілей прадстаўніку берасцейскай абшчыны Міхею Ізефовічу, згодна з якім той атрымліваў шырокія правы главы ўсіх яўрэйскіх абшчын дзяржавы, асабліва гэта датычылася судовых і сацыяльна-эканамічных пытанняў.

З другой паловы XVII–XVIII ст. узмацняліся паланізацыя і акаталічванне насельніцтва ўсходніх зямель Рэчы Паспалітай. Старабеларуская мова выцяснялася з судзебнага і дзяржаўнага справаводства, а ў канцы XVII ст. яе выкарыстанне як афіцыйнай і пісьмовай мовы было забаронена. Пастановай сейма ў 1696 г. усё пераводзілася на польскую мову. Узрасло ўшчамленне правоў праваслаўных і пратэстантаў. У 1668 г. сейм забараніў пераходзіць з каталіцтва ў іншыя веравызнанні. Праваслаўнай шляхце, святарам, мяшчанам быў забаронены доступ у дзяржаўныя органы ўлады.

У дзяржаве нарастаў крызіс. Адной з важнейшых прычын, якія прывялі да яго, было пытанне дыскрымінацыі хрысціянскага нярыма-каталіцкага насельніцтва – дысідэнтаў. Асабліва яно абвастрылася ў 1760-я гг. Праваслаўных, якія не прынялі Брэсцкую унію, называлі дэзунітамі, і яны былі па-за законам. У іх не было права выбірацца ў сейм, займаць дзяржаўныя пасады і адкрываць новыя храмы. Дысідэнты не маглі разлічваць нават на спакойнае карыстанне сваімі маёнткамі і на асаблівую бяспеку. Ідэя ўраўноўвання ў правах дысідэнтаў і каталікаў выклікала жорсткае супраціўленне з боку буйных магнатаў, дробнай шляхты і рыма-каталіцкага духавенства.

Расія дабівалася ад польскага ўрада забеспячэння правоў праваслаўных веруючых і прызнання за Расіяй права прадстаўляць іх інтарэсы перад польскім урадам. У пытаннях свабоды веравызнання Расія выступала разам з Англіяй, Швецыяй і Галандыяй, якія аказвалі падтрымку пратэстантам.

Пры падтрымцы Расіі ў сакавіку 1767 г. была створана Слуцкая канфедэрацыя праваслаўных і пратэстантаў, а ў 1768 г. расійскі пасол князь М. Рапнін здолеў дабіцца на польскім сейме ўраўноўвання правоў дысідэнтаў з каталікамі. Пасля паражэння Барскай канфедэрацыі ў 1772 г. адбыўся першы падзел Рэчы Паспалітай.

Прыхільнікі каталіцкага Касцёла і вярхушка ўніяцкай Царквы імкнуліся да захавання самастойнасці Рэчы Паспалітай, а пасля яе падзелаў – аднаўлення гэтай дзяржавы ў былых межах. У сваю чаргу праваслаўнае насельніцтва Беларусі, у тым ліку і сяляне-ўніяты, арыентавалася на Расію, якая не толькі лічылася традыцыйна галоўным абаронцам праваслаўнай веры, але гістарычна і этнічна была бліжэй беларусам, чым Польшча. Існаванне гэтых дзвюх тэндэнцый і барацьба паміж імі надоўга сталі важнейшай асаблівасцю гістарычнага развіцця беларускіх зямель.

## 3.3. Контррэфармацыя і яе вынікі

Часы развіцця Рэфармацыі сталі самай яркай старонкай рэлігійнай талерантнасці ў Вялікім Княстве Літоўскім, яе «залатым векам». Пазіцыі рыма-каталіцкага Касцёла аслаблі, а некатолікі атрымалі шырокае прадстаўніцтва ў органах улады. У 1569 г. у сенаце ВКЛ з 22 членаў пратэстантамі з'яўляліся 15 (68 % ад усяго складу; у Кароне (Польшчы) тады ж – 50 %). У 1572 г. сярод той самай колькасці

сенатараў было 16 пратэстантаў (што складала 73 %), а католікаў і праваслаўных – па 3.

У студзені 1573 г. канвакацыйны сойм у Варшаве прыняў пастанову, якая законна замацавала рэлігійную талерантнасць – знакаміты акт Варшаўскай канфедэрацыі, які потым цалкам увайшоў у Статут 1588 г. Ад паспалітага народа ВКЛ яго падпісалі 17 паслоў. Прынятая пастанова замацавала поўную свабоду веравызнанняў, дэкларавала роўнасць у публічных і прыватных правах прадстаўнікам усіх хрысціянскіх рэлігій і станаў Рэчы Паспалітай. Адметна, што гэта адбылося праз год пасля таго, як у Парыжы за адну Варфаламееўскую ноч тысячы гугенотаў сталі ахвярамі сваіх рэлігійных апанентаў. Варшаўскую канфедэрацыю як хартыю свабоды рэлігійнага сумлення можна па праву лічыць вялікім дасягненнем шляхецкага народа. Нягледзячы на пратэсты каталіцкага духавенства, Стэфан Баторый пазней пацвердзіў яе, і акт Варшаўскай канфедэрацыі надоўга стаў юрыдычнай асновай, якая гарантавала рэлігійны мір у краіне.

Увасабленнем рэфармацыйных ідэй у праваслаўі, у прыватнасці прынцыпу ўдзелу няклірыкаў у кіраванні царквой, сталі царкоўныя брацтвы. Іх з’яўленне было адказам шырокіх грамадскіх колаў, найперш мяшчан, на глыбокі заняпад усходняй царквы ва ўмовах наступлення каталіцкага Касцёла. Паўставалі праваслаўныя брацтвы пераважна вакол храмаў або манастыроў у буйных гарадах. І калі падобныя аб’яднанні католікаў ставілі на мэце ўмацаванне пазіцый духавенства, то праваслаўныя брацтвы дамагаліся кантролю свецкіх людзей над святарамі і нават епіскапамі. Першым у ВКЛ з’явілася Віленскае Свята-Троіцкае брацтва, створанае ў 1584 г. Потым такія ж арганізацыі ўзніклі ў Крычаве (1588 г.), Магілёве (1590 г.), Бярэсці і Гародні (1591 г.), Менску і Оршы (1592 г.) і ў іншых гарадах. У некаторых з іх існавала па некалькі брацтваў. Напрыклад, у Менску да сярэдзіны XVII ст. іх было сем, у Магілёве – не менш за пяць. Маскоўская Русь такой з’явы наогул не ведала. Як падкрэсліў украінскі гісторык Яраслаў Ісаевіч, Беларусь і Украіна сталі адзінымі краінамі Усходняй Еўропы, дзе атрымалі шырокае распаўсюджванне брацтвы прыхаджан пры праваслаўных цэрквах.

Братчыкамі з’яўляліся галоўным чынам рамеснікі і гандляры, але часам да іх далучаліся і шляхцічы, прадстаўнікі свецкай арыстакратыі і духавенства. Дзейнасць брацтваў была скіравана найперш на дабрачынную дапамогу царкве і кантроль над ёй, на развіццё адука-

цыі для праваслаўных, на апекаванне хворымі, калекамі і сіротамі. Каб канкурыраваць з каталіцкім Касцёлам, брацтвы пачалі ўтвараць свае школы. Першыя з іх былі заснаваны пры Львоўскім і Віленскім брацтвах (1585 г.), а потым на іх узор узніклі брацкія школы ў Берасці (1591 г.), Менску (1592 г.), Магілёве (1592 і 1597 гг.) і іншых беларускіх гарадах. Навучаліся ў іх бясплатна ў асноўным дзеці мяшчан. Галоўнымі прадметамі былі славенская (царкоўнаславянская) і грэчаская мовы (таму такія школы часам называлі славяна-грэчаскімі), а ў Вільні і некаторых іншых гарадах (напрыклад у Бярэсці) на ўзор езуіцкіх калегіумаў у праграму ўключылі яшчэ мовы лацінскую і польскую. Наогул навучальныя праграмы брацкіх школ мелі выразную гуманістычную арыентацыю. Віленскай брацкай школай кіраваў Кірыл Лукарыс, які сам атрымаў адукацыю ў Падуанскім універсітэце.

На поспехі пратэстантаў у Еўропе каталіцкі Касцёл адказаў актыўнай барацьбой з Рэфармацыяй. Пачалася Контррэфармацыя – перыяд каталіцкага адраджэння ў XVI–XVII стст. (ад пантыфікату папы Пія IV (1559–1565 гг.) у 1560 г. да 1648 г. – моманту заканчэння Трыццацігадовай вайны).

Контррэфармацыя ўключала ў сябе шырокі спектр намаганняў па барацьбе з пратэстантызмам. Вылучаюць пяць напрамкаў дзейнасці Контррэфармацыі: веравучэнне; духоўная і структурная перабудова; манаскія ордэны; духоўныя рухі; палітычныя аспекты.

У выніку каталіцкай рэформы Царква зведала адміністрацыйныя змены, якія ўмацавалі яе становішча. Цэнтралізацыя ўлады ў руках папы, з'яўленне семінарый і навучальных устаноў новага тыпу і, як вынік, аднаўленне складу духавенства, барацьба з відавочнымі недахопамі, на якія даўно зважалі многія, – усё гэта дапамагло каталіцкай Царкве адпавядаць эпосе.

Галоўнымі напрамкамі гэтай барацьбы стала стварэнне ордэна езуітаў («Таварыства Ісуса»), выданне афіцыйнага паказальніка забароненых кніг, правядзенне спецыяльнага Усяленскага сабора. Сабор, названы па месцы правядзення Трыдзенцкім, праходзіў з перапынкамі з 1545 г. да 1563 г. Сваімі пастановамі ён узвысіў аўтарытэт папаў, умацаваў уладу епіскапаў, захаваў непарушнымі каталіцкія дагматы, лацінскую мову набажэнстваў, а вучэнне пратэстантаў перадаў анафеме. У 1564 г. было складзена «Трыдзенцкае спавяданне», якому павінны былі прысягнуць усе духоўныя асобы, а таксама ўніверсітэцкая прафесура. Пастановы Трыдзенцкага сабора пасля

іх прыняцця Пётркаўскім сінодам 1577 г. пашырыліся і на Рэч Паспалітую.

Контррэфармацыя навучыла каталіцкую Царкву новым пастырскім, педагагічным, інтэлектуальным, арганізацыйным падыходам, неабходным для задавальнення патрабаванняў новага светаўспрымання. Важную ролю ў рэалізацыі каталіцкай рэформы адыгралі ордэн езуітаў, рэлігійнае мастацтва і літаратура. Перабудова каталіцкай Царквы прадугледжвала стварэнне інквізіцыі, з’яўленне індэкса (спісу) забароненых кніг, якія падлягалі знішчэнню, стварэнне сеткі навучальных установ (калегіумаў) для падрыхтоўкі кадраў місіянераў для ахопленых Рэфармацыяй краін. Езуіты спрыялі пашырэнню дзейнасці іншых каталіцкіх манаскіх ордэнаў. Пры іх падтрымцы ў XVI–XVII стст. францысканцы адкрылі 17 манастыроў, дамініканцы – 41, кармеліты – 16. У ВКЛ з’явіліся бенедыкцінцы, піяры і інш.

У 1564 г. езуіты з’явіліся ў Кароне, а ў 1569 г. па запрашэнні епіскапа Валяр’яна Пратасевіча прыехалі ў Вільню. Праз год іх колькасць павялічылася да 300 чалавек. Сярод іх былі місіянеры, багасловы, прапаведнікі, пісьменнікі. З іх усталяваннем на землях Беларусі пачалося актыўнае наступленне контррэфармацыі, або «новай каталіцызацыі», з дэвізам «кожны шляхціч – католік». Езуіты сталі першым каталіцкім ордэнам, які важнай задачай сваёй дзейнасці лічыў адукацыю і выхаванне моладзі. Барацьбу супраць ідэй пратэстантызму яны вялі ў інтэлектуальнай сферы. Праграма езуіцкіх школ і калегіумаў абапіралася на класічныя мовы, рэлігійны дух і вымагала ад вучняў як ведаў, так і інтэлектуальных здольнасцей. Пераняўшы гуманістычную сістэму навучання, якая існавала і ў пратэстанцкіх навучальных установах, езуіты стварылі самыя лепшыя на той час школы, у якія аддавалі сваіх дзяцей і многія пратэстанты.

Ужо ў 1569 г. езуіты адкрылі ў Вільні сваю двухкласную школу, а праз год – калегіум з пяці класаў. У 1579 г. булаю папы Грыгора XIII (1572–1585 гг.) віленскаму езуіцкаму калегіуму быў нададзены статус акадэміі, і ён ураўняўся ў правах з Кракаўскім універсітэтам. Першым рэктарам Віленскай акадэміі стаў таленавіты езуіцкі палеміст Пётр Скарга (1536–1612 гг.). Стварыўшы сістэму вышэйшых школ, езуіцкі ордэн даў магчымасць моладзі атрымліваць добрую адукацыю ў яго установах, не выязджаючы ва ўніверсітэты Еўропы. Кальвіністы ж засталіся без сваёй вышэйшай школы, бо Жыгімонт II Аўгуст у 1567 г. адмоўна паставіўся да іх спробы адкрыць пратэ-

станцкі ўніверсітэт. Смерць апошняга вялікага апекуна Мікалая Радзівіла Рудога (1584 г.) канчаткова аслабіла лагер рэфарматараў Вялікага Княства Літоўскага.

Пашырэнне ідэй пратэстантызму на землях Беларусі было перапынена ўнутранай інтэграцыяй Рэчы Паспалітай і наступленнем каталіцызму на чале з езуітамі. Менавіта езуіты сцвярджалі зусім нехарактэрную для княства жорсткую палітыку адносна як праваслаўных, так і пратэстантаў. Стаўленне да іншаверцаў хутка мянялася, нарастала напружанне. Прыкладам рэлігійнай нецярпімасці стала дзейнасць Мікалая Крыштафа Радзівіла, празванага Сіроткам (1549–1616 гг.), нашчадка колішняга «слупа» Рэфармацыі – Мікалая Радзівіла Рудога. Ён перайшоў у каталіцтва пад уплывам езуіта Пятра Скаргі і пачаў заўзята нішчыць усё, што было зроблена бацькам: зачыняў пратэстанцкія дамы, паліў кнігі, ліквідаваў друкарні. Так нясвіжская лінія роду Радзівілаў вярнулася да каталіцкай Царквы (кальвіністамі заставаліся Радзівілы біржанскія). Знакамітая берасцейская друкарня ў 1570 г. была зачынена, а яе абсталяванне перавезена ў Вільню, дзе Сіротка адкрыў першае на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага каталіцкае выдавецтва. Праз год спыніла існаванне пратэстанцкая друкарня ў Нясвіжы, яшчэ праз год – у Заслаўі, а ў 1580-х гг. была ліквідавана і Лоская друкарня. У 1581 г. на Рынкавай плошчы ў Вільні з санкцыі біскупа Яна Радзівіла запалалі кнігі іншаверцаў, выдадзеныя ў Нясвіжы, Бярэсці, Заслаўі, а праз дзесяць гадоў езуіты спалілі ў сталіцы кальвінскі збор. У 1598 г. каталікі ўчынілі пагром у віленскім праваслаўным храме Святога Духа. Але найбольш цярпелі кальвіністы, у 1611 г. раз'юшаны натоўп фанатыкаў знішчыў іх збор, бібліятэку і архіў.

Контррэфармацыя ў ВКЛ была накіравана не толькі супраць пратэстантаў, але і супраць праваслаўнай Царквы. Беларускія землі разглядаліся Рымскай курыяй як плацдарм для распаўсюджання каталіцтва далей на Усход, у Маскоўскую дзяржаву. Вядомы папскі пасол Антоній Пасевіна ў сваёй кнізе «Масковія» (1586 г.) пісаў: «Унія, а за ёю святое веравызнанне каталіцкае прыйдуць на Усход з Лівова і Луцка, з Вільны і Полацка». Пад націскам Контррэфармацыі пачаўся масавы пераход магнатаў у рыма-каталіцкае веравызнанне. Найбольш пацярпела ад гэтага праваслаўная Царква, якая страціла сваіх патронаў, бо вялікая група былых праваслаўных магнатаў пасля пратэстантызму не вярнулася да старой веры, а прыняла каталіцтва. Толькі Астафій Валовіч (1530–1610 гг.) пад канец жыцця зноў стаў праваслаўным. Напрыканцы XVI ст. права-

слаўная Царква на тэрыторыі Беларусі заставалася практычна без апекуноў.

Рэфармацыя, Контррэфармацыя і каталіцкая рэформа прывялі да інтэлектуальна-культурнага ажыўлення. На аснове сучасных гістарычных падыходаў Контррэфармацыя і праводзімая адначасова каталіцкая рэформа прадстаўляюцца рэлігійна-культурным пераваротам, якому Еўропа ў XVI ст. у аднолькавай з Рэфармацыяй меры абавязана сваім духоўна-культурным аднаўленнем, развіццём еўрапейскай цывілізацыі.

## 3.4. Праваслаўе на беларуска-літоўскіх землях

Пад канец XVI ст. праваслаўная Царква на ўсходнеславянскіх землях Рэчы Паспалітай перажывала заняпад. Правячыя колы Польшчы і Літвы, будучы каталікамі лацінскага абраду, садзейнічалі распаўсюджванню каталіцізму на падуладных тэрыторыях і ўшчымлялі інтарэсы праваслаўных. Яны ўмешваліся ва ўнутранае жыццё праваслаўнай Царквы, назначалі і змяшчалі епіскапаў, іншы раз на епіскапскія кафедры назначалі свецкіх асоб. Некаторыя іерархі, імкнучыся да большай незалежнасці ад свецкай улады, лічылі выхадам з сітуацыі заключэнне уніі з Рымам, што дазваляла б ім беспрашкодна праводзіць набажэнствы па ўсходняму абраду. Аднак большасць праваслаўных епіскапаў, нягледзячы на ўціск, аж да канца XVI ст. процідзейнічалі гэтым настроям.

Становішча ўскладнялася тым, што распаўсюджванне каталіцтва і Рэфармацыі прывяло да таго, што многія магнаты і шляхта пачалі адракацца ад праваслаўнай веры. Змяніўшы веравызнанне, яны прысвойвалі сабе маёмасць царкоўных устаноў, якія знаходзіліся пад іх апекай. Праваслаўная Царква, такім чынам, страціла вялікую частку сваіх вернікаў з асяроддзя феадалаў і гараджан. З-за недахопу матэрыяльных сродкаў скарачалася колькасць праваслаўных храмаў, манастыроў, іншыя прыходзілі ў заняпад. Становішча праваслаўя пагаршалася па прычыне таго, што епіскапскія кафедры нярэдка пераходзілі да свецкіх людзей, якія куплялі іх у караля за грошы. Такія «пастыры» не ведалі багаслоўя, не маглі належным чынам кіраваць праваслаўнай кафедрай, а ў сваім прызначэнні бачылі толькі крыніцу даходаў.

З дзесяці праваслаўных епархій на тэрыторыі беларускіх зямель тады былі Полацкая, Смаленская, Пінская (Тураўская)

і Уладзіміра-Берасцейская. Рэзідэнцыя мітрапаліта знаходзілася не ў Кіеве, а ў Навагрудку або Вільні. Хаця праваслаўныя цэрквы функцыянавалі амаль у кожным горадзе і мястэчку (а ў буйных гарадах іх было шмат, напрыклад, у Пінску ў сярэдзіне XVI ст. было 13 храмаў, у Гродне – 6, у Клецку – 5), парафіяльная сетка заставалася слабаразвітай. Не хапала храмаў у сельскай мясцовасці. Так, у Пінскім старостве на 105 вёсак налічвалася толькі 10 цэркваў.

Сярод істотных праблем праваслаўнай Царквы былі наступныя: невысокі ўзровень адукаванасці і маральнасці духавенства, а ніжэйшае духавенства ўвогуле было непісьменным. Крызіс праваслаўнай Царквы ў Рэчы Паспалітай дасягнуў свайго апагею ў 1570–1580-я гг. Да ўнутраных прычын яго абвастрэння дадаваўся недахоп апекі з боку дзяржавы, якая ў першую чаргу падтрымлівала каталіцкі Касцёл, да знешніх – нестабільнасць самога Царгародскага патрыярхату і аслабленне з ім сувязяў Кіеўскай мітраполіі. У такой сітуацыі набывалі актуальнасць ідэя аб'яднання ўсходняй Царквы з заходняй, саюз з Рымам, што і адбылося ў 1596 г.

У выніку Берасцейскай уніі 1596 г. праваслаўная Царква апынулася яшчэ ў больш цяжкім становішчы: большасць епіскапаў на чале з мітрапалітам Міхаілам Рагозай перайшлі ва ўніяцтва. Праваслаўная Царква ў ВКЛ як кананічнае цэлае перастала існаваць. Пачалося змаганне з уніятамі за храмы і манастыры. Праваслаўныя храмы або закрываліся, або разбураліся, або пераводзіліся ва ўніяцкія. Уніяты дабіваліся пераходу права ўласнасці на царкоўную маёмасць рознымі спосабамі, як нібыта законнымі з пункту гледжання дзяржаўнай улады, так і адкрыта процiпраўнымі. З моманту заключэння Брэсцкай царкоўнай уніі да сярэдзіны XVII ст. у праваслаўных былі адняты амаль усе цэрквы і многія манастыры, а богаслужэнні тайна праводзіліся ў жылых дамах, на адкрытым паветры і ў непрыстасаваных памяшканнях. У выніку да канца XVIII ст. у распараджэнні базыліян на тэрыторыі Беларусі было 52 манастыры, з іх толькі сем пабудаваны ўніятамі.

Спачатку праваслаўныя аб'ядноўваліся для сумеснай барацьбы разам з пратэстантамі, потым звярталіся за дапамогай да Масквы і ўсходніх патрыярхаў, падавалі скаргі ў сойм і Трыбунал ВКЛ. У 1620 г. Украіну наведаў іерусалімскі патрыярх Феафан, які прызначыў кіеўскім мітрапалітам (у Кіеве) Іова Барэцкага і епіскапаў на епархіі, у тым ліку на Полацкую епархію быў рукапалажаны

архіепіскап Мялецій Сматрыцкі. Але кароль Жыгімонт III (1566–1632 гг.) не дапусціў іх да кафедраў. Пасля ліквідацыі Віцебскага паўстання 1623 г., выкліканага дзеяннямі ўніяцкага архіепіскапа Іасафата Кунцэвіча (1580–1623 гг.), становішча праваслаўнай Царквы пагоршылася, а спроба правесці ў 1626 г. прымірэнчы з'езд праваслаўных і ўніятаў не мела поспеху.

У 1633 г., каб супакоіць праваслаўнае казацтва Украіны і пазбегнуць паўстанняў з яго боку, кароль Уладзіслаў IV Ваза (1595–1648 гг.) аб'явіў пра стварэнне чатырох новых праваслаўных епархій: Луцкай, Львоўскай, Перамышльскай і Магілёўскай. Мітрапалітам кіеўскім быў прызначаны Пётр Магіла (1597–1647 гг.), пры якім адбывалася пэўнае адраджэнне праваслаўнай Царквы. Зноў заснаваная Магілёўская (Беларуская) епархія была адзінай праваслаўнай епархіяй у межах Беларусі да канца XVIII ст. Падчас паўстання пад кіраўніцтвам Багдана Хмяльніцкага 1648–1654 гг. кароль Ян II Казімір Ваза (1648–1668 гг.) быў вымушаны ў 1650 г. абвясціць аб поўнай свабодзе для вызнання і культу праваслаўнай Царквы. Паводле «вечнага міру» 1686 г. паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй, праваслаўная Царква ва Украіне і Беларусі была падпарадкавана Маскоўскаму патрыярхату. Урад Рэчы Паспалітай разглядаў гэта як парушэнне свайго суверэнітэту, таму зноў пачаў уціск праваслаўных з мэтай далучэння іх да уніі. У XVIII ст. рабіліся спробы перадаць Магілёўскую (Беларускую) епархію ўніяцкаму епіскапу.

У другой палове XVIII ст. на ўсёй тэрыторыі Рэчы Паспалітай захавалася толькі адна праваслаўная епархія – Беларуская з цэнтрам у Магілёве. Яшчэ па ўмовах трактата аб «вечным міры» (1686 г.), які быў заключаны паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржавай, праваслаўных епіскапаў у Рэчы Паспалітай назначаў Кіеўскі мітрапаліт, рускі падданы, а кароль толькі зацвярджаў іх. Гэта давала падставы Расійскай дзяржаве на працягу ўсяго XVIII ст. умешвацца ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай. А тая, у сваю чаргу, лічыла праваслаўных чужародным элементам.

У верасні 1732 г. у Варшаве быў склікани сейм, які ўтварыў «генеральную канфедэрацыю» з мэтай перагляду ўсіх прывілегій праваслаўна-рускага насельніцтва Рэчы Паспалітай. Канфедэрацыя пастанавіла знішчыць і забараніць наступныя з іх: абранне праваслаўных дэпутатаў у сеймы, трыбуналы і спецыяльныя камісіі; прыняцце праваслаўных на пасады ў ваяводствах, гарадах і землях Рэчы Паспалітай; адносіны з усімі замеж-

нымі прадстаўніцтвамі пры Варшаўскім двары. Апошні артыкул пазбавіў праваслаўных права звяртацца за апякунствам да прадстаўнікоў Расіі пры каралеўскім двары, атрыманае імі ў 1686 г. па дагавору паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай. Было таксама забаронена праваслаўным свяшчэннікам хадзіць па вуліцах са Святымі Дарамі, царкоўныя таінствы і трэбы можна было праводзіць толькі з дазволу каталіцкіх ксяндзоў за ўстаноўленую плату; публічна хаваць праваслаўных памерлых толькі ноччу; дзеці, якія нарадзіліся ад змешаных шлюбаў, павінны былі належаць да каталіцкай Царквы.

З 1755 г. Беларускую праваслаўную епархію, у якой налічвалася каля 130 цэркваў і 250 тысяч веруючых, узначальваў епіскап Георгій (Каніскі) (1717–1795 гг.). Ён выступаў супраць Ватыкана і Брэсцкай уніі 1596 г., каталіцтва і царкоўнай уніі, заклікаў да аб'яднання беларускага, рускага і ўкраінскага народаў. Епіскапа Г. Каніскага моцна непакоіла становішча праваслаўя. У пісьме да архімандрыта Данскога ён пісаў, што сустракаўся з многімі праваслаўнымі свяшчэннікамі, якія ні на рускай, ні на польскай мове пісаць не ўмелі. Некаторыя з іх нават не ведалі колькасці запаведзяў і таінстваў, а навошта патрэбен Хрыстос, аб тым і пытацца не было патрэбы. Разам з тым епіскап Г. Каніскі звязваў грамадскі прагрэс з развіццём навукі, з распаўсюджваннем адукацыі на ўсе слаі насельніцтва. Па яго ініцыятыве адкрываліся школы і семінарыі, друкаваліся навуковыя і мастацкія творы. Многія свае ідэі ён выказваў у публічных прамовах і царкоўных пропаведзях. Усяго ім складзена каля 80 прамоў і пропаведзяў.

Аднак карэнныя змены ў становішчы праваслаўнай Царквы адбыліся толькі пасля далучэння зямель усходняй Беларусі ў 1772 г. да Расійскай імперыі, дзе праваслаўе было дзяржаўнай рэлігіяй. Каб пазбегнуць небяспекі новых падзелаў, урад Рэчы Паспалітай імкнуўся стварыць у краіне незалежную ад Расіі праваслаўную Царкву, дзеля чаго ў 1791 г. была склікана Пінская кангрэгацыя, аднак яе пастановы не былі выкананы. У той жа час на тэрыторыі ВКЛ заставалася толькі 50 праваслаўных прыходаў, а ва ўсёй Рэчы Паспалітай – каля 300 тысяч прыхаджан.

Пасля далучэння да Расійскай імперыі ўсіх земляў Беларусі тут пачала ажыццяўляцца палітыка ўніфікацыі царкоўнай структуры і паступовага замацавання праваслаўнай Царквы як пануючай у дзяржаве.

## 3.5. Уплыў рэлігіі на развіццё адукацыі, літаратуры, мастацтва, архітэктуры беларускіх зямель

У 1970–1980-я гг. беларускія даследчыкі даказалі наяўнасць на Беларусі ў XVI – пачатку XVII ст. рэнесансавага гуманізму і адпаведнай культуры. Беларуская культура XVI ст. упісвалася ў тагачасную еўрапейскую культуру, хаця і не знаходзілася ў эпіцэнтры яе развіцця.

Адным з фактараў дынамічнага развіцця беларускай культуры была яе поліканфесійнасць. Пратэстанты, езуіты, праваслаўная і ўніяцкая цэрквы грунтоўна дбалі пра навучанне дзяцей. Дзеля гэтага яны стваралі свае школы, выдавалі падручнікі і навучальныя дапаможнікі, у тым ліку на старабеларускай мове. У тыя часы характэрным было шырокае распаўсюджванне палемічнай літаратуры. Безумоўна, што Рэнесанс і Рэфармацыя як агульнацывілізацыйныя з'явы пакінулі глыбокі след у гісторыі Беларусі гэтага перыяду. Аднак яны для Беларусі былі не столькі сацыяльна-палітычнымі, колькі духоўна-культурнымі. На тэрыторыі Беларусі з'явіліся найбольш перадавыя для таго часу пратэстанцкія і брацкія школы, якія існавалі амаль у кожнай пратэстанцкай абшчыне.

У 70-я гг. XVI ст. на Беларусі функцыянавалі 163 кальвінісцкія зборы, пры якіх былі школы ў Бярэсці, Ашмянах, Смаргоні, Нясвіжы, Мінску, Пінску, Магілёве, Оршы, Віцебску. Яскравым прыкладам кальвінісцкай школы на Беларусі быў Слуцкі ліцэй, заснаваны ў 1617 г. Ён меў свой статут, праграму, метадычныя распрацоўкі, а таксама правілы для вучняў і настаўнікаў. У ліцэі вывучаліся галоўным чынам гуманітарныя навукі – лацінская, грэчаская, польская, нямецкая мовы і літаратуры, рыторыка, гісторыя, логіка, правазнаўства, матэматыка, фізіка. Ліцэй быў чатырохкласнай установай, дзе тэрмін навучання ў кожным класе складаў два гады. У адказах вучняў найбольш каштоўным лічылася самастойнасць вывадаў. Большасць вучняў ліцэя станавіліся прапаведнікамі кальвінізму, а найбольш здольныя накіроўваліся ва ўніверсітэты Германіі, Англіі, Італіі.

Арыянскія абшчыны заснавалі школы ў Іўі, Клецку, Нясвіжы, Койданаве, Любчы, Лоску, Навагрудку і іншых гарадах і мястэчках. Арыянскія школы былі двух тыпаў – пачатковыя і гімназіі.

У гімназіях, у тым ліку ў Іўеўскай, Нясвіжскай, Лоскай, разам з мовамі і літаратурамі (лацінскай, грэчаскай, старажытна-яўрэйскай) вывучаліся філасофія, рыторыка, права, геаграфія, прыродазнаўства, матэматыка, фізіка, этыка. Вядомым педагогам арыянскіх школ быў Ян Ліцыній Намыслоўскі (пачатак 1560-х – каля 1635 гг.).

Брацкія школы з'яўляліся цэнтрамі не толькі асветы, але і кнігадрукавання. Брацкія друкарні ў Вільні, Еўі (каля Вільні), Куцейне і Магілёве выдавалі большасць кніг богаслужэбнага зместу. Гэта было выклікана неабходнасцю ўпарадкаваць сістэму богаслужэння, процістаяць каталіцызму і ўніяцкаму ўплыву. Побач з літургічнымі выданнямі прыкметнае месца займалі кнігі для хатняга чытання (творы Іаана Златавуста, Макарыя Егіпецкага, вучэбная і іншая літаратура), а таксама палемічныя выданні, накіраваныя супраць Контррэфармацыі, царкоўна-рэлігійнай уніі, паланізацыі.

Асабліва хутка развівалася каталіцкая сістэма адукацыі. У XVI ст. згодна з пастановамі сінодаў кожны прыход павінен быў мець пачатковую школу. Акрамя таго, шматлікія каталіцкія манаскія ордэны адчынялі свае сярэднія навучальныя ўстановы – калегіумы. Асабліва вядомымі былі езуіцкія і піярскія калегіумы. Першы езуіцкі калегіум быў заснаваны ў Вільні (1570 г.), на тэрыторыі Беларусі – у Полацку (1581 г.). Калегіумы давалі класічную гуманітарную адукацыю. Навучанне было бясплатным, прымаліся юнакі любых саслоўяў і веравызнанняў, навучанне працягвалася 6–7 гадоў. Увесь навучальна-выхаваўчы працэс быў прасякнуты рэлігійнай накіраванасцю. У той жа час калегіумы садзейнічалі ўсталяванню на Беларусі заходнееўрапейскай сістэмы адукацыі. На базе Віленскага езуіцкага калегіума ў 1579 г. была створана езуіцкая акадэмія – першая вышэйшая навучальная ўстанова ў ВКЛ. Першым яе рэктарам быў выдатны палеміст, дзеяч ордэна езуітаў Пётр Скарга (1536–1612 гг.).

У езуіцкіх навучальных установах выкладалі высокакваліфікаваныя педагогі. Вучні вывучалі мовы (лацінскую, грэчаскую), рыторыку, літаратуру, філасофію, гісторыю, багаслоўе, а таксама прыродазнаўчыя і матэматычныя навукі. Пры езуіцкіх установах былі бібліятэкі, тэатры. За перыяд існавання езуіцкіх школ і калегіумаў шэраг іх выпускнікоў сталі вядомымі людзьмі, унеслі ўклад у развіццё еўрапейскай культуры, навукі, адукацыі. У іх ліку рэктар Віленскай акадэміі, а затым езуіцкіх школ Ігнацій Жаба (1713–

1790 гг.), доктар філасофіі Міхаіл Карыцкі (1714–1781 гг.), выдатны астраном, матэматык, асветнік, паэт Марцін Пачобут-Адляніцкі (1728–1810 гг.) і інш. У 1704 г. у Гродна езуіты адкрылі музыкальную бурсу. У 1773 г. у ёй налічвалася 63 музычныя інструменты. У састаў гродзенскай капэлы ўваходзіла 11 чалавек. Бурсы ўдзельнічалі не толькі ў набажэнствах, але і ва ўсіх царкоўных і грамадскіх мерапрыемствах.

Беларуская Рэфармацыя і Контррэфармацыя вылучылі плеяду таленавітых публіцыстаў. Гэта С. Будны, В. Цяпінскі, М. Сматрыцкі, Х. Філалет, Л. Карповіч і інш. Сапраўдным змагаром за праўду паўстае Афанасій Філіповіч (1597–1648 гг.). Яго «Дыярыўш», па сутнасці, з'яўляецца зборам твораў і складаецца з аўтабіяграфічных замалёвак, прамоў, палемічных трактатаў, пасланняў, паданняў, багаслоўскіх разважанняў, рэляцый і г. д. У сваіх творах ён ганьбіў знешнюю і ўнутраную палітыку, а таксама духоўных і свецкіх феадалаў за іх імкненне да раскошы, бязлітасна выкрываў заганы грамадства. Мялецій Сматрыцкі (1572–1630 гг.) – пісьменнік-палеміст, пяру якога належыць каля 20 твораў самых розных напрамкаў. Асобае месца сярод іх займае «Фрынас» (1610 г.), у якім М. Сматрыцкі ад імя сімвалічнага вобраза мацеры-царквы звяртаецца да народа з заклікам еднасці ўсіх сіл у барацьбе з наступаючым каталіцызмам. Адступніцтва ад веры, ад праваслаўнай мацеры-царквы трактавалася ім як здрада радзіме. М. Сматрыцкі быў таксама адным з перакладчыкаў заходнееўрапейскай літаратуры розных часоў і народаў – Пятраркі, Ратэрдамскага і інш.

Развіццё драматургіі паўплывала на развіццё тэатра. Спачатку з'явіўся школьны тэатр, дзе перад пачаткам п'ес на гістарычныя і біблейскія тэмы, а таксама ў антрактах і пасля спектакляў разыгрываліся інтэрмедыі – невялікія сцэнкі ці п'ескі, звычайна камічнага характару, напісаныя гутарковай мовай. Шырокае распаўсюджванне на Беларусі ў XVI ст. атрымаў тэатр лялек – батлейка. Сюжэты батлейкі былі заснаваны на біблейскай і евангельскай тэматыцы, а таксама бытавых матывах. Дзеянне адбывалася ў спецыяльна пабудаваным двухпавярховым доміку з вежачкай-мезанінам. На самым верхнім «узроўні» разыгрываліся сцэнкі са Святога Пісання пра Адама і Еву, нараджэнне Ісуса, на сярэднім – пра злачынствы цара Ірада, а ў самым нізе – сцэнкі з народнага побыту. Пастаноўкі батлейкі суправаджала як вакальная, так і інструментальная музыка: псалмы і канты, народныя песні і танцы. Музычныя нумары пачы-

налі і завяршалі спектаклі, гучалі паміж сцэнамі, з'яўляліся своеасаблівымі інтэрмедыямі.

Ідэі Адраджэння, а затым і барока адлюстроўваліся ў мастацтве. У беларускім жывапісе акрэсліліся два напрамкі: першы – мастацтва, заснаванае на старажытнарускіх традыцыях; другі – жывапіс, які знаходзіўся пад уплывам заходнееўрапейскай мастацкай школы. Але і ў першым, і ў другім напрамках адбывалася перапляценне візантыйскага і заходнееўрапейскага стыляў з мясцовай школай, захаванне мясцовых традыцый, выпрацоўка свайго ідэалу і мастацкіх прынцыпаў.

У выніку сінтэзу розных школ і напрамкаў склалася самабытная беларуская іканапісная школа, якой уласцівы вернасць канону, сімвалізм выяўленчай мовы, характэрнасць тыпажу, шырокае выкарыстанне этнаграфічных элементаў (узорыстасць, разнастайнасць арнаменту, у тым ліку і расійскага). У найбольш ранніх творах XVI ст. («Маці Боская Адзігітрыя» са Случчыны, «Маці Боская Іерусалімская» з Брэстчыны) прыкметна спалучэнне асноўных рыс сярэдневяковага мастацтва з элементамі рэнесансу: светлы каларыт, аб'ём, лірычнасць. Пад уплывам Адраджэння з'явілася імкненне да перадачы аб'ёму, прасторы, прапарцыянальнасці чалавечых фігур і асяроддзя («Нараджэнне Багародзіцы», «Пакланенне вешчуноў» з Брэстчыны).

На Беларусі існавала некалькі іканапісных школ: магілёўская, полацка-віцебская, палеская, гродзенская, слуцка-мінская. Магілёўская школа, напрыклад, характарызавалася стрыманасцю жывапіснай палітры, некаторай прыглушанасцю, у той час як жывапісу палескай школы ў большай ступені ўласціва колеравае гучанне, багацце палітры, а ў гродзенскай прыкметны ўплыў польскага жывапісу XVI–XVII стст. Але, нягледзячы на некаторае адрозненне, для ўсіх іх характэрны рысы, якія і складаюць беларускую іканапісную школу.

Другім важным напрамкам быў манументальны жывапіс. У XVI ст. тут таксама прыкметны ўплыў рэнесанснага стылю – імкненне да перадачы аб'ёму, перспектывы, святлоценявой і колеравай мадэліроўкі. Яскравым прыкладам манументальнага жывапісу пераходнага перыяду з'яўляецца роспіс драўлянай царквы Куцеінскага Богаяўленскага манастыра (каля Оршы). Шматфігурная кампазіцыя (38 сцэн) на біблейскія і евангельскія сюжэты была перанесена амаль на ўсе сцены. І хаця яшчэ дамінуюць статычнасць і фрагментарнасць малюнка, ужо адчуваецца імкненне

авалодаць тэхнікай перадачы руху, спробы адлюстраваць у кампазіцыі прастору і аб'ём.

У канцы XVI ст. на беларускія землі пранікае новы архітэктурна-мастацкі стыль – барока, запазычаны з Італіі. Эпоху барока прынята лічыць пачаткам трыумфальнага шэсця «заходняй цывілізацыі». Стылю ўласцівы кантраснасць, напружанасць, дынамічнасць вобразаў, імкненне да велічы і пышнасці, да сумяшчэння рэалій і ілюзій, шматлікіх скульптур, калон і пілястраў, купалаў складанай формы. Першым узорам гэтага стылю стаў Нясвіжскі касцёл Божага Цела, пабудаваны італьянскім архітэктарам Янам (Джаванні) Марыяй Бернардоні ў 1578–1593 гг.  Касцёл павінен быў сведчыць аб магутнасці каталіцкай Царквы.  Адначасова ён стаў фамільнай пахавальняй для магнатаў Радзівілаў. На Беларусі будаваліся касцёлы з бязвежавымі галоўнымі фасадамі, дзе канцэнтраваліся асноўныя сродкі выразнасці, што, як вядома, было характэрна для італьянскага барока (касцёлы бернардзінцаў і францысканцаў у Гродне, дамініканцаў у Мінску і Навагрудку) і інш.

Пасля Брэсцкай уніі 1596 г. многія праваслаўныя храмы і манастыры былі перададзены ўніятам і каталіцкім ордэнам, якія сталі іх перабудоўваць. Будаўніцтва праваслаўных храмаў было спынена. Але, нягледзячы на процідзеянне, у чатырох гарадах ВКЛ узніклі праваслаўныя манастыры, пачатак якім паклалі драўляныя цэрквы ў Мінску (1611 г.), Вільна (1597 г.), Оршы (1623 г.), Мсціслаўлі (1641 г.).

Распаўсюджаным тыпам культавых пабудоў яўрэяў у гарадах і мястэчках з'яўляліся сінагогі. Не захавалася прыкладаў драўлянай сінагогі, якая, у адрозненне ад каменнай, была больш традыцыйнай пабудовай. Так, галоўная сінагога Пінска (1616 г.) неаднаразова гарэла і разбуралася. Вялікая харальная сінагога ў Мінску была пабудавана ў 1590 г. і ўяўляла сабой тыповы сінагагальны будынак. У 1589 г. нясвіжскія яўрэі атрымалі ад князя Радзівіла Сіроткі грамату, якая дазваляла ім будаваць каменную сінагогу

Да сярэдзіны XVIII ст. школьная адукацыя ў асноўным канцэнтравалася ў руках манаскіх ордэнаў, аднак пазней яна стала набываць больш свецкі характар. Рэформа школ, якая праводзілася пад кіраўніцтвам С. Канарскага, пахіснула манаполію езуітаў у асвеце і адукацыі. У навучальных установах пачалі выкладаць сучасныя мовы, больш увагі ўдзялялася грамадскім і прыродазнаўчым дысцыплінам, тэарэтычныя веды пачалі пад-

мацоўвацца практычным вопытам. У грамадскіх навуках значна аслабела перавага тэалогіі. У 1773–1775 гг. была сфарміравана Адукацыйная камісія – практычна першае ў Еўропе Міністэрства народнай адукацыі. Яна паспрабавала правеці агульную рэформу школы ў Рэчы Паспалітай. Ствараліся сярэднія школы, якія давалі права на паступленне ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. Намаганнямі камісіі на беларускіх землях у кароткі тэрмін было адкрыта 20 новых школ. Камісія адмяніла выкладанне рэлігіі ў рамках школьных праграм.

У грамадска-палітычнай думцы панавала схаластыка. Аднак шырокую вядомасць атрымалі атэістычныя погляды Казіміра Лышчынскага (1634–1689 гг.), ураджэнца мястэчка Лышчыцы на Брэстчыне. Некаторы час ён быў  у ордэне езуітаў,  пасля выйшаў з яго, стаў прапагандаваць атэістычныя погляды. Яму належыць трактат «Аб неіснаванні Бога», у якім сцвярджаецца, што Бог не існуе, а з'яўляецца толькі ілюзіяй, народжанай фантазіяй людзей. Па прыгавору сеймавага суда Казіміра Лышчынскага ў 1689 г. спалілі ў Варшаве.

Высокамастацкай скульптурай, разьбой, фрэскавым жывапісам адрозніваліся касцёлы, манастыры каталіцкіх ордэнаў. Прыкладам могуць служыць інтэр'ер езуіцкага касцёла ў Гродна (разьбяр Ян Шміт), выкананы ў 20–30-я гг. XVIII ст., скульптурны ансамбль Пінскага францысканскага касцёла. У стылі барока былі пабудаваны касцёл і манастыр бернардынак у Мінску. У ВКЛ развіваўся мясцовы кірунак дадзенага стылю – віленскае барока, буйнейшым прадстаўніком якога выступаў віленскі архітэктар Ян Хрыстоф Глаўбіц (1700–1767 гг.). Архітэктурныя помнікі віленскага барока вызначаюцца пластычнасцю аб'ёмаў, маляўнічасцю сілуэта, утворанага стромкімі шмат'яруснымі скразнымі ажурнымі вежамі, якія надаюць галоўнаму фасаду прасторавую структуру. Яго рысы найбольш ярка праявіліся ў культавых збудаваннях уніятаў. Напрыклад, Сафійскі сабор у Полацку (1738–1760 гг.), пабудаваны на фундаменце разбуранага ў пачатку XVIII ст. праваслаўнага храма, касцёлы і манастыры базыліян у Беразвеччы Глыбокскага раёна Віцебскай вобласці, Барунах Ашмянскага раёна Гродзенскай вобласці і інш.

З сярэдзіны XVII ст. беларускі іканапіс канчаткова пераходзіць на еўрапейскі мастацкі стыль, арыентаваны на рэнесансныя і барочныя ўзоры. Аднак пад іх уплывам беларускія іканапісцы стварылі свой мясцовы варыянт гэтых стыляў. У беларускіх іконах

з'явіліся такія рысы, як характэрнасць тыпажу, перадача прыродных чалавечых настрояў (плач, смутак, радасць), востра адлюстраваныя жыццёвыя сітуацыі (нарадзіны, пахаванне), мясцовыя пейзажы, архітэктура, інтэр'еры, мэбля, посуд, адзенне, тыпажы сялян, гараджан, дваран, князёў і інш. У праваслаўнай хрысціянскай іканаграфіі асобнае месца займаў вобраз Прасвятой Багародзіцы. Божая Маці здаўна лічылася апякункай і заступніцай усіх веруючых. Былі створаны спісы цудатворных абразоў, такіх як Маці Божая Адзігітрыя Мінская (XVII ст.), Маці Божая Адзігітрыя Барунская (XVII ст.), Маці Божая з Немаўляткам (XVII ст.), Маці Божая Жыровіцкая (1751 г.) і інш.

# Тэма 4

# РЭЛІГІЯ І ЦАРКВА НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У ПЕРЫЯД РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ (1772–1917 гг.)

*4.1. Змяненне статусу і ролі канфесій у беларускіх губернях Расіі.*

*4.2. Скасаванне Брэсцкай царкоўнай уніі.*

*4.3. Становішча каталіцкага Касцёла на далучаных землях.*

*4.4. Паўстанне 1863 г. і яго ўплыў на дзяржаўна-канфесійную палітыку царскага ўрада.*

*4.5. Стараабрадцы ў беларускіх губернях.*

*4.6. Пратэстантызм у канфесійнай структуры беларускіх губерняў.*

*4.7. Нехрысціянскія веравызнанні: іслам, іўдаізм.*

*4.8. Указ цара Мікалая II «Аб умацаванні асноў верацярпімасці» і яго наступствы.*

*4.9. Царква, Касцёл у этнакультурных працэсах на беларускіх землях.*

## 4.1. Змяненне статусу і ролі канфесій у беларускіх губернях Расіі

У выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай, праведзеных Расіяй, Аўстрыяй і Прусіяй у 1772, 1793 і 1795 гг., беларускія, украінскія і літоўскія землі былі далучаны да Расіі. Яны сталі называцца заходнімі губернямі Расійскай імперыі. Тут карэнным чынам пачала змяняцца эканамічная, грамадска-палітычная, культурная і рэлігійная сітуацыя.

У Расійскай імперыі праваслаўе было пануючай канфесіяй, таму асноўным напрамкам палітыкі царскага ўрада пасля далучэння беларускіх тэрыторый стала ўмацаванне на іх праваслаўя. Галоўным рэзервам для павелічэння праваслаўнай паствы было ўніяцкае насельніцтва. Адразу пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 г. епіскап Георгій (Каніскі) звярнуўся да Кацярыны ІІ (1762–1796 гг.) з просьбай аб пераводзе ўніятаў у праваслаўе. У ліпені 1780 г. быў дадзены дазвол назначаць праваслаўных свяшчэннікаў на вакантныя пасады ва ўніяцкія цэрквы, калі гэтага жадалі прыхаджане.

Пачатак 1780-х гг. азнаменаваўся шэрагам пераходаў уніятаў у праваслаўе. Так, па звестках, якія былі прадстаўлены епіскапам Георгіем (Каніскім) у Свяцейшы Сінод, у 1781 г. да праваслаўя далучылася 66 уніяцкіх цэркваў з 385 000 прыхаджан і 35 святарамі, у 1782 г. – 17 цэркваў з 17 824 прыхаджанамі, у 1783 г. – 12 цэркваў з 9680 прыхаджанамі. Пераходы адбываліся галоўным чынам у тых прыходах, дзе ўладальнікамі вёсак сталі рускія памешчыкі. Потым гэты працэс прыпыніўся аж да 1795 г.

З 1790-х гг. і да пачатку ХХ ст. у беларускіх губернях дзейнічалі асобныя праваслаўныя епархіі: Магілёўская, Мінская, Полацкая, Літоўская, Гродзенская. У 1793 г. тут налічвалася 329 цэркваў, каля 160 святароў, 3 манастыры 1-га і 2-га класа, 28 заштатных манастыроў.

Праваслаўная Царква сустракалася са шматлікімі праблемамі: не хапала кадраў духавенства, нізкім было матэрыяльнае забеспячэнне святароў, востра ўзнікла пытанне з будаўніцтвам новых цэркваў. У пачатку XIX ст. галоўнай крыніцай матэрыяльнага забе-

спячэння кліру была зямля, якую, як правіла, ён апрацоўваў сваімі сіламі.

25 снежня 1841 г. у адпаведнасці з царскім указам ад усіх канфесій заходніх губерняў забіраліся маёнткі і сяляне і перадаваліся ў нагляд і кіраванне Міністэрству дзяржаўных маёмасцей. 20 ліпеня 1842 г. было ўведзена «Палажэнне аб забеспячэнні духавенства Заходняга краю». Але яно значна не палепшыла становішча свяшчэннаслужыцеляў. Так, у прыходзе 1-га класа свяшчэннік атрымліваў 180 руб. срэбрам у год, дыякан – 80, панамар – 30, а ў прыходзе 7-га класа свяшчэннік – 100 руб., дыякан – 40. Прычтам сельскіх прыходаў выдзялялася 33 дзесяціны зямлі.

Пасля далучэння ўніятаў Свяцейшы Сінод прадпісаў духавенству да заходніх губерняў чытаць у цэрквах у нядзелю і ў святочныя дні казанні на простай, гэта значыць беларускай, мове. Але свяшчэннікі лепш ведалі польскую мову. Дрэннымі былі таксама справы з царкоўнаславянскай мовай. Не ўсе свяшчэннікі ведалі малітвы на гэтай мове.

З 1842 г. Свяцейшы Сінод загадаў духавенству Літоўскай, Мінскай, Полацкай і Магілёўскай епархій пачаць вяртанне былых уніятаў у праваслаўе з каталіцтва. Але справа ішла вельмі марудна. У ходзе праведзенага ў 1854 г. у Віцебскай губерні сакрэтнага дазнання высветлілася, што пэўная частка насельніцтва проста называе сябе палякамі, а праваслаўных – маскалямі. У справе веры многія сяляне былі індыферэнтны, хіліліся больш да каталіцкага Касцёла, чым да праваслаўнай Царквы.

Пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. расійскі ўрад узмацніў русіфікацыю Паўночна-Заходняга краю (такая назва афіцыйна ўводзілася з 1840 г. у дачыненні да заходнерускіх губерняў). Значная роля адводзілася праваслаўнай Царкве. Паляпшалася матэрыяльнае становішча свяшчэннаслужыцеляў. Паводле ўказа цара Аляксандра II ад 1870 г., свяшчэннік атрымліваў 400 руб. у год, дыякан – 120, а псаломшчык – каля 100. Пашыраўся царкоўны друк. Ва ўсіх епархіях выходзілі «Епархиальные Ведомости».

Падрыхтоўку святароў ажыццяўлялі чатыры семінарыі: Віленская, Мінская, Віцебская і Магілёўская. Пашыралася роля праваслаўнага духавенства ў сістэме пачатковай адукацыі. Так, у 1867 г. у пачатковых школах пяці заходніх губерняў выкладалі 580 свяшчэннікаў, 93 дыяканы і псаломшчыкі, 116 выхаванцаў духоўных семінарый. Большая частка з іх паходзіла з карэнных губерняў Расіі. Але царкоўныя школы паступова зачыняліся, і да 1873 г. іх засталося

каля 4 тысяч па ўсёй Расійскай імперыі. У 1883 г. у Літоўскай епархіі было толькі 14 царкоўных школ.

Умацаванне пазіцый праваслаўя адбывалася таксама шляхам будаўніцтва новых храмаў і канфіскацыі касцёлаў. Так, толькі ў Гродзенскай губерні з 1864 г. па 1874 г. было пабудавана 59 новых цэркваў, капітальна адрамантавана 29, аказана дапамога ў рамонце 15 прыпісных цэркваў, пераабсталявана пад цэрквы 10 касцёлаў.

Палітыка русіфікацыі і падтрымкі праваслаўя ў заходніх губернях, а таксама абмежаванне дзейнасці каталіцкай Царквы мела вынікам павелічэнне ўдзельнай вагі праваслаўнага насельніцтва. Праваслаўе вызнавала 70,8 % насельніцтва. Найбольшая колькасць праваслаўных у канцы XIX ст. была ў Магілёўскай губерні – 83,1 %, найменшая – у Віленскай – 41,4 %. На другім месцы быў іўдаізм: яго вызнавала 14,1 % насельніцтва. Трэцяе месца па колькасці вернікаў займала каталіцкая канфесія – 13,5 %. Аднак нельга атаясамліваць рэлігійную і нацыянальную самаідэнтыфікацыю, бо сярод католікаў было нямала беларусаў. Так, у Віленскай губерні 46,1 % насельніцтва з'яўлялася католікамі, польскую мову ў якасці роднай лічылі 2,8 %, у Мінскай губерні – 10,1 % і 3 % польскамоўных адпаведна.

## 4.2. Скасаванне Брэсцкай царкоўнай уніі

Палітыка царскага ўрада ў дачыненні да ўніяцтва залежала не толькі ад агульных дзяржаўных установак адносна «инославных исповеданий», але і ад царствуючай асобы. Пры Кацярыне II была ліквідавана Брэсцкая і Луцкая ўніяцкія епархіі, вялікая колькасць уніятаў пераведзена ў праваслаўе. Павел II (1796–1801 гг.) указам ад 28 красавіка 1798 г. «Аб уз'яднанні з рымскай курыяй» узнавіў ліквідаваныя епархіі. Уніяцкая Царква падпарадкоўвалася Рымска-каталіцкай калегіі, якая знаходзілася ў Пецярбургу. Гэта садзейнічала ўзмацненню місіянерскай дзейнасці каталіцкай Царквы на далучаных тэрыторыях, пашырэнню яе ўплыву сярод уніятаў. У кароткі тэрмін толькі ў адной Полацкай уніяцкай епархіі ў каталіцызм перайшло да 100 тысяч уніятаў. Былі выпадкі пераходу ў каталіцтва і праваслаўных. Гэта выклікала пратэсты супраць такога ўказа ўрада, і ў 1799 г. Павел І выдаў указ, згодна з якім каталіцкаму духавенству пад страхам строгай адказнасці забаранялася схіляць уніятаў і праваслаўных у каталіцтва, і працэс

паступовай ліквідацыі ўніяцтва працягнуўся. Пры Аляксандры І (1801–1825 гг.) уніяцкая Царква мела пэўны юрыдычны статус у Беларусі, хаця дзейнасць яе была абмежавана і знаходзілася пад кантролем дзяржавы.

Істотныя змены ва ўрадавай палітыцы адбыліся пры Мікалаі І (1825–1855 гг.). План ліквідацыі ўніяцкай Царквы быў ініцыіраваны ў 1827 г. уніяцкім епіскапам Іосіфам Сямашка (1798–1868 гг.). План прадугледжваў шэраг мер па збліжэнні ўніяцтва з праваслаўем, ліквідацыю лацінскіх запазычванняў у дагматыцы, вяртанне ўсходніх абрадаў і звычаяў ва ўніяцкую Царкву. Замест чатырох уніяцкіх епархій ствараліся дзве: Беларуская з рэзідэнцыяй у Полацку і Літоўская з рэзідэнцыяй у Жыровічах. У 1835 г. быў створаны Сакрэтны камітэт па ўніяцкіх справах, а ў 1837 г. царква была падпарадкавана Сіноду.

Канчатковай кропкай у ліквідацыі ўніяцтва стаў арганізаваны трыма ўніяцкімі епіскапамі – І. Сямашка, В. Лужынскім, А. Зубко 12 лютага 1839 г. у Полацку сабор. На саборы быў прыняты акт аб'яднання ўніяцкай Царквы з праваслаўнай. 23 сакавіка 1839 г. цар Мікалай І зацвердзіў гэтае рашэнне. У праваслаўную веру было перапісана афіцыйна каля 1,5 млн беларускіх уніятаў, аб'яднаных у 1470 парафій. 22 ліпеня 1839 г. папа рымскі Грыгорый XVI асудзіў ліквідацыю ўніяцкай Царквы і яе епіскапаў-адступнікаў.

Працэс пераходу ўніятаў у праваслаўную веру быў складаным і працяглым. Іх пасіўнае супраціўленне (байкот праваслаўнага духавенства, набажэнства, храмаў) працягваўся яшчэ шмат гадоў. Прыхільнасць часткі насельніцтва да ўніяцкай веры захоўвалася яшчэ ў 1860-я гг. Гэты факт выкарыстоўваўся рэвалюцыянерам-дэмакратам К. Каліноўскім, які лічыў унію сапраўднай рэлігіяй беларусаў і заклікаў да яе адраджэння. З атрыманнем дэмакратычных свабод паводле Маніфеста ад 17 кастрычніка 1905 г. каля 120 тысяч былых уніятаў і іх нашчадкаў перайшлі ў каталіцызм.

## 4.3. Становішча каталіцкага Касцёла на далучаных землях

Па меры далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі становішча каталіцкага Касцёла пачало карэнным чынам змяняцца. Вялікая колькасць католікаў стала расійскімі падданымі, прычым на далучаных землях яны складалі ў шэрагу рэгіёнаў заходняга краю да 95 % насельніцтва.

На канец XVIII ст. тэрыторыю былога ВКЛ насялялі каля 39 % уніятаў, 38 % католікаў, 6,5 % праваслаўных, 4,5 % старавераў, 1,6 % пратэстантаў (лютэран і кальвіністаў). У сацыяльным плане гэтыя канфесіі выглядалі наступным чынам: большая частка беларускага насельніцтва (збяднелая шляхта, мяшчане і сяляне) належала да ўніяцкай канфесіі (сярод сельскага насельніцтва ўніятаў налічвалася каля 80 %), багатая і сярэдняя частка шляхты – да каталіцкай.

У апошняй трэці XVIII ст. на беларускіх землях знаходзілася 270 касцёлаў, дзейнічала 18 мужчынскіх і 8 жаночых манаскіх ордэнаў, вялікая колькасць манастыроў. Пры першым падзеле Рэчы Паспалітай да Расійскай імперыі былі далучаны землі, на якіх пражывала каля 100 тысяч католікаў, у асноўным шляхецкага паходжання. Адносіны ўрада да каталіцкай і грэка-каталіцкай цэркваў у асноўным былі лаяльнымі. За католікамі захоўваліся грамадзянскія правы, іх храмы і права на рэлігійнае жыццё. Але, тым не менш, дзейнасць каталіцкай Царквы была ўзята пад кантроль дзяржавы.

У сувязі з гэтым узнікла неабходнасць выпрацоўкі іншай дзяржаўнай палітыкі. Да таго ж за тым, што адбывалася на землях былой Рэчы Паспалітай, уважліва сачыў рымскі папа, які не жадаў мець сваіх католікаў пад упраўленнем праваслаўнага цара.

Перад расійскім урадам стаялі дзве задачы: першая – арганізаваць упраўленне католікамі на ўсёй тэрыторыі, другая – адмежаваць іх ад уплыву рымскага папы. Царыца Кацярына II, у парушэнне канонаў каталіцкай Царквы, стварыла Беларускую каталіцкую епархію з цэнтрам у Магілёве і прызначыла епіскапам ксяндза Станіслава Богуш-Сестранцэвіча (1731–1826 гг.), якому былі падпарадкаваны ўсе касцёлы і кляштары ў дзяржаве. Указам ад 17 студзеня 1783 г. замест Беларускай дыяцэзіі была ўтворана Магілёўская рымска-каталіцкая архіепархія (архідыяцэзія), пры якой былі кансісторыя і капітул з 12 канонікаў.

Усё гэта адбывалася без згоды рымскай курыі. Разам з тым Рым вымушаны быў пайсці на кампраміс і нават узвесці С. Богуш-Сестранцэвіча ў сан мітрапаліта Рымска-каталіцкай Царквы ў Расіі. 15 красавіка 1783 г. папа рымскі Пій VI зацвердзіў сваёй булай архіепархію. З 1795 г. на землях імперыі не маглі аб'яўляцца папскія пасланні і булы без згоды цара. Кацярына II імкнулася выкарыстаць у барацьбе з папскім прастолам ордэн езуітаў, хаця ў 1773 г. папа Клімент XIV яго ліквідаваў. Езуітам на далучаных землях былі не толькі захаваны, але і пашыраны іх маёмасныя правы. У 1812 г. у Полацку была адкрыта езуіцкая акадэмія.

Аднак палітыка царскага самадзяржаўя ў адносінах да каталіцызму цалкам залежала як ад унутраных фактараў, так і ад царствуючых асоб. Так, пры Паўле I праводзілася палітыка свабоды сумлення і асуджалася насілле ў адносінах да іншаверцаў. У 1801 г. Павел I зацвердзіў у Санкт-Пецярбургу Рымска-каталіцкую калегію на чале з архіепіскапам магілёўскім. Калегія выконвала адміністрацыйна-кіруючыя функцыі, што садзейнічала пэўнай аўтаноміі каталіцкай царквы ў імперыі. Ліберальную палітыку адносна каталіцызму праводзіў і цар Аляксандр I.

Сітуацыя пачала змяняцца з 1930-х гг., калі ў Польшчы ўспыхнула паўстанне 1830–1831 гг. Яно ахапіла і частку беларускіх зямель. Актыўнымі ўдзельнікамі нацыянальна-вызваленчага руху выступалі каталіцкае духавенства і шляхта. Ксяндзы ўваходзілі ў шэраг паўстанцкіх камітэтаў, многія касцёлы і манастыры сталі апорнымі пунктамі паўстаўшых, месцамі захавання зброі. Ксяндзы ў касцёлах зачытвалі звароты і іншыя дакументы паўстанцаў, некаторыя з іх змагаліся ў паўстанцкіх атрадах.

Пасля падаўлення паўстання пачалася палітыка абмежавання і выцяснення польскага ўплыву ў краі. Яна закранула і каталіцкі Касцёл. 19 ліпеня 1832 г. быў прыняты Указ цара Мікалая I «Об упразднении римско-католических монастырей». Прадугледжвалася ліквідацыя манастыроў, у якіх быў неўкамплектаваны штат і якія не маглі сябе забяспечыць. Выключэнне складалі манастыры, у якіх былі ўмовы для перасялення манахаў з іншых ліквідаваных манастыроў. У тым жа годзе ў заходніх губернях было закрыта 199 кляштараў з 304. Царскія ўлады забаранілі прымаць паслушнікаў і ўзводзіць новыя святыні, канфіскоўвалі манастырскую і касцёльную маёмасць, закрылі ўсе каталіцкія выдавецтвы, многія ксяндзы былі сасланы ў Сібір. З 1839 г. забаранялася будаўніцтва касцёлаў і капліц без афіцыйнага дазволу. Закрывалася шмат дзеючых касцёлаў, канфіскоўвалася маёмасць, якая належала рымска-каталіцкаму духавенству. За недобранадзейнымі католікамі ўстанаўліваўся паліцэйскі нагляд.

У гэтых умовах на першы план выступала задача выжывання, захавання хаця б часткі свайго ўплыву без адкрытага выступлення супраць існуючага парадку. Касцёл усяляк супрацьстаяў абмежаванням рэлігійнага жыцця, пастырскай працы, свабоды адпраўлення культаў. З'явіліся касцёльныя брацтвы, якія дзейнічалі і па-за сценамі храмаў. Ксяндзы супраціўляліся палітыцы русіфікацыі касцёла, імкнучыся захаваць традыцыйныя формы рэлігійнага жыцця, абрадаў, рытуалаў.

# 4.4. Паўстанне 1863 г. і яго ўплыў на дзяржаўна-канфесійную палітыку царскага ўрада

Паўстанне 1863 г. у Польшчы, Літве і Беларусі закранула і каталіцкі Касцёл. Удзел каталіцкага духавенства ў паўстанні быў розным: ад зачытання маніфеста паўстанцкага жонду да актыўных дзеянняў у паўстанцкіх атрадах. Але як толькі стала відавочным, што масавае паўстанне не ўдалося, вышэйшае каталіцкае духавенства звярнулася да сваіх вернікаў з заклікам скласці зброю і падпарадкавацца законнаму ўраду. Кіраўніцтва паўстаннем у спецыяльным звароце да кліру выкрыла баязлівасць і здрадніцтва служыцеляў культу. Але справа была зроблена: адступніцкая пазіцыя каталіцкага духавенства нанесла вялікую шкоду паўстанню на Беларусі і ў Літве, асабліва ў тых мясцовасцях, дзе каталікі складалі значную частку насельніцтва.

Пасля падаўлення паўстання абвастрылася пытанне аб становішчы каталіцкага Касцёла ў Расійскай імперыі. Намаганнямі царскіх улад Касцёл быў выведзены канчаткова з-пад непасрэднага ўплыву рымскай курыі і ўключаны ў расійскую прававую сістэму. Гэта азначала яго поўную залежнасць ад уладных структур. Адбылося значнае аслабленне епархіяльных структур, зменшылася колькасць прыходаў, скарацілася лічба вернікаў. У выніку секулярызацыі і русіфікацыі школы Касцёл страціў трывалыя пазіцыі ў навучальных установах. Былі прыняты меры па ўстанаўленні больш жорсткага кантролю за каталіцкім духавенствам і манастырамі ў заходніх губернях. Указамі імператара ад 27 кастрычніка 1864 г. і 14 снежня 1865 г. уводзіўся новы парадак прызначэння на пасады каталіцкіх святароў. Вызначаліся тры шляхі закрыцця манастыроў:

- калі ў іх было менш за восем манахаў;
- пры несумяшчальнасці дзейнасці манастыра з грамадскім парадкам;
- у выглядзе пакарання за злачынствы, учыненыя манахамі.

У выніку колькасць каталіцкіх манастыроў значна скарацілася. Да канца 1867 г. у заходніх губернях было закрыта больш за 30 каталіцкіх манастыроў, каля 160 касцёлаў, 80 капліц. Былі накладзены абмежаванні на свабоду перамяшчэнняў ксяндзоў, забаронены іх імправізаваныя пропаведзі. На тэрыторыі беларускіх

і літоўскіх губерняў за перыяд з 1863 г. па 1868 г. у праваслаўе было звернута больш за 70 тысяч католікаў, аднак пазней такая практыка ўжо не прымянялася. У студзені 1864 г. быў выдадзены цыркуляр віленскага генерал-губернатара, які забараняў выкарыстанне польскай мовы ў навучальных установах. Парушальнікам пагражалі вялікімі грашовымі штрафамі. У 1865 г. польская мова была заменена рускай у выкладанні каталіцкага Закона Божага ў народных школах.

Першыя гады пасля падаўлення паўстання вызначаліся недаверам расійскай улады да каталіцкага дваранства, рэпрэсіўнымі мерамі, некаторым абмежаваннем саслоўных правоў. Рэалізацыя ўрадавай палітыкі ў дачыненні да Беларусі вызначалася ў большай ступені спецыфічнымі, чым агульнымі, рысамі ў параўнанні з еўрапейскім цэнтрам Расійскай імперыі. Прычыны гэтага былі абумоўлены неабходнасцю змагання расійскага самадзяржаўя з польскім нацыянальна-палітычным уплывам, а таксама ўсталяваннем рэжыму выключных законаў, асабліва ў дачыненні да каталіцкага і яўрэйскага насельніцтва. Гэта перш за ўсё абмежавальныя меры ўрада ў сферы землеўладання і землекарыстання, прынятыя ў час і адразу пасля падаўлення паўстання. Паводле закона ад 5 сакавіка 1864 г. «асобам польскага паходжання» і яўрэям у заходніх і паўднёва-заходніх губернях Расійскай імперыі было забаронена купляць прыватныя землеўладанні, прададзеныя за даўгі. Законам ад 10 снежня 1865 г. «асобам польскага паходжання» таксама было забаронена набываць ва ўласнасць маёнткі.

Удзел ксяндзоў і манахаў у паўстанні стаў зручнай падставай для царскіх улад, каб прымяніць да іх прымусовыя меры, распачаць жорсткі ўціск. Рэпрэсіям падвергліся 5 % ксяндзоў Царства Польскага, 6 % – Літвы і Беларусі. На Беларусі і ў Літве восем ксяндзоў расстралялі (прычым кожнага другога толькі за чытанне «Маніфеста» паўстанцкага жонду), 36 выслалі на катаржныя работы. Дзясяткі ксяндзоў перасялілі ва ўнутраныя губерні Расіі, пазбавілі сану або пакаралі іншым чынам. Пачалося закрыццё каталіцкіх касцёлаў, якія ў большасці сваёй станавіліся праваслаўнымі храмамі.

Архіўныя матэрыялы сведчаць, што гэтыя падзеі ў розных месцах праходзілі па-рознаму: дзе ціха і непрыкметна, а дзе толькі пры ўмяшанні генерал-губернатара. Да ліку апошніх адносіцца, у прыватнасці, закрыццё касцёла ў мястэчку Юравічы, што ў дваццаці вярстах ад Мазыра. У 1864 г. праваслаўны епіскап мінскі і бабруйскі давёў да ведама М. Мураўёва, што духавенст-

ва гэтага касцёла пастаянна ўмешваецца ў справы праваслаўных. Генерал-губернатар запатрабаваў звесткі аб касцёле і пазіцыі яго святароў у паўстанні 1863 г. Звесткі былі прадстаўлены ваенным начальнікам Мазырскага і Рэчыцкага паветаў. «Юрыдычных фактаў, – сцвярджаў ваенны начальнік, – аб прыняцці ксяндзамі ўдзелу ў мяцяжы хаця няма, але чуткі прымушаюць сумнявацца ў іх палітычнай благадзейнасці». Гэтага для Мураўёва было дастаткова, каб 11 лістапада накіраваць мінскаму губернатару прадпісанне аб неабходнасці закрыць касцёл. Ён быў закрыты 27 лістапада 1864 г.

Захаваліся ўспаміны аб гэтых падзеях тагачаснага вікарнага ксяндза Сянчыкоўскага, у далейшым заўзятага прыхільніка русіфікацыі касцёла. Вось як ён апісваў згаданыя вышэй падзеі: «У Юравічах я знайшоў роту салдатаў, якія на працягу чатырох гадзін сякерамі секлі ў касцёле алтары, статуі 12 апосталаў і арган, які каштаваў 6 тысяч руб. Гэта ўзрушыла мяне да глыбіні душы… Рота салдатаў была пад камандаваннем ваеннага начальніка павета маёра Стэфановіча». Такая канфесійная палітыка прывяла да значнага скарачэння ліку каталіцкіх касцёлаў і капліц, колькасці вернікаў.

У 1865 г. па ініцыятыве Віленскага генерал-губернатара М. М. Мураўёва ў Паўночна-Заходнім краі пачалася праверка рымска-каталіцкіх брацтваў. Ад каталіцкіх епіскапаў і ад Духоўнай калегіі Міністэрства ўнутраных спраў ён патрабаваў звестак аб дзейнасці ўсіх каталіцкіх арганізацый, якія існавалі пры касцёлах. У выніку было прынята рашэнне, што такія аб'яднанні, таварыствы, брацтвы не павінны існаваць нават пад выглядам якой-небудзь дабрачыннасці без дазволу ўлады. Каталіцкія дэканы былі абавязаны пад страхам пакарання не арганізоўваць такія брацтвы пры касцёлах. У адпаведнасці з распараджэннямі Віленскага, Ковенскага, Гродзенскага і Мінскага генерал-губернатараў і галоўных начальнікаў Віцебскай і Магілёўскай губерняў ад 20 красавіка 1868 г. усе дзеючыя ў той час брацтвы павінны быць закрыты. Іх маёмасць перадавалася касцёлам, пры якіх яны дзейнічалі, а кнігі спалены.

Адной з галоўных у гэты час становіцца ідэя «распалячвання» каталіцызму. Яна прадугледжвала ўдзел свецкіх улад у адборы навучэнцаў для каталіцкіх навучальных устаноў, абавязковае ўвядзенне ў іх вывучэнне рускай мовы і гісторыі Расіі, а таксама правядзенне службы ў касцёлах на рускай мове. Хрэсны ход у гарадах за межамі будынкаў касцёлаў і агароджаў храмаў у сельскай

мясцовасці маглі праводзіць толькі праваслаўныя святары. Мерапрыемствы расійскіх улад, асабліва спробы ўвесці рускую мову ў богаслужэнне, выклікалі значнае супраціўленне з боку большасці каталіцкіх святароў.

Адным з кірункаў урадавай палітыкі ва ўмовах Беларусі сталі канфесійныя пераходы з каталіцтва ў праваслаўе. Нават пры фармальна захаванай ранейшай саслоўнай прыналежнасці сацыяльныя правы асобы пры пераходзе ў праваслаўе фактычна пашыраліся. Яўрэі, якія прымалі хрысціянства, таксама ва ўмовах Расійскай імперыі пазбаўляліся многіх негатыўных момантаў сваёй прыналежнасці да іншародцаў.

Асаблівая ўвага ва ўрадавай палітыцы надавалася павелічэнню колькасці праваслаўных храмаў. На ўсёй тэрыторыі Беларусі будаваліся і рамантаваліся праваслаўныя цэрквы, пераводзіліся з унутраных губерняў святары. Грошы на гэтыя патрэбы выдзяляліся з ліку кантрыбуцыйных збораў, якімі былі абкладзены мясцовыя дваране-землеўласнікі. Пад праваслаўныя цэрквы нярэдка выкарыстоўвалі будынкі зачыненых касцёлаў.

У выніку рэалізацыі канфесійнай палітыкі расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX ст. удалося значна павялічыць колькасць праваслаўных вернікаў. У першыя гады пасля паўстання ў праваслаўе пераходзілі нават цэлымі сем’ямі, а часам і прыходамі. Гэтаму садзейнічалі падараванні розных правоў, прывілеяў эканамічнага характару. У пачатку 60-х гг. XIX ст. у беларускіх губернях налічвалася каля 2,5 млн праваслаўных і звыш 1,3 млн католікаў. Паводле даных перапісу насельніцтва 1897 г., тут налічвалася ўжо звыш 5,1 млн праваслаўных і каля 1,9 млн католікаў. Аднак многія з тых, хто перайшоў з каталіцтва ў праваслаўе, доўгі час захоўвалі каталіцкую абраднасць. Гэта датычылася і некаторых былых уніятаў.

У 60-я гг. XIX ст. адбывалася рэформа навучальных устаноў праваслаўнага духоўнага ведамства. Паводле новага статута 1867 г. гэтыя ўстановы сталі ўсесаслоўнымі.

Жорсткія русіфікатарскія мерапрыемствы ўзмацніліся ў час праўлення Аляксандра III (1881–1894 гг.). З канца 60-х гг. XX ст. урад палічыў магчымым змяніць адносіны ў дачыненні да каталіцкай Царквы і выдання польскай літаратуры. У сярэдзіне 1869 г. у беларускіх губернях аднавілі выданне кніг на польскай мове. У 70-я гг. XIX ст. з дазволу віленскага цэнзара былі апублікаваны 254 кнігі, галоўным чынам на рэлігійную тэматыку.

Ушчамленне правоў католікаў у заходніх губернях стала нагодай для дыпламатычнай заявы 29 кастрычніка 1866 г. папы рымскага Пія IX аб цяжкасцях каталіцкай Царквы ў Расійскай імперыі. У адказ на гэта цар Аляксандр II 22 лістапада 1866 г. падпісаў указ аб аб’яўленні канкардату 1847 г., які рэгуляваў адносіны Ватыкана і Расійскай імперыі, страціўшым сілу, і аб разрыве адносін са Святым Прастолам. У выніку пашырыліся правы кантралюемай урадам Рымска-каталіцкай духоўнай калегіі як кіруючага органа каталіцкай Царквы ў Расійскай імперыі. Супраць гэтага выступала Рымская курыя, паколькі такі стан звужаў правы каталіцкіх епіскапаў і ставіў іх у большую залежнасць ад расійскага ўрада.

У 1875 г. у выніку перамоў з расійскім урадам папа рымскі прызнаў Духоўную калегію, але толькі як установу, якая займалася адміністрацыйна-гаспадарчымі справамі каталіцкай Царквы. Аднак пазней расійскі бок без узгаднення з Ватыканам скасаваў Мінскую епархію і правёў некаторыя перастаноўкі. Разглядаючы дзеянні як незаконныя, папа рымскі, тым не менш, вымушаны быў даручыць весці справы былой Мінскай епархіі магілёўскаму архіепіскапу-мітрапаліту. Расійскі ўрад умешваўся ў пытанні прызначэння епіскапаў, што нярэдка прыводзіла да разыходжанняў паміж Ватыканам і Пецярбургам адносна легітымнасці кіраўнікоў каталіцкай Царквы на тэрыторыі Расійскай імперыі. Расійскі ўрад на працягу XIX ст. практычна імкнуўся стварыць на сваёй тэрыторыі каталіцкую Царкву, якая была б максімальна незалежнай ад Рыма.

У час палітычнай рэакцыі пачатку 90-х гг. XIX ст., ва ўмовах узмацнення палітыкі вялікадзяржаўнага шавінізму, каталіцкае дваранства зноў пачало ўспрымацца як ненадзейны саюзнік. Па загаду віленскага генерал-губернатара І. С. Каханава ў 1884–1885 гг. большасць чыноўнікаў каталіцкага веравызнання была звольнена і заменена на рускіх. Да 1888 г. былі зменены ўсе правадыры дваранства з ліку мясцовых каталіцкіх землеўладальнікаў на рускіх дваран, многія з якіх не мелі зямельнай уласнасці ў Беларусі.

Такім чынам, у залежнасці ад напружанасці нацыянальна-вызваленчага руху і палітычнай сітуацыі ў краіне змяняліся палітыка і адносіны ўрада ў дачыненні да канфесій. Але пры гэтым праваслаўная Царква ў палітыцы самадзяржаўя займала важнае месца як фактар умацавання царызму і пераўтварэння Паўночна-Заходняга краю ў састаўную частку Расійскай імперыі.

# 4.5. Стараабрадцы ў беларускіх губернях

Стараабраднiцтва было трэцім па колькасці веруючых хрысціянскім веравызнаннем у беларускіх губернях. Стараабрадцы (старaверы) – прыхільнікі рэлігійнай плыні, якая ўзнікла ў выніку расколу Рускай праваслаўнай Царквы і адмовы часткі насельніцтва прызнаць рэформы патрыярха Нікана другой паловы XVII ст. Па рэлігійнай дагматыцы стараабрадцы не адрозніваліся ад рэфармаванай праваслаўнай Царквы, аднак фактычна захоўвалі старую абраднасць (адсюль назва): 8-канцовы крыж, 2-пальцавае хрышчэнне, двайная (сугубая) алілуя і інш., а таксама стары побыт.

Стараабрадніцтва падзялялася на дзве буйныя галіны – папоўцы і беспапоўцы. Першыя стаяць бліжэй да праваслаўнай Царквы, у іх ёсць свае святары і епіскапы. Больш радыкальныя беспапоўцы ўвогуле адмовіліся ад інстытута свяшчэнства.

На беларускія землі стараабрадцы пачалі перасяляцца ў 1560-я гг. з Памор'я і Ноўгарада. Іх пасяленні былі ў Магілёве, Чэрыкаве, Ветцы, Гомелі, Віцебску, Полацку, Бабруйску і ваколіцах. У канцы XVIII ст. па ініцыятыве царскіх улад узнікла новая плынь – адзінаверства, якое было ўмоўным аб'яднаннем стараевераў з праваслаўнай Царквой: у імя саюзу з Царквой старавеpы прымалі яе законнае свяшчэнства, а Царква дазваляла ім мець старыя абрады і кнігі. У 1794 г. у Гомелі на Спасавай слабадзе была пабудавана першая на Беларусі адзінаверніцкая царква. У 1830–1840-я гг. старaверы жылі пераважна ў Віцебскай губерні – 38 425 чалавек, у Магілёўскай – 13 299, у Мінскай – 7132. У пяці беларускіх губернях у канцы XIX ст. стараабрадцаў налічвалася больш за 150 тысяч чалавек. Большасць з іх па-ранейшаму пражывалі ў Віцебскай губерні.

У залежнасці ад колькасці стараабрадцаў, якія пражывалі ў той ці іншай губерні, дзейнічалі малітоўныя дамы, у якіх стараабрадцы здзяйснялі свае рэлігійныя абрады. Такіх дамоў у Віцебскай губерні было 47, у Магілёўскай – 23, Мінскай – 10, Віленскай – 6. Сваіх рэлігійных навучальных устаноў стараабрадцы не мелі. Навучанне іх дзяцей было абавязкам прыходскага праваслаўнага духавенства і праводзілася хатнім спосабам у доме аднаго або двух членаў прыходскага прытча з улікам іх здольнасцей і надзейнасці. Аднак многія стараабрадцы з гэтым не пагаджаліся і перашкаджалі правядзенню навучання. Негатыўнымі былі іх адносіны да свецкай адукацыі.

З 1897 г. пачаў выдавацца часопіс «Кормчий». Нягледзячы на тое, што выданне насіла агульнарасійскі характар, рэдактары не пакідалі без увагі і стараабрадніцкі рух у беларускіх губернях.

Дзяржаўная палітыка ў адносінах да стараабрадцаў насіла супярэчлівы характар. У 1870 г. МУС накіравала губернатарам заходніх губерняў цыркуляр, у якім гаварылася аб неабходнасці ўраўнівання стараабрадцаў у правах з каталіцкім насельніцтвам. Тлумачылася гэта тым, што стараабрадцы тут прадстаўляюць «самы надзейны рускі элемент», і ўрад можа разлічваць на іх бясспрэчную адданасць. Аднак ужо ў 1875 г. камісія МУС атрымала дырэктыву наступнага зместу: «Меры ўрада ў адносінах да расколу хаця і не павінны насіць на сабе характар праследавання яго, але ў той жа час не могуць быць накіраваны на паслабленне, а тым менш да апекавання расколу».

3 мая 1883 г. быў абнародаваны новы закон «Аб дараванні раскольнікам некаторых грамадзянскіх правоў і па адпраўленні духоўных патрэб». Ён дазваляў раскольнікам правядзенне набажэнстваў, якія не парушаюць грамадскі парадак; выкананне духоўных трэб згодна са сваім абрадам у прыватных і спецыяльных малітоўных дамах; вядзенне гандлю і промыслаў; адходніцтва раскольнікаў; заняцце грамадскіх пасад. У той жа час ім забаранялася распаўсюджваць свае вераванні сярод праваслаўнага насельніцтва; «спакушаць і схіляць каго б ні было ў раскол свой»; адкрываць скіты і абіцелі; праводзіць публічныя мерапрыемствы (шэсці і хрэсныя хады, публічнае нашэнне ікон, спевы на вуліцах і плошчах); друкаваць і распаўсюджваць раскольніцкія богаслужэбныя кнігі.

Спыняліся ганенні на настаўнікаў, аднак яны не прызнаваліся духоўнымі асобамі і не маглі з'яўляцца ў сваім адзенні ў публічных месцах. Быў дазволены рамонт малітоўных дамоў, але будаўніцтва новых магло весціся толькі з дазволу МУС. Адначасова забаранялася будаўніцтва ў стараабрадніцкіх храмах знешніх званіц. Гэты закон, як і папярэднія, стараабрадцамі выконваўся не заўсёды.

З Бабруйскага, Віленскага паветаў, горада Вільні і іншых месц паведамлялася, што стараабрадцы асаблівай варожасці да праваслаўя не праяўлялі. Аднак з Дзісненскага павета прыходзілі іншыя звесткі. Стараабрадцы, якія тут пражывалі, належалі да беспапоўскага толку федасееўскага напрамку. У 1895 г. місіянер Літоўскай епархіі святар Д. Губін паведамляў, што «раскольнікі гэтага павета адрозніваюцца асаблівай варожасцю да праваслаўнай Царквы. Такіх дзёрзкіх і кашчунскіх слоў аб Святых Таінст-

вах праваслаўнай Царквы з боку тых, хто называў сябе носьбітамі старой веры, як у Публішчанскім малітоўным доме, нідзе ў іншых месцах не чуваць!».

Далучэнне старaабрадцаў да праваслаўнай Царквы на правах адзінаверства працягвалася і ў 1880–1890-я гг. Па звестках Сінода, у 1892 г. у Полацкай епархіі дзейнічала восем прыхадскіх аднаверскіх цэркваў. У Віцебскай губерні ў 1894 г. пражывала 5486 адзінаверцаў, у 1905 г. яны мелі дзевяць малітоўных дамоў. Актыўна ішоў працэс пераходу стараабрадцаў у аднаверства і ў праваслаўе ў Віленскай і Ковенскай губернях. Абумоўлена гэта было далучэннем да праваслаўя духоўнага настаўніка беспапоўца паморскага толку архімандрыта Паўла. Спачатку праваслаўныя іерархі аднесліся да імкнення мясцовых стараабрадцаў стварыць адзінаверскія прыходы негатыўна, а літоўскі мітрапаліт Іосіф (Сямашка) забараніў гэта і загадаў пераходзіць адразу ў праваслаўе і ствараць праваслаўныя прыходы. Аднак калі на чале Літоўскай епархіі ў 1868 г. стаў архіепіскап Макарый (1816–1882 гг.), стараабрадцы зноў пачалі хадайнічаць аб адкрыцці адзінаверскіх прыходаў. Архіепіскап Макарый пагадзіўся. У епархію з місіяй прыбыў айцец Павел – у той час ігумен  Нікольскага адзінаверскага манастыра Масквы. Яго місіянерская дзейнасць была паспяховай – многія стараабрадцы пагадзіліся далучыцца да праваслаўнай Царквы на правах адзінаверства. Сінод дазволіў стварыць некалькі адзінаверскіх прыходаў і выдзеліў сродкі на іх утрыманне.

У канцы XIX ст. стала зразумела, што стараабрадніцтва немагчыма пераадолець, у тым ліку і з дапамогай увядзення аднаверства. Як і па ўсёй Расіі, так і ў беларускіх губернях колькасць асоб, якія прынялі адзінаверства, была не такой значнай, як таго хацелі ўлады і праваслаўнае духавенства. Напрыклад, па імперыі з 1882 г. па 1891 г. у адзінаверства было схілена 15 311 стараабрадцаў. У Віцебскай губерні пражывала толькі 5486 адзінаверцаў, у той час як стараабрадцаў налічвалася больш 86 тысяч чалавек. У пачатку XX ст. істотных змен у становішчы стараабрадцаў не адбылося.

## 4.6. Пратэстантызм у канфесійнай структуры беларускіх губерняў

Пратэстантызм (у афіцыйных дакументах таго часу называўся сектанцтвам) у беларускіх губернях быў прадстаўлены лютэранствам і кальвінізмам (рэфарматарствам). Да лютэранства належала

ў асноўным латышскае і нямецкае насельніцтва, якое складалася з сялян і мяшчан; да кальвінізму – польскае і беларускае, у асноўным прадстаўнікі шляхецкага саслоўя.

Колькасць пратэстантаў разам з іншымі веравызнаннямі (іўдзеі, мусульмане) у канцы XVIII ст. складала каля 2 % усіх жыхароў беларускіх тэрыторый. Царскі ўрад цярпіма адносіўся да гэтай канфесіі. Так, у 1775 г. у Полацку лютэранская парафія адкрыла будынак царквы, у 1780 г. па дазволу Кацярыны II новую царкву заснавалі магілёўскія лютэране. У 1809 г. пабудавалі лютэранскую царкву ў Мінску, у 1833 г. – у Віцебску. Аднак пры «цярпімых» адносінах да лютэранства і кальвінізму расійскія ўлады ўстанавілі шэраг абмежаванняў. Пры змешаных шлюбах па існуючаму закону пратэстанты не мелі права выхоўваць дзяцей у духу сваёй веры. Пераход у праваслаўе з пратэстантызму заахвочваўся, у той час як схіленне ў пратэстантызм з'яўлялася ў Расіі крымінальным злачынствам.

Пасля паўстання 1830–1831 гг. была распушчана віленская Літоўская кансісторыя, а з лютэранскіх прыходаў былога ВКЛ – Віленскай, Ковенскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай губерняў была ўтворана «8-я дыяцэзія» Курляндскай кансісторыі (г. Мітва, цяпер Елгава, Латвія), якая кіравала на падставе ўніфікаванага статута. Адначасова быў уведзены новы лютэранскі служэбнік – Агенда, складзены па прускаму ўзору. Справаводства павінна было весціся на нямецкай мове. Кальвінісцкая царква пасля далучэння беларускіх зямель да Расіі страціла сваю аўтаномію. Кальвінісцкія зборы падпарадкоўваліся кансістору, які назначаўся на сваю пасаду царскімі ўладамі. Да пачатку XX ст. на Беларусі засталіся адзінкавыя кальвінісцкія суполкі.

У пачатку 1860-х гг. у пяці беларускіх губернях колькасць пратэстантаў складала 19 951 чалавек (0,45 % ад усяго насельніцтва). Да канца XIX ст. яна ўзрасла да 76 982 чалавек, а ўдзельная вага гэтай канфесіі дасягнула 0,9 %. Пры гэтым больш за ўсё пратэстантаў было ў Віцебскай губерні. Сярод іх пераважалі лютэране.

Згодна са справаздачамі аб стане евангелічна-лютэранскай царквы на 1864 г. у беларускіх губернях дзейнічала 27 лютэранскіх цэркваў, у тым ліку галоўных – 7, прыпісных – 8, шпітальных і хатніх – 1, малітоўных дамоў – 11. Да канца стагоддзя іх колькасць узрасла да 30. Лютэранскія кірхі былі амаль ва ўсіх буйных гарадах Беларусі: Гродна, Мінску, Слуцку, Віцебску, Полацку, Магілёве. У іх праводзілі службу 11 духоўных асоб.

Колькасць евангелісцка-рэфарматарскіх цэркваў і духавенства была значна меншай, чым у лютэран. Па дадзеных Віленскай еван-

гелісцка-рэфарматарскай калегіі, у 1865 г. у Віленскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай губернях было 17 цэркваў з 11 духоўнымі асобамі і 821 прыхаджанінам. Да пачатку XX ст. у сувязі са скарачэннем колькасці кальвіністаў колькасць цэркваў зменшылася да 10, а духоўных асоб – да чатырох чалавек.

Пратэстанты з-за сваёй нешматлікасці не аказвалі вялікага ўплыву на грамадска-палітычнае і рэлігійнае жыццё краю. Да таго ж пратэстанцкае веравучэнне вызнавалася ў асноўным латышскім і нямецкім насельніцтвам, а тэндэнцыі да пашырэння колькасці лютэран і евангелістаў-рэфарматараў сярод беларускага, рускага і польскага этнасаў не назіралася.

Гэтыя абставіны садзейнічалі таму, што ўзаемаадносіны пратэстантаў з астатняй часткай насельніцтва былі нармальнымі. У справаздачы обер-пракурора Сінода за 1883 г. адзначалася: «Лютэране, што належаць у асноўным да служылага і купецкага саслоўяў, не выказваюць фанатызму ў адносінах да праваслаўнай царквы, але і не спачуваюць ёй. Епархіяльнае начальства прымае меры, каб засцерагчы праваслаўнае насельніцтва ад іншаверцаў». Пратэстанты не перашкаджалі сваім дзецям наведваць праваслаўныя царкоўна-прыхадскія школы. Так, у Гродзенскай губерні, па афіцыйных даных за 1901 г., навучалася 24 дзяцей пратэстантаў.

Аднак праваслаўнае духавенства імкнулася не дапусціць далейшага распаўсюджвання пратэстантызму, перашкаджаючы, у прыватнасці, адкрыццю новых культавых устаноў. Так, у 1902 г. праваслаўныя іерархі не далі згоды на будаўніцтва евангелічна-лютэранскага малітоўнага дома ў Дзвінскім прыходзе Віцебскай губерні. Часам у праваслаўнай перыёдыцы і літаратуры з'яўляліся артыкулы, якія змяшчалі крытычныя заўвагі ў адрас пратэстантаў.

На працягу другой паловы XIX – пачатку XX ст. у беларускіх губернях адбываліся рэдкія пераходы веруючых з лютэранства ў праваслаўе і каталіцызм, а з 1905 г. – пераходы з праваслаўя ў лютэранства. Так, напрыклад, у Магілёўскім лютэранскім прыходзе евангелісцка-лютэранскую веру ў 1905 г. прынялі 37 чалавек праваслаўнага веравызнання. У Гродзенскай губерні такіх пераходаў было значна менш, і звязаны яны былі, у асноўным, з заключэннем змешаных шлюбаў. Пры гэтым усё праходзіла спакойна, бесканфліктна. Не ўзнікала праблем і пры заключэнні змешаных шлюбаў з удзелам асоб лютэранскага і рэфармісцкага веравызнанняў. Дакладных дадзеных аб іх колькасці няма, аднак аналіз матэрыялаў дазваляе сцвярджаць аб нешматлікасці такіх шлюбаў.

Так, у Гомелі ў 1896 г. сярод 533 каталіцкіх сем'яў (з іх 70 – змешаныя шлюбы) – налічвалася толькі 12 сем'яў, у якіх адзін з сужэнцаў быў пратэстантам. У Гродне такіх шлюбаў было яшчэ менш. Сярод больш чым 2 тысяч прыхаджан Фарнага касцёла толькі два чалавекі мелі ў якасці свайго сужэнца асобу евангелісцка-лютэранскага веравызнання, прычым у адным выпадку да гэтага веравызнання належалі і дзеці. Шлюбы паміж пратэстантамі і праваслаўнымі былі ўвогуле рэдкай з'явай.

Апрача таго, у беларускіх губернях былі распаўсюджаны пратэстанцкія дэнамінацыі – баптызм, евангелічнае хрысціянства, адвентысты сёмага дня і інш. Яны пранікалі рознымі шляхамі: місіянерская дзейнасць прапаведнікаў, падчас знаходжання сялян на заробках у вялікіх гарадах або за мяжой, міграцыі сялян з іншых губерняў Расіі.

У пачатку XX ст. паслядоўнікі баптызму былі ва ўсіх беларускіх губернях. Першая баптысцкая абшчына з'явілася на Гомельшчыне ў сяле Уць (дата невядома). У 1879 г. была заснавана абшчына ў вёсцы Усох Гомельскага павета Магілёўскай губерні (у 1885 г. налічвала 95 чалавек). У Віцебскай губерні баптысты пражывалі ў Дзвінскім (136 чалавек), Люцынскім (53 чалавекі), Дрысенскім (1 сям'я) паветах. Абшчыны баптыстаў былі таксама ў Мінскай губерні – Рэчыцкім, Слуцкім і Пінскім паветах, а таксама ў Мінску (21 чалавек).

Пасля аб'яўлення ўказа цара Мікалая II аб верацярпімасці ў 1905 г. баптысты актывізавалі сваю дзейнасць і сталі найбольш масавай і ўплывовай сектай сярод іншых сект. Вызначыць дакладную іх колькасць даволі складана, бо самі пратэстанты дакладных звестак не прадстаўлялі.

Адначасова з баптыстамі ў Беларусі з'явіліся евангельскія хрысціяне. У 1882 г. паслядоўнікі гэтага веравучэння былі выяўлены ў горадзе Чачэрску Гомельскага павета Магілёўскай губерні. Некалькі пазней з'явіліся адвентысты. У 1911 г. улады дазволілі правесці сход адвентыстаў у Мінску (16 чалавек). У другіх месцах адвентызм распаўсюджання не атрымаў.

Пратэстанты імкнуліся праводзіць актыўную місіянерскую дзейнасць. Метады евангелізацыі былі розныя – публічныя сходы, распаўсюджванне танных кніг і брашур, арганізацыя бясплатных сталовых, швейных майстэрань, нядзельных школ для дзяцей і інш.

У сакавіку 1879 г. Дзяржаўны Савет выдаў спецыяльны ўказ, які рэгуляваў парадак дзейнасці баптысцкіх абшчын. Указ устанаўліваў,

што грамадскія богаслужэнні баптысты павінны праводзіць у спецыяльных месцах. Усе духоўныя асобы павінны былі зацвярджацца губернатарам.

Аднак спробы прыцягнуць у пратэстанцкія абшчыны паслядоўнікаў з ліку прадстаўнікоў іншых канфесій не давалі, як правіла, станоўчага выніку. Дзейнасць пратэстантаў і стараабрадцаў рэгулявалася ўказам імператара ад 17 кастрычніка 1906 г. аб вядзенні кнігі грамадзянскага стану.

## 4.7. Нехрысціянскія веравызнанні: іслам, іўдаізм

Адносіны царскага ўрада Расійскай імперыі да нехрысціянскіх канфесій былой Рэчы Паспалітай залежалі ад палітычных абставін.

30 кастрычніка 1794 г. у імянным указе Ліфляндскаму, Эстляндскаму генерал-губернатару князю Рапніну Кацярына II пісала: «Не оставьте вы без замечания поселенных в литовских областях татарского племени войск, яко происходящих от народа храброго и прямодушного». У тым жа ўказе царыца паабяцала татарам, «что не только оставляет их в свободе отправлять свое богослужение и при всем том, что в Литве они имеют, но и желаем обеспечить их состояние».

Паводле звестак МУС Расіі, у 1855 г. на тэрыторыі заходніх губерняў пражывала 3152 татарыны, якія вызнавалі іслам. У рэдкіх выпадках іслам вызнавалі асобы рускай, беларускай і польскай нацыянальнасцей. Да 1897 г. колькасць мусульман у заходніх губернях узрасла да 13 877 чалавек. Татары насялялі Віленскі, Лідскі, Ашмянскі, Свянцянскі ўезды Віленскай губерні, Гродзенскі, Слонімскі, Беластоцкі, Брэсцкі, Бельскі ўезды Гродзенскай губерні, Ігуменскі, Навагрудскі, Мінскі, Слуцкі ўезды Мінскай губерні, Дзвінскі ўезд Віцебскай губерні.

Да моманту трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай (1795 г.) на землях Беларусі і Літвы знаходзіліся 23 мячэці і 65 малітоўных дамоў. Найбольшая колькасць іх была ў Трокскім павеце, шчыльна заселеным татарамі. Але ў пачатку XIX ст. колькасць мячэцяў змяншалася ў параўнанні з папярэднім перыядам.

Будаўніцтва і рамонт мячэцяў знаходзіліся пад строгім кантролем улад, аб чым быў прыняты шэраг дакументаў. Пабудаваць мячэці маглі толькі тыя абшчыны, дзе было не менш за 200 мужчын-

мусульман, а мячэць і мула знаходзіліся на ўтрыманні абшчыны. Праекты будынкаў зацвярджаліся мясцовымі губернскімі праўленнямі.

Колькасць мусульманскага духавенства была невялікай. У Гродзенскай губерні, напрыклад, у 1879 г. на тры мячэці прыходзілася ўсяго сем духоўных асоб, а да 1903 г. іх колькасць скарацілася да чатырох чалавек. Такая ж сітуацыя была і ў іншых губернях. Спецыяльных рэлігійных вучэбных устаноў у мусульман заходніх губерняў не было. Аднак у іх існавалі настаўнікі-ходжы, якія пераходзілі з адной мясцовасці ў другую, дзе было неабходна і дзе бацькі жадалі навучаць дзяцей ісламу. Сваіх дзяцей мусульмане таксама навучалі ў школах пры мячэцях.

Мусульмане былі забяспечаны рэлігійнай літаратурай. Кожная сям'я татар мела неабходныя свяшчэнныя кнігі з перакладам арабскага тэксту на польскую мову. У 1858 г. на польскай мове быў выдадзеня «Каран», а ў 1897 г. у Пецярбургу на рускай мове – кніга «Шаратумиман. Заповеди ислама». Выдавалася і іншая літаратура.

У XIX ст. ужо сфарміравалася мусульманская абшчына Паўночна-Заходняга краю. Яе прававы статус вызначаўся юрыдычнымі нормамі ВКЛ, запазычанымі Расійскай імперыяй. Татары-мусульмане заходніх губерняў доўгі час мелі самастойнае кіраванне, а з 1883 г. былі падпарадкаваны Таўрычаскаму магаметанскаму духоўнаму праўленню, якое знаходзілася ў Крыме. Праўленне існавала да 1925 г. Як правіла, грамадзянскія і духоўныя ўлады разглядалі ў асноўным справы, якія датычыліся будаўніцтва і рамонту мячэцяў, а таксама скаргі прыхаджан-мусульман, незадаволеных выбарамі мул або іх дзейнасцю.

Традыцыйна працягвала сваю дзейнасць мусульманская канфесія ў Гродзенскай губерні. Яна была нешматлікай і налічвала каля 1600 чалавек. Канфліктных сітуацый у мясцовых улад з мусульманамі практычна не ўзнікала, за выключэннем мовы набажэнстваў. Мусульмане звычайна выкарыстоўвалі беларускую або польскую мову. Аднак у 1885 г. у выніку даносу і абвінавачвання настаяцеля Слонімскай мячэці імама Мустафы Багушэвіча ў выкарыстанні польскай мовы быў зроблены запыт з урадавай Канцылярыі міністраў начальніку Гродзенскага жандармскага ўпраўлення. У выніку праведзенага расследавання губернскім спраўнікам і паліцмайстарам было накіравана прадпісанне за подпісам гродзенскага губернатара, у якім утрымлівалася патрабаванне «адабраць ад імамаў усіх мячэцяў падпіскі аб тым, што яны абавязваюцца не ўжываць у богаслужэннях

польскай мовы, а таксама паведаміць мясцоваму магаметанскаму насельніцтву, што Караны на польскай мове не дапушчаны да ўжытку, таму іх патрэбна канфіскаваць».

Нягледзячы на тое, што частка мусульман заходніх губерняў удзельнічала ў антыўрадавых выступленнях 1830–1831 і 1863–1864 гг., адносіны да іх з боку ўрада былі добразычлівымі. Мусульманам дазвалялася мець маёнткі, набываць зямлю, трымаць па найму для службы сялян-хрысціян, займаць розныя пасады, працаваць у паліцыі. Духоўныя асобы і мулы заходніх губерняў, пакуль знаходзіліся на пастах, былі вызвалены ад падаткаў і павіннасцей.

Ісламскае веравучэнне ў Беларусі мела абмежаваную сацыяльную базу – этнічных татар. Мусульмане не вялі місіянерскай дзейнасці, не імкнуліся ўцягнуць у сваё веравызнанне асоб праваслаўнай, каталіцкай і пратэстанцкай канфесій. Яны толькі імкнуліся ў акружэнні хрысціянскага насельніцтва захаваць сваю веру. У такіх умовах добрыя ўзаемаадносіны татарскага народа з іншымі народамі беларуска-літоўскіх губерняў у спалучэнні з працавітасцю і высокімі маральнымі якасцямі мусульман спрыялі добрым адносінам да канфесіі ў цэлым. Татары таксама з павагай адносіліся да хрысціян і іх духавенства.

Істотны ўплыў на этнаканфесійную сітуацыю ў заходніх губернях аказала яўрэйскае насельніцтва. З 1772 г. расійскі ўрад прыняў шэраг заканадаўчых актаў, якія датычыліся месцаў пражывання і заняткаў яўрэйскага насельніцтва, а таксама ўстанаўлення «рысы яўрэйскай аседласці». Паколькі яўрэям дазвалялася жыць толькі ў гарадах і мястэчках, гэта істотна зменшыла ў іх колькасць беларускага насельніцтва. Да сярэдзіны 1840-х гг. паміж урадам і яўрэйскім насельніцтвам стаялі кагалы, падчас дзейнасці якіх урад не ўмешваўся ва ўнутраныя і рэлігійныя пытанні яўрэйскага жыцця. У 1844 г. кагалы былі скасаваны, а яўрэйскае насельніцтва было падпарадкавана адміністрацыі, у палітыцы якой у адносінах да яўрэяў перабольшвала імкненне да змяншэння ўплыву іўдаізму.

Прававое становішча яўрэяў у Расійскай імперыі рэгламентавалася сотнямі дакументаў. Заканадаўства Расіі змяшчала больш за 60 абмежаванняў для яўрэяў. Акрамя таго, мясцовая адміністрацыя магла таксама ўводзіць свае абмежаванні, калі лічыла патрэбным. Важнейшым з нарматыўных дакументаў, якія рэгулявалі дзейнасць яўрэйскіх абшчын, было выдадзенае ў 1835 г. «Палажэнне аб яўрэях». Яно прадугледжвала, што на чале яўрэйскіх абшчын стаялі равіны. Яны павінны былі зацвярджацца губернатарамі. У іх задачы

ўваходзіла ажыццяўленне кантролю за рэлігійным жыццём абшчын, захаваннем маральных абавязкаў, дзяржаўных законаў і пастаноў органаў улады. У пачатку XX ст. у расійскім заканадаўстве адбыліся важныя змены: калі да гэтага дыскрымінацыйныя нормы датычыліся толькі асоб іўдзейскага веравызнання, то з гэтага часу і хрышчаныя яўрэі, якія прынялі праваслаўе або каталіцызм, падвяргаліся абмежаванням. Так, па закону 1912 г. забаранялася хрышчаным яўрэям і нават іх дзецям і ўнукам прысвойваць афіцэрскія званні, залічваць у Ваенна-медыцынскую акадэмію і кадэцкія карпусы.

Яўрэйскім абшчынам дазвалялася са згоды губернатара адкрываць новыя сінагогі і малітоўныя школы. Улічваючы той факт, што малітоўныя школы маглі стварацца пры наяўнасці 30 і больш яўрэйскіх дамоў, а сінагогі – больш 80, колькасць культавых устаноў іўдзеяў была даволі ўнушальнай. Так, у Гродзенскай губерні ў 1880 г. з 1120 цэркваў і малітоўных дамоў розных канфесій іўдзеям належалі 379 (64 сінагогі і 315 малітоўных школ). Колькасць іўдзейскага духавенства ў іх складала 359 чалавек.

Некаторыя акты заканадаўства і распараджэнні ўрада абцяжарвалі дзейнасць іўдзеяў. У прыватнасці, быў забаронены пераход з хрысціянства ў іўдаізм, за гэта маглі прыцягнуць да судовай адказнасці. Было забаронена нашэнне яўрэйскага адзення, «пейсаў хасідаў» і г. д. Прадаўжала існаваць «рыса аседласці» яўрэяў, хаця ў 1850–1860-я гг. былі выдадзены ўказы, якія асобным катэгорыям яўрэйства (купцы 1-й гільдыі, вучоныя, рамеснікі і г. д.) стваралі ўмовы для свабоднага месца жыхарства ў межах Расіі, а таксама быў дазволены выезд у Польшчу і назад. У арміі праводзілася насільная хрысціянізацыя. Гэтыя абмежаванні не прымяняліся да караімаў і хрышчаных яўрэяў. Накіраваныя на абарону інтарэсаў і правоў карэннага рускага насельніцтва, гэтыя меры ў яўрэйскім асяроддзі разглядаліся як дыскрымінацыйныя і выклікалі абурэнне.

Палітыка царскага самадзяржаўя аказала сур'ёзны ўплыў на характар адукацыі яўрэяў. Асобы, якія спавядалі іўдаізм, атрымлівалі адукацыю ў розных вучэбных установах – як свецкіх (гімназіі, вучылішчы), так і рэлігійных (хедэры). Але апошнія займалі вядучае становішча, таму магчыма сцвярджаць, што адукацыя іўдзеяў насіла пераважна рэлігійны характар. У 1894 г. у Мінскай губерні, напрыклад, выхаванцы хедэраў складалі 66,3 %, у Гродзенскай – 63 % ад усіх дзяцей школьнага ўзросту. З цягам часу яўрэйская адукацыя стала набываць усё больш свецкі характар. Яўрэйская моладзь імкнулася вучыцца ў гімназіях і ўніверсітэтах, адыходзіла ад рэлігіі

сваіх продкаў. Разам з тым іўдаізм быў незразумелы для хрысціян, іншы раз нават варожа імі ўспрымаўся. Спецыфічны знешні выгляд яўрэяў і атрыбуты іх веры параджалі стэрэатыпы, а ў экстрэмальных выпадках выклікалі агрэсію. Так, у часткі хрысціянскага насельніцтва існавалі перакананні, што яўрэі здзяйсняюць рытуальныя забойствы хрысціянскіх дзяцей, здекуюцца з каштоўнасцей касцёла хрысціянскай веры, спойваюць мясцовае насельніцтва гарэлкай і г. д. Антысемітызм падаграваўся некаторымі прадстаўнікамі праваслаўнага і каталіцкага духавенства.

У другой палове XIX – пачатку XX ст. у цэлым па пяці беларускіх губернях іўдзеі з’яўляліся трэцяй па колькасці вернікаў канфесіяй, а ў Магілёўскай і Мінскай – другой. Паводле перапісу насельніцтва 1897 г., да іўдзеяў аднеслі сябе (у % да агульнай колькасці пражываючых): у Віленскай губерні – 204 686 чалавек (12,8 %); Віцебскай – 175 629 (11,8 %); Гродзенскай – 280 489 (17,5 %); Мінскай – 345 015 (16 %); Магілёўскай – 203 946 (12,1 %). Больш за ўсё іўдзеяў пражывала ў гарадах і мястэчках Гродзенскай і Мінскай губерняў.

## 4.8. Указ цара Мікалая II «Аб умацаванні асноў верацярпімасці» і яго наступствы

У пачатку XX ст. у рэлігійным жыцці Расійскай імперыі адбыліся значныя змены. Яны былі абумоўлены пераглядам канфесійнай палітыкі самадзяржаўя. Ва ўказе ад 12 снежня 1904 г. у пункце 6 імператар указаў: «Подвергнуть пересмотру узаконения о правах раскольников, а равно лиц, принадлежавших к инославным и иноверным исповедованиям, и независимо от всего принять ныне же в административном порядке соответствующие меры к устранению в религиозном быте их всякого, прямо в законе не установленные, стеснения». На падставе гэтага Кабінет міністраў падрыхтаваў палажэнне «Аб умацаванні асноў верацярпімасці», якое было падпісана царом Мікалаем II (1894–1917 гг.) 17 красавіка 1905 г. У ім аб’яўлялася свабода пераходу з праваслаўя ў іншыя веравызнанні; адмяняўся абавязковы перавод у праваслаўе дзяцей у выпадках, калі адзін з бацькоў прымаў праваслаўе. Дазвалялася таксама выкладанне Закона Божага на прыроднай мове вучняў і толькі духоўнымі асобамі адпаведнага веравызнання.

У адносінах рымска-каталіцкага веравызнання прадугледжвалася права на будаўніцтва касцёлаў. Цяпер для іх адкрыцця патрабавалася згода духоўнага рымска-каталіцкага кіраўніцтва, наяўнасць неабходных грашовых сродкаў і адпаведнасць тэхнічным патрабаванням будаўнічага статута. Уніяты, запісаныя пад ціскам да праваслаўнай Царквы, маглі вярнуцца да каталіцкага Касцёла, але лацінскага абраду. Стараабрадцы і сектанты атрымлівалі прававую рэлігійную талерантнасць. Католікам вярталіся адабраныя касцёлы, якія былі закрыты ў адміністрацыйным парадку, за выключэннем тых, якія былі аддадзены праваслаўнай Царкве. Аб'яўлена амністыя для святароў, якія за ўніяцкую душпастырскую дзейнасць былі адпраўлены ў турму і дэпартаваны. Але гэтыя «вольнасці» зноў былі пад пагрозай, калі ў 1908–1912 гг. на чале расійскага ўрада стаяў П. А. Сталыпін. Зноў паўтараліся спробы ўвядзення рускай мовы ў навучанне рэлігіі, у набажэнствы, а таксама дэпартацыя біскупаў і ксяндзоў.

Вялікае значэнне пры фарміраванні канфесійнай палітыкі, рэгуляванні ўзаемаадносін паміж рознымі веравызнаннямі мела пытанне аб змешаных шлюбах. Але тут перавага аддавалася праваслаўнай Царкве і рэгулюючай ролі дзяржавы. У выпадку, калі адзін быў праваслаўны, шлюб павінен быў адбыцца па праваслаўным абрадзе. Дзеці, якія нарадзіліся ў такіх сем'ях, павінны былі быць ахрышчаны і выхаваны па традыцыях праваслаўнай Царквы. Але калі адзін з бацькоў пераходзіў у каталіцтва, то і дзеці да 14 год маглі быць пераведзены ў каталіцтва.

У лютым 1907 г. Савет Міністраў разгледзеў законапраект аб свабодзе сумлення. Адзін з пунктаў датычыўся да змешаных шлюбаў. У шлюбе праваслаўнага з неправаслаўным веравызнанне дзяцей вызначалася пагадненнем бацькоў, і толькі пры адсутнасці такога пагаднення дзеці прылічваліся да праваслаўнага веравызнання. Але прапанова выклікала супраціўленне з боку праваслаўных іерархаў, якія даказвалі, што ніколі веравызнанне не павінна вызначацца самастойна іншымі асобамі, а толькі воляй дзяржавы, гэта значыць законамі. Фактычна пасля забойства П. А. Сталыпіна гэта праблема сама сабой адпала, і ўсё рабілася так, як да прыняцця ўказа аб верацярпімасці. Разам з тым з 1905 г. па 1915 г. з праваслаўя ў каталіцызм па пяці заходніх губернях перайшлі 58 534 асобы, у тым ліку па Віленскай – 28 271, Віцебскай – 4988, Гродзенскай – 6693, Магілёўскай – 1747, Мінскай – 16 835.

Указ «Аб умацаванні асноў верацярпімасці» ў цэлым не пахіснуў пазіцый праваслаўнай Царквы ў жыцці краіны. Болей таго, у артыкуле 4 «Статута духоўных спраў іназемных веравызнанняў» падкрэслівалася, што ў межах дзяржавы адна пануючая праваслаўная Царква мае права прыцягваць на свой бок паслядоўнікаў іншых веравызнанняў і інаверцаў шляхам прыняцця яе вучэння аб веры. Галоўны стрыжань канфесійнай палітыкі – захаванне пануючай ролі праваслаўный Царквы – быў захаваны і надалей. Ні ўказ аб верацярпімасці ад 17 красавіка 1905 г., ні Маніфест 17 кастрычніка 1905 г., ні шэраг наступных заканадаўчых актаў, накіраваных на ліквідацыю абмежаванняў істотных правоў іншаверных і іназемных веравызнанняў, не павінны былі абмяжоўваць існуючыя правы праваслаўнай Царквы. У нейкай ступені адбылася нармалізацыя становішча каталіцкага Касцёла, хаця многія праблемы ўсё ж заставаліся. Быў створаны нават асобны Савет Міністраў па справах рыма-католікаў, які павінен быў падрыхтаваць праект закона аб свабодзе рыма-каталіцкага веравызнання. Аднак гэтым планам перашкодзіла Першая сусветная вайна.

Пачатак вайны праваслаўныя і католікі сустрэлі па-рознаму. У цэрквах адбываліся малебны за перамогу расійскай арміі. Праваслаўныя святары выконвалі абавязкі вайсковых святароў. Перад боем праводзіліся малебны, асвячаліся вайсковыя штандары. У лазарэтах адкрываліся спецыяльныя цэрквы. Больш стрымана да гэтага ставілася каталіцкае духавенства. Аднак і католікі, і праваслаўныя займаліся дабрачыннай дзейнасцю, збіралі сродкі для раненых і пацярпелых ад вайны.

У перыяд нямецкай акупацыі часткі беларускіх зямель немцы праводзілі дастаткова лаяльную нацыянальную палітыку. Гэта дазволіла актывізаваць асобным беларускім ксяндзам (Я. Германовіч, К. Стэповіч, У. Талочка і інш.) нацыянальна-асветную дзейнасць. Аднак каталіцкі элемент не меў значнага ўплыву на беларускае грамадства ў цэлым, якое пераважна складалася з праваслаўных.

Пасля лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. Часовы ўрад адмовіўся ад прыёмаў кіравання царквой папярэдняй уладай. Уносіліся змены ў богаслужэнні. Замест згадавання «царствовавшего дома» ўзносіліся малітвы «о Богохранимой державе Российской и Благоверном Временном правительстве». 7 сакавіка 1917 г. Часовы ўрад абвясціў аб адмене рэлігійных абмежаванняў і адначасова пацвердзіў захаванне царкоўнага землеўладання і выдачы Царкве субсідый. 5 жніўня 1917 г. было створана Міністэрства веравызнанняў з Дэпарта-

ментам Рускай праваслаўнай Царквы, замежных і іншаверных вызнанняў. Міністрам быў прызначаны А. Карташоў.

Распад Расійскай імперыі, а затым абвяшчэнне ў сакавіку 1918 г. Беларускай Народнай Рэспублікі садзейнічалі пераходу хрысціянскага руху на якасна новы этап. 24–25 мая 1917 г. у Мінску адбыўся з'езд беларускага каталіцкага духавенства, які прыняў рэзалюцыі аб неабходнасці ўжывання беларускай мовы ў навучальных установах і касцёлах, аб выданні беларускіх падручнікаў і газеты «Бацькаўшчына», аб магчымасці працы беларускіх святароў па нацыянальнаму адраджэнню і інш. У маі 1917 г. у Петраградзе была створана Беларуская хрысціянска-дэмакратычная злучанасць, ля вытокаў дзейнасці якой стаялі ксяндзы-беларусы Ф. Абрантовіч і Л. Хвецька. У 1920 г. была прынята першая праграма БХД, якая сведчыла аб завяршэнні арганізацыйнага афармлення хрысціянска-дэмакратычнага крыла беларускага нацыянальнага руху і аб гатоўнасці яго прадстаўнікоў да ўсебаковай дзейнасці ў межах адстойвання сацыяльных, нацыянальных і культурных правоў беларусаў.

Ва ўмовах абвастрэння палітычнай барацьбы супрацьлеглую пазіцыю па рэлігійнаму пытанню занялі бальшавікі. У матэрыялах па перагляду праграмы сваёй партыі яны ўнеслі пункт аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і школы ад царквы. Аднак рэалізоўваць сваю палітыку яны пачалі толькі пасля кастрычніцкай рэвалюцыі.

## 4.9. Царква, Касцёл у этнакультурных працэсах на беларускіх землях

Уплывовым фактарам развіцця культуры Беларусі гэтага часу стала супрацьстаянне дзвюх канфесій: праваслаўнай і каталіцкай, носьбітаў розных культурных і духоўных каштоўнасцей. Каталіцызм, у асноўным, з'яўляўся рэлігіяй прывілеяванага, дваранскага саслоўя. Праваслаўе было звязана пераважна з сялянствам і мяшчанствам Беларусі. Цэнтрам праваслаўнай культуры Беларусі быў Магілёў з духоўнай семінарыяй, якую заснаваў архіепіскап Георгій Каніскі. Сярод выхаванцаў гэтай установы быў буйнейшы лінгвіст, фалькларыст і этнограф І. Насовіч (1788–1877 гг.).

У перыяд Расійскай імперыі ўзнікае праблема этнічнай ідэнтыфікацыі польскага і беларускага насельніцтва, католікаў па веравызнанні. Царскія ўлады ў якасці этнавызначальнага крытэрыя выкарыстоўвалі канфесійную прыналежнасць. Менавіта тады шы-

рока распаўсюдзіліся стэрэатыпы «праваслаўны – рускі (беларус)», «католік – паляк». Праваслаўе ўспрымалася як «руская вера», а каталіцтва – як «польская», Рыма-каталіцкі Касцёл – як «польскі». Гэтыя стэрэатыпы замацаваліся і захоўваліся працяглы час.

Падзел беларускага грамадства па саслоўнай і канфесійнай прыкмеце прывёў да існавання на Беларусі трох культурных напрамкаў:

- «заходнерускага», прадстаўнікамі якога з'яўляліся праваслаўнае і часткова ўніяцкае духавенства, купецтва, мяшчанства;
- польскага, носьбітамі якога ў асноўным былі беларускае дваранства і польская шляхта;
- беларускага (каталіцкага), якое сфарміравалася ў рэчышчы беларускага нацыянальнага руху. Яго прадстаўнікамі ў першую чаргу былі ксяндзы-беларусы і беларуская інтэлігенцыя каталіцкага веравызнання, выхадцы пераважна з дробнабуржуазнага асяроддзя.

Наяўнасць гэтых плыняў у агульнай культуры Беларусі, безумоўна, стрымлівала працэс стварэння адзінай беларускай нацыі.

Статус афіцыйнай ідэалогіі атрымала канцэпцыя заходнерусізма (такую назву ёй далі пазней крытыкі), якую распрацоўвалі М. Каяловіч (1828–1891 гг.), І. Грыгаровіч (1792–1852 гг.), А. Сапуноў (1851–1924 гг.). Паводле гэтай канцэпцыі беларусы разам з вялікаросамі і маларосамі з'яўляюцца галінай адзінага рускага народа. Абапіраючыся на праваслаўе, прыхільнікі «заходнерускага» напрамку аднаўлялі, як ім здавалася, асновы традыцыйнай, народнай культуры Беларусі.

Асноўным жа зместам канфесійнай палітыкі самадзяржаўя на тэрыторыі Беларусі было аднаўленне страчаных пазіцый праваслаўя. Аднак формы і метады дасягнення галоўнай мэты пры Аляксандры І і Мікалаі І былі неаднолькавыя. Праваслаўная Царква знаходзілася ў цяжкім матэрыяльным і маральным становішчы, яе веруючымі былі прыгонныя сяляне, бедная шляхта і мяшчане. Праваслаўнае духавенства не клапацілася пра ўладкаванне прыходаў. Пачасціліся выпадкі пераводу праваслаўных і ўніяцкіх сялян у каталіцызм, уз'яднанне ўніятаў з праваслаўем спынілася. Шырокай свабодай карысталася каталіцтва і нават пратэстантызм. З дазволу імператара па ўсёй Беларусі зацвярджаліся езуіцкія місіі. Толькі пасля вайны 1812 г., у ходзе якой выявілася супрацоўніцтва каталіцкага духавенства з напалеонаўскай адміністрацыяй, езуіты былі выдвараны з Расіі, а іх маёмасць канфіскавана.

Мікалай I шукаў у праваслаўнай Царкве апору для сваёй палітыкі. У мэтах павышэння яе прэстыжу, адукацыйнага ўзроўню духавенства ў канцы 1820-х – пачатку 1830-х гг. была праведзена царкоўная рэформа. Змянілася становішча праваслаўнай Царквы і ў Беларусі. У 1826 г. католікам забаранялася будаваць капліцы ў мясцовасцях з пераважна праваслаўным насельніцтвам. У 1827–1830 гг. былі праведзены мерапрыемствы па рэформе ўніяцкай царквы і збліжэнні яе з праваслаўем. Была створана грэка-ўніяцкая калегія, чатыры ўніяцкія епархіі рэарганізаваны ў Беларускую і Літоўскую. У базыліянскія манастыры загадвалі прымаць толькі ўніятаў, а ў практыцы богаслужэння выкарыстоўваць «мясцовы дыялект».

Пасля падаўлення паўстання 1863 г. урад правёў шэраг рэакцыйных мерапрыемстваў у галіне асветы. Ужо ў 1865 г. пачаўся перагляд агульнага напрамку развіцця сеткі і тыпаў школ, складу настаўнікаў, зместу навучальна-выхаваўчай работы. У 1866 г. на тэрыторыі заходнебеларускіх губерняў функцыянавала 1251 навучальная ўстанова, з якіх Міністэрству народнай асветы належалі толькі 130, духоўнаму ведамству – 956, у тым ліку 940 сельскіх вучылішчаў пры цэрквах. Колькасць вучняў складала 30 тысяч, з іх 18 тысяч (58 %) – у сістэме духоўнага ведамства. Сетка навучальных устаноў у Беларусі размяркоўвалася нераўнамерна. У некаторых валасцях школ увогуле не было. На Магілёўшчыне ў пачатку 1860-х гг. існавала ўсяго 38 школ на 204 воласці. Да канца дзесяцігоддзя яны з’явіліся яшчэ ў 103 валасцях.

Настаўнікамі ў гарадскіх вучылішчах нярэдка працавалі дастаткова падрыхтаваныя спецыялісты, выпускнікі вышэйшых навучальных устаноў Пецярбурга, Масквы, Кіева, Вільні. У сельскіх народных вучылішчах настаўнікамі, як правіла, з’яўляліся выпускнікі настаўніцкіх і духоўных семінарый Беларусі. Падрыхтоўка настаўнікаў для пачатковай школы ажыццяўлялася ў настаўніцкіх семінарыях: Маладзечанскай (першая ў Расіі, заснавана ў 1864 г.), Полацкай (1872 г.) і Свіслацкай (1876 г.). Палажэннямі і інструкцыямі аб навучальна-выхаваўчым працэсе прадугледжвалася падрыхтоўка адданых прастолу настаўнікаў, здольных распаўсюджваць у народзе «элементарную і рэлігійна-маральную адукацыю». Для выхавання ў семінарыстаў вернападданніцкіх пачуццяў у семінарыі накіроўваліся рэакцыйна настроеныя выкладчыкі, якія праводзілі афіцыйную палітыку ў галіне адукацыі.

Палітыка расійскага самадзяржаўя была накіравана на абмежаванне правоў нацыянальных меншасцей і ролі каталіцкага Касцёла

на далучаных землях. Забаранялася выкарыстанне ў афіцыйнай перапісцы і ў грамадскіх месцах польскай мовы. З канца XIX ст. практычна адзіным асяродкам культуры і захавання мовы польскай нацыянальнай меншасці заставаўся касцёл. Па ініцыятыве духавенства для дзяцей каталіцкага веравызнання ствараліся тайныя школы. Іх дзейнасць, аднак, праследавалася. Ксяндзоў маглі пакараць штрафам у памеры 300 рублёў або арыштам на тры месяцы. 12 лютага 1902 г. віленскі епіскап С. Звяровіч пайшоў на радыкальныя меры. Ён выдаў цыркуляр, які забараняў католікам пасылаць дзяцей у царкоўна-прыходскія школы і школы граматы. Пераемнік С. Звяровіча на пасадзе віленскага епіскапа Э. Роп 22 жніўня 1905 г. выдаў цыркуляр, у якім патрабаваў ад духавенства адкрываць тайныя школы пры касцёлах. Навучанне вялося на польскай мове. Расходы на ўтрыманне школ бралі на сябе прыхаджане.

Падзеі канца XVIII – пачатку XX ст. востра паставілі пытанне аб нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці беларусаў, аб іх месцы ў гісторыі. Працэс станаўлення беларускай нацыі суправаджаўся фарміраваннем нацыянальнага руху. У канцы XIX – пачатку XX ст. ён насіў культурна-асветны характар і быў накіраваны на нацыянальнае адраджэнне і фарміраванне нацыянальнай свядомасці беларусаў. У пачатку XX ст. адбывалася яго арганізацыйнае афармленне. Галоўнай падзеяй стала стварэнне Беларускай рэвалюцыйнай грамады, якая хутка трансфармавалася ў Беларускую сацыялістычную грамаду.

У духоўных семінарыях у Вільні і Пецярбургу, асабліва ў духоўнай каталіцкай акадэміі ў Пецярбургу, у клерыкаў-беларусаў фарміраваліся погляды на неабходнасць беларусізацыі рэлігійнага жыцця. Істотную ролю ў гэтым працэсе адыграў гурток, заснаваны ў 1907 г. у Пецярбургскім універсітэце прафесарам Імператарскай рымска-каталіцкай духоўнай акадэміі Б. Эпімах-Шыпілам. Удзельнікамі гуртка былі актыўныя ў будучым дзеячы беларускай хрысціянскай дэмакратыі Ідэльфонс Бобіч, Фабіян Абрантовіч, Антон Неманцэвіч, Францішак Будзька, Міхаіл Пятроўскі, Адам Станкевіч і інш. Важнае значэнне ў пашырэнні беларускай працы мела выданне епіскапам-суфраганам Магілёўскай архідыяцэзіі Сцяпанам Данісевічам у 1906 г. «Элемэнтара для добрых дзетак католікаў». Многія святары ў сваіх адносінах з прыхаджанамі карысталіся зразумелай для іх мовай («гаварылі па-просту»). Напярэдадні Першай сусветнай вайны многія ксяндзы-беларусы займаліся стварэннем гурткоў, якія былі арыентаваны на аб'яднанне беларускай моладзі і выхаванне яе

ў духу хрысціянскіх запаведзяў і патрыятызму. Адным з першапраходцаў у гэтых адносінах быў гродзенскі ксёндз Ф. Грынкевіч.

У 1913–1915 гг. у Вільні на беларускай мове выдавалася штотыднёвая грамадска-палітычная, літаратурна-мастацкая і рэлігійна-асветніцкая каталіцкая газета «Беларус». Яна была разлічана на каталіцкую частку беларускіх сялян і інтэлігенцыю. Эпіграфам да ўсіх нумароў газеты былі словы з Евангелля: «Шкада мне гэтага народу… бо не мае чаго есці» (Марк, 8,2). У газеце змяшчаліся каталіцкі каляндар, краёвая царкоўная і замежная хроніка, казанні святароў на тэмы маралі, педагогікі, жыція святых, малітвы. У праграмным артыкуле рэдакцыя абвяшчала, што «будзе заўсёды стаяць на грунце хрысціянска-каталіцкім, абараняючы хрысціянскую справу, паважаючы іншыя народнасці і вераванні». Газета агітавала беларусаў да развіцця нацыянальнай свядомасці, прымянення беларускай мовы ў набажэнствах.

У першай палове XIX ст. у культавых пабудовах праваслаўнай Царквы назіраўся ўплыў старажытнарускай архітэктурнай школы. Пачаткам развіцця «руска-візантыйскага стылю» лічацца 1830-я гг. Развіццё гэтага стылю адбывалася ў двух напрамках: перабудова існуючых каталіцкіх і ўніяцкіх храмаў і ўзвядзенне новых цэркваў па праектах Сінода і прыватных асоб. Найбольшага росквіту стыль дасягнуў у другой палове XIX – пачатку XX ст., калі пачалося масавае будаўніцтва цэркваў-«мураўёвак» за дзяржаўны кошт.

З канца XVIII ст. на беларускія землі пранікае архітэктурны стыль «класіцызм». Збудаванні ў стылі класіцызму вызначаліся строгасцю, прастатой дэкаратыўнай апрацоўкі фасадаў, кампактнасцю аб'ёмаў, правільнымі геаметрычнымі планамі, тонкім і стрыманым архітэктурным дэкорам; у пачатку XIX ст. – манументальнасцю, урачыстасцю. Сярод значных пабудоў вылучаюцца Магілёўскі Іосіфаўскі сабор, вучэбны комплекс Магілёўскай духоўнай семінарыі, жылы корпус і царква Полацкага Богаяўленскага манастыра, Чачэрская Спаса-Прэабражэнская царква, Слаўгарадская царква Раства Багародзіцы і інш. З канца XVIII ст. каталіцкае і ўніяцкае храмабудаўніцтва рэзка скарацілася. Аднак стыль класіцызму набываў пры ўзвядзенні або рэканструкцыі касцёлаў усё большае значэнне. Сярод помнікаў сакральнай архітэктуры вылучаюцца Валожынскі касцёл Святога Юзафа, Лідскі Іосіфаўскі касцёл піяраў, Шчучынскі касцёл св. Тарэзы і інш. Важна адзначыць, што класіцызм не быў адзіным стылем, які выкарыстоўваўся пры ўзвядзенні культавых будынкаў. Архітэктары адвольна спалучалі ў будынках формы готыкі, рэнесансу, барока,

стваралі кангламераты архітэктурных форм, якія даволі цяжка вызначыць.

Адным з асноўных сродкаў фарміравання інтэр’ераў культавых збудаванняў заставаўся манументальны жывапіс. Мастакі выкарыстоўвалі жывапісныя сродкі для стварэння алтароў, нішаў, капэлаў, у якіх знаходзілася частка фігур святых, кампазіцыі на евангельскія сюжэты. Культавы жывапіс у большай ступені працягваў заставацца ў рэчышчы акадэмічнага мастацтва з сухой і халоднай інтэрпрэтацыяй кананічных сюжэтаў.

## Тэма 5

# СТАНОВІШЧА КАНФЕСІЙ У САВЕЦКАЙ ДЗЯРЖАВЕ І БЕЛАРУСІ (1917–1939 гг.)

*5.1. Ідэалагічныя і заканадаўчыя асновы савецкай канфесійнай палітыкі.*

*5.2. Эканамічнае, палітычнае і ідэалагічнае наступленне на рэлігію і Царкву.*

*5.3. Спробы расколу праваслаўнай Царквы.*

*5.4. Становішча іншых канфесій.*

*5.5. Рэпрэсіі супраць духавенства і веруючых.*

# 5.1. Ідэалагічныя і заканадаўчыя асновы савецкай канфесійнай палітыкі

Прыход да ўлады бальшавікоў у 1917 г. стаў пачаткам татальнай барацьбы з рэлігіяй і Царквой. Галоўнай мэтай бальшавікоў была ліквідацыя «рэлігійных забабонаў» у свядомасці людзей, а фактычна – вынішчэнне рэлігіі і Царквы і ўсяго, што з імі звязана. Духавенства і вернуючыя ўспрымаліся новай уладай як ачаг іншадумства і апазіцыі, што ў хуткім часе прывяло да іх праследаванняў і рэпрэсій. Рэлігійная палітыка, якая праводзілася савецкай дзяржавай, у цэлым была накіравана на процідзеянне рэлігіі і рэлігійным арганізацыям. Ідэалагічную аснову гэтай палітыкі склалі творы заснавальнікаў камуністычнай ідэалогіі К. Маркса, Ф. Энгельса, У. Леніна, пастановы ЦК УКП (б), а заканадаўчую – дэкрэты СНК Расійскай Федэрацыі і БССР, пастановы, інструкцыі дзяржаўных органаў Расіі, а затым СССР. У БССР заканадаўства аб культах стваралася на аснове агульнасаюзнага.

Узаемаадносіны Царквы і новай палітычнай улады рэгуляваліся «Дэкрэтам аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і школы ад царквы» ад 23 студзеня 1918 г., пацверджаным СНК БССР 11 студзеня 1922 г. Вось некаторыя яго палажэнні: «1. Царква аддзяляецца ад дзяржавы… 5. Свабоднае выкананне рэлігійных абрадаў забяспечваецца настолькі, наколькі яны не парушаюць грамадскага парадку і не суправаджаюцца пасягненнямі на правы грамадзян Савецкай Рэспублікі. Мясцовыя ўлады маюць права прымаць усе неабходныя меры для забеспячэння ў гэтых выпадках грамадскага парадку і бяспекі. 6. Ніхто не можа, спасылаючыся на свае рэлігійныя погляды, ухіляцца ад сваіх грамадзянскіх абавязкаў… 9. Школа аддзяляецца ад царквы. Выкладанне рэлігійных веравучэнняў ва ўсіх дзяржаўных і грамадскіх, а таксама прыватных навучальных установах, дзе выкладаюцца агульнаадукацыйныя прадметы, не дапускаецца. Грамадзяне могуць вучыць і вучыцца рэлігіі прыватным чынам… 12. Ніякія царкоўныя і рэлігійныя абшчыны не маюць права мець уласнасць. Права юрыдычнай асобы яны не маюць…».

Гэты дэкрэт не проста аддзяляў Царкву ад дзяржавы і школы, што было з'явай нармальнай для дэмакратычнага грамадства, але ў савецкай краіне рабіў вернікаў і духавенства людзьмі другога гатунку, падводзіў юрыдычную базу для будучых ганенняў. Напрыклад, пунктам пятым, у якім ішла гаворка пра «неабходныя меры», якія могуць прымяняць «мясцовыя ўлады», можна было апраўдаць любыя іх дзеянні. Словы гэтага самага пункта пра «свабоднае выкананне рэлігійных абрадаў настолькі, наколькі яны не парушаюць грамадскага парадку» практычна прыраўнівалі хрэсны ход і царкоўны звон да парушэння гэтага парадку. Пункт шосты не ўлічваў кананічнае права Царквы, па якому святар не мае права ваяваць са зброяй у руках, што ў перыяд мабілізацыі магло расцэньвацца як ухіленне ад выканання грамадзянскага абавязку. Пазбаўленне Царквы права юрыдычнай асобы ўскладняла яе дзейнасць, магчымасць абараняць свае правы, выдаваць рэлігійную і апалагетычную літаратуру.

Адносіны дзяржавы і Царквы былі замацаваны ў Канстытуцыі СССР 1924 і 1936 гг. і Канстытуцыі БССР 1928 і 1937 гг. Сацыялістычны лад, згодна з Асноўным законам, забяспечваў усім грамадзянам поўную свабоду сумлення. Гэта азначала адсутнасць якога б ні было знешняга прымусу чалавека да таго, верыць у Бога ці не верыць, як з боку дзяржавы і яе мясцовых органаў, так і з боку рэлігійна-царкоўных арганізацый. Свабода сумлення – гэта роўныя магчымасці для ўсіх грамадзян дзяржавы свабодна вызнаваць любую рэлігію або быць атэістамі, бязбожнікамі. Але, як паказалі рэальныя падзеі, камуністычная партыя, якая з'яўлялася палітычным манапалістам у дзяржаве, праводзіла ў дачыненні да рэлігіі сваю палітыку, якая нярэдка гранічыла з беззаконнем. Працэс узаемаадносін паміж сферай рэлігіі і атэістычнай прапагандай дзякуючы шырокай дзяржаўнай падтрымцы набыў аднабаковасць. Заахвочваючы сістэму атэістычнага выхавання і пазбаўляючы рэлігійных дзеячаў магчымасці стаць годнымі апанентамі, камуністычная партыя палегчыла сваю задачу «выхоўваць ідэйна перакананых і ўсебакова развітых людзей камуністычнага грамадства».

Савецкае заканадаўства аб культах дапаўнялася рознымі інструкцыямі, цыркулярамі, пастановамі, якія выдаваліся СНК, НКУС, Наркаматамі асветы, юстыцыі і г. д. і былі накіраваны на абмежаванне дзейнасці рэлігійных арганізацый. Так, у інструкцыі НКУС і Наркамюста БССР ад 5 мая 1928 г. «Па пытаннях, звязаных з ажыццяўленнем дэкрэта аб аддзяленні царквы ад дзяржавы ў БССР» выз-

начаўся парадак узаемаадносін рэлігійных арганізацый і дзяржаўных органаў улады. Усе рэлігійныя аб'яднанні падлягалі абавязковай рэгістрацыі ў адміністрацыйных аддзелах або НКУС; забаранялася выкарыстоўваць богаслужэнні ў палітычных мэтах; навучанне рэлігіі магло адбывацца прыватным чынам, але пры гэтым не магло насіць групавога характару, і г. д. У выпадку парушэння інструкцыі прадугледжвалася суровая адказнасць.

8 красавіка 1929 г. УЦВК і СНК РСФСР выдалі пастанову «Аб рэлігійных аб'яднаннях». У 68 пунктах гэтага дакумента ўзаконьвалася такая сістэма адносін дзяржавы і Царквы, якая фактычна азначала ўмяшальніцтва дзяржаўных органаў ва ўнутрыцаркоўнае жыццё, звужала ўплыў Царквы на веруючых, абмяжоўвала яе маёмасныя правы, зніжала ролю духавенства ў рэлігійным жыцці. Вызначаўся парадак рэгістрацыі рэлігійных арганізацый, умовы перадачы ім культавых будынкаў, забаранялася дабрачынная дзейнасць і інш.

У 1920–1930-я гг. праводзілася маштабная кампанія па закрыцці культавых устаноў і выкарыстанні іх у «народнагаспадарчых і культурна-асветных мэтах» – пад склады, кінатэатры, клубы і г. д. Вынішчэнне помнікаў архітэктуры суправаджалася канфіскацыяй і, нярэдка, знішчэннем маёмасці храмаў. Кампанія набыла такія маштабы, што НКУС і Міністэрства фінансаў БССР з мэтай зберажэння найбольш каштоўных прадметаў 9 сакавіка 1930 г. прынялі пастанову «Аб парадку размеркавання маёмасці пры ліквідацыі дамоў рэлігійных культаў». Яна прадугледжвала ўсе прадметы з каштоўных металаў і камянёў залічваць у дзяржаўны фонд і перадаваць у Дзяржбанк. Адначасова з заканадаўчым абмежаваннем набыла размах кампанія па барацьбе з рэлігіяй, якая складалася з некалькіх аспектаў: барацьба з рэлігіяй як з ненавуковай тэорыяй, з Царквой і духавенствам (клерыкалізмам) і з рэлігійнай свядомасцю.

## 5.2. Эканамічнае, палітычнае і ідэалагічнае наступленне на рэлігію і Царкву

Пазбаўленне Царквы эканамічнай асновы пачалося з Дэкрэта аб зямлі, у якім гаварылася, што манастырская і царкоўная зямля «адчужаецца бязвыплатна, абарачаецца ва ўсенародны здабытак

і пераходзіць у карыстанне ўсіх працоўных». У адпаведнасці з дэкрэтам «Аб свабодзе сумлення, царкоўных і рэлігійных таварыствах» ад 23 студзеня 1918 г. уся маёмасць царкоўных і рэлігійных арганізацый аб'яўлялася народным здабыткам.

У адпаведнасці з савецкім заканадаўствам толькі ў праваслаўнай Царквы было адабрана 827 500 дзесяцін манастырскай зямлі з усім інвентаром і жывёламі, нацыяналізаваны 84 манастырскія заводы, 704 гасцініцы, 1112 даходных дамоў, 436 малочных фермаў, 602 жывёлагадоўчыя двары, 311 пасек. Царква пазбаўлялася і іншых крыніц даходаў, такіх як, напрыклад, паломніцтва веруючых да святых месцаў, святых магілаў, продаж прадметаў рэлігійнай атрыбутыкі.

На нацыяналізаваную царкоўную маёмасць складаліся акты. Храмы і іншыя будынкі прызнаваліся дзяржаўнай уласнасцю і перадаваліся веруючым у бестэрміновае і бясплатнае карыстанне.

Канфіскацыя царкоўных каштоўнасцей дасягнула кульмінацыі ў 1922 г. У лютым у сувязі з голадам, які ахапіў еўрапейскую частку РСФСР, Прэзідыум УЦВК прыняў дзве пастановы, у якіх прадугледжвалася ў месячны тэрмін з дня апублікавання «адабраць з царкоўных маёмасцяў, якія перададзены ў карыстанне веруючых усіх рэлігій па вопісах і дагаворах, усе каштоўныя прадметы з золата, срэбра і камянёў». Прэзідыум ЦВК БССР 1 сакавіка 1922 г. далучыўся да экспрапрыяцыі царкоўных каштоўнасцей.

Супраць канфіскацыі рэзка выступіў маскоўскі патрыярх Ціхан. Але яго не падтрымаў глава праваслаўнай Царквы ў Беларусі епіскап Мельхісэдэк (Паеўскім), а таксама равін Беларусі Рабіновіч. Адмовіліся падтрымаць экспрапрыяцыю каталікі.

Вынікі экспрапрыяцыі ў БССР былі вельмі сціплымі. У 1922 г. з цэркваў, касцёлаў, сінагог у Маскву было вывезена больш за 65 пудоў срэбра (для параўнання: у РСФСР сабралі каля 18 пудоў золата і 8199 пудоў срэбра). Такі адносна небагаты «ўлоў» тлумачыцца тым, што да гэтага часу царкоўная маёмасць ужо двойчы вывозілася з Беларусі: у пачатку Першай сусветнай вайны – у Расію і падчас польска-савецкай вайны – у Польшчу. У некаторых населеных пунктах пры канфіскацыях справа даходзіла да сутыкненняў людзей з уладамі. І ўсё ж гучных «расстрэльных» працэсаў, як у Петраградзе, па гэтай справе не адбывалася. Аднак у 1924 г. у Мінску адбыўся судовы працэс над групай міран і духавенства на чале з мітрапалітам Мельхісэдэкам. На запыт Мінска Масква не дала «дабро» на смяротны прыгавор, і ўсе падсудныя атрымалі ад аднаго да трох гадоў умоўна.

Паралельна з канфіскацыяй царкоўных каштоўнасцей ішоў працэс па раскрыцці мошчаў (рэліквій) святых. У Полацку тады былі раскрыты мошчы святой прападобнай Еўфрасінні Полацкай, нябеснай апякункі Беларусі. Мошчы адправілі на атэістычную выставу ў Маскву, а затым – у краязнаўчы музей Віцебска. Адбылося глумленне і над другой святыняй беларусаў – мошчамі віленскіх мучанікаў Антонія, Іаана і Яўстафія, якія знаходзіліся на той час у Маскве. На замену «старым» святам прыходзілі новыя (гадавіны кастрычніцкай рэвалюцыі, 1 мая і інш.). Замест царкоўных імёнаў (часцей за ўсё грэчаскіх, лацінскіх, яўрэйскіх) сталі давацца новыя савецкія: Уладзілен, Вілена (у гонар Уладзіміра Леніна), Сталіна (у гонар Сталіна), Красарма (у гонар Чырвонай Арміі) і г. д.

Адным са сродкаў барацьбы з рэлігіяй была масавая атэістычная прапаганда, у якой, аднак, было шмат прымітыўнага, грубага і зневажаючага пачуцці веруючых. З 1925 г. дзейнічаў Саюз Ваяўнічых Бязбожнікаў (СВБ), які ўзначаліў саратнік У. І. Леніна Емяльян Яраслаўскі (Губельман). Карыстаючыся падтрымкай улады, СВБ разгарнуў шырокамаштабнае наступленне на рэлігію. Найбольш папулярнай формай работы СВБ у 1920-я гг. былі антырэлігійныя кампаніі, якія праводзіліся падчас вялікіх святаў, такіх як Каляды і Вялікдзень. Разам з ячэйкамі СВБ у гэтых мерапрыемствах павінны былі прымаць удзел клубы, школы, хаты-чытальні. У час такіх кампаній праводзіліся гутаркі, лекцыі, масавыя вечарыны, чыткі газет, расклейка насценгазет, лозунгаў, плакатаў і г. д.

З дапамогай дзяржавы і ўласнай актыўнасці СВБ павялічваў свае шэрагі. Калі ў 1926 г. на тэрыторыі БССР налічвалася 297 ячэек, 2307 ваяўнічых бязбожнікаў, то ў 1929 г. было 42 200 удзельнікаў, у 1931 г. – 219 750, у тым ліку 98 320 юных бязбожнікаў. Безумоўна, верагоднасць гэтай статыстыкі наўрад ці магла быць прызнана дакладнай, але факт, што ўплыў СВБ на насельніцтва, асабліва моладзь, быў значны.

Аднак у сярэдзіне 1930-х гг. СВБ чакаў сумны лёс. Кіраўніцтва партыі ўбачыла ў суполках СВБ абрысы падпольнай арганізацыі, якая здольна на выступленне супраць улады. Пачаліся рэпрэсіі, у першую чаргу супраць кіраўніцтва СВБ. Значна скарацілася і колькасць членаў СВБ. Па афіцыйных дадзеных, у 1937 г. іх налічвалася 350–400 тысяч чалавек па СССР і каля 35 тысяч па БССР. Асноўнай падставай для разгрому суполак СВБ былі абвінавачванні ў прыналежнасці да «трацкісцкай« змовы, у ажыццяўленні камерцыйных махінацый і г. д.

Але ў хуткім часе ўлада зразумела, што сваімі перагібамі спрыяе захаванню рэлігіі і рашуча змяніла палітыку ў адносінах да СВБ. У кастрычніку 1937 г. ЦК КП(б)Б прыняў рашэнне аб стварэнні рэспубліканскага бюро СВБ, што спрыяла ўзмацненню антырэлігійнай прапаганды і агітацыі ў Беларусі. У пачатку 1940 г. у БССР налічвалася 2857 ячэек, 90 913 членаў СВБ.

У канцы 1920-х гг. у канфесійнай палітыцы савецкай улады наступіў чарговы паварот. На змену адносна ліберальнаму курсу прыходзіць больш жорсткі. Антырэлігійная прапаганда, якая праводзілася ў сярэдзіне 1920-х гг., у цэлым сябе не апраўдала. З рэлігіяй і верай пакончыць не ўдалося. Масавы атэізм не ўкараніўся ў свядомасці насельніцтва. Да таго ж праводзімыя партыяй бальшавікоў і савецкай уладай меры не заўседы атрымлівалі падтрымку ў народа, а то і выклікалі недавер і супраціўленне. У сувязі з гэтым улады перайшлі да больш жорсткіх метадаў барацьбы з рэлігіяй.

У 1928 г. улады абвінавачвалі духавенства ў супраціўленні хлебанарыхтоўкам, а ў 1929 г. – калектывізацыі. Узмацніліся рэпрэсіі ў адносінах да духавенства, канфіскоўваліся званы, закрываліся храмы і г. д. Усё гэта адбывалася на фоне згортвання НЭПа, калектывізацыі, раскулачвання і г. д. Фарміраваўся ўстойлівы вобраз кулака, ксяндза, бацюшкі як ворагаў калектывізацыі і савецкай улады.

У пачатку 1930-х гг. савецкая дзяржава пачала новую кампанію па барацьбе з рэлігіяй. У сувязі з прыняццем другога пяцігадовага плана СВБ абвясціў «бязбожную» пяцігодку. У 1932 г. планавалася закрыццё навучальных устаноў па падрыхтоўцы духавенства, у 1933 г. – ліквідацыя манастыроў і забарона рэлігійнай літаратуры, у 1934 г. – высылка духавенства, у 1935 г. – пераабсталяванне храмаў пад савецкія ўстановы, у 1936–1937 гг. – замацаванне дасягнутых поспехаў і святкаванне канчатковай перамогі атэізму.

Прэса, плакаты, атэістычная літаратура тых гадоў дазваляюць уявіць атмасферу, у якой панавала сапраўдная атэістычная вакханалія. Газета «Рабочий» за 19 студзеня 1930 г., якая выйшла ў дзень свята Хрышчэння Гасподня, пісала, як у Мінску ў той самы дзень праходзіў антырэлігійны мітынг: «Касцёр палаў у крузе, яркія ленты полымя ўзвіваліся ў цемры. Гарэлі іконы. Група дэманстрантаў прынесла невялікую труну, паклала ў яе дзясятак ікон, назаўсёды выгнаных з рабочых кватэр, і падпаліла. Касцёр палаў пасярод плошчы Свабоды… Тысячы мінскіх працоўных прыйшлі ўвечары на гэтую плошчу, каб яшчэ раз даказаць сваю непрымірымасць да рэ-

лігіі, патрабаваць ад гарадскога Савета перадачы цэркваў пад культурныя ўстановы. Калоны дэманстрантаў занялі плошчу да адказа, а з усіх бакоў прадаўжаюць цячы рады працоўных. Едуць транспартнікі. У лозунгах, прымацаваных да аўтамабіляў, яны заяўляюць: "Мы не верым у бога. Чыгуначную царкву – пад клуб"...Там, дзе доўгія гады ілжывая папоўшчына пляла свае сеткі, мы заставім загаварыць радыё, прыкусім языкі званам і цяжкую медзь аддадзім на патрэбы індустрыі».

У жніўні 1934 г. была прынята пастанова СНК БССР аб выкарыстанні малітоўных дамоў пад зернясховішчы. Але веруючыя ў большасці выпадкаў не былі абыякавымі да знішчэння хрысціянскіх святынь. Мелі месца выпадкі супраціўлення дзеянням улад. Як правіла, на месца здарэння выклікаліся міліцыя, супрацоўнікі АДПУ. Бунтаўшчыкоў арыштоўвалі, аддавалі пад суд і адпраўлялі ў лагеры ГУЛАГа. У 1936 г. пад клубы было занята 855 малітоўных дамоў, цэркваў і касцёлаў.

Такім чынам, усё было зроблена для таго, каб вырваць веру з коранем, і гэтага амаль удалося дасягнуць праз арганізацыю маштабнага наступлення на рэлігію і Царкву, якое ўключала ў сябе цэлы арсенал сродкаў эканамічнага, палітычнага і ідэалагічнага характару.

## 5.3. Спробы расколу праваслаўнай Царквы

На думку многіх даследчыкаў праваслаўя, «рэзкае адмоўнае стаўленне ідэолагаў новай улады да Рускай праваслаўнай Царквы, яе іерархіі і духавенства, манаства як формы рэлігійнага жыцця, якое праявілася ў скрытых і яўных ганеннях, разам з тым жаданне гэтай улады экспрапрыіраваць царкоўную маёмасць, не магло не прывесці савецкую ўладу да жорсткага канфлікту з гэтымі арганізацыямі і веруючымі. У ходзе гэтага канфлікту загінулі тысячы людзей, якія стаялі далёка ад палітычнай барацьбы, былі разбураны велізарныя матэрыяльныя багацці нацыі ў выглядзе храмаў, манастырскіх і іншых будынкаў, знішчаны мастацкія творы, якія ствараліся вякамі, закрыты знакамітыя навучальныя ўстановы, у якіх атрымлівалі адукацыю не толькі грамадзяне Расіі, але і замежныя».

Пасля кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. у Рускай праваслаўнай Царкве адбыўся раскол па пытаннях тактыкі і арганізацыі царкоўнага ўладкавання. На Усерасійскім Памесным саборы 1917–1918 гг.

было адноўлена патрыяршаства, ліквідаванае яшчэ ў 1721 г. Пятром I і замененае Свяцейшым Сінодам. Сабор абраў главой РПЦ мітрапаліта Ціхана (Бялавіна) (1865–1925 гг.), стварыў орган кіравання РПЦ – Свяшчэнны Сінод. Але частка духавенства асудзіла Ціхана і заявіла аб сваіх лаяльных адносінах да савецкай улады, выступіла з прапановай «абнаўлення» праваслаўя. Абнаўленцы прапанавалі аб'яднацца духавенству і міранам пад лозунгам рэформ, выступалі за саборнае кіраванне Царквой, дапушчэнне жанатага епіскапа, увядзенне ў богаслужэнне рускай мовы замест царкоўнаславянскай, выкарыстанне новага стылю календара.

Абнаўленцы звярнуліся з лістом у епархіі, у якім прапаноўвалася парваць з «ціханаўшчынай» і перайсці ў «Жывую царкву». Устаноўчы сход гэтай арганізацыі адбыўся 29 мая 1922 г. у Маскве. Раскол у РПЦ падтрымлівалі органы Дзяржаўнага палітычнага ўпраўлення (ДПУ).

23 ліпеня 1922 г. у Мінскім Свята-Духавым кафедральным саборы адбыўся з'езд духавенства Мінскай епархіі. Ён абвясціў аўтаномію Беларускай праваслаўнай Царквы і ўзвёў Мельхісэдэка ў сан мітрапаліта з тытулам «Мінскі і Беларускі». Кіраўніцтва ажыццяўлялася Царкоўным упраўленнем Беларусі. Тэрыторыя была падзелена на акругі, якія мелі свае акружныя ўпраўленні на чале з епіскапамі.

17–19 мая 1924 г. у Магілёве на I Беларускім абласным саборы была створана Беларуская аўтаномная праваслаўная Царква. Адзінай царкоўнай уладай на ўсёй тэрыторыі БССР абвяшчаўся заснаваны Беларускі праваслаўны Свяшчэнны Сінод на чале з епіскапам Полацкім і Віцебскім Серафімам (Мешчараковым). Ён быў прадстаўніком Беларускай праваслаўнай Царквы ў Свяшчэнным Сінодзе Рускай праваслаўнай Царквы і ажыццяўляў сувязь з органамі ўлады. Партыйнае і дзяржаўнае кіраўніцтва БССР выкарыстоўвала раскол, імкнучыся аслабіць пазіцыі праваслаўнай Царквы ў цэлым. Сродкам масавай інфармацыі было дадзена ўказанне паказваць раскол «як праяўленне разлажэння царквы», што павінна было падарваць яе аўтарытэт у вачах веруючых, грамадскасці і аблегчыць правядзенне антырэлігійнай кампаніі.

Правядзенне абнаўленчых ідэй адбывалася ў барацьбе з «ціханаўцамі». Абнаўленства ўспрымалася вернікамі як нешта «ганебнае, богапраціўнае», а абнаўленцаў называлі бязбожнікамі, «чырвонымі папамі», камуністамі. Паміж «ціханаўцамі» і абнаўленцамі вялася барацьба за прыходы. У выніку ў 1927г. у БССР існавала 494 царквы сінадальнай арыентацыі і 635 – ціханаўскай. 9 жніўня 1927 г. Бела-

рускі епархіяльны з'езд аб'явіў аўтакефалію БПЦ. Сталі з'яўляцца аўтакефальныя цэрквы. Але абнаўленцы адмоўна аднесліся да такога рашэння. Яны лічылі, што аўтакефалія ні кананічна, ні гістарычна не апраўдана.

Унутрыцаркоўныя праблемы аказалі ўплыў на ўзровень рэлігійнасці насельніцтва. Зменшылася колькасць богаслужэнняў, а таксама колькасць веруючых, якія наведвалі царкву. У асноўным гэта былі жанчыны і пажылыя мужчыны. Праваслаўнае духавенства страчвала аўтарытэт. Нярэдкімі былі выпадкі адрачэння ад сана. Многія былыя свяшчэннікі затым выкарыстоўваліся органамі ўлады ў сферы антырэлігійнай прапаганды.

Разам з тым у асяроддзі беларускіх абнаўленцаў пачаў нарастаць крызіс. Пагоршылася матэрыяльнае становішча Сінода, узмацніліся канфлікты паміж іерархамі, духавенствам і веруючымі. Гэтаму спрыяў факт наступлення на рэлігію грамадзянскіх улад, масавае закрыццё цэркваў.

20 снежня 1934 г. выйшла пастанова Свяшчэннага Сінода праваслаўных цэркваў у СССР, згодна з якой Украінскі і Беларускі сіноды ставіліся яму ў падпарадкаванне. Аўтаномія БПЦ была ліквідавана.

## 5.4. Становішча іншых канфесій

У складаных умовах апынуліся і іншыя канфесіі – каталіцкая, пратэстанцкая, іўдзейская.

У сярэдзіне 1920-х гг. на тэрыторыі БССР дзейнічалі дзве каталіцкія дыяцэзіі – Мінская і Магілёўская. Яны падпарадкоўваліся Варшаўскаму архіепіскапу. Са жніўня 1926 г. і да сайго арышту 17 верасня 1927 г. адміністратарам гэтых дыяцэзій быў епіскап Баляслаў Слоскан (1893–1981). Каталіцкі Касцёл бальшавікам не ўдалося раскалоць, таму духавенства не страціла ідэйнага адзінства, што спрыяла захаванню больш высокага ўзроўню рэлігійнасці католікаў у параўнанні з праваслаўнымі. У касцёлах рэгулярна праводзіліся богаслужэнні, адпраўляліся ўсе касцёльныя абрады. Адносіны каталіцкага насельніцтва да сваёй веры і духавенства значна адрозніваліся ад адносін праваслаўных. Веруючыя негатыўна ўспрымалі крытыку духавенства, рэлігію, Бога, адмоўна ставіліся да антырэлігійнай прапаганды. Былі выпадкі, калі веруючыя патрабавалі ўвядзення рэлігійных прадметаў у школах. Даходзіла да таго, што некаторыя веруючыя, якія пайшлі працаваць у дзяржаўныя, партыйныя, камсамольскія ўстановы, не пакідалі сваіх рэлігійных перакананняў.

Істотнай праблемай заставалася заблытанасць этнічнага, рэлігійнага і моўнага фактараў, якія ўзмоцнілі падзеі Першай сусветнай вайны, рэвалюцый, савецка-польскай вайны 1919–1920 гг. Каталіцкая рэлігія ў большай ступені, чым польская мова, адыгрывала ролю этнічнага самаідэнтыфікатара як пры вызначэнні насельніцтвам сваёй нацыянальнасці, так і пры афіцыйным уліку і этнічнай ідэнтыфікацыі з боку акружаючага няпольскага насельніцтва. Нярэдка беларусы-католікі адносілі сябе да палякаў па прычыне таго, што хадзілі ў касцёл і належалі да «польскай» (каталіцкай) веры, хаця слаба ведалі польскую мову.

У 1920-я – пачатку 1930-х гг. «польскі фактар» у нацыянальнай палітыцы (беларусізацыі), якая праводзілася ў БССР, меў вялікае значэнне ў «спаборніцтве» з «буржуазна-памешчыцкай Польшчай». Развіццё польскай нацыянальнай школы, прадстаўленне мясцоваму польскаму насельніцтву нацыянальна-культурнай аўтаноміі ў выглядзе нацыянальных сельсаветаў павінна было служыць доказам перавагі сацыялістычнай сістэмы. Аднак у 1930-я гг. па меры фарміравання абагуленага вобраза мясцовых палякаў як антысавецкіх элементаў, польска-фашысцкіх шпіёнаў улада ўзмацніла наступленне на Касцёл і католікаў без уліку іх этнічнай прыналежнасці – палякі або беларусы.

З прыходам савецкай улады назіралася актывізацыя пратэстанцкіх абшчын. Толькі за 1923–1925 гг. іх колькасць павялічылася на 40 % і ў 1929 г. дасягнула 81. У рэспубліцы дзейнічала 41 група евангельскіх хрысціян, 27 груп баптыстаў, 6 груп адвентыстаў. Агульная колькасць пратэстантаў складала 4754 чалавекі. Па сацыяльнаму складу гэтыя групы з'яўляліся серадняцкімі, у іх пераважалі жанчыны сярэдніх гадоў. Па нацыянальнасці ў асноўным былі беларусы, палякі і латышы.

Савецкая ўлада сфарміравала асобыя адносіны да пратэстантызму. Кіраўніцтва савецкай краіны, у прыватнасці У. І. Ленін, бачылі ў сектантах, як іх тады называлі, свайго саюзніка ў барацьбе з традыцыйнымі веравызнаннямі. У пратэстанцкіх дактрынах, як і ў бальшавіцкіх праграмах, прапагандавалася ідэя сацыяльнай і эканамічнай роўнасці. Пратэстанты ў большай ступені, чым іншыя канфесіі, маглі разлічваць на лаяльныя адносіны з боку органаў улады. Рэжым быў зацікаўлены і ў выкарыстанні эканамічнага патэнцыялу евангельскіх цэркваў, іх замежных сувязяў.

Разам з тым лаяльныя адносіны да сектантаў ніколі не былі адзінай і нязменнай лініяй у палітыцы бальшавікоў. Значная частка чле-

наў партыі, Антырэлігійная камісія пры ЦК РКП(б), якая займалася ажыццяўленнем дэкрэта аб аддзяленні царквы ад дзяржавы, разглядалі дзейнасць пратэстантаў як спробы прыстасавання рэлігіі да новых умоў, чарговую форму антысавецкага руху кулацкіх элементаў у вёсцы. Таму барацьба з сектантамі, як і іншымі канфесіямі, была толькі справай часу.

У хуткім часе дамінуючай лініяй партыі стала палітыка, накіраваная на разлажэнне канфесій знутры і правакацыю канфліктаў паміж рознымі рэлігійнымі плынямі. 7 красавіка 1927 г. ЦК УКП(б) прыняў пастанову «Аб сектанцтве», якая істотна абмяжоўвала поле дзейнасці цэркваў і акцэнтавала ўвагу партыйных і дзяржаўных органаў на неапратэстанцкіх канфесіях як адных з галоўных праціўнікаў савецкага ладу. Па меры правядзення калектывізацыі ствараўся вобраз ворага народа, ідэолага кулацтва – сектанта. У канцы 1920-х гг. большасць пратэстанцкіх абшчын у БССР перайшлі на нелегальнае становішча. У 1937 г. былі закрыты ўсе малітоўныя евангельскіх хрысціян і баптыстаў, а большая частка прэсвітараў рэпрэсавана.

У Беларусі пражывала значная колькасць прадстаўнікоў іўдзейскай канфесіі. Паводле статыстычных дадзеных, у 1926 г. налічвалася 405 435 яўрэяў, дзейнічалі 704 сінагогі, у якіх служыў 721 равін. Практычна ва ўсіх гарадах БССР, у якіх пражывала яўрэйскае насельніцтва, існавалі рэлігійныя абшчыны. Першапачаткова яны ствараліся як саюзы прыхаджан той або іншай сінагогі. Росту рэлігійнасці яўрэйскага насельніцтва спрыяла дабрачынная дзейнасць іўдзейскіх абшчын. Аднак і ў асяроддзі іўдзейскай канфесіі не было адзінства. Яшчэ з XVIII ст. з Валыні на беларускія землі пачала пранікаць новая містычная плынь іўдаізму – хасідызм. У адрозненне ад равінаў, хасідскія лідары лічыліся пасрэднікамі паміж веруючымі і Богам, прарокамі і цудатворцамі. Паміж хасідамі і прадстаўнікамі артадаксальнага равінскага іўдаізму разгарнулася барацьба ў форме памфлетаў, адлучэння хасідаў ад сінагогі (херэм), узаемных даносаў уладам.

Барацьба з іўдаізмам пачалася з катэгарычнай забароны на арганізаванае выхаванне дзяцей. Першымі крокамі была ліквідацыя пачатковых школ пры сінагогах (хедэраў) і рэлігійных установах (іешываў). Да ліпеня 1920 г. бальшавікам удалося закрыць яўрэйскія абшчынныя структуры, якія базіраваліся на цэнтральнай ролі сінагогі не толькі ў рэлігійным, але і ў свецкім жыцці яўрэйскага насельніцтва. Бальшавікі падтрымлівалі раскол унутры іўдзейскай

канфесіі. З 1927 г. скрытая варожасць паміж гэтымі двума напрамкамі перарасла ў вострую барацьбу. Пад уплывам рэвалюцыйных пераўтварэнняў, антырэлігійнай прапаганды, развіцця свецкай адукацыі пазіцыі іўдаізму сярод яўрэйскага насельніцтва моцна пахіснуліся.

У такіх умовах важнейшай праблемай, якая стаяла перад кожнай канфесіяй, была барацьба за выжыванне, захаванне сваёй веры і вернікаў. Жыццё патрабавала адхіліць супярэчнасці, якія існавалі раней у адносінах паміж канфесіямі, аб'яднаць намаганні, каб супрацьстаяць бязбожнай бальшавіцкай палітыцы. Гэтага, аднак, не ўдалося дасягнуць.

## 5.5. Рэпрэсіі супраць духавенства і веруючых

З усіх ганенняў, якія выпалі на долю Царквы ў гады савецкай улады, самымі бязлітаснымі і жорсткімі былі тэрор і масавыя рэпрэсіі супраць духавенства і веруючых. Гэта была такая катэгорыя людзей, якія за веру і рэлігійныя перакананні, відаць, больш за ўсіх адчулі самавольства і насілле ўлад. Ужо ў першыя гады існавання савецкай улады тэрор бальшавікоў супраць духавенства прыняў небывалыя памеры. Да пачатку 1922 г. у савецкай краіне, згодна з судовым прысудам, былі расстраляны 1691 свяшчэннаслужыцель, 1962 манахі, 3447 манахінь і паслушнікаў, а без суда – каля 15 тысяч служыцеляў культа.

Немалаважную ролю ў разгортванні рэпрэсій адыграла прынятая СНК РФ 5 верасня 1918 г. «Пастанова аб чырвоным тэрорЫ». У ёй адзначалася, што ў «дадзенай сітуацыі забеспячэнне тылу шляхам тэрору з'яўляецца прамой неабходнасцю; …патрэбна абараніць Савецкую Рэспубліку ад класавых ворагаў шляхам ізаляцыі іх у канцэнтрацыйных лагерах, што падлягаюць расстрэлу ўсе асобы, якія маюць дачыненне да белагвардзейскіх арганізацый, змоваў і мецяжоў, што неабходна апублікаваць імёны ўсіх расстраляных, а таксама прымяненне да іх гэтай меры». Тых, хто заставаўся ў жывых, чакалі лагеры прымусовых работ, якія пачалі стварацца ў 1919 г.

Бальшавікі разумелі, што выкараніць рэлігію аднымі толькі заканадаўчымі, ідэалагічнымі і адміністрацыйнымі мерамі немагчыма. Таму практычна з першых дзён савецкая ўлада стала прымяняць рэпрэсіўныя меры супраць духавенства і веруючых, апраўдваючы

гэтай барацьбой з контррэвалюцыяй і варожымі элементамі. Рэпрэсіі супраць духавенства на тэрыторыі Беларусі, у адрозненне ад РСФСР, спачатку не былі масавымі. Гэты працэс пачаў набіраць сілу толькі ў канцы 1920-х гг.

Важная роля ў барацьбе з рэлігіяй адводзілася антырэлігійнай прапагандзе. На старонках рэспубліканскіх газет і часопісаў сталі з'яўляцца шматлікія публікацыі, якія «выкрывалі антысавецкую дзейнасць» духавенства, яго сувязі «з контррэвалюцыйнымі арганізацыямі і групоўкамі». Вобраз «ворага», шпіёнаманія, якія фарміраваліся ў грамадскай свядомасці, служылі абгрунтаваннем рэпрэсій супраць ні ў чым не павінных людзей. Органы АДПУ заводзілі мноства спраў, «раскрывалі» неіснуючыя контррэвалюцыйныя арганізацыі, ажыццяўлялі над імі расправы, у асноўным пазасудовыя, з дапамогай асобых нарад, калегій, «троек» і «двоек».

Абвінавачванням і рэпрэсіям у 1919 г. падвяргаўся магілёўскі мітрапаліт Эдвард дэ Роп. Аднак па хадатніцтву папы рымскага ён быў вызвалены. У 1920 г. быў арыштаваны савецкімі ўладамі епіскап Мінскай дыяцэзіі Зыгмунт Лазінскі. Адзінаццаць месяцаў ён правёў у маскоўскай «Бутырцы», але па Рыжскай дамове быў вызвалены і прыбыў у Польшчу.

У 1922–1923 гг. у Маскве адбыўся судовы працэс над магілёўскім архіепіскапам Янам Цепляком і 14 актыўнымі каталіцкімі духоўнымі асобамі з Расіі. Іх абвінавацілі ў супраціўленні дэкрэтам і распараджэнням савецкай улады, у арганізацыі барацьбы з савецкай уладай. Я. Цепляка і пробашча касцёла святой Кацярыны ў Петраградзе К. Буткевіча прыгаварылі да расстрэлу, астатніх – да пазбаўлення волі ад трох да дзесяці гадоў. Пазней смяротны прысуд Я. Цепляку быў заменены дзесяццю гадамі пазбаўлення волі. У 1929 г. такі самы прысуд быў вынесены ксяндзу Я. Мацеўскаму.

У 1922 г. у Гомелі прайшла хваля арыштаў у сувязі з адабраннем царкоўных каштоўнасцей. 9–10 мая адбыўся судовы працэс, на якім у якасці абвінавачваемых прысутнічала 7 чалавек, пераважна члены касцёльнага камітэта. Чацвёра з іх былі прыгавораны да пазбаўлення волі на тэрмін ад аднаго да трох гадоў, а трое – на адзін год. Абвінавачванням і рэпрэсіям падвяргалася не толькі каталіцкае духавенства, але і веруючыя. Як правіла, гэта былі заможныя сяляне, члены касцёльных камітэтаў, «былая польская шляхта». У асноўным іх абвінавачвалі ў «контррэвалюцыйных паўстаннях 1918 года», удзеле ў савецка-польскай вайне на баку палякаў,

у «апрацоўцы польскага насельніцтва ў антысавецкім духу для паўстанцкай дзейнасці ў выпадку вайны», у супраціўленні калектывізацыі, захаванні касцёльнай абраднасці і г. д.

У 1929–1930 гг. АДПУ была сфабрыкавана справа аб існаванні ў БССР царкоўна-паўстанцкай арганізацыі «Іезуіт», якая быццам мела філіялы ў Магілёве, Віцебску і Слуцку і налічвала 79 чалавек (5 епіскапаў, 48 папоў і дыяканаў, 8 кулакоў, 3 былыя чыноўнікі, 12 іншых царкоўнікаў). І хаця ніхто з іх не прызнаў сябе вінаватым, усе былі асуджаны.

У жніўні-лістападзе 1933 г. АДПУ па БССР Гомельскай вобласці былі арыштаваны 82 чалавекі – ксяндзы, касцёльны актыў – за прыналежнасць да антысавецкай, шпіёнска-паўстанцкай Польскай Арганізацыі Вайсковай (ПАВ). Як паказваюць дакументы следства, арганізацыя нібыта пачала фарміравацца ў 1921 г. па прапанове польскага консула і па заданні разведорганаў былой буржуазнай Польшчы, якой затым кіравалі служыцелі рэлігійнага культу (ксяндзы). Арганізацыя ставіла канчатковай мэтай звяржэнне існуючага ладу ў Беларусі і далучэнне яе да Польшчы. Кіраўніцтва ПАВ прыпісалі ксяндзам Буйноўскаму, Андрэкусу, Мусцейкусу і інш. Паводле запісаў у матэрыялах следства, для дасягнення сваёй мэты «польваенарганізацыя праводзіла прапаганду польска-патрыятычных ідэй; рыхтавала кадры для ўзброеных выступленняў і дыверсійных актаў у тыле рускіх войск у выпадку вайны; правядзення контррэвалюцыйнай падрыўной работы ў калгасах» і г. д. ПАВ, як напісана ў пратаколах следства, імкнулася пашыраць сваю дзейнасць сярод розных колаў насельніцтва – моладзі, мяшчан, кулакоў, гандляроў, былых вайскоўцаў і інш. Многія з тых, хто падвяргаўся абвінавачванням, увогуле не прызнавалі сябе вінаватымі, але пастановай «тройкі» пры паўнамоцным прадстаўніцтве АДПУ па БССР ад 13 снежня 1933 г. усе атрымалі тэрміны зняволення ў працоўна-папраўленчых лагерах ад 5 да 10 гадоў. Пазней некаторым тэрміны былі зменшаны, а некаторых увогуле вызвалілі датэрмінова.

У «Заключэнні» (па архіўна-следчай справе) УКДБ пры СМ БССР па Гомельскай вобласці ад 14 жніўня 1957 г. зроблена выснова, што пастаўленыя ў віну асуджаным факты аб шпіянажы і контррэвалюцыйнай дзейнасці не атрымалі пацвярджэння, а з матэрыялаў справы выцякае, што частка асоб (40) з'яўлялася антысавецкі настроенай і ў сілу гэтага «праводзіла антысавецкую агітацыю». У адносінах 42 асуджаных рашэнне «тройкі» было адменена.

На працягу 1930-х гг. касцёлы лічыліся расаднікамі шпіянажу, а каталіцкае духавенства – патэнцыяльным ворагам савецкай улады і бальшавікоў. Не выпадкова ў 1937 г. бюро ЦК КПБ (б) двойчы разглядала пытанні «Аб польскіх касцёлах». Бюро давала ўстаноўкі нізавым партыйным арганізацыям як мага хутчэй закрываць касцёлы, арыштоўваць духавенства і веруючых.

Новая хваля рэпрэсій супраць духавенства пачалася ў 1937–1938 гг. НКУС адну за адной фабрыкаваў «гучныя справы». У 1937 г. адбыўся суд па «справе» Беларускай аўтакефальнай царквы, створанай праваслаўнымі святарамі ў 1922 г. Было расстраляна 11 чалавек. У 1938 г. – працэс над «шпіёнска-паўстанцкай арганізацыяй» на чале з мітрапалітам П. Бліновым. Усяго было расстраляна або загінула ў лагерах каля 2000 праваслаўных святароў. У дачыненні да ксяндзоў з ЦК КП(б)Б у Маскву было накіравана данясенне, дзе гаварылася, што «абсалютная большасць іх за апошні час арыштавана, бо яны выкрыты ў вядзенні шпіёнскай работы».

У сакрэтнай «Дакладной запісцы ў ЦК ВКП(б) аб антысавецкай дзейнасці царкоўнікаў і сектантаў у БССР» (ліпень 1936 г.), падпісанай наркомам унутранных спраў Беларусі Наседкіным, гаварылася, што органы НКУС «нанеслі значны аператыўны ўдар па арганізаванаму антысавецкаму падполлю царкоўнікаў і сектантаў». Усіх іх абвінавачвалі ў сувязях і супрацоўніцтве з замежнымі разведкамі – японскай, польскай, германскай, англійскай або амерыканскай, у стварэнні антысавецкіх фарміраванняў і контррэвалюцыйнай дзейнасці. Усяго ж было арыштавана і асуджана органамі НКУС «3247 царкоўнікаў і сектантаў, з іх больш 400 папоў і манахаў, 1 мітрапаліт і 5 епіскапаў».

Канчатковая расправа з праваслаўным духавенствам на Беларусі адбылася ў Мінску ў ноч на 29 ліпеня 1937 г. Тады былі расстраляны апошнія з ацалелага духавенства на чале з епіскапам Бабруйскім Філарэтам (Раменскім). На пачатку 1940-х гг. ва Усходняй Беларусі былі гвалтоўна зачынены ўсе цэрквы. Працягвалі нелегальна дзейнічаць толькі дзве абшчыны: у Магілёве і Гомелі. Галоўнай стратай Царквы сталі святары: каля 2 тысяч духоўных асоб праваслаўнага веравызнання былі расстраляны або загінулі ў сталінскіх лагерах. Рэпрэсіям падвяргаліся таксама і шматлікія веруючыя, члены царкоўных камітэтаў. Іх абвінавачвалі ў правядзенні контррэвалюцыйнай агітацыі, сувязях з нацыяналістычнымі элементамі і інш.

Разгромам «контррэвалюцыйнага» духавенства ў БССР быў нанесены магутны ўдар па рэлігіі. Па «патрабаванні шырокіх працоўных мас», якія былі ініцыіраваны савецкімі, партыйнымі або камсамольскімі органамі, адбывалася закрыццё храмаў, касцёлаў, малітоўных дамоў, сінагог, іншых сакральных святынь. Многія разбураліся дашчэнту, іншыя прыстасоўваліся пад гаспадарчыя і культурна-асветныя ўстановы. Практычна да канца 1930-х гг. з рэлігіяй у БССР было пакончана.

## Тэма 6

# РЭЛІГІЙНАЕ ЖЫЦЦЁ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1920–1930-я гг.)

*6.1. Канфесійная палітыка польскага ўрада.*

*6.2. Дзейнасць каталіцкага Касцёла.*

*6.3. Праваслаўная Царква і яе аўтакефалія.*

*6.4. Неапратэстантызм, каталіцкі Касцёл візантыйска-славянскага абраду і іншыя вызнанні.*

## 6.1. Канфесійная палітыка польскага ўрада

Рыжскі мірны дагавор падпісаны 18 сакавіка 1921 г. паміж Польшчай і Расіяй, уключаў артыкулы, якія вызначалі становішча рэлігіі і царквы ў абедзвюх краінах. У прыватнасці, адзначалася, што «царква і рэлігійныя таварыствы, да якіх належаць асобы польскай нацыянальнасці ў Расіі, Украіне і Беларусі, маюць права ў межах унутранага заканадаўства самастойна наладжваць сваё ўнутранае рэлігійнае жыццё. Вышэй адзначаныя цэрквы і рэлігійныя таварыствы маюць права ў межах унутранага заканадаўства карыстацца і набываць рухомую і нерухомую маёмасць, неабходную для выканання рэлігійных абрадаў, а таксама ўтрымання духоўных і царкоўных устаноў. На тых жа асновах яны маюць права карыстацца храмамі і ўстановамі, неабходнымі для выканання рэлігійных абрадаў. Гэтымі ж правамі карыстаюцца асобы рускай, украінскай і беларускай нацыянальнасцей у Польшчы».

Заходняя Беларусь характарызавалася высокім узроўнем рэлігійнасці насельніцтва. Па дадзеных польскай статыстыкі, у Беластоцкім ваяводстве ў 1930-я гг. пражывала 1674 тысяч чалавек, з іх каталікаў – 58,6 %, праваслаўных – 16,1 %, іўдзеяў – 14,7 %, іншых – 1,6 %; у Віленскім – 1275 тысяч чалавек, з іх каталікаў – 61,2 %, праваслаўных – 26,8 %, іўдзеяў – 9,4 %, іншых – 2,6 %; у Навагрудскім – 1081 тысяча чалавек, з іх каталікаў – 39,5 %, праваслаўных – 51,2 %, іўдзеяў – 9 %, іншых – 0,3 %; у Палескім – 1164 тысячы чалавек, з іх каталікаў – 7,8 %, праваслаўных – 79,2 %, іўдзеяў – 12,6 %, іншых – 0,4 %.

У першай Канстытуцыі II Рэчы Паспалітай, прынятай 17 сакавіка 1921 г., у артыкулах 110–116, 120 вызначаліся правы і магчымасці развіцця нацыянальных меншасцей, а таксама гарантавалася «поўная ахова і свабоднае адпраўленне рэлігійных культаў, роўнасць у грамадзянскіх і палітычных правах» усім жыхарам Польшчы незалежна ад рэлігіі, нацыянальнасці, колеру скуры, мовы. Аднак артыкул 114 прызнаваў першынство каталіцкай веры, адзначаючы, што сярод усіх роўных першай з’яўляецца каталіцкая вера, і што важнейшыя пасады могуць займаць толькі асобы каталіцкага веравызнан-

ня. У дзяржаўных установах, на пошце, на чыгунцы маглі працаваць толькі католікі. Пры працаўладкаванні яны звычайна мелі перавагу перад прадстаўнікамі іншых канфесій.

Канстытуцыя 1935 г. паўтарала асноўныя палажэнні ў пытаннях веравызнання Канстытуцыі 1921 г. і тым самым замацоўвала нефармальнае дамінуючае становішча каталіцкага Касцёла і ў Заходняй Беларусі. Правячыя колы Польшчы адводзілі Касцёлу не апошнюю ролю ў паланізацыі «крэсаў усходніх». Аб гэтым недвухсэнсоўна выказаўся беластоцкі ваявода Генрых Асташэўскі ў дакладной запісцы ў Міністэрства ўнутраных спраў Польшчы «Аб узмацненні польскага пануючага ўплыву» (1938 г.): «...усялякае пачынанне ў накірунку ўмацавання польскага пануючага ўплыву ў ваяводстве павінна ісці ў накірунку падпарадкавання Касцёла польскай дзяржаўнасці».

Прававы статус праваслаўнай Царквы і яе вернікаў у Польскай дзяржаве вызначаў трактат аб нацыянальных і рэлігійных меншасцях, так званая малая версальская дамова, якая была падпісана 19 чэрвеня 1919 г. Яна гарантавала ўсім грамадзянам Польшчы роўнасць перад законам і магчымасць карыстацца грамадзянскімі і палітычнымі правамі. Гарантам выканання дамовы выступала Ліга Нацый. Аднак найважнейшай і неадкладнай задачай канфесійнай палітыкі польскага ўрада было адмежаванне праваслаўнай Царквы ад уплыву Маскоўскай патрыярхіі. У гэтым дзяржава знайшла прыхільнікаў у асобе некаторых праваслаўных епіскапаў. 14 чэрвеня 1922 г. на саборы епіскапаў у Варшаве было прынята рашэнне аб аўтакефаліі праваслаўнай Царквы ў Польшчы. Супраць гэтага выступілі кіраўнікі трох заходнебеларускіх епархій – Віленскай, Гродзенскай і Пінскай. Іх падтрымалі свяшчэннікі, якія прыехалі з Расіі, клірыкі-беларусы. Аднак, нягледзячы на супраціўленне, 17 верасня 1925 г. Сінод епіскапаў урачыста абвясціў праваслаўную Царкву ў Польшчы аўтакефальнай.

Тым не менш праваслаўная Царква ўвесь перыяд складала для польскага ўрада пэўную праблему. У канцы 1935 г. на пасяджэнні Савета Міністраў быў створаны Камітэт па нацыянальных справах. У яго склад, апрача прэм’ера, увайшлі міністры ўнутраных спраў, ваенны, веравызнання і сельскай гаспадаркі. Камітэт займаўся ўрэгуляваннем юрыдычнага статусу праваслаўнай Царквы. На пасяджэнні ў снежні 1935 г. былі прыняты «Тэзісы», у якіх утрымлівалася праграма дзеянняў урада ў адносінах да праваслаўнай Царквы. Яна павінна была стаць інструментам для ўвядзення на ўсходніх землях польскай культуры.

Агульныя дырэктывы рэлігійнай палітыкі польскай дзяржавы былі выкладзены міністрам веравызнанняў В. Свянціцкім у лісце ўсім ваяводам у снежні 1938 г. «Рэлігійная палітыка са спецыяльным разгледжаннем праваслаўнай праблемы». Сярод важнейшых былі вызначаны праблемы дэрусіфікацыі, барацьба з беларускім і ўкраінскім рухам, выключэнне рускай мовы з выкладання рэлігіі ў школах, пропаведзяў у цэрквах. Былі дадзены ўказанні адносна дзейнасці каталіцкага Касцёла візантыйска-славянскага абраду – захоўваць ранейшыя адмоўныя адносіны.

Што датычыць розных пратэстанцкіх арганізацый, а таксама іўдзейскіх і мусульманскіх, то ўрадавая палітыка, з аднаго боку, не стрымлівала іх дзейнасці, а з другога – не садзейнічала ўмацаванню іх пазіцый.

## 6.2. Дзейнасць каталіцкага Касцёла

Дзякуючы падтрымцы дзяржавы каталіцкі Касцёл хутка ўмацаваў свае пазіцыі ў грамадстве. Адбывалася ўпарадкаванне адміністрацыйна-касцёльных структур, павялічвалася колькасць касцёлаў, вялася падрыхтоўка кадраў духавенства. Касцёл ахопліваў сваім уплывам публічнае жыццё, адукацыю, культуру і інш. Тэрыторыя Заходняй Беларусі ўваходзіла ў склад Віленскай архідыяцэзіі, Пінскай і Ломжынскай дыяцэзій. У Заходняй Беларусі налічвалася 329 парафіяльных і 86 філіяльных касцёлаў. Іх колькасць павялічвалася як за кошт будаўніцтва новых, так і рэвіндыкацыі – адабрання ў судовым парадку ад праваслаўных храмаў, якія ў перыяд Расійскай імперыі з'яўляліся касцёламі і перададзены праваслаўнай Царкве па рашэнні царскіх улад.

У 1925 г. польскі ўрад падпісаў канкардат з Апостальскай Сталіцай. Адным з яго вынікаў стала фарміраванне воінскага душпастырства. Былі створаны адпаведныя структуры. Вайсковыя капеланы праводзілі рэлігійна-выхаваўчую работу сярод салдат, афіцэраў і іх сем'яў. Апрача таго, дзяржава аказвала значную матэрыяльную падтрымку каталіцкаму Касцёлу і духавенству, выдзяляла сродкі на ўтрыманне семінарый, пакрывала расходы касцёльнай адміністрацыі.

Многанацыянальны састаў веруючых у мітраполіі быў адной з асноўных праблем, якая стаяла не толькі перад каталіцкім Касцёлам, але і перад польскімі ўладамі. І калі паміж палякамі і літоўцамі з канца XIX ст. не існавала канфліктаў на глебе мовы пропаведзяў,

то ў міжваенны перыяд узніклі рознагалоссі паміж палякамі і беларусамі. Улады расцэньвалі законныя патрабаванні літоўцаў і беларусаў як пагрозу польскай бяспекі.

З 1926 г. мітрапалітам Віленскай архідыяцэзіі стаў архіепіскап Рамуальд Ялбжыкоўскі, вядомы сваім прапольскім настроем. Яго дзейнасць была накіравана на тое, каб не дапусціць уцягнення каталіцкага Касцёла ў палітычную барацьбу. У сувязі з гэтым ён забараніў ужываць у набажэнствах мясцовую мову – літоўскую або беларускую – і абавязаў карыстацца толькі польскай і лацінскай. Ён рашуча спыняў памкненні ўсіх арганізацый нацыянальных меншасцей і іх прыхільнікаў, якія дамагаліся ўступак у справе актывізацыі нацыянальных рухаў у межах каталіцкага Касцёла. У гэтым ён карыстаўся падтрымкай дзяржаўных улад. Актыўная дзейнасць ксяндзоў-беларусаў станавілася падставай для ўзнікнення канфліктаў на нацыянальна-рэлігійнай глебе. Найбольшы размах атрымаў канфлікт у парафіі Жодзішкі Свянцянскага павета, дзе пробашчам быў ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі. Ён праводзіў богаслужэнні на беларускай мове, чым выклікаў незадавальненне і санкцыі з боку Віленскай мітрапалітарнай курыі.

Рэлігійнае жыццё не абмяжоўвалася сценамі храмаў. У навучальных установах, за выключэннем вышэйшых, абавязковым было навучанне асновам рэлігіі. Гэта адносілася не толькі да каталіцкага, але і да іншых веравызнанняў – праваслаўнага, пратэстанцкага, іўдзейскага, мусульманскага. У каталіцкім Касцёле традыцыйна ўшаноўваўся культ Маці Божай Каралевы Польшчы. Вернікі здзяйснялі паломніцтвы ў Чэнстахоў на Ясную Гару і ў Вільна ў Вострую Браму, дзе знаходзіліся цудатворныя іконы. Некаторыя святы насілі як дзяржаўны, так і рэлігійны характар: 3 мая – Дзень Канстытуцыі Польшчы і свята Маці Божай Каралевы Польшчы, 15 жніўня – гадавіна перамогі ў Варшаўскай бітвы 1920 г. і свята Ушэсця Маці Божай і інш.

У міжваенны перыяд у Польшчы друкавалася вялікая колькасць розных рэлігійных газет, часопісаў, брашур. Іх выдаўцамі былі манаскія ордэны, свецкія і рэлігійныя арганізацыі. У сярэдзіне 1930-х гг. налічвалася 300 назваў друкаваных выданняў. Многія з іх распаўсюджваліся сярод насельніцтва Заходняй Беларусі. У 1920-я гг. актыўную місіянерскую і выдавецкую дзейнасць у Гродна разгарнулі айцы-францысканцы пад кіраўніцтвам айца Максіміліяна Кольбе. У прыватнасці, яны выдавалі часопіс «Рыцар Беззаганнапачатай», газету «Малы дзённік», разлічаныя на розныя колы насельніцтва.

Пад патранатам каталіцкага Касцёла былі створаны шматлікія арганізацыі, якія аб'ядноўвалі розныя катэгорыі насельніцтва. Іх дзейнасць была накіравана на пашырэнне, паглыбленне і абарону прынцыпаў каталіцызму ў асабістым і грамадскім жыцці. Найбольш уплывовымі сярод іх былі Акцыя каталіцкая, Таварыства народнай школы, Дабрачыннае таварыства святых Вінцэнта і апостала Паўла і інш. Істотную ролю ў рэлігійным жыцці адыгрывалі манастыры. Толькі на тэрыторыі Віленскай архідыяцэзіі – самай вялікай ў Заходняй Беларусі – было 25 мужчынскіх і 56 жаночых манастыроў і манаскіх дамоў, у беларускай частцы архідыяцэзіі – адпаведна 10 мужчынскіх і 24 жаночыя фармацыі. Пад іх патранатам знаходзіліся дашкольныя ўстановы, дамы апекі, інтэрнаты для моладзі, школы і інш. Адначасова законныя сёстры і браты праводзілі місіянерскую дзейнасць.

Каталіцкі Касцёл меў дастатковую колькасць кадраў духавенства. Іх падрыхтоўку ажыццяўлялі духоўныя семінарыі ў Ломжы, Пінску і Вільні. Сярод духавенства было нямала выхадцаў з дробнабуржуазнага беларускага асяроддзя, што адлюстравалася на іх палітычных поглядах і актыўнай дзейнасці па беларусізацыі Касцёла і выкарыстанні яго ў мэтах беларускага нацыянальнага адраджэння. У Заходняй Беларусі актыўную дзейнасць праводзіла Беларускае нацыянальнае аб'яднанне (папярэднія назвы: Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя, Хрысціянская дэмакратычная злучанасць). Друкаваны орган – «Беларуская крыніца». БХД выступала за самастойнасць беларускага народа на ўсіх яго землях, перадачу зямлі ва ўласнасць і без выкупу беззямельным і малазямельным сялянам, абавязковасць вывучэння рэлігіі ў школах, супраць аддзялення царквы ад дзяржавы і інш. Некаторыя ксяндзы-беларусы былі яе актыўнымі ўдзельнікамі, у іх ліку Адам Станкевіч, Аляксандр Хадыка, Уладзіслаў Талочка, Вінцэнт Гадлеўскі, Пётр Татарыновіч, Люцыян Хвецька і інш. Дзейнасць каталіцкага духавенства, яго грамадска-палітычныя погляды знаходзіліся пад кантролем мясцовых органаў улады. Санацыя баялася росту сярод духавенства антыдзяржаўных настрояў, а таксама ўплыву кліру на фарміраванне нацыянальных ідэй сярод моладзі.

## 6.3. Праваслаўная Царква і яе аўтакефалія

Праваслаўная Царква разглядалася польскай дзяржавай як палітычны інстытут былой Расійскай імперыі. Істотным элементам палітыкі польскіх улад адносна праваслаўя было рашэнне пытан-

ня аб нацыянальным характары гэтай Царквы ў Польшчы. Праваслаўнае духавенства ад іерархаў да прыхадскіх свяшчэннікаў было выхавана ў руска-манархічным духу, таму яно не жадала прымаць палітычныя змены, якія адбыліся пасля распаду Расійскай імперыі. Свяшчэннікі не заўважалі працэсаў абуджэння нацыянальнай свядомасці, якія адбываліся ў беларускім і ўкраінскім грамадстве. Таму стаяла задача адмежаваць праваслаўную Царкву ад Маскоўскай патрыярхіі і арганізаваць яе дзейнасць на пачатках аўтакефаліі. Апрача таго, у аўтакефаліі ўлады бачылі сродак магчымага збліжэння каталіцкай і праваслаўнай Царквы, што спрыяла б апалячванню і акаталічванню беларускага насельніцтва.

14–15 чэрвеня 1922 г. у Варшаве быў скліканы Сабор епіскапаў. Ён прыняў пастанову аб самастойнасці праваслаўнай Царквы ў Польшчы на аснове аўтакефаліі. Яна стала называцца Польская Аўтакефальная Святая Праваслаўная Царква. 17 верасня 1925 г. аўтакефалія была зацверджана Канстанцінопальскім патрыярхам. Для польскага ўрада гэта быў несумненны поспех. Аднак частка праваслаўнага духавенства і веруючых асудзілі абвяшчэнне аўтакефаліі. Улады праводзілі праверку праваслаўнага духавенства з мэтай выяўлення свяшчэннікаў, якія былі негатыўна настроены да Польскай дзяржавы. Калі такія выяўляліся, да іх прымянялі меры ўздзеяння: звальненне з пасад, перавод у іншыя прыходы або высяленне з дзяржавы.

Адной са складаных праблем для праваслаўнай Царквы была рэвіндыкацыя – працэс перадачы каталіцкаму Касцёлу культавых будынкаў, зямель, іншай рухомай і нерухомай маёмасці, што да 1793–1839 гг. належала ўніятам (грэка-католікам), але была адпісана царскім урадам праваслаўнай Царкве. У польскай дзяржаве адбываўся адваротны працэс. У 1930 г. католікі падалі судовыя скаргі аб рэвіндыкацыі 500 праваслаўных цэркваў, 300 з іх паводле прысудаў былі пераўтвораны ў касцёлы. Мела месца разбурэнне цэркваў. Гэта прывяло да канфліктаў на рэлігійнай і нацыянальнай глебе. Супраць адчужэння праваслаўных храмаў выступалі і беларускія паслы ў сейме. У такой сітуацыі польскія ўлады вымушаны былі заняць узважаную пазіцыю і не заўсёды ісці на задавальненне іскаў аб адабранні цэркваў.

У 1922 г. былі зроблены першыя спробы рэфармавання Царквы ў паланізацыйным духу. Сінодам Царквы было дазволена выкарыстанне польскай мовы разам з рускай, беларускай і ўкраінскай у навучанні рэлігіі і пропаведзях. Увядзенне нацыянальных моў у богаслужэнні ставілася ў залежнасць ад патрабаванняў мясцовага насельніцтва. У 1924 г. быў заменены юльянскі каляндар на грыга-

рыянскі. Але гэта выклікала пратэсты веруючых і духавенства. У будучым прадаўжалася выкарыстанне двух календароў.

У рэалізацыі паланізатарскай палітыкі на «крэсах усходніх» важная роля адводзілася інспіраванаму польскімі ўладамі руху «праваслаўных палякаў». 14 верасня 1935 г. у Беластоку быў зарэгістраваны статут таварыства «Дом праваслаўных палякаў імя Юзэфа Пілсудскага». Аналагічныя таварыствы былі зарэгістраваны ў Гродна, Навагрудку, Слоніме і іншых гарадах. Іх дзейнасць была ў асноўным сканцэнтравана на арганізацыі сходаў, гутарак, лекцый, тэатральных пастановак, звязаных з польскімі нацыянальнымі традыцыямі.

У Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд аформіўся рух за беларусізацыю праваслаўнай Царквы. Беларускія дзеячы В. Багдановіч, А. Коўш, Р. Астроўскі і іншыя хацелі выкарыстаць магчымасць уплыву праваслаўя для абуджэння нацыянальнай свядомасці сярод беларускага насельніцтва. Але іх праграма зводзілася ў асноўным да ўвядзення казанняў і навучання рэлігіі на беларускай мове. Беларусізацыя праваслаўнай Царквы не дала вынікаў. Большасць духавенства не лічыла беларусаў за нацыю, іншыя ж хаця і садзейнічалі беларускаму культурна-асветніцкаму руху, аднак з недаверам ставіліся да яго лідараў. Польскаму ўраду, нягледзячы на пэўныя поспехі ў падпарадкаванні Царквы свайму ўплыву, не ўдалося зрабіць яе фактарам паланізацыі «крэсаў усходніх».

## 6.4. Неапратэстантызм, каталіцкі Касцёл візантыйска-славянскага абраду і іншыя вызнанні

У 1920–1930-я гг. у Заходняй Беларусі было каля 47 розных найменняў пратэстанцкіх суполак. Павелічэнню іх колькасці садзейнічалі наступныя прычыны:

- акупацыя значнай часткі Беларусі немцамі, сярод якіх было нямала пратэстантаў;
- актыўная місіянерская дзейнасць розных замежных прапаведнікаў.

Цэнтрам пратэстанцкага руху на Гродзеншчыне стала Зэльва. У 1922 г. сюды з Омска вярнуўся Антон Кіцун (памёр у 1938 г.). Знаходзячыся ў Сібіры, ён стаў баптыстам, а ў Зэльве яго абралі прэсвітарам абшчыны. У хуткім часе цэрквы евангельскіх хрысціян-баптыстаў з’явіліся ў Лідзе, Ваўкавыску, Гродна. У Брэсце актыўную дзейнасць разгарнуў Дзёкуць-Малей.

У міжваенны перыяд стаў актыўна развівацца неапратэстантызм. Гэта філасофска-рэлігійная плынь у пратэстантызме XIX–XX стст., якая імкнулася ўлічыць вынікі развіцця навукі і зменлівыя гістарычныя ўмовы для аховы асноў хрысціянскага веравучэння шляхам перагляду яго традыцыйнага дагматычнага разумення. У тлумачэнні рэлігіі прыхільнікі гэтай плыні надаюць вялікае значэнне псіхалагічным і культурным фактарам. Неапратэстанты лічаць, што Бог адкрываецца выключна індывідуальнаму ўнутранаму пачуццю, а рэлігійная вера – гэта адказ на запатрабаванні самой чалавечай прыроды. Рэлігія разглядаецца як частка агульнай культурнай гісторыі, а Хрыстос – як гістарычная асоба. Галоўным зместам хрысціянства яны лічаць этычнае вучэнне Хрыста.

У Заходняй Беларусі былі суполкі евангельскіх хрысціян у духу апостальскім, хрысціян веры евангельскай, пяцідзясятнікаў, метадыстаў, мурашкаўцаў, евангельскіх хрысціян у духу «малеванцаў», даследчыкаў Свяшчэннага Пісання і інш. Іх засноўвалі замежныя рэлігійныя і дабрачынныя неапратэстанцкія арганізацыі, якія праводзілі рэлігійную дзейнасць у Польшчы і Заходняй Беларусі. Важным фактарам распаўсюджання неапратэстанцкіх суполак была дзяржаўная палітыка Польшчы ў адносінах да праваслаўнай Царквы. Яна садзейнічала адыходу ад праваслаўя часткі насельніцтва і яе пераходу ў неапратэстанцкія абшчыны.

У пачатку 1930-х гг. цэнтрам неапратэстанцкага руху з’яўлялася Палескае ваяводства. Тут было сканцэнтравана каля 60 % прыхільнікаў неапратэстантызму (у Беластоцкім ваяводстве – 17 %, Наваградскім – 15 %, Віленскім – 7,6 %). Агульная колькасць – больш за 7800 чалавек. Па нацыянальнаму складу ў абшчынах пераважалі беларусы. Беларускія абшчыны на рэгіянальных правах уваходзілі ў склад арганізацый, якія аб’ядноўвалі польскія, беларускія і ўкраінскія абшчыны: «Саюз славянскіх абшчын Евангельскіх хрысціян і баптыстаў», «Саюз абшчын славянскіх баптыстаў», «Саюз адвентыстаў сёмага дня ў Польшчы».

У 1920-я гг. на землях Заходняй Беларусі і Украіны па рашэнні папы Пія XI адбывалася аднаўленне Касцёла ўсходне-славянскага (візантыйска-славянскага) абраду, або неауніі. У 1924 г. у Альберціне (каля Слоніма) распачала сваю дзейнасць місія ордэна езуітаў на чале з уніяцкім епіскапам Антонам Неманцэвічам (памёр у 1942 г.). Місійную акцыю падтрымаў Епіскапат Польшчы. Формы дзейнасці місіянераў былі разнастайныя:

- аднаўленне занядбаных храмаў і ператварэнне іх ва ўніяцкія;

- правядзенне богаслужэнняў ва ўніяцкіх традыцыях;
- дапамога бедным;
- выданне ўніяцкай літаратуры;
- выкладанне гісторыі ўніяцтва ў школах слонімскага павета і інш.

Польскія ўлады з самага пачатку існавання місіі адкрыта не выказваліся супраць гэтай акцыі, хаця ў заключаным у 1925 г. паміж Польшчай і Святым Прастолам канкардаце не было размовы пра новы абрад. З недаверам да неауніі аднесліся лакальныя ўлады, якія ў яе распаўсюджанні бачылі падставу для вызравання новых канфліктаўна і так у палітычна нестабільных «крэсах усходніх».

У 1931 г. апостальскім візітатарам візантыйска-славянскага абраду папа назначыў епіскапа Мікалая Чарнецкага, украінца па паходжанні. Польскія ўлады назначэнне ўспрынялі стрымана, але мясцовым уладам забаранілі супрацоўнічаць у арганізацыі місійнай справы з епіскапам Чарнецкім, і рабіць гэта рэкамендавалі вельмі далікатна, не правакуючы канфліктаў. Неаунія, якая, па задуме яе арганізатараў, павінна была аслабіць праваслаўе, наадварот, яго ўмацоўвала. У абарону Царквы выступалі цэлыя рэлігійныя асяродкі, праваслаўнае духавенства. Аднак некаторая частка свяшчэннікаў, якая канфліктавала са сваім кіраўніцтвам, у пераходзе ў візантыйска-славянскі абрад бачыла шанс для царкоўнай кар’еры.

З 1931 г., пасля аўдыенцыі епіскапа Мікалая Чарнецкага ў Ватыкане, праца па ўкараненні неауніі ішла ў двух напрамках: на Валыні па лініі ўкраінскай, Віленшчыне і ў Заходняй Беларусі – па лініі беларускай, што павінна было спрыяць развіццю беларускай нацыянальнай ідэі. Аднак гэта не ўваходзіла ў планы польскіх улад, якія ў 1930-я гг. імкнуліся да ўзмацнення паланізацыі і фарміравання аднаЛітай польскай дзяржавы. З пункту іх гледжання, неаунія стварала дадатковыя праблемы ў няпростых нацыянальна-рэлігійных адносінах «на крэсах усходніх». Па гэтай прычыне з Міністэрства рэлігійных вызнанняў і народнай асветы паступалі ўказанні ваяводам блакіраваць развіццё неауніі. У Заходняй Беларусі неаунія не атрымала падтрымкі насельніцтва. Колькасць такіх прыходаў была нязначнай – у 1929 г. – 26, белага духавенства – 25, чорнага духавенства – 7. Агульная колькасць прыхільнікаў абраду складала каля 16,5 тысяч чалавек. Акцыя не атрымала належнай падтрымкі нават сярод былых уніятаў.

Сярод нехрысціянскіх веравызнанняў найбольш налічвалася яўрэйскіх абшчын. У Заходняй Беларусі існавала каля 400 сінагог. Вялікая ўвага надавалася выхаванню дзяцей у хедэрах – рэлігій-

ных школах пры сінагогах. Іўдаізм, у параўнанні з іншымі вызнаннямі, не выклікаў у польскай адміністрацыі клопату. Рэлігійныя праблемы яўрэйскай грамадскасці «на крэсах усходніх» не разглядаліся ў адрыве ад усяго краю. Улада не ўмешвалася ў рэлігійныя праблемы, за выключэннем, калі станавілася вядома, што рэлігійныя абшчыны знаходзяцца пад уплывам радыкальных грамадска-палітычных груповак. Іўдзейскія абшчыны займаліся рэлігійнай дзейнасцю і не ўмешваліся ў палітыку. Палітычныя партыі функцыянавалі па-за структурамі іўдзейскіх абшчын, хаця гэта не азначала, што асобныя палітычныя групоўкі не мелі ўплыву на равінаў або кіраўніцтва кагалаў. Органы ўлады на падставе распараджэнняў міністра рэлігійных вызнанняў і грамадскай асветы, выдадзеных у пачатку 1930-х гг., значна ўзмоцнілі кантроль за іўдзейскімі абшчынамі. Бюджэты абшчын павінны былі зацвярджаць павятовыя старасты, а равінаў абавязвалі здаваць экзамен на валоданне польскай мовай.

Нешматлікія групы стараабрадцаў, мусульман і караімаў, традыцыйна звязаныя з гэтымі абшарамі, выказвалі сваю лаяльнасць да польскай дзяржавы і не стваралі якіх-небудзь палітычных праблем. Мусульмане былі аб'яднаны ў 19 абшчын. Мусульманскае духавенства і нешматлікая інтэлігенцыя далучыліся да культурна-асветніцкай дзейнасці сярод татар. Яе каардынаваў Культурна-асветніцкі саюз татар Польшчы праз сетку ўласных аддзелаў у ваяводствах.

На тэрыторыі Заходняй Беларусі існаваў шэраг рэлігійных груп, якія не мелі юрыдычнага статусу, афіцыйна не былі прызнаны і называліся сектамі. Да сектаў залічваліся некаторыя пратэстанцкія групы. Праціўнікамі легалізацыі такіх веравызнанняў былі як каталіцкі Касцёл, так і праваслаўная Царква, якія баяліся страціць веруючых. Адносіны ўлад усіх ўзроўняў да сектпаў на працягу міжваеннага перыяду былі адмоўнымі. Прычына заключалася ў тым, што частка беларускай інтэлігенцыі шукала ў пратэстанцкіх веравызнаннях альтэрнатыву «польскаму каталіцызму» і «расійскаму праваслаўю». Польскія ўлады трактавалі дзейнасць такіх сектаў як элемент, які дэстабілізуе грамадска-палітычную сітуацыю ў краіне, і патрабавалі ад лакальных структур узмацнення за імі кантролю і недапушчэння на іх уплыву палітычных арганізацый нацыянальных меншасцей.

Другая сусветнай і Вялікая Айчынная вайна карэнным чынам змянілі рэлігійнае жыццё і паставілі ўсе канфесіі ў складаныя ўмовы існавання.

## Тэма 7

# РЭЛІГІЙНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ Ў ГАДЫ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ І ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ (ВЕРАСЕНЬ 1939–1945 г.)

*7.1. Рэлігійнае жыццё ў заходніх абласцях БССР (верасень 1939 – 22 чэрвеня 1941 г.).*

*7.2. Канфесійная палітыка нямецкіх акупацыйных улад у Беларусі.*

*7.3. Становішча і дзейнасць праваслаўнай Царквы.*

*7.4. Каталіцкі Касцёл ва ўмовах нямецкай акупацыі.*

*7.5. Рэпрэсіі акупантаў супраць духавенства і веруючых.*

*7.6. Становішча канфесій пасля вызвалення Беларусі ад нямецкіх акупантаў.*

# 7.1. Рэлігійнае жыццё ў заходніх абласцях БССР (верасень 1939 – 22 чэрвеня 1941 г.)

З устанаўленнем савецкай улады ў Заходняй Беларусі адбыліся істотныя змены як у дзяржаўна-канфесійных адносінах, так і ў становішчы саміх канфесій. Савецкая ўлада з самага пачатку паказала сваё негатыўнае стаўленне да рэлігіі і Царквы. Аднак, у адрозненне ад усходніх абласцей, дзе барацьба з рэлігіяй прывяла да амаль поўнага знішчэння рэлігійнага жыцця, у заходніх абласцях гэтага не адбылося. Па дадзеных Цэнтральнага савета Саюза Ваяўнічых Бязбожнікаў, у 1940 г. тут налічвалася 446 касцёлаў, 617 ксяндзоў, 542 царквы, 606 праваслаўных свяшчэннікаў, 387 сінагог, 293 равіны, 14 манастыроў.

З лістапада 1939 г. уводзілася савецкае заканадаўства аб рэлігійных культах. Вясной 1940 г. былі ўведзены ўстановы ЗАГС, якія перанялі ад касцёлаў і цэркваў метрычныя кнігі, а таксама рэгістрацыю нараджэнняў, пахаванняў і шлюбаў. Забаранялася дзейнасць усіх рэлігійных арганізацый, якія існавалі ў міжваенны перыяд, выкладанне рэлігіі ў школах, а духавенству – з’яўляцца ў бальніцах і дамах грамадскай апекі (састарэлых, інвалідаў) для аказання пастырскіх паслуг.

Наступленне на канфесіі ішло ў розных напрамках. Былі нацыяналізаваны ўсе будынкі, якія належалі цэрквам, касцёлам, манастырам, сінагогам. Духоўныя асобы, дзеючыя царкоўныя будынкі абкладаліся завышанымі падаткамі. Праводзілася антырэлігійная прапаганда з мэтай дыскрэдытацыі рэлігіі і Царквы і адыходу ад іх насельніцтва, у першую чаргу моладзі. Аднак зменшыць уплыў рэлігіі і духавенства на веруючых не ўдалося. У дакладных запісках партыйных і савецкіх органаў, спецпаведамленнях НКУС прыводзіліся шматлікія звесткі аб «актывізацыі контррэвалюцыйных элементаў», «стварэнні разгалінаваных паўстанцкіх арганізацый» і г. д. У першую чаргу гэта адносілася да каталіцкага насельніцтва.

За духоўнымі асобамі быў устаноўлены таемны нагляд органаў НКУС. 11 кастрычніка 1939 г. за подпісам наркома ўнутраных спраў

СССР Л. Берыя быў выдадзены загад «Аб аператыўных мерах супраць антысавецкіх варожых элементаў». У адпаведнасці з ім патрабавалася ў сціслы тэрмін арганізаваць улік так называемых «контррэвалюцыйных элементаў і варожых катэгорый насельніцтва». У іх лік трапіла духавенства ўсіх канфесій. Аднак у барацьбе з рэлігіяй савецкая ўлада надавала ў першую чаргу значэнне не рэпрэсіўным, а ідэалагічным і прапагандысцкім мерам: правядзенню антырэлігійнай прапаганды ў школах, клубах, бальніцах, на прадпрыемствах і ўстановах. Праводзіліся антырэлігійныя вечары, лекцыі, гутаркі і інш.

У такіх умовах адбываліся змены ў дзейнасці саміх канфесій. З аднаго боку, у мэтах самазахавання яны былі вымушаны прыстасоўвацца да такога жыцця, змірыцца з існуючымі парадкамі. Важнейшай задачай было захаваць свой уплыў на веруючых, не дапусціць знішчэння рэлігіі, адыходу ад яе насельніцтва.

У найбольш складанай сітуацыі аказаўся каталіцкі Касцёл. Ён разглядаўся новай уладай як пасобнік польскіх паноў і капіталістаў у прыгнёце народных мас, у апалячванні і акаталічванні беларускага народа. Духавенства называлі як слугамі, так і шпіёнамі Ватыкана. Нягледзячы на гэта каталіцкае духавенства імкнулася праводзіць актыўную місіянерскую дзейнасць, навучала дзяцей рэлігіі, заклікала веруючых не паддавацца антырэлігійнай прапагандзе. У дакладных запісках НКУС гаварылася аб падтрымцы ксяндзамі польскага антысавецкага падполля, якое дзейнічала ў заходніх абласцях Беларусі з восені 1939 г.

Праваслаўная Царква ў заходніх абласцях БССР трапіла пад юрысдыкцыю Маскоўскай патрыярхіі. У сувязі з ад'ездам за мяжу праваслаўных епіскапаў Савы (Саветава) з Гродна і Матфея (Сямашкі) з Вільні адбыліся кадравыя перастаноўкі. Мітрапаліт Сергій (Страгародскі) зацвердзіў на кафедры епіскапа Пінска-Навагрудскага Панцеляімана (Ражноўскага) і прысвоіў яму званне Экзарха Патрыярхіі, узнагародзіў брыльянтавым крыжам на клобук. Пад яго юрысдыкцыю падпадала праваслаўная Царква на далучаных тэрыторыях.

Увосень 1940 г. Маскоўская патрыярхія вызначыла архіепіскапа Валынскага і Луцкага Мікалая (Ярушэвіча) экзархам заходніх абласцей Украіны і Беларусі. Ён кіраваў далучэннем да Рускай праваслаўнаў Царквы заходнеўкраінскіх і заходнебеларускіх епархій, якія раней знаходзіліся пад юрысдыкцыяй Польскай праваслаўнай Царквы. Архіепіскап Панцеляіман (Ражноўскі) прызначаўся на пасаду епар-

хіяльнага архіерэя зноў створанай Гродзенска-Віленскай епархіі з тытулам архіепіскапа Гродзенскага і Віленскага.

Афіцыйна працягвалі існаваць яўрэйскія абшчыны. Адносіны новай улады да іўдаізму ў многім вызначаліся тым, што яўрэйскае насельніцтва ў цэлым падтрымлівала савецкую ўладу, не аказвала ёй супраціўлення. Многія яўрэі прымалі актыўны ўдзел ў грамадска-палітычным, эканамічным і культурным жыцці, уваходзілі ў склад савецкіх і партыйных органаў.

Аднак яўрэйскія абшчыны былі пазбаўлены права мець свае дзіцячыя, юнацкія і жаночыя навучальныя ўстановы – як рэлігійнага, так і свецкага характару. Забаранялася рэлігійная дзейнасць па-за сінагогай. Згортванне сістэмы яўрэйскай рэлігійнай адукацыі прывяло да эміграцыі выкладчыкаў і навучэнцаў найбольш вядомых іешываў (школ). Закрываліся сінагогі, у іх размяшчаліся дамы сацыялістычнай культуры, спортзалы, зернясховішчы. 3 лютага 1941 г. органы НКУС прыступілі да ўстаранення так званых «яўрэйскіх клерыкалаў» – найбольш аўтарытэтных рэлігійных дзеячаў, якія былі звязаны з міжнароднымі яўрэйскімі арганізацыямі. Іх абвінавачвалі ў правядзенні антысавецкай агітацыі і прапаганды, падтрымцы нелегальных сувязяў з замежнымі грамадзянамі і арганізацыямі, правядзенні нелегальных сходаў яўрэйскага духавенства і г. д.

Такім чынам, у перадваенны перыяд у заходніх абласцях БССР адбыліся істотныя змены ў становішчы і дзейнасці ўсіх канфесій. Яны былі звязаны ў першую чаргу з той палітыкай, якую праводзіла савецкая ўлада ў адносінах да рэлігіі і Царквы. Адносна ліберальны характар гэтай палітыкі не азначаў адыходу ад курса на поўнае выцясненне рэлігійнага светапогляду са свядомасці людзей, а Царквы – з публічнага жыцця грамадства. У новых умовах адбываліся таксама змены ў дзейнасці саміх канфесій. Найбольшыя цяжкасці выпалі на іх долю ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

## 7.2. Канфесійная палітыка нямецкіх акупацыйных улад у Беларусі

Рэлігійныя праблемы займалі важнае месца ў палітыцы нямецкіх акупантаў. Адносіны немцаў да рэлігіі і Царквы былі вызначаны ў праграмных дакументах нацыянал-сацыялістычнай партыі Германіі, распараджэннях, якія накіроўваліся з Берліна і Рыгі акупацыйным уладам, а таксама залежалі ад абстаноўкі ў канкрэтным рэгіёне.

Праграма Нацыянал-сацыялістычнай Рабочай Партыі Германіі (НСРПГ), прынятая ў 1920 г., дэкларавала свабоду ўсім рэлігійным вераванням у дзяржаве да той пары, пакуль яны не пачыналі пагражаць яе інтарэсам або парушаць маральна-этычныя пачуцці германскай расы. Пры гэтым палітыка партыі не звязвала сябе ні з якой рэлігіяй. Нацысты заяўлялі аб прыярытэце інтарэсаў і маральных каштоўнасцей нямецкага народа над усімі астатнімі «недачалавекамі».

Хрысціянства з яго ўніверсалізмам і агульначалавечымі маральнымі каштоўнасцямі супярэчыла духу і літары нацызму. Гітлераўскае кіраўніцтва Германіі адмоўна адносілася да хрысціянскай Царквы з яе строгай іерархіяй і дагматыкай. Адмаўляючы хрысціянскі светапогляд, абраднасць, традыцыі, нацысты прадугледжвалі стварыць свой, палітызаваны, варыянт царквы, які быў бы праваднікам нацыянал-сацыялізму.

У той жа час асаблівая роля адводзілася пратэстантызму. З гэтай канфесіяй немцы звязвалі падтрымку ўсяму, «што нямецкае, альбо гэта будзе датычыць нямецкай чысціні, паглыблення нацыянальных пачуццяў, альбо абароны нямецкага ладу жыцця, мовы, а таксама нямецкай свабоды, паколькі гэта складае яго аснову». І хаця да пачатку нападу на Савецкі Саюз адносіны кіруючай вярхушкі Германіі да пратэстантаў сталі менш лаяльнымі, аднак на акупаванай тэрыторыі БССР немцы не чынілі перашкод дзейнасці пратэстанцкіх абшчын. З пачатку акупацыі ў Мінскай вобласці пачалі дзейнасць 7 малітоўных дамоў евангельскіх хрысціян і баптыстаў, у Бягомльскім раёне Віцебскай вобласці – 3, у Віцебску – 1. Актывізавалі сваю дзейнасць абшчыны ў Оршы, Магілёве і інш.

Свяшчэннікам катэгарычна забаранялася выкарыстоўваць сваё становішча і ўплыў на веруючых у палітычных мэтах. У выпадку парушэння духоўныя асобы падвяргаліся пакаранням. Падпісанне ў 1933 г. канкардату Трэцяга Рэйха з Ватыканам было толькі шырмай, за якой нацысты хавалі свае сапраўдныя мэты – ліквідацыя ў канчатковым выпадку ўсіх інстытутаў Царквы, у першую чаргу каталіцкай.

Рэалізацыя гэтай палітыкі ў акупаванай Беларусі сутыкалася з многімі праблемамі. Перапляценне тут нацыянальных і канфесійных асаблівасцей рэгіёнаў, спадчына савецкай улады, якая нанесла вялікі ўрон канфесіям, вымушалі нямецкія акупацыйныя ўлады выстаўляць сябе «абаронцамі пакрыўджаных народаў», не забываючы, аднак, пра галоўную мэту – «падзяляй і валодай». На першых

парах веруючым дазвалялася адкрываць касцёлы, цэрквы, якія былі закрыты раней бальшавікамі, праводзіць у іх богаслужэнні, без перашкод здзяйсняць рэлігійныя абрады, навучаць дзяцей рэлігіі. У сувязі з гэтым назіралася актывізацыя рэлігійнага жыцця на занятых немцамі тэрыторыях, што ў расійскай і польскай гістарыяграфіі вызначаецца як «рэлігійнае адраджэнне».

Аднак у хуткім часе былі прыняты меры па ўзмацненні кантролю за дзейнасцю рэлігійных арганізацый. Адносіны немцаў да праваслаўнай, каталіцкай і пратэстанцкай цэркваў залежалі не толькі ад агульных установак, якія зыходзілі «зверху», але і ад таго, наколькі дзейнасць канфесій можа быць выкарыстана дзеля рэалізацыі планаў акупацыйнай палітыкі. У заходніх абласцях БССР, дзе быў больш уплыў каталіцызму, а каталіцкае духавенства ў той або іншай ступені было звязана з польскім рухам супраціўлення, адносіны немцаў да Касцёла былі больш жорсткімі. Тут мелі месца рэпрэсіі ў дачыненні да духавенства – расстрэлы і абмежаванні яго дзейнасці. У акрузе Беларутэнія, дзе аселі беларускія калабаранты і ксяндзы-беларусы, пры пасрэдніцтве гаўляйтэра Вільгельма фон Кубэ рабіліся спробы абвяшчэння аўтакефаліі праваслаўнай Царквы і каталіцкага Касцёла, а таксама выкарыстання беларускай мовы ў набажэнствах. Але ў кожным выпадку праследавалася мэта – адгарадзіць Царкву ад уплыву Маскоўскай Патрыярхіі, а Касцёл – ад Ватыкана.

Агульнае кіраўніцтва, а тым самым і рэалізацыя царкоўнай палітыкі на акупіраваных тэрыторыях СССР уваходзіла ў абавязак рэйхскамісара па занятых усходніх абласцях і падпарадкаваных яму рэйхскамісараў, генеральных і гебітскамісараў.

Адным з першых крокаў, распачатых немцамі пасля прыняцця занятай тэрыторыі пад грамадзянскае кіраванне, стала рэгістрацыя дзеючых у Беларусі свяшчэннікаў усіх канфесій. Яна праводзілася гебітскамісарамі ў лістападзе 1941 г. Да заявы, якую свяшчэннікі падавалі ў мясцовую ўправу на выдачу дазволу на царкоўную дзейнасць, прыкладаліся асабістая анкета і аўтабіяграфія. Дазвол выдаваўся гебітскамісарамі з санкцыі генеральнага камісара толькі пасля праверкі асобы і яе нацыянальнай прыналежнасці, а таксама лаяльных адносін да немцаў. З грамадскіх месц выдаляліся рэлігійныя атрыбуты. Духавенству забаранялася абмяркоўваць дзеянні акупацыйных улад.

Рэлігійныя арганізацыі вялі сваю дзейнасць ў строгай адпаведнасці з падпісанай рэйхскамісарам Остланда Генрыхам Лозе

19 чэрвеня 1942 г. пастановай аб прававым статусе рэлігійных арганізацый на акупаваных тэрыторыях. Яна прадугледжвала ўмовы і парадак абавязковай рэгістрацыі існуючых і стварэнне новых рэлігійных таварыстваў. Іх дзейнасць, а таксама дзейнасць свяшчэннікаў знаходзілася пад наглядам акупацыйных органаў. Богаслужэнні ў касцёлах і цэрквах дазвалялася праводзіць (за выключэннем пахаванняў і шлюбаў) толькі ў нерабочыя гадзіны. Былі выпадкі, калі немцы забаранялі богаслужэнні нават у нядзельныя дні.

Канфесійная палітыка германскіх улад распаўсюджвалася не толькі на цывільнае насельніцтва. Сярод служачых Рэйха, а таксама ваеннапалонных у лагерах на тэрыторыі Беларусі было нямала веруючых. Але задавальненне рэлігійных  патрэб ваеннапалонных немцы не лічылі абавязковым. Што датычыць ваеннаслужачых, то набажэнствы для іх строга рэгламентаваліся: вызначаліся дні, месца, час правядзення.

У 1943–1944 гг. рэлігійныя праблемы не выклікалі ў немцаў патрэбы іх рэгуляваць на прававым узроўні. Магчыма, гэта было звязана з вырашэннем, на думку кіраўніцтва Рэйха, рэлігійнага пытання на Усходзе. З другога боку, пагаршалася становішча для немцаў на савецка-германскім фронце.

## 7.3. Становішча і дзейнасць праваслаўнай Царквы

Становішча праваслаўнай Царквы падчас нямецкай акупацыі Беларусі знаходзілася пад непасрэдным кантролем немцаў. Патрыятычная пазіцыя, якую заняла Маскоўская Патрыярхія на чале з Патрыяршым Месцазахавальнікам Сергіем (Страгародскім) (1867–1944 гг., з 12 верасня 1943 г. Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі), вымушала акупацыйныя ўлады прымаць канкрэтныя крокі, каб унесці раскол у адзінства Царквы і аддзяліць праваслаўную Царкву ў Беларусі ад Рускай праваслаўнай Царквы. Такая палітыка адпавядала памкненням часткі праваслаўнага духавенства і беларускіх нацыяналістаў, якія марылі аб аўтакефаліі і беларусізацыі царкоўнага жыцця.

На акупаванай тэрыторыі са згоды нямецкіх улад адкрываліся цэрквы, у іх у вялікай колькасці адбываліся хрышчэнні і шлюбы. Царкве дазвалялася займацца дабрачыннай дзейнасцю, навучаць дзяцей рэлігіі, ствараць курсы па падрыхтоўцы свяшчэннаслужы-

целяў. Усяго з 1941 г. па 1945 г. у Беларусі было рукапаложана ў сан 213 свяшчэннікаў. Ажывілася манастырскае жыццё. Аднавілі сваю дзейнасць манастыры ў Жыровічах, Мінску, Полацку, Гродна і інш.

3 сакавіка 1942 г. уладыка Панцеляіман (Ражноўскі), які стаяў на чале Царквы ў Беларусі, склікаў сабор епіскапаў. На ім было прынята рашэнне ўтварыць шэсць епархій, якія ўзначалілі: Віцебскую – епіскап Афанасій (Мартас); Гродзенскую – епіскап Венядзікт (Бабкоўскі); Мінскую – епіскап Панцеляіман (Ражноўскі); Магілёўскую – епіскап Філарэт (Нарко); Навагрудскую – епіскап Веніямін (Навіцкі); Смаленскую – епіскап Сімяон (Сеўба). Але ў канцы мая акупацыйныя ўлады адхілілі мітрапаліта Пацеляімана ад кіраўніцтва Царквой і адправілі яго ў манастыр у Ляды пад нагляд нямецкай ваеннай паліцыі. Прычына заключалася ў прапатрыяршай арыентацыі мітрапаліта і яго супраціўленні спробам абвяшчэння аўтакефаліі Царквы ў Беларусі. Упраўленне царкоўнымі справамі было перададзена архіепіскапу Філафею (Нарко).

30 жніўня – 1 верасня 1942 г. у Мінскім Спаса-Прэабражэнскім манастыры адбыўся сабор духавенства, інспіраваны нямецкімі акупацыйнымі ўладамі. На саборы было абвешчана аб устанаўленні аўтакефаліі Беларускай праваслаўнай Царквы і аддзяленні яе ад Маскоўскай Патрыярхіі, прыняты Статут. У параграфе 113 гэтага дакумента гаварылася, што кананічнае абвяшчэнне аўтакефаліі магчыма толькі пры ўмове, калі яна будзе прызнана Памеснымі праваслаўнымі цэрквамі. Але нягледзячы на ўсе намаганні прыхільнікаў аўтакефаліі, кананічнага прызнання ні з боку Памесных Цэркваў, ні большасці духавенства і веруючых Беларусі яна не атрымала.

Разам з тым многія свяшчэннікі праводзілі актыўную дзейнасць па адраджэнні праваслаўнай веры ва ўсходніх абласцях БССР. У студзені 1942 г. па распараджэнні духоўных улад у Віцебскай, Магілёўскай, Гомельскай і Мінскай абласцях арганізацыяй царкоўнага жыцця займаліся архімандрыт Серафім (Шахмуць) і свяшчэннік Грыгорый Кударэнка. Імі было праведзена больш за дзевяноста богаслужэнняў. Пасля вяртання ў Мінск яны служылі ў адкрытай імі царкве Святога Духа (зараз Свята-Духаў кафедральны сабор). Пры храме быў адноўлены манастыр.

У 1941 г. толькі ў Мінскай епархіі было адкрыта каля 120 прыходаў (каля 30 % іх дарэвалюцыйнай колькасці). Праваслаўныя цэрквы дзейнічалі ў кожным уездзе Віцебскай вобласці. У 1943 г. па ўсёй

Беларусі было адкрыта больш за 78 прыходаў. У цэрквах адбывалася вялікая колькасць хрышчэнняў і шлюбаў. Святары і створаныя пры цэрквах камітэты займаліся дабрачыннай дзейнасцю, дапамагалі пацярпелым ад вайны. У Мінску, напрыклад, кожная царква 10 % свайго даходу пералічвала на дапамогу бедным, удовам і сіротам.

Значная частка праваслаўнага духавенства ўсё ж не прыняла акупацыйны рэжым, маральна і матэрыяльна дапамагала савецкім партызанам і падпольшчыкам, воінам Чырвонай Арміі. Такая пазіцыя адпавядала ідэалогіі патрыятычнага служэння, якая была сфарміравана Маскоўскай Патрыярхіяй і яе Патрыяршым Месцазахавальнікам Сергіем (Страгародскім). За яго подпісам на акупаваныя немцамі тэрыторыі накіроўваліся адозвы да духавенства і міран, у якіх ён заклікаў аказваць усякую дапамогу партызанам, тым самым набліжаць вызваленне краіны ад фашысцкага гнёту. Святары забяспечвалі партызан прадуктамі, медыкаментамі, хавалі параненых, выдавалі неабходныя даведкі аб тым, напрыклад, што падазраваемыя ў сувязях з партызанамі мясцовыя жыхары з'яўляюцца людзьмі глыбока веруючымі і не маюць да гэтага ніякага дачынення, збіралі звесткі аб нямецкіх і паліцэйскіх фарміраваннях і перадавалі іх партызанам і інш.

Пасля знакамітай сустрэчы Іосіфа Сталіна з прадстаўнікамі Маскоўскай Патрыярхіі, якая адбылася 5 верасня 1943 г. у Крамлі, у партызанскіх зонах некаторыя камандзіры атрадаў дазвалялі адкрываць цэрквы, запрашаць святароў і праводзіць богаслужэнні.

У снежні 1942 г. мітрапаліт Сергій (Страгародскі) звярнуўся да ўсіх веруючых з просьбай аб ахвяраванні сродкаў на танкавую калону імя Дзмітрыя Данскога. Праваслаўныя веруючыя Беларусі адгукнуліся на просьбу. Адначасова яны адпраўлялі пасылкі з цёплымі рэчамі для чырвонаармейцаў на фронт. Да снежня 1944 г. у фонд абароны краіны, сем'ям і сіротам было сабрана праваслаўнымі Беларусі 4 872 000 рублёў.

У ліпені 1944 г. па загаду нямецкіх акупацыйных улад увесь беларускі праваслаўны епіскапат пакінуў Беларусь. Лёс яго членаў склаўся няпроста. Тыя, хто застаўся ў жывых, перайшлі служыць у Рускую праваслаўную зарубежную Царкву. На вызваленай ад нямецкіх акупантаў зямлі праваслаўная Царква працягвала дзейнічаць ва ўмовах жорсткай савецкай канфесійнай палітыкі.

# 7.4. Каталіцкі Касцёл ва ўмовах нямецкай акупацыі

Дзейнасць каталіцкага Касцёла ў акупаванай немцамі Беларусі залежала ад многіх фактараў, сярод якіх істотную ролю адыгрывала палітыка нямецкіх акупантаў адносна каталіцызму і Ватыкана, а таксама разгортванне польскага руху супраціўлення, з якім было звязана духавенства. Немалаважна было і тое, што ў заходніх абласцях, у адрозненне ад усходніх, каталіцкі Касцёл не быў знішчаны бальшавікамі.

У ліку першачарговых мер, якія прадугледжвалі абмежаванне рымска-каталіцкага Касцёла на Усходзе, былі закрыццё каталіцкай семінарыі ў Вільні, забарона любой каталіцкай дзейнасці на ўсходняй прасторы, якая праследуе мэту акаталічвання насельніцтва. Палітыка немцаў у адносінах да каталіцкага Касцёла ставіла мэтай вынішчэнне любога праяўлення ў ім «польскасці» ў рэлігійным жыцці, аж да поўнай ліквідацыі яго як «польскай» арганізацыі і пераўтварэння ў сацыяльны інстытут, пазбаўлены права ўдзелу ў публічным жыцці і ўплыву на яго.

Інтэнсіўнасць рэлігійнага каталіцкага жыцця ў розных рэгіёнах Беларусі была рознай. Найбольшае ажыўленне назіралася ў заходніх абласцях. Усе парафіяльныя касцёлы мелі амаль поўны склад духавенства. Пачалося навучанне дзяцей і падлеткаў рэлігіі, выхаванне іх у рэлігійным духу. Але перыяд свабоды быў нядоўгім. У канцы 1941 г. адбыліся змены адносін акупацыйных улад да палякаў-католікаў. Немцы больш падтрымлівалі беларускіх нацыяналістаў, дазвалялі адкрываць беларускія школы, аддавалі перавагу праваслаўю. Польскія школы ліквідаваліся, ксяндзы арыштоўваліся.

Каталіцкае духавенства і веруючыя ў цяжкіх умовах акупацыі імкнуліся дапамагчы суайчыннікам матэрыяльна і маральна. У жніўні-кастрычніку 1941 г. у Гродне ксяндзом-дэканам Альбінам Ярашэвічам быў створаны «Грамадзянскі камітэт дапамогі ахвярам вайны». Дапамога людзям была аказана грашыма, прадуктамі, адзеннем, а таксама за кошт добраахвотных ахвяраванняў. Такія факты матэрыяльнай дапамогі пацярпелым ад вайны, бежанцам мелі месца і ў іншых рэгіёнах, дзе дзейнічалі касцёлы.

Найбольш складанай справай, звязанай з рызыкай і небяспекай для жыцця, была дапамога яўрэям. Аднак у той сітуацыі можна было дапамагаць толькі асобным людзям або сем’ям. Вядомыя

выпадкі, калі ў касцёлах, манастырах або сем'ях католікаў хаваліся цэлыя сем'і яўрэяў. Ксяндзы выдавалі яўрэям праўкі аб тым, што яны з'яўляліся палякамі.

Ва ўсходніх абласцях Беларусі богаслужэнні для мясцовага насельніцтва праводзіліся ваеннымі капеланамі, якія былі ў часцях вермахта. Увосень 1941 г. у Полацку была адноўлена дзейнасць езуіцкай семінарыі. Яе рэктарам стаў польскі езуіт Мірскі. Але ўсё гэта ішло насуперак лініі нямецкіх акупацыйных улад, якія імкнуліся ні ў чым не дапусціць уплыву палякаў, таму Мірскі не знаходзіў разумення і падтрымкі ў немцаў.

Спробы адраджэння каталіцызму ў Мінска-Магілёўскай дыяцэзіі былі прадпрыняты былым епіскапам гэтай дыяцэзіі Баляславам Слосканам, які пражываў у Аглоне крайза (акругі) Дынабург у Латвіі. Два разы ён звяртаўся з адпаведнай просьбай да рэйхскамісара Остланда Генрыха Лозе, але атрымаў адмоўны адказ. У 1942 г. з такім жа пасланнем да генеральнага камісара Беларутэніі Вільгельма фон Кубе звяртаўся епіскап Тэафіл Матулёніс, які пражываў у Коўна. Але, як і ў выпадку са Слосканам, епіскапу Матулёнісу адмовілі.

Найбольш актыўна каталіцкае жыццё працякала ў Мінску. Аднавіліся богаслужэнні ў кафедральным саборы на плошчы Свабоды, у Чырвоным касцёле святых Сымона і Алены, у касцёле на Кальварыйскіх могілках. 16 мая 1942 г. у Мінску быў урачыста адкрыты касцёл, у якім да вайны размяшчаўся тэатр юнага гледача. Богаслужэнні праводзіліся ў касцёлах на беларускай мове. Актыўную дзейнасць па адраджэнні Касцёла ў акрузе Беларутэнія праводзілі ксяндзы-беларусы Вінцэнт Гадлеўскі, Станіслаў Гляколўскі, Дзяніс Малец і інш.

Спробы рэарганізаваць Касцёл у акрузе Беларутэнія прадпрымалі таксама беларускія дзеячы, якія вярнуліся з эміграцыі і супрацоўнічалі з немцамі. У тых умовах яны лічылі магчымым стварэнне беларускага Касцёла, які б актыўна займаўся фарміраваннем нацыянальнай свядомасці беларускага народа. 26 верасня 1941 г. Беларускі камітэт у Варшаве накіраваў папскаму нунцыю ў Берліне пісьмо, у якім прапаноўвалася стварыць на тэрыторыі генеральнай акругі Беларусі архіепіскапства з рэзідэнцыяй у Мінску і епіскапстваў у Гродне і Магілёве і прызначыць трох беларускіх епіскапаў. Адказу, аднак, не было. Тым не менш ідэя стварэння беларускага нацыянальнага Касцёла прадпрымалася і надалей.

18 снежня 1942 г. В. фон Кубе старшыня Беларускай народнай самапомачы доктар Іван Ермачэнка накіраваў прапановы аб стварэнні ў Беларусі касцёльнай іерархіі, падрыхтаваныя ксяндзом Вінцэнтам Гадлеўскім. Але пісьмо засталося без адказу. У верасні 1943 г. В. фон Кубе, у якога беларускія нацыяналісты мелі падтрымку, быў забіты падпольшчыкамі. А ў снежні таго ж года каля маёнтка Трасцянец быў забіты ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі, актыўны прыхільнік беларусізацыі Касцёла. Для немцаў пагаршалася сітуацыя на фронце. Справа рэарганізацыі Касцёла зайшла ў тупік.

## 7.5. Рэпрэсіі акупантаў супраць духавенства і веруючых

Нягледзячы на знешне лаяльную палітыку ў адносінах да рэлігіі і Царквы, нямецкія акупанты, тым не менш, не грэбавалі і рэпрэсіямі супраць духавенства і веруючых. Пры гэтым найбольшыя ўдары прыйшліся на каталіцкі Касцёл і яго духавенства. Асноўнай прычынай былі сувязь духавенства з польскім рухам супраціўлення – Арміяй Краёвай, дапамога яўрэям, а таксама тое, што каталіцкае духавенства разглядалася як частка польскай інтэлігенцыі, якую немцы прадугледжвалі знішчыць. Што датычыць праваслаўнага кліру, то ён знаходзіўся паміж двух агнёў. З аднаго боку, немцы рэпрэсіравалі іх за сувязь з савецкімі партызанамі і падпольшчыкамі. З другога – партызаны выносілі смяротны прысуд тым свяшчэннікам, якіх выкрывалі ў супрацоўніцтве з акупантамі. Было шмат выпадкаў, калі немцы падчас карных аперацый спальвалі цэрквы разам з мясцовымі жыхарамі.

Калі акупацыйныя ўлады лічылі неабходным, у цэрквах і касцёлах размяшчаліся лагеры для ваеннапалонных. З храмаў немцы вывозілі ў Рэйх найбольш каштоўныя рэчы, а званы здымалі і адпраўлялі на пераплаўку.

Формы знішчэння свяшчэннікаў і манахаў у Беларусі не адрозніваліся ад тых, якія немцы выкарыстоўвалі ў раней акупаваных краінах Еўропы. Іх арыштоўвалі, адпраўлялі ў канцлагеры, расстрэльвалі. За духавенствам устанаўлівалася тайнае сачэнне.

Рэпрэсіі супраць каталіцкага духавенства ўзмацніліся з 1942 г. Відавочна, гэта было выклікана ростам польскага антыфашысцкага

руху ў заходніх абласцях БССР, які напамінаў аб сабе антынямецкімі лістоўкамі, газетамі, дыверсіямі, актамі сабатажу. Так, у канцы чэрвеня – пачатку ліпеня 1942 г. гестапаўцы арыштавалі 16 ксяндзоў з чатырох дэканатаў Баранавіцкай вобласці. У сакавіку 1943 г. дзевяць з іх былі расстраляны каля Ліды. Прычынай расстрэлу была іх актыўная пастырская дзейнасць.

За перыяд вайны ў Ломжынскай дыяцэзіі, да якой адносіўся шэраг заходнебеларускіх парафій, у канцлагерах загінуў 31 ксёндз, расстраляна на месцы 13. Праз нямецкія турмы прайшлі 13 свяшчэннаслужыцеляў, праз канцлагеры – 21. У Віленскай архідыяцэзіі рэпрэсіям падвергліся 184 духоўныя асобы, 85 з іх былі замучаны. Рэпрэсіўныя акцыі ішлі адначасова з абмежаваннем дзейнасці Касцёла, богаслужэнняў, рабаваннем і разбурэннем духоўных святынь.

У гісторыю каталіцкага Касцёла як сімвал мучаніцтва ўвайшла расправа немцаў над 11 сёстрамі-назарэтанкамі з Навагрудка. Назарэтанкі не былі звязаны з польскімі або савецкімі партызанамі, яны сціпла выконвалі сваё зямное прызначэнне, рыхтавалі дзяцей да першай споведзі, дапамагалі людзям маральна вынесці цяжкасці акупацыі.

Рэпрэсіям па рэлігійных матывах падвяргаліся і свецкія католікі. 26 студзеня 1992 г. у польскім горадзе Улацлаваку пачаўся працэс кананізацыі 108 «Мучанікаў за веру 1939–1945 гадоў» – ахвяр нацызму – епіскапаў, ксяндзоў, манахаў і манахінь, а таксама людзей свецкіх. А 13 чэрвеня 1999 г. у Варшаве папа рымскі Ян Павел II абвясціў іх благаслаўлёнымі. Сярод іх 12 асоб, якія былі звязаны сваім жыццём, дзейнасцю і мучаніцкай смерцю з Беларуссю. 5 сакавіка 2000 г. у грона благаслаўлёных у Рыме былі ўнесены яшчэ 11 сясцёр-назарэтанак з Навагрудка.

Праваслаўныя святары і вернікі падвяргаліся рэпрэсіям за сувязь з партызанамі або знішчаліся падчас карных аперацый. Так, у Дрысенскім (зараз Верхнедзвінскі) раёне Віцебскай вобласці пры правядзенні карных аперацый было спалена пяць цэркваў. У кастрычніку 1943 г. у вёсцы Доры Валожынскага раёна Мінскай вобласці карнікі зажыва спалілі ў царкве 26 чалавек. 15 лютага 1943 г. паліцэйскія і эсэсаўцы спалілі ў вёсцы Хораства Пінскай вобласці 300 вернікаў і свяшчэнніка айца Іаана. Такіх прыкладаў можна прывесці шмат. Памяць аб новамучаніках ушаноўваецца ў праваслаўнай Царкве ў Беларусі.

# 7.6. Становішча канфесій пасля вызвалення Беларусі ад нямецкіх акупантаў

У ходзе правядзення беларускай наступальнай аперацыі «Баграціён» у чэрвені-жніўні 1944 г. тэрыторыя БССР была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. Пачалося аднаўленне разбураных вайной народнай гаспадаркі і культуры. Аднак у становішчы канфесій змен у лепшы бок не адбылося. Дзяржава прадоўжыла даваенны курс, накіраваны на абмежаванне дзейнасці рэлігійных арганізацый, узмацненне кантролю за імі, выцясненне з усіх сфер грамадскага жыцця. Адначасова органы НКУС выяўлялі факты сувязі духавенства з нямецкімі акупацыйнымі ўладамі, антысавецкімі фарміраваннямі і распачалі супраць такіх асоб рэпрэсіі. Яны закранулі духавенства ўсіх канфесій.

Праваслаўная Царква ў Беларусі перажывала крызіс. Па ацэнцы ўрадавай камісіі, урон, нанесены акупантамі праваслаўным храмам, склаў 86 091 230 рублёў. За гады акупацыі і ваенных дзеянняў было знішчана, спалена або разбурана 77 касцёлаў у тагачасных межах БССР. Толькі па Гродзенскай вобласці агульны ўрон касцёлам склаў, паводле афіцыйнай статыстыкі, 31 822 317 рублёў. Фактычна лічбы ўрону рэлігійным культам шматкратна большыя. Камісія не ўлічвала гісторыка-культурнай каштоўнасці касцёлаў і цэркваў і разрабаваных немцамі прадметаў культу.

19 лістапада 1944 г. СНК СССР прыняў пастанову № 1603 «Аб парадку адкрыцця малітоўных будынкаў рэлігійных культаў». Лёс касцёлаў, цэркваў, малітоўных дамоў пратэстантаў цалкам залежаў ад упаўнаважаных па справах рэлігій і РПЦ, якія вырашалі «аб мэтазгоднасці і магчымасці задавальнення хадайніцтваў веруючых аб адкрыцці малітоўных будынкаў» у кожным канкрэтным выпадку. Канчатковае рашэнне прымалася Саветам па справах рэлігійных культаў (для праваслаўных – па справах РПЦ) пры Савеце Народных Камісараў СССР. Далёка не ўсе хадайніцтвы веруючых задавальняліся.

Найбольш складаным і неўнармаваным было пытанне юрысдыкцыі праваслаўных прыходаў у Беларусі. Абсалютная большасць духавенства і прыхаджан станоўча ўспрынялі пераход пад юрысдыкцыю Маскоўскага Патрыярхата і патрабаванні «Палажэння аб кіраўніцтве РПЦ», прынятага на Памесным саборы РПЦ 31 студзе-

ня – 2 лютага 1945 г. 10 жніўня 1945 г. у Мінск прыехаў архіепіскап Васіль (Ратміраў), які застаў становішча Царквы ў Беларусі «ў плачэўным стане». Прыезд епіскапа веруючыя сустрэлі з радасцю. Ужо ў першыя дні яго знаходжання ў Мінску ў кананічныя зносіны з РПЦ быў прыняты праз пакаянне 31 святар.

Яшчэ адной праблемай як царкоўнай улады, так і ўпаўнаважаных па справах РПЦ і рэлігійных культаў была рэгістрацыя і прызначэнне на прыходы святароў. Як праваслаўныя, так і каталіцкія святары, якія атрымалі прызначэнне ад польскіх або нямецкіх улад, не хацелі зноў рэгістравацца ў органах улады, лічылі гэта парушэннем царкоўных канонаў, спасылаліся на тое, што царква аддзелена ад дзяржавы, а значыць, рэгістрацыя ёсць умяшальніцтва дзяржавы ў справы царквы.

Партыйна-савецкі апарат не выпускаў з-пад свайго кантролю рэлігійнае жыццё, дзейнасць духавенства ўсіх канфесій. Духоўныя асобы ўспрымаліся партыйна-савецкімі функцыянерамі як ворагі савецкага ладу, калгаснага будаўніцтва, якое пачыналася ў заходніх абласцях рэспублікі, а рэлігія – як варожая ідэалогія. На рэспубліканскай нарадзе па агітацыі і прапагандзе, якая адбылася ў Мінску ў пачатку кастрычніка 1944 г., першы сакратар ЦК КП(б)Б П. К. Панамарэнка выказаў заклапочанасць пашырэннем дзейнасці царкоўнікаў на вызваленых тэрыторыях. «Адпраўленне ўсялякіх культаў і нашу верацярпімасць нельга змешваць, – гаварыў ён. – Няхай яны існуюць, папы, але мы павінны клапаціцца, каб не поп стаў фігурай, ад якой будуць залежаць пастаўкі або веснавая сяўба».

З цяжкасцю наладжвалася рэлігійнае жыццё. Паменшылася колькасць веруючых у выніку вывазу на работу ў Германію і знішчэння насельніцтва немцамі падчас акупацыі, унутранай міграцыі, а католікаў – па прычыне выезду ў Польшчу ў 1944–1946 гг. Пачалася рэгістрацыя рэлігійных абшчын (парафій, прыходаў), духавенства. Па рашэнні мясцовых органаў улады ад веруючых пачалі адбіраць касцёлы і цэрквы «для народнагаспадарчых мэт», а дакладней – для пераўтварэння іх у зернясховішчы, склады, спортзалы, клубы і інш.

19 студзеня 1945 г. архіепіскап Васілій (Ратміраў) звярнуўся да старшыні СНК БССР П. К. Панамарэнкі з просьбай дазволіць адкрыць царкоўны завод па вытворчасці царкоўных свечак. Просьба была задаволена. Даходы ад продажу свечак ішлі як на патрэбы царквы, так і ў фонд абароны. Адначасова веруючыя

збіралі грашовыя і матэрыяльныя сродкі для байцоў Чырвонай Арміі.

Найбольш складаная рэлігійная сітуацыя назіралася ва ўсходніх абласцях БССР, дзе па ўсіх канфесіях моцны ўдар быў нанесены яшчэ да вайны. Віленская епархіяльная курыя ўсклала місію па задавальненню духоўных адпраў рыма-католікаў Слуцка, Асіповіч, Бабруйска, Гомеля і г. д. на ксяндза з Бераставіцы Мечыслава Малыніча. Акрамя правядзення богаслужэнняў на кватэрах веруючых, па яго ініцыятыве веруючыя пісалі заявы ва ўсе інстанцыі СССР аб адкрыцці касцёлаў ва ўсходніх абласцях рэспублікі. За такую дзейнасць ксяндза М. Малыніча прыцягвалі да адміністрацыйнай адказнасці, а скаргі католікаў аб'яўлялі незаконнымі. У 1946 г. ксяндза М. Малыніча арыштавалі органы НКУС.

Пратэстанцкія канфесіі (баптысты, евангельскія хрысціяне, пяцідзясятнікі) дзейнічалі ў неспрыяльных умовах. У 1944 г., пасля прыходу Савецкай Арміі, у Вільні быў створаны Рэспубліканскі царкоўны савет ХВЕ Беларусі і Літвы. Савет хадайнічаў перад уладамі СССР аб магчымасці рэгістрацыі цэркваў ХВЕ. Аднак савецкі ўрад, які разглядаў пяцідзясятнікаў як «чужы савецкай уладзе элемент», адмовіў у рэгістрацыі. Па ініцыятыве Савета па справах рэлігійных культаў пры СМ СССР пачаліся перагаворы аб уваходжанні Хрысціян Веры Евангельскай ва Усесаюзны Савет Евангельскіх Хрысціян і Баптыстаў (УСЕХБ), створаны ў кастрычніку 1944 г. У Беларусі евангельскія хрысціяне і пяцідзясятнікі аб'ядналіся ў верасні 1945 г. Аднак аб'яднанне выклікала незадавальненне з абодвух бакоў. Супраць выступілі 28 абшчын ХВЕ (Бярозаўскі і Жабінкаўскі раёны Брэсцкай вобласці), якія затым дзейнічалі нелегальна. Яны не прызналі кіраўніцтва УСЕХБ, якое «прадалося антыхрысту» (савецкай уладзе). Тым не менш 83 абшчыны ХВЕ далучыліся да УСЕХБ.

Мусульманскія абшчыны ў Беларусі былі нешматлікімі і прадстаўлены татарамі. Моладзь баялася праяўляць цікавасць да нацыянальнай традыцыі, таму мячэці наведвалі людзі старэйшага ўзросту. Паступова мусульманскія абшчыны перасталі існаваць. Да пачатку 1950-х гг. іх засталося толькі дзве – у вёсцы Мураўшчыза Іўеўскага раёна і ў вёсцы Асмолава Нясвіжскага раёна.

Іўдаізм, роўна як і каталіцызм і ўніяцтва, ствараў найбольшыя праблемы ў дзяржаўна-канфесійных адносінах. Падчас Халакосту ў БССР, па розных падліках, было знішчана ад 400 да 900 тысяч

яўрэяў. А да тых, хто застаўся, улада адносілася з недаверам, абвінавачваючы іх у яўрэйскім «буржуазным нацыяналізме», сувязях з сусветным сіянізмам, а пасля ўтварэння ў 1948 г. дзяржавы Ізраіль і выездам яўрэяў на «зямлю абетаваную» – яшчэ і ў адсутнасці патрыятызму і калабарацыянізме. Многія баяліся прызнаць сваю нацыянальнасць, размаўляць на сваёй мове, прытрымлівацца традыцый, мянялі імёны і прозвішчы на славянскія. Не аднаўляліся разбураныя падчас акупацыі сінагогі. Усё гэта паступова прыводзіла да затухання рэлігійнага жыцця яўрэяў, таму афіцыйных іўдзейскіх абшчын у Беларусі практычна не было.

## Тэма 8

# РЭЛІГІЯ І ЦАРКВА Ў САВЕЦКІМ ГРАМАДСТВЕ Ў ПАСЛЯВАЕННЫ ПЕРЫЯД (1945–1991 гг.)

*8.1. Асаблівасці савецкай дзяржаўна-канфесійнай палітыкі.*

*8.2. Рэпрэсіі супраць духавенства.*

*8.3. Праваслаўная Царква і яе дзейнасць.*

*8.4. Каталіцкі Касцёл: становішча ў грамадстве, напрамкі дзейнасці.*

*8.5. Пашырэнне ўплыву пратэстанцкіх абшчын.*

## 8.1. Асаблівасці савецкай дзяржаўна-канфесійнай палітыкі

Летам 1944 г. нямецкія акупанты былі выгнаны Чырвонай Арміяй з Беларусі. Пачаліся цяжкія для народа гады аднаўлення разбуранай вайной гаспадаркі і культуры. Працэсы, якія адбываліся ў пасляваенны час, характарызаваліся ўмацаваннем таталітарнай сістэмы, пашырэннем яе ўплыву на ўсе бакі сацыяльна-эканамічнага, грамадскага і духоўнага жыцця краіны.

У адносінах з канфесіямі дзяржава прадоўжыла курс на ўзмацненне кантролю за іх дзейнасцю і абмежаванне ўплыву на насельніцтва. Пастановай № 572 СНК СССР ад 19 мая 1944 г. быў арганізаваны Савет па справах рэлігійных культаў пры ўрадзе, у задачу якога ўваходзіла «ажыццяўленне сувязі пажіж Урадам СССР і кіраўнікамі рэлігійных аб’яднанняў: армяна-грыгарыянскай, стараабрадніцкай, каталіцкай, грэка-каталіцкай, лютэранскай цэркваў і мусульманскага, іўдзейскага, буддысцкага, сектанцкага веравызнанняў па пытаннях гэтых веравызнанняў, якія патрабуюць вырашэння Урадам СССР».

29 мая 1944 г. пастановай СНК СССР № 625 зацвярджалася «Палажэнне аб Савете па справах рэлігійных культаў пры СНК СССР». Яно вызначала шырокае кола пытанняў, якія былі падкантрольны і знаходзіліся ў кампетэнцыі Савета і яго Упаўнаважаных пры СНК саюзных і аўтаномных рэспублік і абл(край)выканкамах. Стварэнне такіх структур павінна было сведчыць аб «гарманічных» адносінах дзяржавы і Царквы, аб забеспячэнні свабоды сумлення ў савецкай краіне. Але на практыцы ўсё было інакш. Уладныя структуры прымалі розныя меры дзеля абмежавання дзейнасці канфесій, іх уплыву на насельніцтва, у першую чаргу на дзяцей і моладзь, выцяснення са сферы грамадскага жыцця.

З хрысціянскіх канфесій найбольш праследавалася рымска-каталіцкая, рэлігійны цэнтр якой – Ватыкан – па-ранейшаму заставаўся варожым для СССР. Да Рускай праваслаўнай Царквы савецкі ўрад праяўляў своеасаблівую лаяльнасць, ствараючы некаторыя магчымасці для царкоўнага адраджэння і пашырэння

яе ўплыву. Па-ранейшаму заставалася негатыўнае стаўленне да пратэстантаў.

Вырашальнае значэнне для далейшага лёсу ўсіх канфесій мела Усесаюзная нарада Упаўнаважаных Савета па справах рэлігійных культаў, якая адбылася ў Маскве 20 мая 1945 г. На ёй была агучана сфарміраваная ва ўрадавых колах ацэнка дзейнасці канфесій у гады Вялікай Айчыннай вайны, іх адносін з акупацыйнымі ўладамі, укладзе ў барацьбу з акупантамі. У дакладзе старшыні Савета І. Палянскага адзначалася асаблівая патрыятычная місія праваслаўнай Царквы, што «заявіла ўсім веруючым аб небяспецы, якая стала пагражаць Савецкаму Саюзу, і мабілізавала ўсіх сваіх веруючых на барацьбу з нямецкімі захопнікамі. Услед за праваслаўнай Царквой з такімі ж патрыятычнымі адозвамі выступілі кіраўнікі мусульман, армянскай, стараабрадніцкай Царквы, евангельскія хрысціяне і баптысты. Што датычыць рыма-каталіцкай і лютэранскай цэркваў, то, замест мабілізацыі веруючых на адпор ворагу, – адзначалася ў дакладзе, – яны адкрыта перайшлі на яго бок, сталі вітаць іх як вызваліцеляў ад бальшавікоў і амаль цалкам служыць інтарэсам германскага імперыялізму».

З 1945 г. пачалася рэгістрацыя рэлігійных абшчын і духавенства ўсіх канфесій. Заключаліся дагаворы аб перадачы веруючым у бестэрміновае і бясплатнае карыстанне культавых будынкаў. Гэтыя меры негатыўна ўспрыняло каталіцкае духавенства, якое расцаніла іх як умяшальніцтва ў справы Касцёла.

Адной з асаблівасцей канфесійнай палітыкі савецкай дзяржавы была перавага адміністрыравання, у выніку чаго дзейнасць рэлігійных культаў і духавенства ставілася ў строга вызначаныя рамкі, якія сама дзяржава і ўстанаўлівала. Фактычна гэта азначала ўмешванне дзяржавы ва ўнутрыцаркоўнае жыццё, кантроль за канфесіямі праз сістэму адміністрацыйных, палітычных і юрыдычных устаноў, пачынаючы ад пятага ўпраўлення КДБ да Савета па справах рэлігійных культаў. Савецкае заканадаўства было скіравана на ўзмацненне кантролю за духавенствам, прымяненне мер уздзеяння (ад пазбаўлення «справак» духоўным асобам на права займацца рэлігійнай дзейнасцю да крымінальнай адказнасці). З 1947 г. духавенству забаранялася навучанне дзяцей рэлігіі.

Распаўсюджанай формай барацьбы з рэлігіяй было закрыццё культавых устаноў і перадача іх для выкарыстання ў «народнагаспадарчых мэтах» – пад установы культуры, спортзалы і нават склады для захавання збожжа і інш. Пры гэтым культавая маёмасць нярэд-

ка знішчалася. Органы ўлады абгрунтоўвалі такія дзеянні «распадам рэлігійных абшчын», «наяўнасцю культавага будынка ў іншым населеным пункце», «адсутнасцю свяшчэнніка» і інш. Закрыццё і нават знос касцёлаў і цэркваў працягваўся да сярэдзіны 1980-х гг. Пры гэтым не ўлічвалася іх каштоўнасць як помнікаў гісторыі і культуры. Такая палітыка нанесла непараўнальна вялікі ўрон культуры Беларусі і духоўнасці беларускага народа.

З 1963 г. пры гарадскіх і раённых Саветах дэпутатаў ствараліся камісіі па кантролю за выкананнем савецкага заканадаўства аб культах. Іх важнейшая задача заключалася ў тым, каб забяспечыць канстытуцыйныя правы грамадзянам СССР на свабоду адпраўлення рэлігійных культаў і свабоду антырэлігійнай прапаганды, недапушчэнне парушэння заканадаўства з боку веруючых, духавенства і ўладных структур. На практыцы гэта прывяло да ўзмацнення кантролю за дзейнасцю рэлігійных арганізацый і духавенства, павелічэння прымянення да іх мер «уздзеяння» за дапушчаныя «парушэнні». Да ліку «парушэнняў» адносіліся хрышчэнне, шлюб без запісаў у метрычныя кнігі, так званае «прыслужванне» падлеткаў каля алтара ксяндзу падчас богаслужэння, прысутнасць у храмах непаўналетніх дзяцей, «прымусовыя паборы» з веруючых на ўтрыманне храмаў, выплата падаткаў, паломніцтва да святых месц, цудадзейных ікон і інш.

Адным з напрамкаў канфесійнай палітыкі была атэізацыя грамадскага жыцця. Атэістычная прапаганда праводзілася партыйнымі, савецкімі, камсамольскімі арганізацыямі, установамі культуры, адукацыі, таварыствам «Веды». 7 ліпеня 1954 г. была прынята пастанова ЦК КПСС «Аб буйных недахопах у прыродазнаўчай і навукова-атэістычнай прапагандзе». Яна была накіравана супраць усіх канфесій. У пастанове пераглядалася і асуджалася як «прымірэнства» папярэдняя лінія ў царкоўным пытанні. Прапаноўвалася вярнуцца на даваенны шлях «наступлення на рэлігійныя забабоны».

Выкананне пастановы суправаджалася зневажаннем пачуццяў веруючых, парушэннем іх рэлігійных правоў і свабод, што выклікала нарастанне незадавальнення ў краіне. 10 лістапада 1954 г. ЦК КПСС прыняў пастанову «Аб памылках у правядзенні навукова-атэістычнай прапаганды сярод насельніцтва». І хаця ў ёй асуджаліся выпады супраць духавенства і веруючых, але курс на ўзмацненне атэістычнай прапаганды па-ранейшаму захоўваўся. У наступныя дзесяцігоддзі ЦК КПСС і ЦК КПБ атэістычную прапаганду разглядалі як важны напрамак ідэалагічнай работы. Асаблівае значэнне

яна мела ў 1970-я – першай палове 1980-х гг., у перыяд абвастрэння ідэалагічнай барацьбы дзвюх сістэм – сацыялістычнай і капіталістычнай. Асноўны ўдар тады быў накіраваны на каталіцкі Касцёл, кіруючы цэнтр якога – Ватыкан – па-ранейшаму разглядаўся як памагаты буржуазіі.

Змяненні ў дзяржаўна-канфесійных адносінах пачалі адбывацца толькі з сярэдзіны 1980-х гг., у перыяд перабудовы ў Савецкім Саюзе.

## 8.2. Рэпрэсіі супраць духавенства

Пасляваенны перыяд азнаменаваны не толькі наступленнем дзяржавы на канфесіі, але і палітычнымі рэпрэсіямі супраць духавенства, якое абвінавачвалі ў супрацоўніцтве з нямецка-фашысцкімі акупантамі, а каталіцкае – яшчэ і за сувязь з Арміяй Краёвай, «антысавецкую агітацыю». Органы НКУС, перш чым прад'явіць абвінавачванне духоўным асобам, падвяргалі іх праверцы, сачылі за імі, збіралі кампрамат.

Арышт адбываўся пасля прад'яўлення падпісанага пракурорам ордэра. У арыштаваных праводзілі вобыск, па вопісу канфіскоўвалі маёмасць, рэчы асабістага карыстання. У турме падследчых падвяргалі шматлікім допытам, якія прадаўжаліся гадзінамі і нават на працягу некалькіх месяцаў. Следчыя дабіваліся «чыстасардэчных прызнанняў» арыштаваных у тых «злачынных дзеяннях», у якіх іх абвінавачвалі. У якасці сведкаў выступалі прыхаджане, ад якіх на допытах патрабавалі паказанняў у супрацоўніцтве свяшчэннікаў з антысавецкімі фарміраваннямі або нямецкімі акупацыйнымі ўладамі, правядзенні антысавецкай агітацыі, зрыве мерапрыемстваў савецкай улады і г. д. Сведкамі былі і настаўнікі школ, старшыні сельсаветаў, некаторыя партыйныя, савецкія, камсамольскія работнікі. Здаралася, што многія з іх нават не былі знаёмыя з абвінавачваемымі, але «штосьці» «некалі» чулі аб іх «варожай» дзейнасці. У віну духавенству ставілася таксама наяўнасць у іх рэлігійнай літаратуры, выдадзенай яшчэ ў міжваенны перыяд. Але «прызнанні» падпісваліся толькі тады, калі ахвяры былі маральна зломлены.

Арыштаваных абвінавачвалі ў злачынствах, склад і мера пакарання па якіх вызначаліся Крымінальным кодэксам БССР. Пазбаўленне свабоды не магло перавышаць 10 гадоў, але ў далейшым гэты тэрмін быў даведзены да 25 гадоў. Найбольш часта выкарыстоўваліся абвінавачванні па артыкулах 63, 72, 73, 74, 75, 76 Крымінальнага кодэкса БССР, якія давалі неабмежаваныя магчымасці для

іх прымянення. Так, напрыклад, згодна з артыкулам 63, крымінальнымі прызнаваліся любыя дзеянні, накіраваныя на звяржэнне або падрыў улады Саветаў, абранага імі ўрада, падрыў або аслабленне ўнутранай бяспекі СССР і асноўных гаспадарчых, палітычных і нацыянальных заваёў рэвалюцыі. Арыштаваных у першыя пасляваенныя гады нярэдка абвінавачвалі ў здрадзе Радзіме (арт. 63-1, -2, -3, -4). Санкцыі па гэтым артыкуле прадугледжвалі вышэйшую меру пакарання з канфіскацыяй усёй маёмасці. У 1947 г. смяротнае пакаранне было адменена, аднак яно аўтаматычна замянялася на 25 гадоў прабывання ў папраўча-працоўных лагерах.

Следства заканчвалася судом. Ваенны трыбунал войск МУС выносіў прыгавор, які, як правіла, не падлягаў змякчэнню нават пасля звароту асуджанага ў вышэйстаячыя судовыя інстанцыі. Галоўным абвінавачваннем было, па версіі органаў, якія выносілі прысуд, супрацоўніцтва з акупацыйнымі ўладамі, «праводзімая актыўная антысавецкая і здрадніцкая дзейнасць на карысць немцаў». Больш таго, многіх з рэпрэсіраваных святароў следчыя органы стараліся «выкрываць» у супрацоўніцтве з замежнымі разведкамі ў 1920–1930-я гг. Абвінавачваемыя не прызнавалі такіх несправядлівых прыгавораў, аднак іх скаргі ў вышэйстаячыя інстанцыі заставаліся без задавальнення. З 1944 г. па 1953 г. у Беларусі былі рэпрэсіраваны 102 ксяндзы. З 1944 г. па 1948 г. падвергліся рэпрэсіям 78 праваслаўных святароў. Адбываць пакаранне асуджаных накіроўвалі ў лагеры, якія знаходзіліся на Урале, у Сібіры, Казахстане. Мала каму ўдалося адтуль вярнуцца.

У апошнія дзесяцігоддзі тэма палітычных рэпрэсій супраць духавенства актыўна даследавалася як беларускімі, так і польскімі, расійскімі даследчыкамі. Апублікавана шмат артыкулаў, манаграфій, у якіх апавядаецца пра зламаныя лёсы соцен людзей, як правіла, беспадстаўна абвінавачаных. Толькі пасля смерці Сталіна з лагераў паступова пачалі вызваляць ахвяр палітычных рэпрэсій, былі сярод іх і духоўныя асобы. Праўда, працэс іх рэабілітацыі распачаўся толькі ў канцы 1980-х гг. 16 студзеня 1989 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР прыняў Указ «Аб дадатковых мерах па аднаўленні справядлівасці ў адносінах ахвяр рэпрэсій, якія мелі месца ў перыяд 1930–1940-х – пачатку 1950-х гг.». Ён быў заклікаць паскорыць працэс рэабілітацыі і аднаўлення сацыяльнай справядлівасці, ліквідаваць беззаконне ў адносінах соцен тысяч бязвінна пацярпелых грамадзян. Паводле Указа рэабілітоўваліся асуджаныя ў свой час па рашэнні «троек» УНКУС, калегіямі АДПУ і «асобых на-

рад» НКУС – МДБ – МУС СССР. Гэтае правіла не распаўсюджвалася на здраднікаў Радзімы, карнікаў перыяду Вялікай Айчыннай вайны, нацысцкіх злачынцаў, удзельнікаў нацыяналістычных бандфарміраванняў і іх саўдзельнікаў і некаторых іншых катэгорый.

Важнае значэнне ў справе рэабілітацыі духавенства маюць заканадаўчыя акты, прынятыя ў рэспубліцы: «Палажэнне аб парадку аднаўлення правоў грамадзян, пацярпелых ад рэпрэсій у 20–50-я гады» (зацверджана ВС БССР 21 снежня 1990 г.), «Аб парадку рэабілітацыі ахвяр палітычных рэпрэсій 20–50-х гадоў у Беларускай ССР» (Пастанова ВС БССР ад 6 чэрвеня 1991 г.) і інш. Працэс рэабілітацыі працягваецца. На жаль, няма апублікаваных звестак як аб самім працэсе рэабілітацыі, так і аб колькасці рэабілітаваных. Аднаўленне гістарычнай праўды пойдзе на карысць грамадству, родным і блізкім тых, хто ў свой час быў рэпрэсіраваны савецкай уладай.

## 8.3. Праваслаўная Царква і яе дзейнасць

На становішча праваслаўнай Царквы ў БССР у пасляваенныя дзесяцігоддзі ў многім аказала уплыў патрыятычная пазіцыя, якую заняла Маскоўская Патрыярхія і непасрэдна патрыярх Сергій (Страгародскі) у гады Вялікай Айчыннай вайны. Лаяльнасць праваслаўнай Царквы да савецкай дзяржавы забяспечыла ёй лепшыя ўмовы існавання, чым каталіцкаму Касцёлу. Немалаважнае значэнне мела антыватыканская пазіцыя кіраўніцтва РПЦ, якая супадала з пазіцыяй савецкай дзяржавы. Маскоўская Патрыярхія ацэньвала пазіцыю Рыма як непрыхільную для праваслаўя, а савецкае кіраўніцтва ў Ватыкане бачыла памагатага самых рэакцыйных колаў буржуазіі.

Усё гэта, аднак, не перашкаджала савецкаму ўраду закрываць цэрквы, выкарыстоўваць іх у «народнагаспадарчых мэтах», учыняць ганенні на духавенства.

Дзейнасць РПЦ у Беларусі праходзіла пад уплывам ідэалогіі Маскоўскай Патрыярхіі, якая фарміравалася ў 1940–1950-я гг. Яшчэ патрыярх Сергій (Страгародскі), мітрапаліты Алексій (Сіманскі), Мікалай (Ярушэвіч) сфармулявалі дактрыну патрыятычнага служэння праваслаўнай супольнасці сваёй Айчыне. Патрыятызм яны тлумачылі ўзвышана-рэлігійнымі настроямі праваслаўнага чалавека. Прыклады такіх настрояў давалі факты гераізму на фронце і ў тыле. Рухаючая сіла патрыятызму – любоў да Радзімы – можа

і павінна праяўляцца ў гатоўнасці ахвяраваць за яе жыццё. На працягу дзесяцігоддзяў дактрына «патрыятычнага служэння» была тым сродкам, дзякуючы якому Царква існавала ў атэістычнай дзяржаве.

Агульныя тэндэнцыі ў палітыцы Рускай праваслаўнай Царквы праяўляліся і ў дзейнасці Мінскай і Беларускай епархіі. Духавенства ў большасці сваёй падтрымлівала савецкую ўладу, займала ў адносінах да яе лаяльную пазіцыю.

Пасля вызвалення Беларусі ад нямецкіх захопнікаў кіраўніцтва праваслаўнай Царквой у Беларусі ажыццяўляў епіскап Васілій (Ратміраў) (1881–1970 гг.). Вайна нанесла Царкве значныя страты. Многія храмы былі разбураны падчас ваенных дзеянняў. У 1945 г. на ўліку дзеючых было 705 цэркваў, у 1947 г. – 906, у 1948 г. – 1050. Адразу пасля вайны засталося 556 святароў, 97 дыяканаў, 318 псаломшчыкаў. Каля 500 месцаў былі вакантнымі. З 1945 г. па 1953 г. у сан святароў было ўзведзена 225 чалавек, псаломшчыкаў – 113 чалавек. Сярод іх 72 выпускнікі Жыровіцкай духоўнай семінарыі. Найбольшая праблема з кадрамі існавала ва ўсходніх абласцях БССР. Некаторыя святары пакінулі прыходы, баючыся рэпрэсій.

Змяншалася колькасць наведвання храмаў праваслаўнымі веруючымі. Прычына была ў тым, што нярэдка ў нядзелю ці ў рэлігійныя святы калгаснікі павінны былі працаваць у калгасах. Мясцовыя органы ўлады мелі права адхіляць хадайніцтвы веруючых аб утварэнні новых прыходскіх абшчын. Задаволіць жа іх мог толькі Савет па справах РПЦ у Маскве, які назіраў за тым, каб колькасць прыходаў не перавышала вызначанай нормы. У 1944–1947 гг. у БССР быў атрыманы дазвол на адкрыццё толькі 17 храмаў. У 1950 г. па патрабаванню ўлад былі забаронены хрэсныя хады і служэнне водасвятных малебнаў на рэках. З 1950-х гг. не сталі прызначацца епіскапы на новаўтворныя кафедры, таму адзінай епархіяй у БССР доўгі час заставалася Мінская. У 1954 г. у Беларусі засталося 967 дзеючых праваслаўных цэркваў, з іх 759 (78,5 %) знаходзіліся ў заходніх абласцях. Духоўнае пастырства ажыццяўлялі 2 архіерэі, 743 святары, 47 дыяканаў.

За ўнутрыцаркоўным жыццём пільна сачылі партыйныя і савецкія органы, КДБ. Вялася антырэлігійная прапаганда. Духавенства было абкладзена вялікімі падаткамі. З пачатку 1960-х гг. духавенства фактычна было адхілена ад кіраўніцтва царквой, паколькі кіруючыя функцыі перадаваліся выканаўчым органам абшчыны. Частай была змена кадраў у прыходах.

Найбольшыя ганенні на праваслаўную Царкву назіраліся ў так званы «хрушчоўскі» перыяд. Курс на пабудову камунізму, абвешчаны на XXII з'ездзе КПСС у 1961 г., прывёў да новых антырэлігійных дзеянняў партыі і ўрада. Інструкцыі, якія зыходзілі ад партыйна-савецкага кіраўніцтва, абмяжоўвалі збор сродкаў ад веруючых на царкоўныя патрэбы, на будаўніцтва і куплю дамоў для прычта (служыцеляў культу), змяншалі сродкі на рамонт храмаў.

Толькі за адзін год, з 1 студзеня 1960 г. да 1 студзеня 1961 г., колькасць праваслаўных храмаў па краіне скарацілася на 1392, пры гэтым у Беларусі колькасць дзеючых цэркваў скарацілася на 212 – з 944 да 732.

Разам з тым вышэйшае кіраўніцтва РПЦ быццам бы і не заўважала ўсяго трагізму сітуацыі. У лютым 1967 г. патрыярх Алексій у інтэрв'ю італьянскай газеце «Corriera della Sera» сказаў: «Лічым шчаслівым тое, што наша Царква існуе ва ўмовах сацыялістычнага ладу. У цяперашні час наш народ рыхтуецца да ўрачыстага святкавання 50-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Рыхтуемся да гэтага і мы, веруючыя грамадзяне, паколькі высока ацэньваем тое шчасце, якое прынесла народам нашай краіны Кастрычніцкая рэвалюцыя».

Тым не менш па ўказанні органаў улады адхіляліся хадайніцтвы веруючых аб вяртанні храмаў, рэгістрацыі царкоўных абшчын. І хаця Упаўнаважаныя па справах РПЦ пры Савеце Міністраў СССР рэкамендавалі сваім упаўнаважаным у рэспубліках і абласцях уважліва адносіцца да вырашэння пытанняў, звязаных з адабраннем у веруючых цэркваў або іх зломе ці пераабсталяванні, працэс набіраў тэмпы. Цэрквы выкарыстоўваліся як складскія памяшканні, клубы, кінатэатры, перадаваліся розным суб'ектам гаспадарання або разбіраліся на будаўнічыя патрэбы. Антырэлігійная палітыка, якая праводзілася савецкай уладай, не дазваляла бачыць у храме духоўную каштоўнасць. Улады не лічыліся з тым, што для веруючых храм – гэта Дом Божы, і яго руйнаванне зневажала пачуцці людзей.

У 1970-я гг. новая хваля атэістычнай прапаганды і абмежаванняў дзейнасці Царквы была звязана з узмацненнем ідэалагічнай барацьбы сацыялістычнай і капіталістычнай сістэм. Тым не менш, згодна з сацыялагічнымі даследаваннямі, назіраўся рост масавай рэлігійнасці і павышэнне ўзроўню адукацыі веруючых, што сведчыла аб павароце да рэлігіі інтэлігенцыі.

У 1970–1980-я гг. палепшыліся адносіны паміж праваслаўнай і каталіцкай цэрквамі. Гэта адбылося таму, што пасля Другога Ва-

тыканскага сабора (1962–1965 гг.) каталіцкі Касцёл стаў на экуменічную пазіцыю. І хаця адносіны да экуменізму ў праваслаўнай Царквы былі адмоўныя, яна была зацікаўлена ў развіцці міжканфесійнага дыялогу з іншымі хрысціянскімі цэрквамі. Да таго ж перад чалавецтвам паўставала ўсё больш глабальных праблем, вырашэнне якіх патрабавала намаганняў усіх людзей добрай волі, у тым ліку і хрысціянскіх цэркваў. Адбываліся сумесныя богаслужэнні ў абарону міру, на якіх прысутнічалі духоўныя асобы праваслаўнай і каталіцкай канфесій. Аднак больш цеснаму ўзаемадзеянню перашкаджалі як кананічныя разыходжанні, так і палітычныя, у першую чаргу ўніяцкая праблема. Праваслаўная Царква не прызнавала і не прызнае ўніятаў, лічыць унію некананічнай, у той жа час каталіцкі Касцёл асуджае прымусовае ўключэнне па ўказанню І. Сталіна ў 1945 г. у праваслаўе больш як 5 млн католікаў візантыйскага абраду.

Ва ўмовах атэізацыі грамадства, закрыцця храмаў нярэдка на вялікай тэрыторыі заставаліся дзеючымі або касцёл, або царква. І тады веруючыя, незалежна ад веравызнання, наведвалі гэты храм, спасылаючыся на тое, што вера адна – хрысціянская. Былі выпадкі, калі католікі запрашалі да сябе праваслаўных свяшчэннікаў, каб асвяціць дом, хрысціць дзяцей, адпяваць памерлага. Праваслаўныя, калі не было паблізу царквы, звярталіся з такімі ж просьбамі да ксяндзоў.

Перабудова, якая праводзілася ў 1985–1990 гг. у СССР і БССР, спыніла ганенні на праваслаўную і іншыя цэрквы. Распачалося адкрыццё прыходаў, веруючым вярталіся царкоўныя будынкі. У 1988 г. у Беларусі шырока адзначалася 1000-годдзе Хрышчэння Русі. У 1989 г. быў створаны Беларускі Экзархат Маскоўскага Патрыярхату (Беларуская праваслаўная Царква) на чале з Мінскім мітрапалітам Філарэтам (Вахрамеевым) (нар. 21.4.1935).

## 8.4. Каталіцкі Касцёл: становішча ў грамадстве, напрамкі дзейнасці

Становішча каталіцкага Касцёла ў пасляваенны перыяд значна адрознівалася ад становішча іншых канфесій. Адна з галоўных прычын недаверу савецкай улады да каталіцызму заключалася ў тым, што гэта была адзіная ў СССР рэлігійная арганізацыя, кіраўніцтва якой знаходзілася за мяжой. Адносіны СССР і Ватыкана былі варожымі, «пацяпленне» адбылося фактычна толькі ў канцы 1980-х гг. Пасля

вайны каталіцкае духавенства абвінавачвалася ў сувязі з нямецкім акупантам, шпіянажы на карысць замежных разведак, антысавецкай дзейнасці і інш.

У 1945 г. у шасці заходніх абласцях (Баранавіцкай, Брэсцкай, Пінскай, Гродзенскай, Маладзечанскай, Полацкай) налічвалася 325 касцёлаў, 188 ксяндзоў. Ва ўсходніх абласцях было толькі 33 касцёлы, не занятыя пад склады і культурна-асветніцкія ўстановы, але і яны не функцыянавалі. Колькасць дзеючых рэлігійных абшчын і духавенства пастаянна змяншалася і ў канцы 1980-х гг. склала 121 абшчыну і каля 100 ксяндзоў. Асаблівасцю касцёла ў Беларусі быў той факт, што ён не меў сваёй уласнай касцёльнай адміністрацыі. Прапановы віленскага епіскапа Рамуальда Ялбжыкоўскага, а затым ксяндза Адама Станкевіча ў 1944 і 1946 гг. савецкаму ўраду наконт стварэння касцёльнай адміністрацыі былі пакінуты без увагі. У 1960–1970-я гг. па гэтай прычыне дэканаты, якія былі размешчаны ў Гродзенскай і Брэсцкай абласцях, у кананічных адносінах былі падпарадкаваны польскім адміністрацыйна-касцёльным упраўленням – Беластоцкай і Драгічынскай епархіям. У 1944–1946 гг. колькасць духавенства і веруючых значна зменшылася ў сувязі з выездам у Польшчу польскага насельніцтва з тэрыторыі БССР.

У перыяд так званай «хрушчоўскай адлігі» наступленне ўладных структур на Касцёл працягвалася. Шырокі размах набылі атэістычная прапаганда і дзейнасць устаноў адукацыі і культуры па фарміраванні матэрыялістычнага светапогляду насельніцтва, асабліва дзяцей і моладзі. Працягваўся курс на закрыццё касцёлаў і выкарыстанне іх «у народнагаспадарчых і культурна-асветніцкіх мэтах». Так, калі ў 1953 г. у БССР было 278 дзеючых касцёлаў, то ў 1969 г. – 112. Адначасова змяншалася колькасць ксяндзоў. У 1962 г. іх налічвалася 215, у 1969 г. – 135, у сярэдзіне 1980-х гг. – каля 50 чалавек. Падрыхтоўка маладых кадраў духавенства ажыццяўлялася тайна ксяндзамі старэйшага пакалення і наступным іх рукапалажэннем у сан у Польшчы або Літве.

Характэрнай асаблівасцю дзейнасці каталіцкага Касцёла ў заходніх абласцях БССР была яго «польская накіраванасць». Прычыны заключаліся ў тым, што асноўная колькасць рэлігійных абшчын знаходзілася на Гродзеншчыне, дзе больш за ўсё пражывала польскай нацыянальнай меншасці – католікаў па веравызнанні. Касцёл для іх выконваў ролю не толькі рэлігійнай установы, але і нацыянальна-культурнага асяродка, а выкарыстанне польскай мовы ў набажэн-

ствах было важным фактарам нацыянальнай самаідэнтыфікацыі. Да таго ж каталіцкае духавенства атрымала адукацыю ў міжваенны перыяд у Польшчы, таму цвёрда захоўвала традыцыі польскага Касцёла. Аднак сярод католікаў было нямала беларусаў. Богаслужэнні на беларускай мове не праводзіліся.

Становішча каталіцкага Касцёла ўскладнялася працягам эканамічнага ўціску, шматразова завышанымі падаткамі, аплачваць якія за кошт веруючых расцэньвалася органамі ўлады як парушэнне савецкага заканадаўства аб культах. Пад жорсткім кантролем дзяржаўных органаў знаходзілася фінансава-гаспадарчая дзейнасць рэлігійных абшчын, выкананне веруючымі абрадаў, навучанне дзяцей рэлігіі, дзейнасць духавенства і інш.

Касцёл у Беларусі меў цесныя сувязі з Касцёлам у Польшчы і Літве, таму беларускае духавенства ведала аб змяненнях, якія адбываліся ў літургіі і рэлігійным жыцці. Дзякуючы геаграфічнай блізкасці з Літвой туды выязджалі многія веруючыя, асабліва з прыгранічных раёнаў, для правядзення там абрадаў хрышчэння і шлюбу, паколькі ў Беларусі свабодна іх здзяйсняць забаранялася. Многія наведвалі санктуарый Маці Божай Вострабрамскай, які знаходзіўся ў Вільнюсе. У літоўскіх касцёлах веруючыя набывалі абразы, ружанцы, малітоўнікі, рэлігійную літаратуру.

Важнае значэнне для Касцёла ўсеагульнага, а таксама і ў Беларусі, меў Другі Ватыканскі сабор (1962–1965 гг.). Прынятыя на ім дакументы і іх рэалізацыя садзейнічалі абнаўленню (aggiornamento) дзейнасці Касцёла. Пасля сабора распачынаюцца працэсы, якія ўсё больш уключаюць каталіцкі Касцёл у вырашэнне актуальных праблем сучаснасці, патрабуюць прыстасавання яго вучэння да зменлівых патрэб цывілізацыйнага развіцця чалавецтва, прадухілення адыходу ад Касцёла шырокіх мас веруючых, асабліва моладзі.

Сабор дазволіў увядзенне ў літургію мясцовых моў замест латыні, унёс змяненні ў правядзенне некаторых абрадаў і сакрамантаў (таінстваў). Улічваліся і сацыяльныя змены, якія адбываліся ў секулярызаваным свеце, агульны ўздым палітычнага і культурнага ўзроўню насельніцтва, дасягненні навукі і тэхнікі і інш.

Ужо ў 1964 г. некаторыя ксяндзы Беларусі пачалі адпраўляць рэлігійныя абрады (хрышчэнне, шлюб, пахаванне) на польскай мове, а не на лаціне. Новыя трэбнікі паступалі з Польшчы па пошце або праз прыватных асоб. Уводзіліся пэўныя змены ў набажэнствы. Духавенства ў сваёй пастырскай дзейнасці асноўны акцэнт ставіла на праблемы маралі, выхавання дзяцей у рэлігійным духу,

на павышэнне рэлігійнай культуры веруючых. Узмацнялася ўвага да сям'і як да «малога касцёла», дзе ўсе члены павінны былі аб'ядноўвацца супольнай малітвай, захоўваць рэлігійныя традыцыі і звычаі, каталіцкую веру. У заходніх абласцях рэспублікі Касцёл імкнуўся адрадзіць сваю місію ў справе фарміравання самасвядомасці, культуры, традыцый, звычаяў польскай нацыянальнай меншасці. Духавенства запэўнівала веруючых, што кожны паляк – католік, кожны католік – паляк.

Дзейнасць каталіцкага Касцёла, у тым ліку ў Беларусі, значна актывізавалася ў перыяд пантыфікату папы рымскага Яна Паўла II (1978–2005 гг.), польскага кардынала Кароля Вайтылы. Ян Павел II – першы ў гісторыі Святога Прастола папа-славянін. З першых дзён яго пантыфікату стала відавочна, што ў палітыцы Ватыкана адбудуцца глабальныя змены. Намаганні папы і Апостальскай Сталіцы былі накіраваны на забеспячэнне свабоды дзейнасці каталіцкага Касцёла, перш за ўсё ў краінах сацыялізму, дзе рэлігійнае жыццё было на грані затухання, уключэнне Касцёла ў вырашэнне актуальных праблем сучаснасці, рэалізацыю рэлігійных правоў і свабод чалавека. Вучэнне папы ставіць чалавека, яго правы і годнасць у цэнтр усёй складанай рэчаіснасці, а таксама яе палітычнага вымярэння. «Не Касцёл павінен быць дарогай чалавека, а чалавек – дарогай Касцёла», – сцвярджаў папа.

Пад уплывам перамен, якія адбываліся ў 1980-я гг., значна актывізавалася дзейнасць католікаў у Беларусі. Яны ўсё больш патрабавалі ад улад забяспечыць рэалізацыю канстытуцыйных правоў і свабод чалавека, вярнуць касцёлы, якія былі незаконна адабраны, дазволіць ксяндзам з Літвы або Польшчы працаваць у пустуючых парафіях, не забараняць навучаць дзяцей рэлігіі, бесперашкодна прыводзіць іх у касцёл.

## 8.5. Пашырэнне ўплыву пратэстанцкіх абшчын

На 1 кастрычніка 1946 г. у БССР на ўліку было 277 пратэстанцкіх абшчын, у якіх налічвалася 15 860 веруючых, з іх 11 247 – у заходніх, 4653 – ва ўсходніх абласцях. У 1948 г. колькасць зарэгістраваных абшчын склала 235, а колькасць веруючых – каля 16 тысяч. Такім чынам, пратэстанцкія секты, як іх называла савецкая ўлада, нягледзячы на жорсткую рэлігійную палітыку, працягвалі развіваць сваю місіянерскую дзейнасць.

Палітыка савецкай улады ў дачыненні да пратэстантаў была скіравана на стрымліванне росту і дзейнасці абшчын, адмову ім у рэгістрацыі. У сувязі з гэтым абшчыны перайшлі на нелегальнае становішча. Веруючых запалохвалі рэпрэсіямі. Ганенні ўзмацніліся ў сувязі з правядзеннем суцэльнай калектывізацыі ў заходніх абласцях БССР у канцы 1940-х – пачатку 1950-х гг. Як правіла, пратэстанты не хацелі ўступаць у калгасы. Да судовай адказнасці «за падбухторванне» былі прыцягнуты некаторыя прэсвітары. Але запалохаць веруючых не ўдалося, і яны прадаўжалі адпраўляць абрады тайна.

Найбольш моцнымі былі пазіцыі баптыстаў у заходніх раёнах, дзе касцёлы былі закрыты. У канцы 1954 г. у БССР дзейнічала 155 абшчын баптыстаў (больш 55 тысяч чалавек).

У 1946 г. афіцыйнага прызнання дабіліся шэсць арганізацый Адвентыстаў Сёмага Дня ў Брэсцкай, Гродзенскай, Віцебскай і Пінскай абласцях. Адвентысты мелі свой цэнтр, які быў створаны пасля вайны, – Усесаюзны савет АСД, але ён быў распушчаны ў 1963 г. за незаконную дзейнасць. АСД негатыўна адносіліся да мерапрыемстваў савецкай улады, не прызнавалі ўсеагульную воінскую павіннасць, юнакі адмаўляліся служыць у арміі. Школьнікі не наведвалі ў суботу школы, удзельнічалі ў малебнах, спявалі ў хорах. Забароны і абмежаванні расцэньваліся адвентыстамі як выпрабаванні, пасланыя Богам, і яшчэ больш умацоўвалі іх у правасце сваёй справы.

Да 1954 г. у БССР дзейнічала каля 80–100 цэркваў Хрысціян Веры Евангельскай, арганізацыйна аформіліся чатыры раённыя аб'яднанні: Палескае, Навагрудскае, Віленска-Маладзечанскае і Брэсцка-Пружанскае.

З 1953 па 1958 гг. адбывалася «пацяпленне» палітычнага клімату. Аднак гэта не адбілася на дзейнасці абшчын АСД, іегавістаў, ЕХБ у БССР.

У пачатку 1960-х гг. у пратэстантаў СССР узнік апазіцыйны рух, які прывёў да расколу УСЕХБ і фарміравання альтэрнатыўнага міжцаркоўнага органа – Савета Цэркваў ЕХБ (СЦ ЕХБ). На чале гэтага руху стаялі маладыя прэсвітары – Г. К. Кручкоў і Р. П. Вінс. Сутнасць іх дзейнасці заключалася ў тым, каб арганізаваць масавы рух веруючых з патрабаваннем змяніць савецкае заканадаўства. Але спачатку, на іх думку, неабходна было выкараніць тое прыстасаванства служыцеляў УСЕХБ, якое дазваляла гэтай інстытуцыі існаваць ва ўмовах таталітарнай дзяржавы і якое Савет Цэркваў лічыў грахоўным адступленнем ад Божай ісціны. У 1963 г. СЦ ЕХБ канчаткова сфарміраваўся і выпусціў першы нумар афіцыйнага друкаванага

органа – часопіс «Вестник Спасения» (зараз выходзіць пад назвай «Вестник Истины»). У цэрквах, якія ўваходзілі ў СЦ ЕХБ, колькасць веруючых дасягала дзясяткі тысяч. СЦ ЕХБ ігнараваў савецкае заканадаўства аб культах, аказваў дапамогу веруючым, якія ў выніку ганенняў аказаліся ў месцах пазбаўлення волі, і іх сем'ям. Амаль усе цэрквы, якія ўваходзілі ў СЦ ЕХБ, не мелі рэгістрацыі. Богаслужэнні праводзіліся на кватэрах, прыватных дамах, а іншы раз і ў лесе. Падобны рух, хаця і не такі масавы, узнік і ў іншых пратэстанцкіх канфесіях. У пяцідзясятнікаў з'явілася брацтва незарэгістраваных абшчын, вядомае як Аб'яднаная царква хрысціян веры евангельскай. Свой рух «незарэгістраваных» быў і ў Адвентыстаў сёмага дня.

У 1960–1970-я гг. у СССР і БССР узмацняецца ціск на рэлігію і Царкву. 1 красавіка 1966 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР прыняў пастанову «Аб прымяненні артыкула 142 Крымінальнага кодэкса БССР» за арганізацыю і сістэматычнае правядзенне рэлігійных сходаў, шэсцяў і іншых цырымоній культу, якія парушаюць грамадскі парадак; арганізацыю і сістэматычнае правядзенне заняткаў па навучанню непаўналетніх дзяцей рэлігіі і інш. Як вынік, адбывалася скарачэнне зарэгістраваных абшчын ЕХБ і веруючых. На 1 студзеня 1970 г. у БССР было 147 зарэгістраваных абшчын ЕХБ. Да іх адносіліся пяцідзясятнікі (100 груп), АСД (7 груп), а таксама іегавісты. У 1970 г. па рэспубліцы да адміністрацыйнай адказнасці было прыцягнута 388 чалавек, у асноўным з абшчын ХВЕ і ЕХБ. З пачатку 1980-х гг. становішча пратэстантаў у БССР паляпшаецца. У гэтыя гады павялічваецца колькасць абшчын ЕХБ. У 1984 г. іх было зарэгістравана 172 з колькасцю веруючых 14 615.

Актывізацыя дзейнасці пратэстанцкіх абшчын, як і іншых рэлігійных арганізацый, назіраецца ў канцы 1980-х гг. Кропкай адліку сталі ўрачыстасці з нагоды 1000-годдзя Хрышчэння Русі. У абшчынах атрымалі развіццё ўсе напрамкі рэлігійнага жыцця: адкрыццё нядзельных школ, дзейнасць місій, адкрыццё біблейскіх курсаў і інш. Да 1988 г. у БССР было зарэгістравана 13 абшчын АСД, а ў 1991 г. – рэспубліканскае аб'яднанне «Беларуская канферэнцыя АСД».

## Тэма 9

# РЭЛІГІЯ І ЦАРКВА Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

*9.1. Змяненне дзяржаўна-канфесійных адносін і іх уплыў на актывізацыю рэлігійнага жыцця.*

*9.2. Павышэнне ролі Беларускай праваслаўнай Царквы ў грамадстве.*

*9.3. Дзейнасць каталіцкага і грэка-каталіцкага Касцёла.*

*9.4. Асаблівасці развіцця пратэстантызму.*

*9.5. Іўдаізм, іслам, нетрадыцыйныя рэлігіі ў канфесійнай структуры Беларусі.*

## 9.1. Змяненне дзяржаўна-канфесійных адносін і іх уплыў на актывізацыю рэлігійнага жыцця

Абвяшчэнне суверэнітэту БССР садзейнічала змяненню ролі рэлігіі ў беларускім грамадстве. Да прычын, якія спрыялі адраджэнню канфесій, адносяцца:

- дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця;
- запаўненне ідэалагічнага вакууму ў сувязі з крызісам камуністычнай ідэалогіі;
- прызнанне прыярытэту хрысціянскіх духоўных каштоўнасцей перад іншымі;
- магчымасць адкрыта выказваць сваю рэлігійную прыналежнасць той часткай насельніцтва, якая, па розных меркаваннях, яе скрывала;
- радыкальныя змяненні ў дзяржаўна-царкоўных адносінах;
- прызнанне дзяржавай пазітыўнай ролі рэлігіі і Царквы ў гістарычным і сацыякультурным развіцці грамадства;
- своеасаблівая мода на рэлігійную культуру;
- асэнсаванне пэўнай часткай людзей рэлігіі як гаранта стабільнасці грамадства і інш.

Хуткае адраджэнне рэлігійнага жыцця патрабавала прыняцця новага заканадаўства, у якім замацоўваўся б прынцыпова новы статус дзяржаўна-канфесійных адносін і роля Царквы ў грамадстве. 9 студзеня 1993 г. пачаў дзейнічаць Закон Рэспублікі Беларусь «Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях». Ён стаў кропкай адліку ў фарміраванні дэмакратычных падыходаў да пытанняў свабоды сумлення. Устанаўлівалася роўнасць рэлігій перад законам, права грамадзян свабодна вызначаць свае адносіны да рэлігіі. Абвяшчаўся прынцып неўмяшальніцтва дзяржавы ў справы рэлігійных арганізацый, няўдзел апошніх у палітычнай барацьбе і інш.

Аднак у 2002 г. у Закон былі ўнесены некаторыя змяненні. Так, у яго прэамбуле хаця і дэкларавалася роўнасць рэлігій перад законам, аднак быў ацэнены ўклад кожнай з канфесій у гістарычнае

і культурнае развіццё Беларусі. Прызнавалася «вызначальная роля Праваслаўнай царквы ў гістарычным станаўленні і развіцці духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа». За каталіцкім Касцёлам адзначалася толькі «духоўная, культурная і гістарычная роля на тэрыторыі Беларусі». Што да Евангелічна-Лютэранскай Царквы, іўдаізму і ісламу, то тут была адзначана «неаддзельнасць іх ад агульнай гісторыі народа Беларусі».

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка ўдзяляе вялікую ўвагу пытанням дзейнасці рэлігійных арганізацый. Традыцыйнымі сталі яго сустрэчы з членамі Сінода праваслаўнай Царквы і кіраўніцтвам Рымска-каталіцкага Касцёла ў Рэспубліцы Беларусь. Апарат Упаўнаважанага па справах рэлігіі і нацыянальнасцей Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы дзяржаўнага кіравання ажыццяўляюць узаемадзеянне з рэлігійнымі арганізацыямі ў вырашэнні сацыяльна значных пытанняў, прымаюць меры па папярэджанні парушэнняў дзеючага заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Асаблівасцю рэлігійнага жыцця посткамуністычнай Беларусі стаў рост колькасці рэлігійных арганізацый. З 1988 г. па 2009 г. іх колькасць павялічылася больш чым у тры разы. На пачатак 2015 г. у рэспубліцы налічвалася больш за 3,4 тысячы рэлігійных абшчын, якія належалі да 25 канфесій і напрамкаў. Рэлігійныя арганізацыі маюць свае цэнтры, манастыры, місіі, духоўныя адукацыйныя ўстановы, выдавецтвы і інш.

Паводле дадзеных за 2012 г., у Беларусі дзейнічалі 1531 праваслаўная, 494 каталіцкія, больш за 1 тысячу пратэстанцкіх абшчын. Па абласцях рэспублікі яны размяшчаюцца нераўнамерна. Так, найбольшая колькасць абшчын праваслаўнай Царквы ў Брэсцкай вобласці (378), найменшая – у Магілёўскай (129). Каталіцкіх абшчын больш у Гродзенскай вобласці (91), менш – у Гомельскай (17) і Магілёўскай (40). Пратэстанцкія абшчыны традыцыйна больш распаўсюджаны ў Брэсцкай вобласці (303), менш – у Гродзенскай (85) і Магілёўскай (86).

Асноўнай крыніцай інфармацыі аб канфесійным складзе краіны з’яўляюцца сацыялагічныя даследаванні. У адпаведнасці з артыкулам 5 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях» ніхто не абавязаны паведамляць аб сваіх адносінах да рэлігій і не можа падвяргацца якому-небудзь прымусу пры вызначэнні сваіх адносін да вызнання той або іншай рэлігіі, да ўдзелу або няўдзелу ў дзейнасці рэлігійных арганізацый. Па гэтай

прычыне пытанне аб веравызнанні не ўключаецца як абавязковае пры дзяржаўным перапісе насельніцтва.

Па дадзеных Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, праведзеныя ў 2012 г. сацыялагічныя даследаванні паказалі, што 95,5 % насельніцтва аднесла сябе да той або іншай рэлігіі, з іх: 83 % – праваслаўныя (77 % ад агульнай колькасці насельніцтва); 10 % – каталікі (9,5 % ад агульнай колькасці насельніцтва); 1,5 % – іншыя рэлігіі. Аднак сярод тых, хто заявіў аб сваёй канфесійнай прыналежнасці, 21,5 % рэспандэнтаў не змаглі даць адназначнага адказу на пытанне, ці з'яўляюцца яны веруючымі. З усіх апытаных далі адназначны адказ аб сваёй веры ў Бога 65 % рэспандэнтаў. Варта адзначыць таксама наяўнасць вялікай колькасці атэістаў або людзей, якія абыякава адносяцца да рэлігіі. Не ідэнтыфікуюць сябе ні з адной з рэлігіяй 12 % насельніцтва. Доля веруючых у агульнай колькасці дарослага насельніцтва складае прыкладна 50 %, каля 8 % вераць не ў Бога, а ў духоўныя звышнатуральныя сілы. Да няверуючых увогуле адносяць сябе каля 13 % насельніцтва.

Размеркаванне рэлігійных абшчын у Беларусі мае дакладна вызначаную мяжу, якая раздзяляе Беларусь на дзве часткі – усходнюю і заходнюю. Заходнія вобласці характарызуюцца больш высокім узроўнем рэлігійнасці: каля 70–80 % насельніцтва веруючыя, тут сканцэнтравана большая колькасць абшчын, чым ва ўсіх абласцях.

Істотнай тэндэнцыяй у апошнія гады, у адрозненне ад 1990-х гг., з'яўляецца зніжэнне наведвання храмаў. Рэгулярна іх наведваюць і ўдзельнічаюць у набажэнствах ад 10 % да 19 % праваслаўных веруючых, пры гэтым ніколі не наведваюць царкву каля 20 % праваслаўных. Доля каталікаў знізілася з 53 % у 1994г. да 26,5 % у 2004 г., а доля пратэстантаў – з 94 % да 72 %.

На думку многіх даследчыкаў, як беларускіх, так і польскіх, у Беларусі па-ранейшаму захоўваецца пэўная сувязь паміж нацыянальнай і рэлігійнай прыналежнасцю. Па дадзеных Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, праваслаўнае веравызнанне ідэнтыфікуюць са сваёй этнічнай прыналежнасцю 78,2 % беларусаў, 81,2 % рускіх, 68,4 % украінцаў, 28,6 % палякаў. Каталікамі, у сваю чаргу, лічаць сябе 80,1 % палякаў, 25,6 % беларусаў і 4,8 % рускіх.

Дзякуючы новаму заканадаўству ўсе канфесіі атрымалі магчымасць не толькі актыўна праводзіць місіянерскую дзейнасць, але і

прымаць удзел у грамадска-палітычным, сацыякультурным жыцці, займацца дабрачыннай і асветніцкай дзейнасцю. Рэлігійны фактар стаў адным з важнейшых ва ўнутранай і знешняй палітыцы Рэспублікі Беларусь. Існуючая ўлада ўлічвае гэта і адпаведным чынам будуе свае ўзаемаадносіны з Царквой. Асноўным прынцыпам гэтых узаемаадносін з'яўляецца забеспячэнне сацыяльнай стабільнасці, міжканфесійнага міру і нацыянальнай згоды, што з'яўляецца важнай умовай нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, а таксама яе становішча ў сусветнай супольнасці.

## 9.2. Павышэнне ролі Беларускай праваслаўнай Царквы ў грамадстве

Беларуская праваслаўная Царква займае вядучае месца ў рэлігійным жыцці краіны. Яна ўключае 15 епархій, 1643 прыходы, 1535 цэркваў (194 – у стадыі будаўніцтва), 7 духоўных навучальных устаноў, 15 мужчынскіх і 20 жаночых манастыроў, 15 брацтваў, 10 сястрыцтваў. У прыходах пастырскае паслушанне нясуць 1643 свяшчэннаслужыцелі, 166 дыяканаў (дадзеныя на 2015 г.).

Архіерэйскі Сабор Рускай праваслаўнай Царквы, які праходзіў 9–11 кастрычніка 1989 г., прыняў рашэнне аб утварэнні Беларускага Экзархата Маскоўскага Патрыярхату. 16 кастрычніка 1989 г. Свяшчэнны Сінод пастанавіў: Экзарху Беларусі надалей мець тытул «Мітрапаліт Мінскі і Гродзенскі, Патрыяршы Экзарх усея Беларусі; Прэасвяшчэннага Філарэта, мітрапаліта Мінскага і Беларускага, назначыць Экзархам Беларусі». 25 снежня 2013 г. Свяшчэнны Сінод РПЦ у сувязі з выхадам на заслужаны адпачынак мітрапаліта Філарэта назначыў архіепіскапа Разанскага і Міхайлаўскага Паўла (Панамарова) (нар. 19.02.1952 г.) Прэасвяшчэнным Мінскім і Слуцкім, Патрыяршым Экзархам усея Беларусі, а з 23 кастрычніка – главой новаўтворанай Мінскай мітраполіі з прысваеннем тытула «Мінскі і Заслаўскі».

Для падрыхтоўкі свяшчэннікаў на базе Жыровіцкага Свята-Успенскага мужчынскага манастыра дзейнічае Мінская духоўная семінарыя, пры якой функцыянуюць нядзельная школа і рэгенцкі клас. Прафесію рэгента і псаломшчыка атрымліваюць таксама выпускнікі Мінскага і Віцебскага духоўных вучылішчаў. З 1995 г. пачала працаваць Мінская духоўная акадэмія. У Экзархаце дзейніча-

юць Віцебская духоўная семінарыя, Мінскае, Слонімскае і Віцебскае духоўныя вучылішчы, 654 нядзельныя школы, больш за 100 царкоўных арганізацый, якія займаюцца сацыяльнай дзейнасцю (дадзеныя на 2012 г. – *Э. Я.*). Развіваецца сетка навучальных устаноў, у якіх прадстаўнікі розных канфесій могуць атрымаць рэлігійную адукацыю. У іх ліку – Інстытут тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірыла пры Беларускім дзяржаўным універсітэце. І хаця інстытут працуе пад патранажам Беларускага Экзархата Рускай праваслаўнай Царквы і яго рэктарам з'яўляецца ганаровы Патрыяршы Экзарх усея Беларусі мітрапаліт Філарэт, багаслоўскую адукацыю тут атрымліваюць праваслаўныя, каталіцкія і ўніяцкія студэнты, якія вызнаюць праваслаўе, каталіцызм і ўніяцтва. Багаслоўскую падрыхтоўку ажыццяўляе таксама тэалагічны факультэт Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава.

БПЦ бачыць сваю місію зямнога служэння ў выхаванні веруючых у духу хрысціянскіх каштоўнасцей, а таксама патрыятызму. Больш за дзесяць гадоў сумесна з Узброенымі Сіламі і іншымі вайсковымі фарміраваннямі праводзяцца ваенна-патрыятычныя спартыўныя злёты праваслаўнай моладзі Беларусі. У 2010 г. у Мінску быў асвечаны храм-помнік у гонар Усіх Святых і ў памяць аб ахвярах, якія паслужылі выратаванню нашай Айчыны. 2 ліпеня 2010 г. у крыпце храма-помніка з удзелам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнкі і Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі Філарэта адбылася цырымонія захавання астанкаў трох невядомых салдат, якія загінулі ў бітвах трох войнаў – Айчыннай 1812 г., Першай сусветнай і Вялікай Айчыннай. У 2015 г. з удзелам прадстаўнікоў БПЦ ва ўсіх абласцях і ў г. Мінску адбыліся акцыі ў гонар 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. З 2011 г. дзейнічае рэлігійная арганізацыя пад назвай «Рэлігійная місія Сінадальнага аддзела па турэмным служэнні Беларускай Праваслаўнай Царквы». Яна ўзаемадзейнічае з Дэпартаментам выканання пакаранняў МУС Рэспублікі Беларусь. Дзейнасць місіі накіравана на правядзенне работы сярод асоб, якія знаходзяцца ў турмах, і іх сацыяльную рэабілітацыю.

Адной з найбольш значных падзей у жыцці БПЦ апошніх гадоў стала ўзнаўленне Крыжа Еўфрасінні Полацкай – дакладнай копіі знакамітага крыжа работы майстра XII ст. Лазара Богшы. Гэты Крыж з вялікай пашанай быў асвечаны і дастаўлены ў Крыжа-Уздвіжанскі сабор Полацкага Спаса-Еўфрасіньеўскага манастыра ў верасні 1997 г. Аднаўленне святыні беларускага народа стала сімвалам нацыянальнага яднання.

БПЦ з кожным годам пашырае выдавецкую дзейнасць. У цяперашні час выходзяць 4 часопісы, 10 газет, царкоўныя календары і іншая рэлігійная літаратура. Сярод найбольш буйных выданняў – часопіс «Вестник Белорусского Экзархата». Рэгулярна выпускаюцца мясцовыя епархіяльныя «Вестники» ў Мінскай, Магілёўскай, Гродзенскай і Полацкай епархіях. Умацаванню ўзаемадзеяння Царквы з навуковай інтэлігенцыяй садзейнічаюць штогадовыя Мінскія епархіяльныя чытанні – канферэнцыі-семінары. Падобныя мерапрыемствы адбываюцца і ў іншых епархіях. Сумесна з вучонымі абмяркоўваюцца актуальныя пытанні гісторыі праваслаўнай Царквы, яе ўкладу ў развіццё беларускай культуры, сацыяльнага служэння і інш.

Ажыццяўляючы актыўную палітыку па супрацоўніцтву з праваслаўнай Царквой, дзяржава зыходзіць з таго, што «праваслаўе ўпісалася» ў гістарычную, культурную і палітычную традыцыі беларусаў. У 2003 г. падпісана Пагадненне аб узаемным супрацоўніцтве Дзяржавы і Праваслаўнай Царквы. Аналагічныя пагадненні падпісалі і розныя міністэрствы: культуры, узброеных сіл, унутраных спраў, адукацыі і інш. Аналагічныя пагадненні падпісаны таксама на ўзроўні епархій і адпаведных структур. БПЦ пры падтрымцы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнкі актыўна ўмацоўвае свае пазіцыі ў грамадска-палітычным і сацыякультурным жыцці краіны. 13 лютага 2015 г. ва ўрачыстай абстаноўцы падпісана Праграма супрацоўніцтва паміж Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь і Беларускай Праваслаўнай Царквой на 2015–2020 гг. Праграма накіравана на выхаванне маральна зрэлай, духоўна развітай асобы, якая здольна ўсвядоміць сваю адказнасць за лёс Айчыны і свайго народа, прадугледжвае выкарыстанне патэнцыялу праваслаўных традыцый і каштоўнасцей у фарміраванні асобы чалавека, садзейнічанне развіццю гуманітарнай, у тым ліку тэалагічнай і рэлігіязнаўчай, адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь і інш.

БПЦ развівае міжнародныя кантакты з праваслаўнымі і неправаслаўнымі цэрквамі і рэлігійнымі арганізацыямі розных краін. Яны накіраваны на захаванне міжканфесійнага міру, умацаванне міжцаркоўных сувязяў, аб’яднанне намаганняў у вырашэнні агульных задач, якія стаяць перад імі, стварэнне пазітыўнага іміджу Беларусі ў свеце. Сярод найбольш плённых форм такіх сувязяў – правядзенне багаслоўскіх і экуменічных сустрэч, навукова-практычных канферэнцый, паломніцкія паездкі, сустрэчы Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі з дыпламатычнымі прадстаўнікамі дзяржаў і інш.

БПЦ як састаўная частка Рускай праваслаўнай Царквы ўмацоўвае пазіцыі праваслаўя ў Беларусі. Рэспубліку з афіцыйнымі візітамі наведваў Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі, пад сустрэчы якіх адбываліся сустрэчы з кіраўніцтвам рэспублікі, веруючымі. 20–21 чэрвеня 2015 г. адбыўся чарговы візіт у Беларусь Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла. Візіт быў прымеркаваны да 1000-годдзя скону Хрысціцеля Русі князя Уладзіміра, які даў пачатак хрысціянскай цывілізацыі для ўсходніх славян. Ключавой падзеяй першага дня візіту стала адкрыццё духоўна-адукацыйнага цэнтра БПЦ. Патрыярх Кірыл правёў літургіі ў Васкрасенскім саборы г. Мінска, а 22 чэрвеня – у Нікольскім гарнізонным храме Брэсцкай крэпасці, Свята-Васкрасенскім храме г. Брэста. Важнае месца падчас візіту заняла сустрэча патрыярха Кірыла з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкам.

## 9.3. Дзейнасць каталіцкага і грэка-каталіцкага Касцёла

Каталіцкая канфесія – другая па колькасці веруючых і распаўсюджванні ў рэспубліцы. Яна аб'ядноўвае чатыры епархіі (дыяцэзіі), якія налічваюць 479 абшчын. Дзейнічаюць 3 духоўныя навучальныя ўстановы, 9 місій, 8 манастыроў, 465 касцёлаў, яшчэ 37 будуецца. Забяспечанасць культавымі будынкамі складае 98 % і з'яўляецца самай высокай сярод усіх канфесій у рэспубліцы. Дзяржавай перададзена больш за 300 аб'ектаў для рэлігійных мэтаў, за выключэннем некаторых, якія выкарыстоўваюцца як установы культуры. У іх ліку – касцёл св. Роха ў Мінску (раней у ім знаходзілася канцэртная зала), касцёл у вёсцы Волчын Камянецкага раёна, касцёл і брыгідскі кляштар у Гродна і інш.

У 1991 г. Ватыканам была створана Мінска-Магілёўская архідыяцэзія, Пінская і Гродзенская дыяцэзіі, у 1999 г. – Віцебская дыяцэзія. У красавіку 1999 г. Святы Прастол стварыў Канферэнцыю Каталіцкіх Епіскапаў Беларусі (ККЕБ) – калегіяльны орган кіраўніцтва Касцёлам. Да чэрвеня 2006 г. яе старшынёй з'яўляўся кардынал Казімір Свёнтак, з чэрвеня 2006 г. па чэрвень 2015 г. – епіскап Аляксандр Кашкевіч, з чэрвеня 2015 г. – мітрапаліт Тадэвуш Кандрусевіч. У парафіях Беларусі працуе 470 ксяндзоў, з іх 110 – замежныя грамадзяне, пераважна з Польшчы. Падрыхтоўку кадраў ажыццяўляюць Вышэйшая духоўная семінарыя ў Гродна (з 1990 г.) і Пінская духоўная семінарыя (з 1999 г.). Разам імі падрыхтавана больш за 170 ксяндзоў.

У 2015 г. каталіцкі Касцёл у Беларусі атрымаў рэгістрацыю Мінскай тэалагічнай акадэміі імя святога Яна Паўла II. Навучанне будзе адбывацца па двух напрамках – падрыхтоўка каталіцкіх святароў і тэалагічная адукацыя свецкіх асоб. Тэалагічная акадэмія, на думку архіепіскапа Тадэвуша Кандрусевіча, павінна павысіць імідж Беларусі і будзе садзейнічаць далейшаму развіццю беларускай культуры, узбагачаць яе духоўным зместам.

У адпаведнасці з беларускім заканадаўствам рэлігійныя арганізацыі атрымалі права выдавецкай дзейнасці. Так, Мінска-Магілёўская архідыяцэзія выдае часопісы «Наша вера», «Ave Maria», Віцебская – інфармацыйны бюлетэнь «Каталіцкія навіны», Пінская – часопіс «Дыялог». У Гродне выдаецца дыяцэзіяльная газета «Слова Жыцця» на беларускай, рускай і польскай мовах. Функцыянуе каталіцкае выдавецтва «Про Хрысто», якое выпускае рэлігійную літаратуру на беларускай мове. Беларускае радыё кожную нядзелю трансліруе богаслужэнні на беларускай мове з архікафедральнага касцёла Прасвятой Дзевы Марыі ў г. Мінску, рэспубліканскае тэлебачанне паказвае богаслужэнні на Раство і Вялікдзень з касцёлаў рэспублікі.

Актывізацыі дзейнасці каталіцкага Касцёла сярод веруючых садзейнічала каранацыя папам Янам Паўлам II цудатворных абразоў Маці Божай Лагішынскай (1995), Брэсцкай (1996), Будслаўскай (1998), Кангрэгацкай (г. Гродна, 2005), Гудагайскай (2007), Браслаўскай (2009). У парафіях рэспублікі адбываюцца перэгрынацыі рэліквій святых каталіцкага Касцёла. Католікі атрымалі магчымасць праводзіць паломніцтвы да святых месцаў Беларусі, а таксама замежжа – у Ватыкан, Кракаў, Вільна, Іерусалім і інш.

Адзін з напрамку дзейнасці каталіцкага Касцёла – дабрачыннасць. Пры ККЕБ і ва ўсіх дыяцэзіях дзейнічаюць філіялы дабрачынных арганізацый «Карытас», якія аказваюць значную дапамогу тым, каму яна патрабуецца. Дабрачынныя арганізацыі актыўна супрацоўнічаюць з установамі сацыяльнай абароны насельніцтва.

У адносінах з дзяржаўнымі органамі кіраўніцтва каталіцкага Касцёла зыходзіць са шматвекавога вопыту ўзаемадзеяння з дзяржаўнымі, грамадска-палітычнымі сістэмамі, а таксама з вопыту дзяржаўна-канфесійных адносін у Савецкім Саюзе. Гэты вопыт не заўсёды паддаецца простаму вымярэнню і ацэнкам. Каталіцкі Касцёл здолеў захаваць сябе нават тады, калі дзяржаўная палітыка была накіравана на абмежаванне яго дзейнасці да мінімуму. Савецкі Саюз ужо не існуе, а Касцёл застаўся і працягвае сваё служэнне грамадству.

Кіраўніцтва Касцёла імкнецца дыстанцыравацца ад палітыкі, не дазваляе ўцягнуць Касцёл у якія-небудзь палітычныя інтрыгі. У інтэрв'ю карэспандэнту газеты «СБ – Беларусь сегодня» мітрапаліт Тадэвуш Кандрусевіч сказаў: «Адносіны Царквы і палітыкі заўсёды складваліся нялёгка. Мы зыходзім са слоў Ісуса Хрыста: "Богу – Богава, кесару – кесарава". Гэтыя словы з'яўляюцца асноватворнымі ў развіцці сацыяльнага вучэння каталіцкага Касцёла аб адносінах Царквы і палітыкі, якое дакладна і ясна гаворыць: Царква і палітыка – асобныя аўтаноміі. Царква ставіць глабальную задачу выратавання чалавека, прывядзення яго ў Царства Божае. Дзяржава, палітыка ў асноўным вырашае задачы, калі так можна сказаць, часовага характару – у эканоміцы, міжнародных адносінах. Калі ёсць узаемаразуменне паміж дзяржавай і Царквой, разам можна шмат добрага і карыснага зрабіць людзям. Бо ў цэнтры клопату Царквы – чалавек».

За гады існавання суверэннай Беларусі паміж органамі ўлады ўсіх узроўняў і рэлігійнымі арганізацыямі склаліся партнёрскія адносіны. Пры садзейнічанні ўладных структур праводзяцца значымыя для Касцёла мерапрыемствы: паломніцтвы да святых месц, працэсіі і інш. Штогод у Магілёве праходзіць міжканфесійны фестываль духоўнай музыкі «Магутны Божа«, у Віцебску – міжнародны фестываль каталіцкага кіно «Магніфікат». Дзяржава фінансавала аднаўленне роспісаў у Архікафедральным саборы Прасвятой Дзевы Марыі ў г. Мінску і інш.

Касцёл праводзіць актыўную евангелісцка-выхаваўчую работу з дзецьмі і моладдзю, імкнецца далучаць моладзь да спрадвечных хрысціянскіх каштоўнасцей. Склаліся разнастайныя формы работы ў гэтым напрамку – парафіяды, Дні моладзі, Дні хрысціянскай культуры і інш. Касцёл надае вялікую ўвагу развіццю міжканфесійнага дыялогу, у першую чаргу з праваслаўнай Царквой. Сумеснымі намаганнямі абедзве канфесіі ўносяць істотны ўклад ва ўмацаванне міру і добразычлівых адносін у беларускім грамадстве.

У рэспубліцы адноўлена дзейнасць Беларускай грэка-каталіцкай Царквы (БГКЦ). Яе архіпастырам з'яўляецца прэфект Кангрэгацыі Усходніх Цэркваў кардынал Леанарда Сандры. Кіраўніцтва паўсядзённым жыццём Царквы ажыццяўляе Апостальскі Візітатар «ad nutum Sanctae Sedis» для грэка-католікаў Беларусі архімандрыт Сяргей (Гаек) (нар. 08.02.1949 г.). Ён склікае сінаксы (сходы. – *Э. Я.*) для рашэння найбольш важных праблем духавенства БГКЦ. У склад духавенства ўваходзяць 15 свяшчэннікаў і 1 дыякан. У духоўных на-

вучальных установах навучаецца дзевяць семінарыстаў, у тым ліку двое манахаў-рэферэнтаў.

БГКЦ складаецца з двух протапрэсвітаратаў (дэканатаў): Цэнтральна-заходняга імя Мікалая (Чарнецкага) і Усходняга імя святога Язафата (Кунцэвіча). У склад першага ўваходзяць г. Мінск, Брэсцкая, Гродзенская і Мінская вобласці – усяго 12 прыходаў (узначальвае протаіерэй Андрэй Абламейка), у склад другога – Магілёўская, Віцебская і Гомельская вобласці, усяго 6 прыходаў (узначальвае іераманах Лявонцій (Тумоўскі)). БГКЦ падтрымлівае цесныя сувязі з беларускімі грэка-католікамі за мяжой.

## 9.4. Асаблівасці развіцця пратэстантызму

Распад СССР і абвяшчэнне Беларуссю незалежнасці адкрылі новыя магчымасці для пропаведзі Евангелля. Як самастойныя аб'яднанні пачалі дзейнічаць Саюз Евангельскіх Хрысціян-Баптыстаў, Саюз Хрысціян Веры Евангельскай, Аб'яднанне Абшчын Хрысціян Поўнага Евангелля, Канферэнцыя Адвентыстаў Сёмага Дня і інш.

Пратэстанты ў Беларусі на сучасным этапе прадстаўляюць сабой рэлігійную меншасць. У 2000 г. налічвалася 130 тысяч чалавек, у 2010 г., па некаторых дадзеных, – каля 180 тысяч. У рэспубліцы афіцыйна зарэгістравана больш за 1 тысячу пратэстанцкіх абшчын 14 дэнамінацый. Апрача таго, без дзяржаўнай рэгістрацыі прадаўжаюць дзейнічаць 29 груп веруючых Савета Цэркваў Евангельскіх Хрысціян-Баптыстаў. Найбольшая колькасць пратэстанцкіх абшчын прыходзіцца на Брэсцкую вобласць (294), Мінскую і г. Мінск (225) і Гомельскую (137) (усе дадзеныя на 2012 г. – *Э. Я.*).

18 лістапада 1989 г. прадстаўнікі 118 цэркваў Хрысціян Веры Евангельскай (пяцідзясятнікі) на з'ездзе ў Мінску прынялі рашэнне аб стварэнні Саюза ХВЕ Беларусі. На сучасным этапе гэта канфесія найбольш дынамічна папаўняецца вернікамі. Толькі з 1991 г. па 2001 г. было адкрыта больш за 300 новых цэркваў па ўсёй рэспубліцы. Аб'яднаная Царква ХВЕ на сённяшні дзень з'яўляецца найбольш шматлікай сярод пратэстанцкіх напрамкаў (512 абшчын) і больш за 100 абшчын, якія дзейнічаюць без рэгістрацыі. 454 абшчыны маюць уласныя малітоўныя дамы. Аб'яднанне ўваходзіць у сусветнае брацтва Асамблеі Бога. Пяцідзясятніцтва прадстаўлена так званым «незарэгістраваным брацтвам», Хрысціянамі Веры Апостальскай (10 цэркваў), Хрысціянамі Поўнага Евангелля (55 цэркваў). З 1996 г.

выдаецца газета «Благадаць». З 2002 г. дзейнічае выдавецтва «Ковчег спасення».

Саюз Евангельскіх Хрысціян-Баптыстаў у Рэспубліцы Беларусь налічвае 312 цэркваў і амаль 14 тысяч хрышчаных членаў. Адвентысцкая царква аб'ядноўвае 5 тысяч чалавек у 76 цэрквах. Евангелісцка-лютэранская царква складаецца з 27 прыходаў. У Мінску адкрыты кальвінісцкі Беларускі евангелісцкі рэфарматарскі збор. Апрача названых вышэй, у рэспубліцы дзейнічаюць Новаапостальская царква, прэсвітарыянская царква, Царква Ісуса Хрыста Святых Апошніх Дзён, абшчыны месіянскіх яўрэяў і інш.

Адным з традыцыйных напрамкаў пратэстантызму ў Беларусі з'яўляецца лютэранства. Першая лютэранская абшчына была зарэгістравана ў Рэспубліцы Беларусь у 1993 г. Да 1998 г. самаарганізацыя лютэранскіх абшчын у Беларусі ў розных мясцовасцях праходзіла практычна ізалявана. Некаторыя з новаўтвораных абшчын далучыліся да Евангелічна-Лютэранскай Царквы ў Расіі і іншых дзяржавах (нямец. *Evangelisch* – Lutherische Kirche in Russland und andere Staaten) – ЕЛКРАС, астатнія дзейнічалі абсалютна незалежна. Летам 1999 г. ЕЛКРАС прызначыў пастара Леаніда Цвікі (Віцебск) епіскапскім візітатарам у Беларусі. 2 снежня 2000 г. у Віцебску адбыўся ўстаноўчы Сінод Беларускай Евангелічна-Лютэранскай Царквы Рэспублікі Беларусь (ЕЛЦРБ). 11 сакавіка 2001 г. Леанід Цвікі быў рукапаложаны епіскапам. Аднак ЕЛРАКС выступіў з асуджэннем стварэння ЕЛЦРБ. Па гэтай прычыне дзве з 13 лютэранскіх абшчын не ўвайшлі ў склад ЕЛЦРБ, а засталіся ў складзе ЕЛРКС. У 2002 г. епіскап Леанід Цвікі быў адхілены ад пастырскага служэння. Царква перайшла на кансістарыяльнае кіраванне, быў абраны в. а. епіскапа. 27 верасня 2003 г. чатыры абшчыны «нямецкай традыцыі» аб'явілі аб непадпарадкаванні Кансісторыі і стварылі Каардынацыйны савет ЕЛЦРБ «для абароны законных правоў і інтарэсаў прыцясняемых абшчын і святчэннаслужыцеляў ЕЛЦРБ». 29 кастрычніка 2004 г. у г. Лідзе гэтыя абшчыны правялі Устаноўчы Сінод і стварылі Саюз ЕЛЦРБ. У ім налічваецца 10 абшчын. 26 студзеня 2016 г. архіепіскап Евангелічна-Лютэранскай Царквы Расіі Дзітрых Баўэр назначыў пастыра гродзенскай лютэранскай абшчыны Уладзіміра Татарнікава сваім прадстаўніком на тэрыторыі Беларусі «з мэтай аб'яднання і развіцця лютэранскіх абшчын Рэспублікі Беларусь». Лютэране праводзяць місіянерскую дзейнасць, аказваюць гуманітарную дапамогу людзям, якія маюць у ёй патрэбу. Адзіны дзеючы ў Беларусі гістарычны лютэранскі храм – кірха – знаходзіц-

ца ў г. Гродна. Беларускія лютэране падтрымліваюць сувязі з абшчынамі Германіі і Літвы.

Для падрыхтоўкі новых прапаведнікаў у верасні 1996 г. быў адкрыты тэалагічны інстытут. У многіх цэрквах дзейнічаюць біблейскія школы, а для дзяцей – нядзельныя школы. Для каардынацыі работы з дзецьмі пры Саюзе ХВЕ створана місія «Служэнне дзецям». Праводзіцца работа сярод вязняў, па рэабілітацыі людзей, залежных ад алкаголю і наркотыкаў.

Адной з праблем, якая знаходзіцца ў цэнтры ўвагі пяцідзясятніцтва, з'яўляецца тэма сям'і і царквы. Пяцідзясятнікі надаюць вялікае значэнне стварэнню моцнай абшчыны, якая з'яўляецца вялікай сям'ёй. З'яднаная абшчына становіцца астраўком «ісціннага» жыцця, дзе маральнасць кожнага веруючага з'яўляецца агульнай справай, а выпадкі адхілення абмяркоўваюцца ў царкве. Асуджэнню падвяргаюцца аборты, кланіраванне, эўтаназія. Прапаведнікі пяцідзясятнікаў трактуюць у духу свайго веравучэння і іншыя надзённыя праблемы. Так, яны з'яўляюцца прыхільнікамі «тэалогіі росквіту», згодна з якой можна дасягнуць максімальнага поспеху ў камерцыйнай, сацыяльнай і культурнай сферах.

Палітычныя погляды пратэстантаў у постсавецкі перыяд значна змяніліся. Яны сталі больш адкрытымі для супрацоўніцтва з уладай і грамадствам. Беларускія пратэстанцкія цэрквы актыўна ўключыліся ў грамадскае і сацыякультурнае жыццё краіны. У апошнія гады рэалізавана шмат сацыяльных праграм, накіраваных на аказанне дапамогі маламаёмасным, інвалідам і іншым неабаронным слаям грамадства. Аказваецца дапамога шматдзетным сем'ям, дзецям-сіротам і дзецям-ахвярам чарнобыльскай аварыі, ствараюцца рэабілітацыйныя цэнтры для алкагольна і наркатычна залежных людзей.

На працягу 1990-х гг. беларускі пратэстантызм цесна ўзаемадзейнічае з сусветнай пратэстанцкай супольнасцю. Гэта аказала ўплыў на рознабаковасць і маштабнасць сацыяльнага служэння, фарміраванне сістэмы адукацыі і падрыхтоўкі багаслоўскіх кадраў, уваходжанне ў мас-медыйную прастору і г. д. Зместам эвалюцыі пратэстанцкіх арганізацый у працэсе трансфармацыі беларускага грамадства на працягу 1990-х гг. – пачатку XXI ст. выступаюць паслядоўная інстытуцыялізацыя, дэсектанізацыя, плюралізацыя дэнамінацыйнай структуры, удакладненне дактрынальнага мінімуму, фарміраванне элементаў сацыяльнай дактрыны, павышэнне сацыяльнага статусу членаў абшчын, іх усё

больш актыўнае ўцягненне ў грамадска-палітычныя і сацыяльна-эканамічныя працэсы.

Пры гэтым айчынныя баптысты імкнуліся абнавіць страчаны прынцып аўтаноміі асобнай абшчыны, дэцэнтралізаваць кіраўніцтва, у той час як пяцідзясятніцкія арганізацыі праявілі тэндэнцыю да іерархізацыі, гэта значыць стварэння кіраўніцтва ад ніжэйшай абшчыны да цэнтралізаванага. Пратэстантызм на сучасным этапе з'яўляецца істотным фактарам грамадска-рэлігійнага жыцця краіны.

## 9.5. Іўдаізм, іслам, нетрадыцыйныя рэлігіі ў канфесійнай структуры Беларусі

Рэлігійную меншасць у рэспубліцы па-ранейшаму складаюць іўдаізм і іслам. З 1990-х гг. пачынаецца працэс адраджэння беларускай іўдзейскай канфесіі і адначасова ўзмацняецца актыўнасць жыцця яўрэйскіх абшчын. Колькасць яўрэйскага насельніцтва змяншаецца за кошт эміграцыі ў Ізраіль, ЗША , краіны Захаду і Расію. Па дадзеных перапісу 1989 г., у Беларусі пражывала 112 тысяч яўрэяў, у 1999 г. – 28 тысяч, у 2009 г. – 13 тысяч. Абсалютная большасць яўрэяў русіфікавана – па перапісу 2009 г. 86 % яўрэяў Беларусі назвалі сваёй роднай мовай рускую, 96 % размаўляюць на ёй дома. 9 % яўрэяў назвалі роднай мовай беларускую, але размаўляюць на ёй дома толькі 2 %. У іўдаізме існуе ўнутраны раскол. Іўдаізм прадстаўлены па трох напрамках – артадаксальны, прагрэсіўны і хесэд-любавіч. Прыхільнікі артадаксальнага іўдаізму выступаюць за ізаляцыю канфесіі і яўрэйскага этнасу. Прагрэсіўныя абшчыны, кіраўніцтва якіх складаецца пераважна з моладзі і інтэлігенцыі, наадварот, сацыяльна актыўныя. Разам з тым абсалютная большасць яўрэяў не з'яўляюцца актыўнымі веруючымі. У распараджэнні яўрэйскіх абшчын знаходзіцца 11 культавых будынкаў-сінагог: 2 – у Мінску, 2 – у Магілёве, 2 – у Віцебску, па адной – у Гродне, Пінску, Брэсце, Бабруйску, Гомелі. Жыццё яўрэйскіх абшчын шматграннае: гэта культурная дзейнасць, захаванне рэлігійных традыцый, дабрачыннасць і адукацыя.

У Беларусі пражывае каля 100 тысяч мусульман. Асноўная татарская галіна ісламу захавалася на захадзе рэспублікі, дзе ў міжваенны перыяд улады лаяльна адносіліся да мусульман. Яны аб'яднаны ў 25 абшчын, сярод якіх 24 адносяцца да суніцкага, 1 – да шыіцкага напрамку ісламу. У іх карыстанні 8 мячэцяў (у Відзах, Слоніме,

Смілавічах, Навагрудку, Клецку, Лоўчыцах, Маладзечна), будуецца мячэць у Мінску. У 1994 г. былі створаны самастойны Муфціят Рэспублікі Беларусь і Мусульманскае рэлігійнае аб'яднанне ў Рэспубліцы Беларусь. Разам з Беларускім аб'яднаннем татар-мусульман «Аль-Кітаб» (з 2000 г. – «Зікр-уль-Кітаб») яны праводзяць работу па нацыянальна-культурным і рэлігійным адраджэнні самабытнага татарскага народа Беларусі.

У 1997 г. у рэспубліцы адзначалася 600-годдзе перасялення татар-мусульман на землі Беларусі. Татары захавалі сваю самабытнасць дзякуючы мусульманскай рэлігіі. Праведзеныя ў пачатку 1990-х гг. у месцах кампактнага пражывання мусульман Беларусі сацыялагічныя даследаванні сведчылі аб адраджэнні рэлігійнасці і памылковасці меркаванняў аб рэлігійнай асіміляцыі беларускіх татар. Так, сімвал веры («шахаду») – галоўнае мусульманскае патрабаванне – прызналі 31,8 % моладзі, 51 % людзей сярэдняга і 87 % старэйшага ўзросту. Менавіта іслам быў і застаецца галоўным сродкам самазахавання беларускіх татар, якія даўно страцілі сваю мову і не захавалі сваіх звычаяў.

Першыя крокі на шляху адраджэння былі прадпрыняты яшчэ ў 1991 г. сіламі татарскай інтэлігенцыі і студэнтаў з мусульманскіх краін, якія навучаліся ў гарадах Беларусі. Імі былі створаны нядзельныя школы ў Іўі, Навагрудку, Мінску, Смілавічах, Гродна, Слоніме, Маладзечна. Тады пачаў выходзіць чатыры разы ў год часопіс «Байрам», у якім публікавалася інфармацыя аб жыцці і дзейнасці мусульманскіх абшчын, аб асновах ісламу і правах мусульман, гісторыі беларускіх татар і важнейшых падзеях у мусульманскіх краінах.

Адной з галоўных задач у дзейнасці Мусульманскага рэлігійнага аб'яднання ў Рэспубліцы Беларусь і Беларускага татарскага аб'яднання татар-мусульман «Зікр-уль-Кітаб» была і застаецца работа па аднаўленні і будаўніцтву мусульманскіх мячэцяў, культурных цэнтраў, школ, музеяў, ісламскіх бібліятэк і іншых устаноў, неабходных для жыццядзейнасці мусульман Беларусі.

У канцы 1980-х – 1990-х гг. у Беларусь пачалі пранікаць новыя рэлігійныя рухі, якія называюць неакульты, альтэрнатыўныя рэлігіі, «рэлігіі Новага часу». Гэта рэлігійныя напрамкі і групы, якія ўзніклі, як правіла, у ЗША ў XIX–XX стст., адтуль атрымалі шырокае распаўсюджанне ў Еўропе і іншых рэгіёнах свету. Іх поспех звязаны з крызісам і аслабленнем пазіцый традыцыйных форм рэлігійнай свядомасці, перш за ўсё хрысціянства, а такса-

ма сацыяльна-палітычнымі і культурнымі пераменамі. Адной з прычын з'яўляецца свайго роду «мода», а таксама рэлігійная неадукаванасць і маральная беспрынцыповасць асобных людзей, расчараванасць у афіцыйных каштоўнасцях тэхнакратычнага грамадства.

Спецыялісты адзначаюць, што ўсе неакульты, за рэдкім выключэннем, з'явіліся на тэрыторыі Беларусі ў выніку духоўна-культурнай экспансіі замежнага місіянерства з мэтай пашырэння сферы ўплыву розных дзеючых, галоўным чынам на захадзе, рэлігійных і псеўдарэлігійных арганізацый. Неакульты часта выступаюць пад рознымі назвамі, пастаянна мяняюць назвы сваіх абшчын і ствараюць для вярбоўкі паслядоўнікаў цэлую сетку псеўдаграмадскіх арганізацый – гуманітарных, аздараўленчых, экалагічных і г. д. У дзейнасці неакультаў ёсць адна агульная рыса – гэта поўнае падпарадкаванне свядомасці і паводзін веруючага кіраўніцтва секты, якое імкнецца толькі «сваю» рэлігію прадставіць ісцінай, у абранасці сваёй місіі, у нецярпімасці да іншых рэлігій.

Да неакультаў адносяцца Міжнароднае таварыства свядомасці Крышны, Таварыства трансцэндэнтнай медытацыі, Царква Аб'яднання, Царква Хрыста, Царква сайенталогіі, мармоны і інш. Так, мармоны (Царква Ісуса Хрыста Святых Апошніх Дзён) заснавана ў 1820-я гг. у ЗША Джозэфам Смітам. Асноўныя палажэнні веравучэння мармонаў выкладзены ў «Кнізе мармонаў», напісанай Д. Смітам. Мармоны ігнаруюць боскасць Хрыста, сцвярджаюць, што Ісус па сутнасці не адрозніваецца ад людзей – ён вечны, але і ўсе астатнія людзі вечныя ў такім самым сэнсе. Мармоны называюць Хрыста «наш старэйшы брат», гэта значыць, загадзя ставяць сябе ў адзін рад з ім. У мармонскім вучэнні моцныя язычніцкія ўяўленні.

Няма адзінай думкі адносна таго, да якой рэлігійнай дэнамінацыі аднесці мармонаў. Многія хрысціянскія канфесіі адмаўляюцца прызнаваць мармонаў хрысціянамі. Так, Руская праваслаўная Царква лічыць Царкву Ісуса Хрыста Святых Апошніх Дзён «язычніцкай сектай». У прыватнасці, мармоны крытыкуюцца за адмаўленне прызнаваць дагмат аб Святой Тройцы, з чаго робіцца выснова аб тым, што Бацька, Сын і Святы Дух, аб якім мармоны гавораць, што гэта тры Багі, супярэчыць монатэістычнаму прынцыпу многіх хрысціянскіх канфесій, які ўвасабляецца ў дагмаце аб Святой Тройцы. Усе гэтыя цячэнні супраць Святой Тройцы на Нікейскім саборы (325 г.) адназначна прызнаны ерассю і супярэчлівасцю Слову Божаму.

У Беларусі афіцыйна дзеючых абшчын неакультаў няшмат. Налічваецца 4 абшчыны  мармонаў – (Віцебская вобласць – 1, Магілёўская – 1, г. Мінск – 2); бахаі – 5 (Брэсцкая, Віцебская, Гомельская і Магілёўская вобласці, г. Мінск); крышнаітаў – 6 (па 1 ва ўсіх абласцях і г. Мінску, за выключэннем Мінскай вобласці). Аднак гэта не выключае  пранікнення неакультаў у рэспубліку ўвогуле.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Канфесійная гісторыя Беларусі налічвае тысячагоддзі – ад першых прымітыўных вераванняў людзей, язычніцтва да высока развітых рэлігій сучаснасці. Яна багатая, шматгранная, нясе ў сабе высокі маральны, культурны, інтэлектуальны патэнцыял на кожным этапе гістарычнага развіцця. Канфесійную гісторыю Беларусі трэба разглядаць як неад'емную частку айчыннай і ўсеагульнай гісторыі. З рэлігіяй і Царквой на тэрыторыі Беларусі звязаны падзеі грамадска-палітычнага жыцця, развіццё культуры, мастацтва, літаратуры, адукацыі.

Хрысціянізацыя Русі кіеўскім князем Уладзімірам стала і для беларускіх зямель магутным штуршком для цывілізаванага развіцця, спрыяла наладжванню шматбаковых сувязяў з еўрапейскімі краінамі.

Да XIV ст. на беларускіх землях панавала праваслаўная Царква. Крэўская унія 1385 г. парушыла гэтую манаполію. Каталіцтва не толькі стала веравызнаннем кіруючых колаў ВКЛ, а затым і значнай часткі яго насельніцтва, але і абумовіла больш цесныя сувязі з Польшчай. Ваенна-палітычнае і царкоўнае ўзаемадзеянне дзвюх дзяржаў дазволіла супрацьстаяць экспансіі Тэўтонскага ордэна ў Прыбалтыцы і падарваць яго місіянерскія намеры.

Каталіцызм, а з XVI ст. пратэстантызм садзейнічалі ўмацаванню сувязяў беларускіх зямель з еўрапейскімі краінамі, развіццю грамадска-палітычнай, філасофскай, рэлігійнай думкі, асветы, кнігадрукавання, архітэктуры. Праваслаўе ў выніку праводзімай правячымі коламі ВКЛ празаходняй палітыкі было адхілена ад актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці, аднак яно не здавала сваіх пазіцый.

Рэлігія і палітыка былі цесна звязаны паміж сабой. Яркім праяўленнем такога альянсу стала ўзнікненне ўніяцкай Царквы ў выніку падпісання Брэсцкай царкоўнай уніі ў 1596 г. І хаця гэта было, згодна з праваслаўным веравучэннем, парушэннем канонаў праваслаўнай Царквы, тым не менш, уніяцтва, або грэка-каталіцызм, праіснавала на беларускіх землях да афіцыйнай яго ліквідацыі ў 1839 г. Ва Украіне, нягледзячы на тое, што ўніяцтва афіцыйна па ўказанні Сталіна было скасавана ў 1945 г. на Львоўскім праваслаўным саборы, яно працягвала існаваць падпольна і ў цяперашні час з'яўляецца самай уплывовай канфесіяй.

У XIV–XVI стст. на беларускія землі пранікаюць іўдаізм і іслам – рэлігіі, вызнаўцамі якіх былі яўрэі і татары адпаведна. Дзякуючы

спрадвечнай талерантнасці беларусаў яны сталі істотным фактарам грамадска-палітычнага развіцця і кансалідацыі беларускага грамадства, фарміравання ў ім талерантнасці, спрыялі ўзаемаабагачэнню культур, развіццю і перайманню іх лепшых традыцый.

Перыяд Рэчы Паспалітай азнаменаваўся барацьбой з Рэфармацыяй (Контррэфармацыяй), умацаваннем каталіцызму і рознабаковай дзейнасцю манаскіх ордэнаў (пераважна каталіцкіх). Аднак пры гэтым у беларускім грамадстве захоўвалася талерантнасць, з'яўляліся новыя кірункі ў развіцці культуры, носьбітамі якіх была Царква – каталіцкая, праваслаўная, уніяцкая, а таксама іншыя веравызнані.

Па меры ўваходжання беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі і пераўтварэння іх у заходнія губерні царскі ўрад з мэтай умацавання тут свайго пануючага ўплыву падтрымліваў праваслаўную Царкву, разглядаючы яе як важны фактар выцяснення польска-каталіцкага ўплыву, русіфікацыі насельніцтва беларускіх губерняў, распаўсюджвання рускай мовы і культуры. Каталіцызм быў адсунуты на другі план, а яго ўплыў на насельніцтва царскія ўлады ўсяк абмяжоўвалі. У 1839 г. была ліквідавана ўніяцкая Царква, а былыя ўніяты пераведзены ў праваслаўе.

Значны ўплыў на змяненне рэлігійнай сітуацыі аказаў Указ цара Мікалая II аб верацярпімасці ад 14 красавіка 1905 г. Нягледзячы на яго дваісты характар, неправаслаўныя канфесіі атрымалі большую свабоду для сваёй дзейнасці. У гады Першай сусветнай вайны большая частка тэрыторыі Беларусі была акупіравана кайзераўскімі войскамі. У перыяд акупацыі стварыліся ўмовы для пашырэння місіянерскай дзейнасці розных пратэстанцкіх напрамкаў.

Карэнным чынам змянілася становішча ўсіх канфесій пасля кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. і прыходу да ўлады бальшавікоў. Дзяржава была аддзелена ад царквы і царква ад школы, дэклараваласся свабода сумлення. Аднак дзяржава не адмовілася ад татальнага кантролю і ўмяшальніцтва ў справы рэлігійных арганізацый. Яны былі пазбаўлены права юрыдычнай асобы. Былі канфіскаваны царкоўныя землі і іншая нерухомасць, устанаўліваліся высокія падаткі для духавенства і на царкоўныя будынкі. Разбураліся або выкарыстоўваліся пад склады, кінатэатры, спортзалы, клубы і г. д. цэрквы, касцёлы, сінагогі. Духавенства і веруючыя падвяргаліся ганенням і рэпрэсіям. Партыйныя і савецкія органы прыкладалі максімум намаганняў на «вызваленне народных мас ад рэлігійных забабонаў».

У выніку ў канцы 1930-х гг. ва ўсходняй Беларусі з рэлігіяй і Царквой было практычна пакончана.

Іншая сітуацыя склалася на землях Заходняй Беларусі, якія па ўмовах Рыжскага мірнага дагавора ад 18 сакавіка 1921 г. былі ўключаны ў склад Польскай дзяржавы. Пры тым, што Канстытуцыя Польшчы фармальна гарантавала роўнасць усіх канфесій, прывілеяванае становішча замацоўвалася за каталіцкай. Праваслаўная Царква абвяшчалася аўтакефальнай. Прадпрымаліся спробы яе паланізацыі. Шырока разгарнулася дзейнасць неапратэстанцкіх арганізацый. Ватыкан рабіў крокі па адраджэнні візантыйска-славянскага абраду (неауніі) на «крэсах усходніх».

У гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны на долю канфесій выпалі цяжкія выпрабаванні. Складаным было іх становішча ў часы нямецкай акупацыі Беларусі. Рэлігійная палітыка нямецкіх акупантаў была, пры знешняй яе лаяльнасць да царкоўнага жыцця, накіравана на жорсткі кантроль за дзейнасцю ўсіх канфесій і выкарыстанне іх у інтарэсах Рэйха. Розныя адносіны да каталіцкай, праваслаўнай і пратэстанцкай цэркваў былі прадыктаваны як умовамі ваеннага часу, адносінамі кожнай з канфесій да акупантаў, так і агульнай лініяй нямецкай палітыкі «раздзяляй і валадар».

Акупанты спрабавалі ўнесці раскол у праваслаўную Царкву, выкарыстоўваючы амбіцыі часткі беларускіх праваслаўных іерархаў, духавенства і нацыяналістаў на абвяшчэнне аўтакефаліі Царквы і аддзяленні яе ад Маскоўскай Патрыярхіі. Але абсалютная большасць духавенства і веруючых занялі патрыятычныя пазіцыі і змагалася з нямецкімі захопнікамі.

Больш складаная сітуацыя назіралася ў каталіцкім Касцёле. Сувязь духавенства з польскім рухам супраціўлення – Арміяй Краёвай – паслужыла падставай абмежаванняў і ўціску на Касцёл. Няўдалымі аказаліся спробы ксяндзоў-беларусаў у акрузе Беларутэнія па беларусізацыі Касцёла. Больш спрыяльныя ўмовы былі ў пратэстанцкіх абшчын у сілу іх гістарычнай сувязі з нямецкім народам. Праваслаўнае і каталіцкае духавенства падвяргалася рэпрэсіям і расстрэлам, а храмы – рабаванню і нават знішчэнню.

У пасляваенны перыяд у палітыцы дзяржавы ў адносінах да Царквы не адбылося значных змен. Аднак урад вымушаны быў будаваць адносіны з кожнай канфесіяй дыферэнцавана, улічваючы вопыт Вялікай Айчыннай вайны і іх уклад у барацьбу з нямецкімі акупантамі або супрацоўніцтва з імі. У сувязі з гэтым больш лаяльным было стаўленне да праваслаўнай Царквы, а каталіцкая

і пратэстанцкая канфесіі падвяргаліся большаму ўціску. Супраць духавенства ўсіх канфесій органы НКУС – МУС праводзілі рэпрэсіі, з боку партыйна-дзяржаўнага апарату ажыццяўляўся кантроль за іх дзейнасцю, абмяжоўвалася рэлігійнае жыццё, закрываліся храмы і малітоўныя дамы.

Шырокі размах набыло наступленне на рэлігію і Царкву ў хрушчоўскі перыяд. У планах партыі, якая абвясціла курс на будаўніцтва камунізму, «рэлігійныя забабоны» былі істотнай перашкодай. Да папярэдняга курсу на закрыццё манастыроў і храмаў і зняцце рэлігійных абшчын з рэгістрацый дадаліся масіраваная атэістычная прапаганда, якая была накіравана на ўсе слаі насельніцтва, праследаванне моладзі за ўдзел у рэлігійных абрадах.

Важнейшай асаблівасцю канфесійнай палітыкі савецкай дзяржавы, якая рэалізоўвалася і ў БССР, была арганізацыя атэістычнай работы, адносіны да рэлігіі як да перажыткаў мінулага, спробы яе выкаранення са свядомасці людзей, у першую чаргу дзяцей і моладзі. Рэлігійны фактар разглядаўся як істотны ў ідэалагічнай барацьбе дзвюх сістэм – капіталістычнай і сацыялістычнай, пры гэтым рэлігіі адводзілася роля абаронцы буржуазнага ладу.

У канцы ХХ ст. у сувязі з працэсамі дэмакратызацыі ў савецкай краіне, а затым абвяшчэннем суверэнітэту БССР адбылася пераацэнка ролі і месца рэлігіі і яе інстытутаў у жыцці беларускага грамадства, стварыліся  перадумовы для адраджэння рэлігійных арганізацый і хрысціянскіх каштоўнасцей. Карэнным чынам змянілася дзейнасць канфесій у Рэспубліцы Беларусь. Гэтаму спрыяла новае беларускае заканадаўства, а таксама канфесійная палітыка дзяржавы. Паміж органамі ўлады і рэлігійнымі арганізацыямі склаліся партнёрскія адносіны ў вырашэнні надзённых праблем грамадства.

З 1990-х гг. пачаўся новы этап канфесійнай гісторыі Беларусі, які прадаўжаецца па сённяшні дзень.

# ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДЛЯ САМАСТОЙНАГА ВЫВУЧЭННЯ ТЭМ

## Тэма 1. ХРЫСЦІЯНІЗАЦЫЯ РУСІ. ХРЫСЦІЯНСТВА Ў ГІСТОРЫІ ДЗЯРЖАЎ-КНЯСТВАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

1. Падрыхтуйце паведамленне аб старажытных вераваннях людзей.
2. Што такое язычніцтва (паганства)? Якія боствы існавалі ў старажытных славян ?
3. Што ўяўляе сабой хрысціянства? Якія асноўныя дагматы гэтай рэлігіі?
4. Чаму хрысціянства першапачаткова падвяргалася ганенням з боку рымскіх улад?
5. Якую ролю адыгрывала хрысціянства ў дзяржаўна-палітычным, грамадскім і культурным развіцці краін Еўропы?
6. Якія фактары спрыялі пранікненню хрысціянства на Русь?
7. Як вы ацэньваеце ролю князя Уладзіміра ў Хрышчэнні Русі?
8. Як адбывалася хрысціянізацыя княстваў на беларускіх землях?
9. Падрыхтуйце паведамленні аб першых знакамітых хрысціянах заходнерускіх (беларускіх) княстваў. У чым, на вашу думку, заключаецца іх духоўны подзвіг?
10. Пакажыце, як уплывала хрысціянства на быт, мараль, светапогляд славян.
11. На канкрэтных прыкладах раскрыйце ролю хрысціянства ў развіцці філасофскай і тэалагічнай думкі, летапісання, жывапісу, архітэктуры, мастацтва, міжнародных сувязяў старажытных княстваў на беларускіх землях.

## Тэма 2. РЭЛІГІЯ І ЦАРКВА НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У ПЕРЫЯД ВКЛ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIII – 1569 г.)

1. Пакажыце на канкрэтных прыкладах сувязь палітыкі і рэлігіі ў ВКЛ.
2. Якая існавала структура праваслаўнай Царквы ў ВКЛ? У склад якіх адміністрацыйна-царкоўных адзінак уваходзілі беларускія землі?
3. Якімі былі адносіны да праваслаўнай Царквы вялікіх князёў літоўскіх?
4. Чым было абумоўлена падпісанне Крэўскай уніі і ўвядзенне каталіцтва на Літве?

5. Які ўплыў аказала каталіцтва на ўнутранае і знешняе становішча ВКЛ?

6. Як адбывалася распаўсюджанне каталіцтва на беларускіх землях?

7. У чым сутнасць Рэфармацыі? У выніку якіх падзей яна ўзнікла?

8. Падрыхтуйце паведамленне аб ідэолагах Рэфармацыі М. Лютэры, Ж. Кальвіне, У. Цвінглі і іх веравучэнні.

9. У чым праявілася асаблівасць Рэфармацыі на беларускіх землях? Ахарактарызуйце плябейска-сялянскі і шляхецка-бюргерскі кірункі.

10. Назавіце дзеячаў Рэфармацыі ў ВКЛ. Якую ролю ў распаўсюджанні рэфармацыйных ідэй яны адыгралі?

11. Прывядзіце факты дзейнасці пратэстантаў на тэрыторыі беларускіх зямель.

12. Назавіце прычыны, якія прывялі да міжканфесійных канфліктаў на тэрыторыі ВКЛ у пачатку XVII ст.

13. Падрыхтуйце паведамленне аб іўдаізме і ісламе і іх распаўсюджанні на беларускіх землях.

14. Які ўплыў аказалі канфесіі на развіццё культуры, асветы, кнігадрукавання, мастацтва, архітэктуры беларускіх зямель?

## Тэма 3. РЭЛІГІЯ І ЦАРКВА НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У ПЕРЫЯД РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ (1569 г. – КАНЕЦ XVIII ст.)

1. Пералічыце прычыны, якія прывялі да падпісання Брэсцкай царкоўнай уніі.

2. Як адбывалася падрыхтоўка да Брэсцкага царкоўнага сабора? Якія рашэнні на ім былі прыняты?

3. У чым сутнасць уніяцкай Царквы? Як адбывалася распаўсюджанне уніі?

4. Чаму ў Рэчы Паспалітай у XVIII ст. узмацніліся канфлікты на рэлігійнай глебе? Як яны вырашаліся?

5. Ахарактарызуйце палітыку ўрада Рэчы Паспалітай у адносінах да іўдзеяў і мусульман.

6. Як была выкарыстана Расіяй сітуацыя з дысідэнтамі (некатолікамі) у Рэчы Паспалітай?

7. Ахарактарызуйце сутнасць і асноўныя напрамкі Контррэфармацыі, асаблівасці яе праўлення на беларускіх землях.

8. Які ўплыў аказала Контррэфармацыя на грамадска-палітычную і рэлігійную сітуацыю ў ВКЛ?

9. Падрыхтуйце паведамленні аб праваслаўных брацтвах і брацкіх школах.

10. Якая роль належала каталіцкаму Касцёлу ў ажыццяўленні Контрэфармацыі?

11. Вызначце ролю езуітаў у адукацыйным, культурным і сацыяльным развіцці беларускіх зямель.

12. Ахарактарызуйце становішча праваслаўнай Царквы на беларуска-літоўскіх землях. Чым быў выкліканы крызіс праваслаўя?

13. Пакажыце на канкрэтных фактах, якую ролю ў развіцці асветы, літаратуры, мастацтва, архітэктуры аказала кожная з дзеючых на беларускіх тэрыторыях канфесія.

## Тэма 4. РЭЛІГІЯ І ЦАРКВА НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У ПЕРЫЯД РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ (1772–1917 гг.)

1. Як змянілася канфесійная сітуацыя на беларускіх землях пасля далучэння іх да Расіі?

2. Назавіце асноўныя напрамкі канфесійнай палітыкі царскага ўрада на далучаных землях.

3. Ахарактарызуйце становішча каталіцкага Касцёла, праваслаўнай, уніяцкай Царквы, пратэстантаў, стараабрадцаў, іўдзеяў і мусульман пасля далучэння беларускіх зямель да Расіі.

4. Як адбывалася ліквідацыя ўніяцкай Царквы? Якую ацэнку атрымала гэтая падзея ў гісторыі?

5. Вызначце ролю каталіцкага Касцёла, духавенства ў паўстаннях 1830–1831, 1863–1864 гг.

6. Ахарактарызуйце змены, якія адбыліся пасля падаўлення паўстанняў у дзяржаўнай канфесійнай палітыцы.

7. Якой была рэакцыя Папскага Прастола на абмежаванні дзейнасці каталіцкага Касцёла ў Расіі?

8. Хто такія стараабрадцы? Раскажыце аб іх становішчы ў беларускіх губернях Расіі.

9. Як ажыццяўлялі місіянерскую дзейнасць пратэстанцкія дэнамінацыі?

10. Вызначце асаблівасці дзейнасці іўдзейскіх і мусульманскіх абшчын, іх адносіны з хрысціянамі.

11. У якіх умовах быў прыняты Указ цара Мікалая II «Аб умацаванні асноў верацярпімасці»? Прааналізуйце яго асноўныя палажэнні.

12. Якія змены наступілі ў рэлігійным жыцці і становішчы канфесій у сувязі з яго выкананнем?

13. Падрыхтуйце паведамленні аб ролі кожнай канфесіі ў этнічных і культурных працэсах на беларускіх землях.

## Тэма 5. СТАНОВІШЧА КАНФЕСІЙ Ў САВЕЦКАЙ ДЗЯРЖАВЕ І БЕЛАРУСІ (1917–1939 гг.)

1. Чаму з прыходам да ўлады бальшавікоў у кастрычніку 1917 г. пачалася татальная барацьба з рэлігіяй?

2. Дайце ацэнку Дэкрэту СНК РФ «Аб аддзяленні дзяржавы ад царквы і школы ад царквы», іншым заканадаўчым актам савецкага ўрада з пункту гледжання забеспячэння свабоды сумлення і гарантый дзейнасці рэлігійных арганізацый.

3. Прывядзіце прыклады, якія сведчаць аб мэтанакіраваным абмежаванні рэлігійных арганізацый, умяшальніцтве ўладных структур у іх дзейнасць.

4. Чым была выклікана экспрапрыяцыя ўладнымі органамі царкоўных каштоўнасцей ? Дайце вашу ацэнку гэтым фактам.

5. Якія ідэалагічныя сродкі выкарыстоўвала савецкая ўлада ў барацьбе з рэлігіяй?

6. Раскажыце аб дзейнасці Саюза ваяўнічых бязбожнікаў.

7. Якія змены адбываліся ў Рускай праваслаўнай Царкве пасля кастрычніцкай рэвалюцыі?

8. Растлумачце, чаму ў праваслаўнай Царкве адбыўся раскол на «ціханаўцаў» і «абнаўленцаў»? Якія ідэі прапаведваліся кожным з гэтых напрамкаў?

9. Ахарактарызуйце становішча іншых канфесій – каталіцкай, пратэстанцкай, іўдзейскай, мусульманскай.

10. Растлумачце, чаму савецкая ўлада праводзіла рэпрэсіі супраць духавенства і веруючых? У чым іх абвінавачвалі?

11. Якія вынікі барацьбы з рэлігіяй у БССР? Дайце ім ацэнку з пункту гледжання сённяшняга дня.

## Тэма 6. РЭЛІГІЙНАЕ ЖЫЦЦЁ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1920–1930-я гг.)

1. Якія факты сведчаць аб высокім узроўні рэлігійнасці насельніцтва Заходняй Беларусі?

2. Вызначце асноўныя напрамкі канфесійнай палітыкі польскага ўрада.

3. Чаму польскі ўрад быў зацікаўлены ў аўтакефаліі праваслаўнай Царквы ў Польшчы? Калі гэта адбылося?

4. Прывядзіце прыклады, якія сведчаць аб актыўнай дзейнасці каталіцкага Касцёла і праваслаўнай Царквы ў Заходняй Беларусі.

5. Якія праблемы існавалі ў каталіцкім Касцёле і як яны вырашаліся?

6. Раскажыце аб дзейнасці Беларускай хрысціянскай дэмакратыі і ксяндзоў-беларусаў.

7. Хто і чаму быў зацікаўлены ў паланізацыі і беларусізацыі праваслаўнай Царквы?

8. Як адбывалася адраджэнне Царквы візантыйска-славянскага абраду?

9. Якія фактары спрыялі актывізацыі пратэстанцкіх і неапратэстанцкіх дэнамінацый? Сярод якіх катэгорый насельніцтва яны праводзілі сваю дзейнаць?

10. Якую дзейнасць праводзілі мусульманскія і іўдзейскія абшчыны, стараабрадцы?

## Тэма 7. РЭЛІГІЙНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ Ў ГАДЫ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ І ВЯЛІКАЙ АЙЧЫНАЙ ВАЙНЫ (ВЕРАСЕНЬ 1939–1945 г.)

1. Раскажыце аб адносінах савецкай улады да рэлігіі і царквы ў заходніх абласцях БССР.

2. Як была ўспрынята савецкая ўлада духавенствам і веруючымі розных канфесій? Чаму каталіцкае духавенства падтрымала польскі антысавецкі рух у заходніх абласцях БССР?

3. Якія змены адбываліся ў дзейнасці канфесій і рэлігійным жыцці з устанаўленнем савецкай улады?

4. Чаму ў палітыцы Германіі рэлігійны фактар набываў асаблівае значэнне? Якія адносіны кіраўніцтва Рэйха былі да каталіцызму, пратэстантызму, праваслаўя?

5. Вызначце важнейшыя асаблівасці канфесійнай палітыкі Германіі на акупіраванай тэрыторыі Беларусі.

6. Якую пазіцыю ў адносінах да немцаў занялі асноўныя канфесіі ў Беларусі? Ці згодны вы з шырока распаўсюджаным у савецкай гістарыяграфіі сцвярджэннем, што каталіцкі Касцёл цалкам перайшоў на службу да акупантаў?

7. Чаму частка праваслаўнага духавенства імкнулася да стварэння аўтакефальнай нацыянальнай праваслаўнай Царквы і аддзялення ад Маскоўскай Патрыярхіі? Хто іх падтрымліваў у гэтых памкненнях?

8. Прывядзіце прыклады, якія сведчаць аб патрыятычнай пазіцыі праваслаўнай Царквы.

9. Якую місію ў час акупацыі выконваў каталіцкі Касцёл? Раскажыце аб яго дзейнасці.

10. Чаму нямецкія акупанты праводзілі рэпрэсіі супраць духавенства і веруючых усіх канфесій?

11. Выкажыце ваш пункт гледжання на праблему Халакоста і адносін хрысціянскіх канфесій да масавага вынішчэння яўрэяў.

12. Ці змянілася становішча рэлігійных арганізацый пасля вызвалення БССР ад нямецкіх акупантаў?

## Тэма 8. РЭЛІГІЯ І ЦАРКВА Ў САВЕЦКІМ ГРАМАДСТВЕ Ў ПАСЛЯВАЕННЫ ПЕРЫЯД (1945–1991 гг.)

1. Вызначце асаблівасці дзяржаўнай канфесійнай палітыкі ў савецкі перыяд. Ці адбыліся ў ёй змены ў параўнанні з даваенным часам і чаму?

2. Якія формы і метады кантролю за дзейнасцю рэлігійных арганізацый прымяняліся партыйнымі і ўладнымі структурамі? Ці не парушалі яны свабоду сумлення і рэлігійныя свабоды?

3. Чаму ў Беларусі стала магчымым руйнаванне культавых будынкаў, пераўтварэнне іх у культасветустановы, склады, знішчэнне царкоўнай маёмасці?

4. У сувязі з чым супраць духавенства ў пасляваеннае дзесяцігоддзе былі разгорнуты рэпрэсіі? Наколькі яны былі абгрунтаваны?

5. Чаму толькі з другой паловы 1980-х гг. пачаўся працэс рэабілітацыі духавенства – ахвяр сталінскіх рэпрэсій?

6. Якія змены адбыліся ў дзейнасці РПЦ? З якімі праблемамі сутыкалася праваслаўная Царква і як яны вырашаліся?

7. Ахарактарызуйце адносіны праваслаўнай Царквы і каталіцкага Касцёла ў пасляваенны перыяд. Што перашкаджала наладжванню міжканфесійнага дыялогу?

8. Якую дзейнасць праводзіў каталіцкі Касцёл? Чаму адносіны партыйна-савецкага кіраўніцтва да Касцёла і Ватыкана былі варожымі?

9. Чаму, нягледзячы на ўціск і масавую атэізацыю грамадства, Касцёл здолеў захаваць сябе як рэлігійны і сацыякультурны інстытут?

10. Які ўплыў на Касцёл у Беларусі аказалі Другі Ватыканскі сабор і дзейнасць папы Яна Паўла II?

11. Вызначце асаблівасці палітыкі савецкай улады ў адносінах да іншых веравызнанняў – пратэстантаў, іўдзеяў, мусульман. Што вам вядома аб дзейнасці гэтых канфесій у БССР?

## Тэма 9. РЭЛІГІЯ І ЦАРКВА Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

1. Пералічыце фактары, якія аказалі ўплыў на карэнныя змены дзяржаўна-канфесійных адносін ў СССР і БССР у другой палове 1980-х – пачатку 1990-х гг.?

2. Ахарактарызуйце заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб рэлігійных арганізацыях.

3. Як змяніліся адносіны да рэлігіі і Царквы ў беларускім грамадстве? Ці лічыце вы гэта заканамернай і прагрэсіўнай з’явай?

4. На канкрэтных прыкладах праілюструйце, як адбывалася адраджэнне рэлігійнага жыцця ў Рэспубліцы Беларусь.

5. Якую місіянерскую, дабрачынную, культурную і асветніцкую дзейнасць праводзяць рэлігійныя арганізацыі?

6. Раскажыце, як развіваюцца адносіны дзяржавы, мясцовых органаў улады з рэлігійнымі арганізацыямі ў вырашэнні надзённых праблем грамадства?

7. Падрыхтуйце паведамленні аб дзейнасці рэлігійных арганізацый (па выбару) у вашай мясцовасці.

8. Што такое неакульты або «новыя рэлігіі»? Якую небяспеку яны нясуць чалавеку і грамадству?

# СПІС РЭКАМЕНДУЕМАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. *Андреев, М. В.* Политика клерикального антикоммунизма (Ватикан, 1917–1987) / М. В. Андреев. – М., 1987. – 63 с.

2. *Апіок, Т. В.* Хрысціянскія канфесіі на беларусі ад старажытнасці да нашага часу / Т. В. Апіок. – Магілёў, 2000.

3. *Арлоў, У.* Еўфрасіння Полацкая / У. Арлоў. – Мінск, 1992.

4. Асветнікі зямлі беларускай. X – пачатак XX стагоддзя: энцыкл. даведнік / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2001. – 496 с.

5. Атеистический словарь. – М.: Политиздат, 1983. – 559 с.

6. *Бабосов, Е. М.* Современный католицизм и наука / Е. М. Бабосов. – Минск: Беларусь, 1964. – 320 с.

7. *Балтрушэвіч, Н. Г.* Становішча пратэстанцкай Царквы на Беларусі ў перыяд з 1943 па 1985 гг.: агульная характарыстыка / Н. Г. Балтрушэвіч // Весн. Брэсц. дзярж. ун-та. – 2007. – № 2. – С. 33–41.

8. Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя: Жыццяпісы. Мартыралогія. Успаміны / уклад. Ю. Гарбінскі. – Мінск: Мюнхен, 1999. – 752 с.

9. Беларусь: государство, религия, общество: материалы междунар. науч.-практ. конф., Минск – Жировичи, 7 июня 2007 г. / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории, Минск. Духовн. акад. м. Святителя Кирилла Туровского; редкол.: протоиерей В. Антоник [и др.]. – Минск: Беларус. наука, 2008. – 397 с.

10. *Бендин, А. Ю.* Проблемы веротерпимости в Северо-Западном крае Российской империи (1863–1914 гг.) / А. Ю. Бендин. – Минск: БГУ, 2010. – 439 с.

11. *Блинова, Т. Б.* Иезуиты в Беларуси: роль иезуитов в организации образования и просвещения / Т. Б. Блинова. – Гродно: ГрГУ им. Я. Купалы, 2002. – 427 с.

12. Бог жыве на Белай Русі. Бог і мова. Бог жыве ў нашых сэрцах: зб. – Мінск: Эказон-ДС, 1996. – 30 с.

13. *Болтрушевич, Н. Г.* Религиозная ситуация на территории Беларуси в годы Великой Отечественной войны (на примере протестантской конфессии) [Электронный ресурс] / Н. Г. Болтрушевич. – Режим доступа: www.cyberltnika.ru/article/n.

14. *Вабішчэвіч, А. М.* Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. М. Вабішчэвіч. – Брэст: БрДУ, 2008. – 319 с.

15. Верования и конфессии [в]: Беларусь: Народ. Государство. Время / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории; редкол.: А. М. Коваленя [и др.]. – Минск: Беларус. наука, 2009. – 879 с.

16. *Верашчагіна, А. У.* Гісторыя канфесій на Беларусі ў другой палове XX стагоддзя / А. У. Верашчагіна, А. В. Гурко. – Мінск: Ін-т сац.-паліт. даслед. пры Прэзідэнце Рэсп. Беларусь, 1999. – 136 с.

17. Верующий в условиях перестройки (динамика духовно-нравственных ориентаций): коллектив. монография. – М.: Главн. ред. науч. и учеб. лит-ры АОН при ЦК КПСС, 1989. – 139 с.

18. *Врублевский, А.* Репрессии против духовенства и верующих в советской Белоруссии в 1920–30-е годы [Электронный ресурс] / А. Врублевский. – Режим доступа: www.anton55555.wordpress.cjm/2011/05/16.

19. Второй Ватиканский собор. Конституции, Декреты, Декларации. – Брюссель, 1992. – 573 с.

20. Гісторыя Беларусі: падручнік: у 2 ч. / пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – Мінск: Выш. школа, 2007. – Ч. 1: Ад старажытных часоў – па люты 1917 г. – С. 60–70.

21. Гісторыя беларускага мастацтва: у 5 т. – Мінск: Навука і тэхніка, 1987–1994.

22. *Ганчар, А. І.* Деятельность римско-католического Костела по сохранению позиций католицизма на территории Беларуси (1864–1905 гг.): дис. … канд. ист. наук / А. И. Ганчар. – Гродно: ГрГУ им. Я. Купалы, 2007. – 200 с.

23. *Горбацкий, А. А.* Старообрядчество на белорусских землях / А. А. Горбацкий. – Брест, 2004. – 237 с.

24. *Горны, А. С.* Сінодзік пацярпелых за веру і Царкву Хрыстову ў Гродзенскай епархіі (XX стагоддзе) / А. С. Горны. – Гродна: ЮрСа-Прынт, 2014. – 147 с.

25. Государственно-конфессиональные отношения в Республике Беларусь: материалы заседания «круглого стола», 22 апр. 1999 г., Минск / науч. ред. И. В. Котляров. – Минск: ИСПИ при Администрации Президента Респ. Беларусь, 1999. – 57 с.

26. *Грыцкевіч, А. П.* Рэлігійнае пытанне і знешняя палітыка царызму перад падзеламі Рэчы Паспалітай / А. П. Грыцкевіч // Вес. Акад. навук БССР. Сер. грамадскіх навук. – 1973. – № 6. – С. 62–71.

27. *Гурко, А. В.* Конфессиональная ситуация в Республике Беларусь: этнический и исторический аспекты / А. В. Гурко. – Минск: ИСПИ при Администрации Президента Респ. Беларусь, 2001. – 104 с.

28. *Гурко, А. В.* Новые религии в Республике Беларусь: этнологические исследования / А. В. Гурко. – Минск, 2003.

29. *Густова, Л.* Церковное пение. Белорусская певческая культура православной традиции / Л. Густова. – Минск: Харвест, 2013. – 224 с.

30. *Дмитриев, М. В.* Православие и Реформация: реформационные движения в восточнославянских землях Речи Посполитой во второй половине XVI в. / М. В. Дмитриев. – М.: Изд-во МГУ, 1990. – 135 с.

31. *Довгяло, Н. В.* Межконфессиональные отношения в БССР в 20-е гг. XX века / Н. В. Довгяло // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. 2. Гісторыя. Эканоміка. Права. – 2010. – № 2. – С. 11–17.

32. Документы обличают: реакционная роль религии и церкви на территории Белоруссии. – Минск: Беларусь, 1967. – 272 с.

33. *Дорош, Н. И.* Православный Гродно / Н. И. Дорош. – Гродно, 2000. – 266 с.

34. *Жилинская, И.* Государственно-конфессиональные отношения в Республике Беларусь / И. Жилинская, Л. Земляков, Н. Коликова. – Минск, 2008.

35. Жития священномучеников Минской епархии. 1-я половина XX века / авт.-сост. Ф. Кривонос. – Минск: Изд. В. М. Скакун, 2002. – 176 с.

36. *Завальнюк, У.* Касцёлы царскай Расii / У. М. Завальнюк. – Мінск: Рымска-каталiцкая парафія св. Сымона і св. Алены, 2009. – Вып. 1. – 220 с.

37. *Завальнюк, У. М. кс.* Узняліся крыжы над святынямі / У. М. Завальнюк. – Мінск: Выданне касцёла св. Сымона і св. Алены, 1999. – 204 с.

38. *Загідулін, А. М.* Беларускае пытанне ў польскай нацыянальнай і канфесійнай палітыцы ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. М. Загідулін. – Гродна: ГрДУ імя Янкі Купалы, 2010. – 183 с.

39. *Загідулін, А. М.* Этнаканфесійная палітыка польскіх улад у Заходняй Беларусі (1921–193 гг.) / А. М. Загідулін. – Гродна: ГрДУ імя Янкі Купалы, 2007. – 71 с.

40. Закон Рэспублікі Беларусь «Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях»: прын. Вярхоўным Саветам Рэсп. Беларусь 17 снеж. 1992 г. // Звязда. – 1993. – 9 студ.

41. Закон Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь "Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях"»: прыняты Палатай прадстаўнікоў Нац. сходу Рэсп. Беларусь 27 чэрв. 2002 г.: адобр. Саветам Рэсп. 2 кастр. 2002 г. // Звязда. – 2002. – 5 кастр.

42. Закон СССР «О свободе совести и религиозных организациях»: принят Верховным Советом СССР 1 окт. 1990 г. // Правда. – 1990. – 9 окт.

43. *Земляков, Л. Е.* Религиозные процессы в Беларуси. Проблемы государственно-правового регулирования / Л. Е. Земляков. – Минск: РИВШ БГУ, 2001. – 208 с.

44. *Зноско, К.* Исторический очерк Церковной унии. Ее происхождение и характер [Электронный ресурс] / К. Зноско. – Режим доступа: www.razlib.ry/istoria.

45. Іканапіс Беларусі XV–XVIII стагоддзяў / склад. Н. Ф. Высоцкая. – Мінск: Беларусь, 1992. – 232 с.

46. *Канапацкая, З.* Ислам и татарская диаспора в Республике Беларусь [Электронный ресурс] / З. Канапацкая. – Режим доступа: www.elib.bsu.by.

47. Канфесіі на Беларусі (канец XVIII–XX стст.) / В. В. Грыгор'ева [і інш.]; пад навук. рэд. У. І. Навіцкага. – Мінск: Экаперспектыва, 1998. – 337 с.

48. Католицизм в Белоруссии: традиционализм и приспособление / К. К. Койта [и др.]; редкол.: А. С. Майхрович [и др.]; АН БССР, Ин-т философии и права. – Минск: Наука и техника, 1987. – 240 с.

49. *Киприанович, Г. Я.* Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве / Г. Я. Киприанович. – Минск: Изд-во Белорус. Экзархата, 2006. – 351 с.

50. *Коваленя, А. А.* Религия и церковь: краткий научно-популярный очерк / А. А. Коваленя [и др.]. – Минск: АРТЫ-ФЕКС, 1998. – 112 с.

51. *Корзун, М. С.* Русская православная церковь на службе эксплуататорских классов. X век – 1917 год / М. С. Корзун. – Минск: Беларусь, 1984. – 255 с.

52. *Короткая, Т. П.* Религиоведение: религии в Беларуси / Т. П. Короткая. – Минск: БГЭУ, 2004. – 98 с.

53. *Короткая, Т. П.* Старообрядчество в Белоруссии / Т. П. Короткая, Е. С. Прокошина, А. А. Чудинова. – Минск: Навука і тэхніка, 1992. – 117 с.

54. *Кривонос, Ф., прот.* Лекции по истории Православной Церкви Беларуси / Ф. Кривонос. – Минск: ВРАТА, 2012. – 238 с.

55. *Кулагін, А. М.* Каталіцкія храмы на Беларусі: энцыкл. даведнік / А. М. Кулагін. – Мінск: БелЭн, 2000. – 216 с.

56. *Кулагін, А. М.* Праваслаўныя храмы на Беларусі: энцыкл. даведнік / А. М. Кулагін. – Мінск: БелЭн, 2000. – 328 с.

57. *Лебедев, А.* Костёл и власть на Гомельщине (20–30-е годы XX в.) / А. Лебедев, В. Пичуков, С. Ласковски, кс. – Варшава; Люблин; Гомель, 2009. – 470 с.

58. *Линкевич, В. Н.* Взаимоотношения католичества и православия в белорусских губерниях во 2-й половине XIX – начале XX в. [Электронный ресурс] / В. Н. Линкевич. – Режим доступа: www.zapadrus.su/zaprus/tradbl.903.

59. *Лыч, Л.* Уніяцкая царква ў Беларусі: этнакультурны аспект / Л. Лыч. – Мінск: Кнігазбор, 2010.

60. *Мараш, Я. Н.* Политика Ватикана и католической церкви в Западной Белоруссии. 1921–1939 / Я. Н. Мараш. – Минск: Беларусь, 1983. – 96 с.

61. *Марзалюк, І. А.* Этнічны і канфесійны свет беларускага горада XVI–XVIII стст. / І. А. Марзалюк. – Магілёў: МагДУ імя А. Куляшова, 2007. – 164 с.

62. *Марозава, С. В.* Берасцейская царкоўная унія 1596 г. у беларускай гістарыяграфіі / С. В. Марозава. – Гродна: ГрДУ імя Я. Купалы, 2002. – 132 с.

63. *Марозава, С. В.* Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596–1839 гады) / С. В. Марозава. – Гродна:ГрДУ імя Янкі Купалы, 2001. – 352 с.

64. *Мартинович, В. А.* Введение в понятийный апарат сектоведения: пособие для студентов Института теологии БГУ / В. А Мартинович. – Минск: БГУ, 2008. – 103 с.

65. *Мартос, А. архиеп.* Беларусь в исторической, государственной и церковной жизни / А. Мартос. – Минск: Белорус. экзархат Рус. Православ. Церкви, 1990. – 300 с.

66. *Навіцкі, У. І.* Палітыка КПСС – КПБ у адносінах да рымска-каталіцкай царквы ў Беларусі (1944–1965) / У. І. Навіцкі // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь: стан і перспектывы развіцця: матэрыялы II Усебеларус. канф. гісторыкаў, Мінск, 10–11 кастр. 1997 г. / М. П. Касцюк (навук. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДУ, 1999. – С. 206–209.

67. Неокульты: «новые религии» века? / Е. С. Прокошина [и др.]; под ред. А. С. Майхровича. – Минск: Четыре четверти, 2000. – 240 с.

68. *Новикова, Л. Г.* Религиозность в Беларуси на рубеже веков: тенденции и особенности проявления: социологический аспект / Л. Г. Новикова. – Минск: БТН–информ, 2001. – 132 с.

69. Новые религиозные движения. Материалы для самостоятельной работы. Для студентов всех факультетов / сост. Г. Е. Каданчик. – Горки, 2009. – 21 с.

70. Образование, наука и духовно-культурная жизнь в западнобелорусском регионе [в]: Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921–1953 гг.: в 2 кн. / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории; редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. – Минск: Беларус. навука, 2014. – Кн. 1. – С. 477–554.

71. *Опиок, Т. В.* Конфессиональная политика в БССР в 1920–1930-е гг.: учеб. пособие для студентов IV курса ист. ф-та / Т. В. Опиок. – Могилев: УО «МГУ им. А. А. Кулешова, 2011. – 104 с.

72. О религии и церкви: сб. высказываний классиков марксизма-ленинизма, документов КПСС и Советского государства / сост.: А. М. Залесский, Т. Г. Крупченя. – Минск: Беларусь, 1983. – 123 с.

73. Основы социальной концепции Русской Православной Церкви / Юбилейный Архиерейский Собор Русской Православной Церкви. – М., 2000. – 88 с.

74. *Падокшын, С. А.* Унія. Дзяржаўнасць. Культура (Філасофска-гістарычны аналіз) / С. А. Падокшын. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2000. – 111 с.

75. Поместный Собор Русской Православной Церкви. Троице-Сергиева Лавра, 6–9 июня 1988 г.: материалы. – М.: Изд. Моск. Патриархии, 1990. – 480 с.

76. Православие в духовной жизни Беларуси: сб. материалов междунар. науч.-практ. конф., Брест, 25–26 апр. 2007 г. / УО БрГУ им. А. С. Пушкина; Брест. епархия БПЦ; редкол.: М. Э. Чесновский [и др.]. – Брест: БрГУ им. А. С. Пушкина, 2008. – 295 с.

77. Православие в духовной жизни Беларуси: сб. материалов II междунар. науч.-практ. конф., Брест, 4–5 мая 2011 г. / УО БрГУ им. А. С. Пушкина; Брест. епархия БПЦ; редкол.: М. Э. Чесновский [и др.]. – Брест: БрГУ им. А. С. Пушкина, 2012. – 156 с.

78. Проникновение христианства в Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: www.ehuhelp.blogspot.com/2013//11/blogpost_2201.html.

79. *Рапов, О. М.* Русская церковь в IX – первой трети XII в. Принятие христианства / О. М. Рапов. – М.: Высш. шк., 1988. – 416 с.

80. Рэлігія і царква на Беларусі: энцыкл. даведнік / Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларус. энцыкл., 2001. – 366 с.

81. *Свирид, А. Н.* История униатской церкви в Западной Беларуси (1921–1939 гг.) / А. Н. Свирид. – Брест: БрГУ, 2012. – 220 с.

82. *Силова, С. В.* Крестный путь. Белорусская Православная Церковь в период немецкой оккупации 1941–1944 гг. / С. В. Силова. – Минск: Белорус. Экзархат, 2005. – 71 с.

83. *Смиловицкий, Л.* Особенности советской религиозной политики в Беларуси в послевоенный период (1944–1956 гг.) [Электронный ресурс] / Л. Смиловицкий. – Режим доступа: www.thepointjournal/jutput/index.hp.

84. *Старостенко, В. В.* Религии в современной Беларуси / В. В. Старостенко. – Могилев: МГУ им. А. А. Кулешова, 2013. – 60 с.

85. *Табунов, В. В.* Политика российского правительства по отношению к христианским вероисповеданиям в Беларуси в конце XIX – начале XX столетий / В. В. Табунов. – Могилев: МГУ им. А. Кулешова, 2009. – 30 с.

86. *Тихонов, А. К.* Католики, мусульмане и иудеи Российской империи в XVIII – начале XX в. / А. К. Тихонов. – СПб.: СПбГУ, 2008. – 365 с.

87. *Траццяк, І. І.* Беларускае каталіцкае духавенства ля вытокаў сацыякультурнай ідэнтыфікацыі / І. І. Траццяк. – Гродна: ГрДУ імя Янкі Купалы, 2013. – 267 с.

88. *Траццяк, Я.* Беларускае духавенства ў першай палове XX ст. [Электронны рэсурс ] / Я. Траццяк. – Режим доступа: www.pdf.kamunikat.org/2166 - 5.pdf.

89. *Трусов, И. Г.* Православные храмы Гродно / И. Г. Трусов. – Минск: Мэджик Бук, 2008. – 100 с.

90. *Филатова, Е. Н.* Конфессиональная политика царского правительства в Беларуси 1772–1860 гг. / Е. Н. Филатова. – Минск: Белорус. наука, 2006. – 192 с.

91. Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа: зб. навук. арт.: у 2 ч. / рэдкал.: Э. С. Ярмусік [і інш.]. – Гродна: ГрДУ імя Янкі Купалы, 2009.

92. *Черепица, В. Н.* Очерки истории Православной Церкви на Гродненщине / В. Н. Черепица. – Гродно: ГрГУ им. Янки Купалы, 2005. – Ч. II. – 440 с.

93. *Шиленок, Дм., свящ.* Из истории Православной Царкви в Беларуси (1922–1939) / Дм. Шиленок. – М.: Из-во Крутиц. подворья, 2014.

94. Этнокультурные процессы Гродненского Понеманья в прошлом и настоящем/ А. В. Гурко [и др.]. – Минск: Беларус. навука, 2014. – 447 с.

95. *Яноўская, В. В.* Хрысціянская царква ў Беларусі 1863–1914 гг. / В. В. Яноўская. – Мінск: БДУ, 2002. – 199 с.

96. Ян Павел II – чалавек веры і культуры: матэрыялы міжнар. сімпозіума, Мінск, 25 ліст. 2006 г. – Мінск: Про Хрысто, 2006. – 143 с.

97. *Ярмусик, Э. С.* Католический Костёл в Белоруссии в годы Второй мировой войны (1939–1945 гг.) / Э. С. Ярмусик. – Гродно: ГрГУ им. Янки Купалы, 2002. – 240 с.

98. *Ярмусик, Э. С.* Католический Костёл в Беларуси в 1945–1990 годах / Э. С. Ярмусик. – Гродно: ГрГУ им. Янки Купалы, 2006. – 568 с.

# ЗМЕСТ

**УВОДЗІНЫ** .......... 3

**Тэма 1. ХРЫСЦІЯНІЗАЦЫЯ РУСІ. ХРЫСЦІЯНСТВА Ў ГІСТОРЫІ ДЗЯРЖАЎ-КНЯСТВАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ** .......... 5

1.1. Дахрысціянскія вераванні нашых продкаў. Перадумовы пранікнення і ўвядзення хрысціянства на беларускіх землях .......... 7
1.2. Хрысціянства, яго сутнасць і прычыны ўзнікнення .......... 10
1.3. Хрышчэнне Русі князем Уладзімірам .......... 12
1.4. Хрысціянізацыя насельніцтва княстваў заходніх зямель Русі .......... 14
1.5. Роля хрысціянства ў развіцці культуры беларускіх зямель .......... 17

**Тэма 2. РЭЛІГІЯ І ЦАРКВА НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У ПЕРЫЯД ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIII – 1569 г.)** .......... 21

2.1. Праваслаўе на беларуска-літоўскіх землях .......... 23
2.2. Крэўская унія. Распаўсюджанне каталіцтва .......... 25
2.3. Рэфармацыя: сутнасць, яе сацыяльная і антыкаталіцкая накіраванасць .......... 27
2.4. Рэфармацыйны рух на Беларусі .......... 28
2.5. Іншыя рэлігійныя вызнанні: іўдаізм і іслам .......... 34
2.6. Уплыў рэлігіі на развіццё культуры беларускіх зямель .......... 36

**Тэма 3. РЭЛІГІЯ І ЦАРКВА НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У ПЕРЫЯД РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ (1569 г. – КАНЕЦ XVIII ст.)** .......... 43

3.1. Брэсцкая царкоўная унія. Распаўсюджанне ўніяцтва на беларускіх землях .......... 45
3.2. Рэлігійныя праблемы ў дзяржаве. Пашырэнне ўплыву каталіцызму .......... 47
3.3. Контррэфармацыя і яе вынікі .......... 49
3.4. Праваслаўе на беларуска-літоўскіх землях .......... 54

3.5. Уплыў рэлігіі на развіццё адукацыі, літаратуры, мастацтва, архітэктуры беларускіх зямель ........................ 58

**Тэма 4. РЭЛІГІЯ І ЦАРКВА НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У ПЕРЫЯД РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ (1772–1917 гг.)** ..................... 65

4.1. Змяненне статусу і ролі канфесій у беларускіх губернях Расіі ........................ 67
4.2. Скасаванне Брэсцкай царкоўнай уніі ........................ 69
4.3. Становішча каталіцкага Касцёла на далучаных землях ........................ 70
4.4. Паўстанне 1863 г. і яго ўплыў на дзяржаўна-канфесійную палітыку царскага ўрада ........................ 73
4.5. Стараабрадцы ў беларускіх губернях ........................ 78
4.6. Пратэстантызм у канфесійнай структуры беларускіх губерняў ........................ 80
4.7. Нехрысціянскія веравызнанні: іслам, іўдаізм ........................ 84
4.8. Указ цара Мікалая ІІ «Аб умацаванні асноў верацярпімасці» і яго наступствы ........................ 88
4.9. Царква, Касцёл у этнакультурных працэсах на беларускіх землях ........................ 91

**Тэма 5. СТАНОВІШЧА КАНФЕСІЙ У САВЕЦКАЙ ДЗЯРЖАВЕ І БЕЛАРУСІ (1917–1939 гг.)** ........................ 97

5.1. Ідэалагічныя і заканадаўчыя асновы савецкай канфесійнай палітыкі ........................ 99
5.2. Эканамічнае, палітычнае і ідэалагічнае наступленне на рэлігію і Царкву ........................ 101
5.3. Спробы расколу праваслаўнай Царквы ........................ 105
5.4. Становішча іншых канфесій ........................ 107
5.5. Рэпрэсіі супраць духавенства і веруючых ........................ 110

**Тэма 6. РЭЛІГІЙНАЕ ЖЫЦЦЁ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1920–1930-я гг.)** ........................ 115

6.1. Канфесійная палітыка польскага ўрада ........................ 117
6.2. Дзейнасць каталіцкага Касцёла ........................ 119
6.3. Праваслаўная Царква і яе аўтакефалія ........................ 121
6.4. Неапратэстантызм, каталіцкі Касцёл візантыйска-славянскага абраду і іншыя вызнанні ........................ 123

**Тэма 7. РЭЛІГІЙНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ Ў ГАДЫ СУСВЕТНАЙ І ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ (ВЕРАСЕНЬ 1939–1945 г.)** ........ 127

7.1. Рэлігійнае жыццё ў заходніх абласцях БССР (верасень 1939 – 22 чэрвеня 1941 г.) ........ 129
7.2. Канфесійная палітыка нямецкіх акупацыйных улад у Беларусі ........ 131
7.3. Становішча і дзейнасць праваслаўнай Царквы ........ 134
7.4. Каталіцкі Касцёл ва ўмовах нямецкай акупацыі ........ 137
7.5. Рэпрэсіі акупантаў супраць духавенства і веруючых ........ 139
7.6. Становішча канфесій пасля вызвалення Беларусі ад нямецкіх акупантаў ........ 141

**Тэма 8. РЭЛІГІЯ І ЦАРКВА Ў САВЕЦКІМ ГРАМАДСТВЕ Ў ПАСЛЯВАЕННЫ ПЕРЫЯД (1945–1991 гг.)** ........ 145
8.1. Асаблівасці савецкай дзяржаўна-канфесійнай палітыкі .. 147
8.2. Рэпрэсіі супраць духавенства ........ 150
8.3. Праваслаўная Царква і яе дзейнасць ........ 152
8.4. Каталіцкі Касцёл: становішча ў грамадстве, напрамкі дзейнасці ........ 155
8.5. Пашырэнне ўплыву пратэстанцкіх абшчын ........ 158

**Тэма 9. РЭЛІГІЯ І ЦАРКВА Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ** ........ 161

9.1. Змяненне дзяржаўна-канфесійных адносін і іх уплыў на актывізацыю рэлігійнага жыцця ........ 163
9.2. Павышэнне ролі Беларускай праваслаўнай Царквы ў грамадстве ........ 166
9.3. Дзейнасць каталіцкага і грэка-каталіцкага Касцёла ........ 169
9.4. Асаблівасці развіцця пратэстантызму ........ 172
9.5. Іўдаізм, іслам, нетрадыцыйныя рэлігіі ў канфесійнай структуры Беларусі ........ 175

**ЗАКЛЮЧЭННЕ** ........ 179

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДЛЯ САМАСТОЙНАГА ВЫВУЧЭННЯ ТЭМ** .. 183

**СПІС РЭКАМЕНДУЕМАЙ ЛІТАРАТУРЫ** ........ 190

Вучэбнае выданне

**Ярмусік** Эдуард Станіслававіч

# КАНФЕСІЙНАЯ ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

Вучэбны дапаможнік

Рэдактар *Н. В. Баярава*
Камп'ютарная вёрстка *С. С. Рухавай*
Карэктар *І. М. Падамацька*

Падпісана да друку 20.09.2016. Фармат 60×84/16.
Папера афсетная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 11,6. Ум.-выд. арк. 12,1. Тыраж 230 экз. Заказ 60.

Выдавец і паліграфічнае выкананне
дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/174 ад 12.02.2014.
Вул. Маскоўская, 15, 220007, г. Мінск.